АЎТАР БЕСТСЕЛЕРАЎ

**ДЖОН БЭВІР**

# НАБЛІЗІЦЦА ДА БОГА

Жыццё блізкіх адносін з Богам

Дарагі сябар,

у Бібліі шмат цудоўных абяцанняў. Усе яны праўдзівыя і ўсе яны маюць патэнцыял змяніць наша жыццё, але адно з самых выбітных абяцанняў у тым, што Бог прагне ведаць вас <u>блізка</u>!

Мы знаходзім гэтае найвялікшае запрашэнне ў кнізе Якуба: «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас» (4:8). Спыніцеся на хвіліну і паразважайце: Творца сусвету, зямлі і ўсяго, што яе напаўняе, шукае вашай прысутнасці. Але не толькі прысутнасці. Ён таксама жадае быць блізкім да вас, бо мы ведаем, што Ён – Бог, Які сур'ёзна ставіцца да адносінаў з вамі.

Гэтае фантастычнае (і трывалае) запрашэнне Творцы сусвету адкрывае магчымасць не толькі здалёк пакланяцца Яму, але і мець настолькі блізкія і насычаныя адносіны з Ім, што вы будзеце ведаць Яго сэрца, а Ён – ваша.

Сябры, заклікаю вас прыняць гэтае запрашэнне, выправіцца ў цудоўнае і дзівоснае падарожжа, наблізіцца да Айца і быць блізка да Божага сэрца.

Ваш брат у Хрысце,



MessengerX

Джон
JohnBevere@ymail.com

Messenger INTERNATIONAL

АЎТАР БЕСТСЕЛЕРАЎ

**ДЖОН БЭВІР**

# НАБЛІЗІЦЦА ДА БОГА

Жыццё блізкіх адносін з Богам

**Drawing Near,** Belarusian, by John Bevere
© 2025 Messenger International
MessengerInternational.org
Originally published in English as Drawing Near

Additional resources in Belarusian by John and Lisa Bevere are available for free download and video streaming at **MessengerX.com** and on the **MessengerX** App
To contact the Author: JohnBevere@ymail.com

This book is a gift from Messenger International and is
NOT FOR SALE

**Наблізьцеся да Бога,** Джон Бэвір, на беларускай мове
© 2025 Messenger International
MessengerInternational.org
Пераклад з англійскай Drawing Near

Дадатковыя рэсурсы на беларускай мове аўтарства Джона і Лізы Бэвіраў можна бясплатна спампаваць ці праглядзець на: **MessengerX.com** і ў праграме **MessengerX**.
Звязацца з аўтарам: JohnBevere@ymail.com

Гэтая кніга – падарунак ад служэння Messenger International
і НЕ ПРЫЗНАЧАЕЦЦА ДЛЯ ПРОДАЖУ

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

App Store – гандлёвая марка Apple Inc., зарэгістраваная ў ЗША і іншых краінах.
Google Play і лагатып Google Play – гандлёвыя маркі Google LLC.

# ЗМЕСТ

*УСТУП* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . V

*Раздзел 1* НАЙВЯЛІКШАЕ ЗАПРАШЭННЕ УСІХ ЧАСОЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

*Раздзел 2* БОЖЫ ПОШУК. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

*Раздзел 3* АБАРАНЯЙ СВОЙ ГОЛАД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*Раздзел 4* ЛЮБОЎ ДА ЯГО ПРЫСУТНАСЦІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

*Раздзел 5* ЗА ЗАВЕСАЙ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

*Раздзел 6* СЯБРЫ БОГА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

*Раздзел 7* ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ САПРАЎДНАЙ БЛІЗКАСЦІ? . . . . . . . . . . . . . 107

*Раздзел 8* САПРАЎДНАЕ ПАКЛАНЕННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135

*Раздзел 9* З КІМ ЖЫВЕ БОГ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151

*Раздзел 10* БЛІЗКАСЦЬ СА СВЯТЫМ ДУХАМ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

*Раздзел 11* АБЯЦАННЕ АЙЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193

*Раздзел 12* МОВА БЛІЗКАСЦІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221

*Раздзел 13* ПОЎНАЯ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ ВЕРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 249

*Раздзел 14* НАБЛІЗІЦЦА ДА БОГА. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 273

*ДАДАТАК А*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285

*ДАДАТАК Б* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 291

# УСТУП

У 1991 годзе Бог выразна прамовіў да мяне: «Сыне Мой, Я хачу, каб ты напісаў кнігу».

Наступныя дні былі напоўнены супярэчлівымі эмоцыямі. З аднаго боку, мяне ахапіў страх, які бамбардзіраваў мой розум думкамі пра непазбежную няўдачу; з другога — мне хацелася смяяцца. Я цярпець не мог ніякай пісаніны! Калі ў школе задавалі творчыя работы, я гадзінамі глядзеў на пустыя старонкі. Потым я праваліў моўную частку выпускных экзаменаў SAT. Выключная непрыязнь да ўсяго звязанага з літаратурай прывяла мяне на інжынерную спецыяльнасць у каледжы.

І вось Бог кажа мне напісаць кнігу. Ні ў якім разе! Я нешта няправільна пачуў, разважаў я. Таму я адгарадзіўся ад гэтых думак, але праз дзесяць месяцаў без справы Бог паслаў да мяне дзвюх жанчын з двух розных штатаў. На працягу двух тыдняў адна ад адной яны паўтарылі аднолькавыя словы,

ласкава і цвёрда папярэдзіўшы: «Джон, калі ты не напішаш кнігі, якія Госпад даў табе, Ён аддасць іх камусьці іншаму. Але за гэта ты станеш перад Яго судом».

Калі я пачуў другую жанчыну, мяне ахапіў страх Гасподні, які пераважыў мой страх і нелюбоў да пісьма. Я пачаў. Я памятаю, што здарылася, калі я прыняў рашэнне паслухацца: калі я набіраў тэкст, у мяне хутка з’яўляліся думкі, якія раней ніколі не прыходзілі ў галаву. Я хутка зразумеў: гэта не мая, а Божая вестка. З таго дня прайшло шмат гадоў; цяпер пасланні, якія Бог даў у выглядзе кніг, перакладзены на сто трыццаць моваў, выдадзены дзясяткамі мільёнаў кніг і распаўсюджваюцца па ўсім свеце.

Пасля напісання першай кнігі я даў Богу асабістае абяцанне, што ніколі не напішу кнігу толькі дзеля таго, каб пісаць. Я буду пісаць толькі тады, калі Ён скажа мне гэта зрабіць. Гэта абяцанне было выпрабавана: кожны год з 1992 па 1999 Бог даваў мне пасланне, якое я мусіў напісаць. Але пасля напісання «Under Cover» я тры гады не меў слова ад Бога адносна кнігі. Выдаўцы часта звярталіся да мяне з пытаннем, якой будзе мая наступная кніга і ці могуць яны яе апублікаваць, але я нічога не пісаў, бо яшчэ не меў слова ад Бога.

Нарэшце, праз тры гады Бог зноў даў слова: пасланне, якое вы зараз трымаеце ў руках. Я ўпэўнены, што адна з прычын затрымкі была звязана з працай, якую Святому Духу трэба было зрабіць ува мне і маім сэрцы да нараджэння гэтай кнігі. Я веру ў Госпада ўжо дваццаць пяць гадоў, але ніколі не адчуваў такой прагі быць побач з Ім. За апошнія паўтара года я стаў бліжэй да Госпада, чым калі-небудзь раней. Я ніколі раней столькі не плакаў. Гэтыя пачуцці перапаўнялі мяне ў гасцінічных нумарах, самалётах, офісе, машыне, дома і на прыродзе, калі я мэтаскіравана маліўся.

## УСТУП

Рэальнасць Яго прысутнасці ніколі не была такой яскравай і адчувальнай.

Я веру, што гэтая кніга — плод навучання Святым Духам. У ёй вы знойдзеце запрашэнне ад Бога, які прагне блізкасці з вамі, Яго дзецьмі. Перад пачаткам чытання я хацеў бы памаліцца разам. Прамаўляйце гэтыя словы ўсім сэрцам і ведайце, што я малюся імі за вас ўслых у сваім кабінеце. Мы маем абяцанне Ісуса: «калі двое з вас на зямлі згодзяцца адносна любой справы, дык што ні папросяць, станецца ім ад Айца Майго, Які ў небе» (Мц. 18:19). Давайце памолімся разам:

*Ойча, у імя Ісуса, я прашу, каб у час чытання гэтай кнігі Ты адкрыў мне вочы, каб бачыць, і вушы, каб чуць, і даў мне сэрца, якое будзе ўспрымаць і разумець. Я жадаю хадзіць у блізкасці з Табой і рабіць гэта пастаянна. Я жадаю ведаць Тваю мудрасць, волю, сакрэты і тое, што Ты любіш, а таксама знаходзіцца ў Тваёй прысутнасці. Няхай гэтае пасланне прынясе не толькі разуменне, але і сілу перамяняць маё жыццё на вобраз Твайго дарагога Сына і майго Госпада Ісуса. Бо калі Ён хадзіў па гэтай зямлі, Ён дасканала з'яўляў Тваю славу Сваёй блізкасцю да Цябе. Няхай я таксама з'яўляю славу Ісуса, набліжаючыся да Яго праз асобу Святога Духа. Я аддаю гэта зараз Табе і загадзя дзякую Табе за перамены, якія Ты зробіш ува мне, калі я пачую і прыслухаюся да Тваіх натхнёных слоў у гэтай кнізе. Дзякую Табе, што маё жыццё ніколі не будзе такім жа. Я прашу гэтага ў згодзе з Тваім слугой Джонам Бэвірам. Амэн.*

Цяпер верце і дзякуйце Богу за тое, што Ён адказаў на вашу шчырую малітву. Я радуюся, ведаючы, што ўжо цяпер

УСТУП

Святы Дух пачынае рыхтаваць вас да большай блізкасці, уздымаючы вашу малітву да святога трона Адзінага, хто можа сапраўды задаволіць кожнае ваша жаданне. Няхай Айцец, Ісус і Святы Дух стануць для вас больш рэальнымі, чым раней!

З павагай,<br>
Джон Бэвір<br>
лістапад 2003 г.

Раздзел 1

# НАЙВЯЛІКШАЕ ЗАПРАШЭННЕ УСІХ ЧАСОЎ

«Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас»
ЯКУБА 4:8

З сэрца Божага гучыць заклік — не, нават крык — інтэнсіўнасць якога штодня узмацняецца: «Чаму ты задаволены без Маёй прысутнасці? Чаму ты застаешся далёкім, калі можаш мець блізкасць са Мной?»

У кожнага з нас ёсць сябры ці людзі, якімі мы захапляемся і з якімі хочам быць бліжэй. Яны займаюць асаблівае месца ў нашых сэрцах, і бавіць час з імі прыемна, асабліва калі гэта адбываецца па іх запрашэнні. Просьба далучыцца да іх напаўняе нас чаканнем, радасцю і захапленнем. Мы з радасцю шукаем час у сваім календары і прымаем іх запрашэнне.

У Пасланні Якуба мы знаходзім найвялікшы заклік усіх часоў: «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас» (4:8).

Спыніцеся на хвіліну і падумайце пра гэта: Творца Сусвету, зямлі і ўсіх яе жыхароў жадае вашай прысутнасці. Не толькі прысутнасці, але і блізкіх адносінаў з намі, бо мы чытаем: «Ён – Бог зайздросны» (Вых. 34:14).

Гэта нязменнае жаданне Бога. Ён запрашае нас, бо прагне, каб Яго дзеці ведалі Яго. Каб адкрыць шлях да такіх блізкіх адносін, з моманту грэхападзення чалавецтву спатрэбіліся тысячы гадоў, складаная падрыхтоўка і велізарная цана. Ян, адзін з найбліжэйшых сяброў Ісуса, казаў:

> «Ніхто ніколі не бачыў Бога; адзіны непаўторны Сын, або адзінародны Бог, Які знаходзіцца ва ўлонні [у інтымнай прысутнасці] Айца, Ён з’явіў Яго [Ён адкрыў Яго і вывеў Яго туды, дзе Яго можна бачыць; Ён растлумачыў Яго і даў Яго ведаць]» (Ян 1:18, сучасны пашыраны пераклад).

Адам ведаў Госпада тварам у твар; але з-за граху, або непаслушэнства, быў аддзелены ад слаўнай Божай прысутнасці, і яго лёс стаў лёсам усяго чалавецтва. Мужчыны і жанчыны больш не маглі бачыць або ведаць Бога, як некалі Адам. Аднак Айцец усім сэрцам, поўным спачування, прагнуў вызваліць нашу супольнасць ад гэтага жудаснага наканавання. У адказ Ён паслаў Ісуса, які быў з Айцом ад пачатку, Бога, з’яўленага ў целе, каб заплаціць цану, якая вызваліць нас ад цемры і прымірыць нас з Богам, калі мы прымем Яго як нашага Госпада.

Аднак гэтае ўз’яднанне Бога і чалавека не прапаведавалася і не перажывалася ў поўнай меры. Мы падкрэслівалі вызваленне ад граху і смерці, але забыліся абвясціць блізкія адносіны, якія чакаюць усіх вызваленых. Такое занядбанне дорага нам каштуе і можа

стаць катастрафічным, бо многія прапускаюць прыгажосць блізкага пазнання Бога. Падзеі, падобныя на гэту трагедыю, разыгрываліся ў Старым Запавеце з нашчадкамі Абрагама.

## Два абсалютна розныя матывы

Мяне заўсёды здзіўляў кантраст поглядаў і паводзінаў Майсея ў параўнанні з яго сваякамі, народам Ізраіля. Кніга Выхаду пачынаецца з пакут нашчадкаў Абрагама ў жорсткім палоне. Габрэі былі ў Эгіпце амаль чатырыста гадоў. Спачатку да іх ставіліся добра, але неўзабаве яны былі паняволеныя і з імі сталі жорстка абыходзіцца. У роспачы габрэі пачалі прасіць Бога пра вызваленне.

Госпада кранулі іх малітвы, і Ён паслаў вызваліцеля на імя Майсей, які нарадзіўся ў сям'і габрэяў, але пазбегнуў рабства і быў выхаваны як унук фараона ў яго доме. Як князь Эгіпта, ён быў узрушаны цяжкім становішчам братоў, але вымушана ўцёк у пустыню, каб выратаваць сваё жыццё і каб праз тры гады вярнуцца і Божым Словам і сілай вызваліць Ізраіль з рабства.

Вызваленне Ізраіля з эгіпецкага рабства сімвалізуе наша вызваленне з рабства граху. Эгіпет — вобраз свету, а Ізраіль — вобраз царквы. Калі мы нараджаемся нанова, мы вызваляемся ад сістэмы тыраніі і прыгнёту свету.

Няцяжка ўявіць, як жорстка эгіпцяне эксплуатавалі народ Ізраіля і здзекваліся з яго. Спіны ізраільцянаў спаласавалі шнары ад наглядчыцкіх бізуноў; народ Ізраіля жыў у трушчобах і кепска харчаваўся. У іх не было надзеі на спадчыну, бо яны былі рабамі, праца якіх стварала дабрабыт эгіпцян. Яны плакалі, калі тысячы немаўлят-сыноў забілі па загадзе фараона.

Нягледзячы на ўсю гэту жорсткасць, іх памяць была

кароткай. Нават пасля вызвалення з Эгіпта кожны раз, калі нешта ішло не так, яны шкадавалі пра ўцёкі з рабства і высмейвалі ўласныя малітвы пра вызваленне, кажучы «*лепш нам было* ў Эгіпце». Яны нават нахабна прапаноўвалі: «Паставім сабе правадыра і вернемся ў Эгіпет» (Лк. 14:4, *курсіў аўтара*).

Але Майсей вылучаўся тым, што толькі для яго адзінага ўмовы ў Эгіпце былі лепшымі; на самой справе, ніхто ў свеце не жыў так камфортна. Яго выхаваў самы багаты чалавек на зямлі; ён жыў у найлепшым доме, еў найлепшае, апранаўся ў найлепшае і вучыўся ў найлепшых. Слугі клапаціліся пра ўсе яго патрэбы і выконвалі жаданні, бо яго спадчынай былі вялізныя багацці і абяцанні. Майсей добраахвотна адмовіўся ад усяго гэтага і, у адрозненне ад народа Ізраіля, ніколі не азіраўся назад і не прагнуў таго, што засталося ў Эгіпце.

У чым жа розніца? Справа ў тым, што Майсей сустрэў Бога. Ён убачыў агонь і наблізіўся. Ён сустрэў жывога Бога ў палаючым кусце на Сінаі; а Ізраіль — не! Калі Госпад паклікаў Майсея, той наблізіўся. Пазней, калі дзецям Ізраіля зрабілі яшчэ лепшае запрашэнне, яны адступілі (гл. Вых. 20:18–21).

Я вельмі часта пытаюся ў цэркваў: «Куды Майсей вёў народ Ізраіля, калі яны выйшлі з Эгіпту?» Звычайны адказ — «у абяцаную зямлю». Але гэта не так. Ён накіроўваўся да гары Харэў, або Сінай. Успомніце словы Бога да фараона праз Майсея: «Адпусьці народ Мой, і ён будзе служыць Мне ў пустыні» (Вых. 7:16). Ён не казаў: «Адпусці народ Мой, каб яны маглі атрымаць зямлю ў спадчыну». Навошта было Майсею весці народ у абяцаную зямлю, не пазнаёміўшы з Тым, Хто даў абяцанне, з Жаданым вякоў? Калі б Майсей спачатку прывёў іх у абяцаную зямлю, яны б палюбілі абяцанні больш, чым Таго, Хто абяцаў, Самога Бога. Майсей

не мог дачакацца, каб прывесці ізраільцянаў у тое самае месца, дзе ён сустрэўся з Богам.

Мы часта рабілі тое самае і ў нашых цэрквах: больш прапаведавалі пра тое, што Ісус зробіць для нас, а не пра тое, кім Ён ёсць на самой справе! У выніку выхавалі многіх, хто служыць Богу ў першую чаргу дзеля карысці, а не дзеля радасці ведання Яго. Гэта можна параўнаць з жанчынай, якая выходзіць замуж за мужчыну дзеля грошай; яна не хоча ведаць мужа такім, які ён ёсць, а шукае таго, што ён можа зрабіць для яе. На нейкім узроўні, магчыма, яна яго і кахае, але па цалкам няправільных прычынах.

Людзі, якія падкрэсліваюць дабраславенні Бога ў шкоду адносінам з Ім, нараджаюць вучняў, якія прыходзяць да Бога, каб нешта атрымаць, а не тых, хто ідзе да Яго за тое, кім Ён ёсць. Бог не падобны ні на кога іншага, і ніхто не параўнаецца з Яго цудам. Як толькі мы сустракаем Бога, як сведчыць досвед Майсея, усе абяцанні адыходзяць на задні план. Госпад нашмат цудоўнейшы за ўсё ў свеце, нават за Яго дабраславенні.

Галоўнай мэтай Бога ў вызваленні Ізраіля было тое, каб яны маглі пазнаць і палюбіць Яго. Ён жадаў адкрыцца ім і сказаў: «Я… вас насіў на крылах арліных, і прынёс вас да Сябе» (Вых. 19:4). Аднак ізраільцяне прапусцілі свой лёс.

Божае жаданне блізкасці са Сваім народам ніколі не змяншалася і не змянялася, бо гэтае жаданне пастаянна адкрываецца ў Яго Слове і адлюстравана ў гарачай малітве Паўла:

> [Бо я заўсёды малюся] каб Бог Госпада нашага Ісуса Хрыста, Айцец славы, даў вам Духа мудрасьці і адкрыцьця [разумення таямніц і сакрэтаў] у [глыбокім і блізкім] пазнаньні Яго. (Эф. 1:17, *курсіў аўтара*)

Бог абвясціў Сваё прагненне і жадае, каб кожнае народжанае звыш дзіця глыбока і блізка спазнала Яго! Ці радуе гэта вас? Калі не, падумайце над гэтымі словамі хвіліну і дазвольце гэтаму цуду напоўніць вас.

Мы служым жывому Богу, Айцу і Творцу, чыё сэрца баліць за Сваіх дзяцей. Ён камунікуе з намі і жадае нашага адказу. Павел хутка звярнуў на гэта ўвагу вернікаў з Карынфа, якія змагаліся з рознымі пытаннямі: «Вы ведаеце, што, калі былі вы паганамі, да *ідалаў безгалосых* скіроўваліся, быццам вялі вас» (1 Кар. 12:2–3). У закліку Паўла мы бачым адну з асноўных характарыстык, якая адрознівае Бога, нашага Айца, ад усіх фальшывых багоў і ідалаў, — Ён гаворыць!

## «З’едзь з дарогі»

Нядаўна, калі я ехаў у машыне, Святы Дух прамовіў да майго сэрца: «Я хачу табе нешта сказаць. З’едзь з дарогі».

Я навучыўся: калі Бог кажа мне нешта зрабіць, я павінен імгненна падпарадкавацца незалежна ад таго, наколькі дробязным ці нязручным гэта мне здаецца. Хіба ж не быў Майсей на другім баку пустыні, пасвіўшы статкі свайго цесця, калі Госпад прыцягнуў яго ўвагу (Бог робіць гэта ў розныя спосабы)? Бог падышоў да куста і прымусіў палаць, не згараючы.

Мы чытаем, што Майсей сказаў сабе: «Пайду і пагляджу» (Вых. 3:3). Слова *«пайду»* паходзіць ад габрэйскага слова *сиwr*. Джэймс Стронг, эксперт па арыгінальных мовах Святога Пісання, вызначае гэта слова як «павярнуць». Майсей свядома адхіліўся ад запланаваных дзеянняў, каб адгукнуцца на заклік Святога Бога.

Калі Майсей адказаў, мы чытаем: «І ўбачыў ГОСПАД, што ён зьвярнуўся паглядзець... і паклікаў яго Бог з сярэдзіны куста, і сказаў: «Майсей, Майсей!»

Бог паклікаў Майсея па імені, толькі калі ўбачыў, што той адхіліўся ад звыклага маршруту. Я думаю, калі б Майсей не адказаў, Госпад не пайшоў бы далей. Бог не клікаў яго, калі статкі былі ў загонах Етры, гэта быў не самы зручны час. Раптам бы Майсей падумаў: *«Калі я не прыгляджу за статкамі, яны паўсюль разбрыдуцца і мне прыйдзецца некалькі гадзін, а можа і цэлы дзень, збіраць іх. Я падыйду сюды пазней, калі ўсё будзе пад кантролем і я зраблю ўсе свае справы».* Ці быў бы вынік такім самым?

Нехта можа меркаваць, што Бог мусіў зрабіць нешта яшчэ больш драматычнае, але ці адпавядае гэта Божай прыродзе? Узгадайце Самуэля, калі ў маладосці ён служыў першасвятару Гэлію і яго сынам (гл. 1 Сам. 3). Аднойчы ўвечары Самуэль кладзецца спаць і чуе голас, які кліча: «Самуэль! Самуэль!»

Самуэль бяжыць да Гэлія і кажа: «Вось я, бо ты клікаў мяне».

Гэлій адказвае: «Я цябе не клікаў, вяртайся ў ложак».

Самуэль зноў чуе, што яго клічуць па імені другі раз, і бяжыць да святара, але атрымлівае той самы адказ. Так паўтараецца тры разы, і нарэшце святар разумее і раіць хлопчыку, як адказаць. У чацвёрты раз, калі хлопчык чуе: «Самуэль! Самуэль!» — ён ведае, як адказаць: «Гавары, бо слуга Твой слухае». Тады Госпад гаворыць і паказвае яму Сваю волю і таямніцы, якія адкрыюцца пазней.

Бог мог бы зрабіць інакш. Магчыма, калі Ён убачыў, што Самуэль не разумее, Ён мог бы сказаць: «Самуэль, не бяжы да Гэлія! Гэта Я, Госпад, твой Бог, клічу цябе. Я хачу гаварыць з табой». Але ці Божы гэта шлях? Бог жадае, каб Яго прагнулі і прызнавалі, а таксама каб Яго ведалі. Ён шукае руплівых духам, тых, хто будзе шукаць і імкнуцца да Яго, нават калі гэта патрабуе ўпартасці і настойлівасці.

Гледзячы на Евангеллі, мы бачым падобную заканамернасць.

Ісус заканчвае карміць пяць тысяч чалавек пяццю хлябамі і дзвюма рыбамі. Потым Ён кажа вучням сесці ў лодку і паплыць перад Ім на другі бок мора. Ён ідзе на гару, каб правесці час з Айцом. Пазней мы чытаем, што ў той жа вечар, калі вучні ўсё яшчэ змагаліся з ветрам, каб пераплысці мора,

> Каля чацвёртай варты ночы прыходзіць да іх, ідучы па моры, і *хацеў абысьці іх*. (Марка 6:48, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу на словы: «*хацеў абысьці іх*». У іншым перакладзе гаворыцца: «*і хацеў прайсці міма іх*». Аднак, убачыўшы Ісуса, вучні закрычалі, і Ён адказаў: «Будзьце пэўныя! Гэта Я; не бойцеся». Ён увайшоў у лодку, і вецер сціх. Калі б вучні не закрычалі, Ён пайшоў бы далей і прайшоў бы побач. Калі б яны не закрычалі, Ісус не стаў бы навязвацца ім.

Здаецца, Божая заканамернасць — зрабіць крок да нас, і, калі мы адгукаемся, Ён робіць яшчэ крок і падыходзіць бліжэй. Калі мы не адгукаемся, Ён не настойвае і не перапыняе абраны намі курс дзеянняў. Хто ведае, ці чакаў бы Бог, калі б Майсей не збочыў з дарогі, як Ён зрабіў у выпадку з Самуэлем, а Ісус — у выпадку са Сваімі вучнямі? Ён часта чакае, пакуль мы не станем дастаткова галоднымі, каб адказаць на Яго голас.

Вяртаючыся да прыкладу на пачатку раздзела: што, калі б я не з’ехаў з дарогі, калі Ён звярнуўся да мяне? Ці прапусціў бы я сустрэчу з Ім? Я ўпэўнены, бывалі такія выпадкі, але тады праз кіламетр акурат быў прыпынак ля трасы. У той момант, калі я з’ехаў з дарогі, я пачуў, як Дух Божы шапнуў майму сэрцу: «Ці не казаў Я вам: “несупынна маліцеся?”» (1 Фес. 5:17).

Я адказаў: «Так, Госпад, казаў».

Ён спытаў далей: «Малітва — гэта маналог ці дыялог?»

Я адказаў: «Гэта дыялог, Госпад, двухбаковая размова».

Яго словы прагучалі хутка: «Што ж, калі Я сказаў маліцца несупынна, гэта азначае, што Я гатовы камунікаваць з табой несупынна!»

Само сабой зразумела, што я ўсхваляваўся. Я зразумеў цудоўную магчымасць, якую атрымаў, і яна тычылася не толькі мяне, але і кожнага з Яго дзяцей.

Вы можаце спытаць: *вы маеце на ўвазе, што Бог будзе гаварыць несупынна*? Гэта не тое, што Ён сказаў майму сэрцу. Ён сказаў, што гатовы камунікаваць несупынна. Словы — гэта толькі адна з многіх разнастайных формаў камунікацыі. Мая жонка можа зірнуць на мяне, і я ведаю, што яна кажа, хоць не прагучала ні слова. Часам я магу апісаць тое, што яна сказала адным сваім позіркам, на трох старонках. Чаму? Я пражыў з ёй больш за дваццаць гадоў і навучыўся спосабу і манеры яе камунікацыі. Калі б вы былі побач і ўбачылі такі позірк, для вас ён нічога не значыў бы. Чаму? Таму што вы не ведаеце яе так, як я. Насамрэч, першыя некалькі гадоў нашага шлюбу я мог таксама не разумець яе думку. Цяпер, пасля дваццаці аднаго года разам, я даведаўся крыху больш пра яе спосабы камунікацыі.

## Заклік наблізіцца

Важна ведаць, што гэтая кніга — не кіраўніцтва, «як рабіць», а хутчэй карта, якая паказвае шлях да нашага канчатковага пункта прызначэння — сэрца Бога. Калі у мяне будзе карта скарбаў, якая паказвае шлях да закапаных скарбаў на бязлюдным востраве, яна не прынясе мне карысці, пакуль я не адпраўлюся на востраў і не азнаёмлюся з мясцовасцю, каб арыентавацца; а потым мне трэба будзе

прыкласці намаганні, каб пераадолець сцежкі, узабрацца на скалы і перасекчы даліны на шляху да схаванага скарбу. З майго боку спатрэбяцца пэўныя выдаткі, энергія і намаганні. Карта толькі падкажа шлях і дапаможа не марнаваць час, а таксама засцеражэ ад схаваных пастак. Гэтая кніга падобная да такой карты: яна запрашае далучыцца да мяне ў цудоўным і захапляльным падарожжы — падарожжы да сэрца Бога. Слова Божае, якое зміяшчаецца на гэтых старонках, засцеражэ вас ад ям, пастак і небяспек, што паспрабуюць збіць вас са шляху. Яно павінна ўберагчы вас ад непатрэбных праблем і марнай траты сілаў.

Таму, калі вы гатовыя, пачнем!

## Пытанні для вывучэння

1. Якая падзея або перажыванне ў жыцці выклікала ў вас жаданне прачытаць гэтую кнігу?
2. Разгледзьце наступныя прыклады Божага запрашэння наблізіцца:
   - Майсей убачыў палаючы куст і павярнуўся, каб разабрацца. Пры гэтым Бог паклікаў яго.
   - Малады чалавек Самуэль пачуў голас чатыры разы, перш чым адказаў: «Гавары, бо слуга Твой слухае».
   - Калі вучні ўбачылі Ісуса, які ішоў па вадзе так, быццам хацеў прайсці міма іх — яны закрычалі.

Якi з гэтых прыкладаў найлепш апісвае Божае запрашэнне да вас? Ці адгукнуліся вы? Калі так, то якім быў ваш адказ?

3. Разважаючы пра малітву як дыялог, двухбаковую размову, падумайце, што Бог казаў вам як вусна, так і невербальна?

Раздзел 2

# БОЖЫ ПОШУК

Госпад сказаў: «Я лічыў цябе вышэйшым за Сябе».

Біблія перадае асноўныя тэмы; гэтыя ісціны праходзяць ад кнігі Быцця да Адкрыцця. Адна з такіх тэмаў — гарачае жаданне Бога мець зносіны з чалавекам. Відавочна, Бог хоча наблізіцца да нас нават больш, чым мы жадаем наблізіцца да Яго!

Ён сапраўды прагне нас (гл. Як. 4:5). Слова *«прагнуць»* азначае «моцна жадаць». Гэтае глыбокае жаданне прысутнічала ў Яго сэрцы ад пачатку часоў. Пасля грэхападзення Адама першыя словы Бога не былі абвяшчэннем суду. Наадварот, Ён спытаўся: «Адам, дзе ты?» Ці чуеце вы шчыры крык Яго сэрца: «Чаму ты хаваешся ад Мяне?» Давайце паглядзім на Яго прагненне да адносін з намі на працягу гісторыі.

## Прапрапраўнук Адама

Прапрапраўнука Адама звалі Энох. Я думаю, аднойчы Энох пайшоў да Адама і папрасіў яго расказаць пра час, праведзены ў садзе, бо хацеў ведаць, як гэта: сапраўды хадзіць з жывым Богам. Вы можаце здзівіцца: якім чынам Энох мог размаўляць са сваім прапрапрадзедам? І вось адказ: калі дажыць да 930 гадоў, можна ўбачыць шмат пакаленняў сваіх прапрапра... унукаў. Калі нарадзіўся Энох, Адаму было ўсяго 622 гады.

Матэматычна мы бачым з Бібліі, што Адаму было 687 гадоў, калі Энох, ва ўзросце 65 гадоў, звярнуўся да яго. Гэта вынікае з кнігі Быцця: Энох хадзіў з Богам трыста гадоў, хоць пражыў 365 гадоў.

> І хадзіў Энох з Богам… трыста гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок. І былі ўсе дні Эноха трыста шэсьцьдзясят пяць гадоў (Быц. 5:22–23).

Верагодна, што ў 65 гадоў для Эноха ўсё змянілася, калі ён атрымаў дабраслаўленне з вуснаў патрыярха Адама і пачуў пра яго душэўны боль.

Я магу толькі ўяўляць, у мяне няма дакументаў, якія б гэта пацвярджалі, але магчыма, Эноху спатрэбіліся гады, каб набрацца смеласці, пайсці да знакамітага продка і спытаць пра сад. Адам не вельмі жадаў гаварыць пра тыя падзеі. Усе нашчадкі Адама ведалі гэта і, хутчэй за ўсё, з маладосці папярэджвалі Эноха, каб той не абмяркоўваў такую тэму з Адамам.

Гістарычныя габрэйскія крыніцы кажуць пра дэпрэсію, якую Адам перажыў пасля выгнання з саду. Цяжар быў невыносным. У некаторых крыніцах распавядаецца, як Адам і Ева сядзелі ў цёмных пячорах, не ў сілах паглядзець адзін

на аднаго ад сораму за тое, што адбылося. Адам страціў сваю велічнасць. Адна справа — чуць пра абяцанне хадзіць з Богам, але зусім іншая — страціць адчувальную рэальнасць знаходжання ў Яго славе. Адам пацярпеў невымоўную страту, але Энох настойваў, выкарыстаўшы старажытны аповед Адама пра душэўны боль і дадаўшы сваю веру і чаканні. Хоць ранейшыя пакаленні расчаравана абмяркоўвалі страту Адама, Энох заўважыў абяцанне: «Я буду хадзіць з Богам».

Я ўяўляю сабе іх сустрэчу. Энох баяўся, але яго запал нарэшце пераўзышоў страх. У дрыготкіх ценях паразы ён настойліва верыў у святло чагосьці большага. Для яго гісторыя Адама была не проста гісторыяй няўдачы; гэта было адкрыццём найвышэйшага жадання Бога хадзіць з чалавекам. Цікава, ці ўбачыў Адам агонь Эноха, калі перадаваў далёкае дабраславенне, знойдзенае ва ўспамінах пра яго дні ў райскім садзе.

Адам плакаў, калі распавядаў балючыя ўспаміны: «Энох, я хадзіў з Ім... у Ягонай славе. Творца сусвету, Творца ўсяго, што ты бачыш, хадзіў побач са мной! Ён падзяліўся вялікай мудрасцю Сваёй задумы: як Сваімі рукамі Ён падвесіў і размясціў зоркі сусвету; як гэтыя самыя рукі стварылі мяне, а потым трымалі мяне за руку. Ён назваў кожную зорку па імені і ўстанавіў іх для адрознення пораў года і як знакі для падарожнікаў. Ён паказаў мне, як выраўняў зямлю гравітацыйнымі і электрамагнітнымі палямі і стварыў ідэальны клімат. Ён падзяліўся таямніцамі насення і распавёў, як насенне прыносіць плод паводле свайго роду; як крыніцы бездані, мудра размешчаныя па ўсёй Зямлі, паліваюць яго. Энох, Ён даверыў мне прывілей назваць усіх жывёл — больш за пяць мільярдаў відаў! Мы абмяркоўвалі назвы разам, але Ён пакінуў канчатковы выбар за мной!»

Чым больш Адам гаварыў, тым больш прагнуў Энох, пакуль прагненне не адолела яго. Ён мусіць хадзіць з Богам, як Адам; ён не прымаў адмоўнага адказу.

Энох атрымаў у спадчыну нават тое, што не атрымаў Адам: пыл Адама вярнуўся ў зямлю, аднак у Кнізе Быцця гаворыцца: «І хадзіў Энох з Богам; і ня стала яго, бо забраў яго Бог» (Быц. 5:24). Энох пакінуў гэтую зямлю, не ўбачыўшы смерці.

У жыцці Энох быў вялікім прарокам. Ён гаварыў да свайго часу, а таксама прарочыў да нашага — пра самазванцаў, якія паўстануць у царкве ў апошнія дні, паводзячы сябе так, быццам яны выратаваныя Божай ласкай (і нават верачы ў гэта), і пра суд, што прыйдзе пасля (гл. Юды 1:15). Энох бачыў відзежы Божага суду, абвяшчаючы другое прышэсце Госпада за тысячы гадоў да Яго беззаганнага нараджэння.

Чаму Бог забраў Эноха, калі яму было ўсяго 365 гадоў? Ці было гэтаму прычынай вялікае прароцкае служэнне? Не, прычынай было тое, што Энох «хадзіў з Богам», і Ліст да Гебраяў кажа нам, што Энох «спадабаўся Богу» (Гебр. 11:5).

Зразумейце мяне правільна. Хаджэнне з Богам прывяло да магутнага і эфектыўнага служэння, але Богу спадабалася менавіта гарачае жаданне Эноха блізка пазнаць Яго. Крануўшы Божае сэрца, Энох меў блізкія адносіны з Богам так, як Ён гэтага прагне.

## Крык Божага сэрца на працягу стагоддзяў

Бог прагне гэтага многа стагоддзяў! Ён шукае людзей, якія жадалі б спазнаць Яго ў адказ на Яго жаданне ведаць нас! Пасля Эноха быў Ной, яшчэ адзін прапрапраўнук, які кранул сэрца Бога. У Кнізе Быцця гаворыцца: «Ной хадзіў з Богам» (Быц. 6:9). Ной адгукнуўся на Божае жаданне мець адносіны з

чалавекам і наблізіўся да Яго. Калі Ной наблізіўся да Бога, Бог наблізіўся да яго і папярэдзіў пра тое, што адбудзецца. Суд, які заспеў свет знянацку, спачатку быў таямніцай паміж Ноем і Богам. Блізкія адносіны Ноя з Богам паўсталі з упэўненасці, што Бог адкажа тым, хто шукае Яго, тым, хто адважваецца паверыць і наблізіцца, каб адчуць блізкасць з Ім.

Мы зноў бачым гэта на прыкладзе Абрагама, калі Бог запрашае: «хадзі перад абліччам Маім» (Быц. 17:1). Гэтае запрашэнне паўтараецца для Ісаака і Якуба; яшчэ да нараджэння Якуба Бог сказаў: «Якуба Я палюбіў» (Рым. 9:13). Госпад шукаў Якуба, як Ён шукае усіх нас, нават калі той не шукаў Бога. Калі Якуб уцёк ад брата, ён знайшоў Бога, Які чакаў, каб прыцягнуць яго ўвагу. Калі Якуб спаў на камені, Бог даў яму ў сне відзеж лесвіцы, па якой падымаліся і спускаліся анёлы. Адкрылася сувязь, усталяваная Богам паміж Ім і чалавекам.

Пасля чатырохсот гадоў няволі дзеці Ізраіля, нашчадкі Якуба, былі збянтэжаны Яго галоўнай мэтай вызваліць іх з няволі. Яны думалі, што ўсё гэта звязана з атрыманнем у спадчыну абяцанай зямлі, але Божая мэта была значна большай. Найвышэйшым жаданнем Бога была блізкасць з Яго народам, і Ён выразна выказаў Свае намеры, калі звярнуўся да ўсяго народа з гарачымі і паэтычнымі словамі:

> Вы бачылі, што Я зрабіў Эгіпту, а вас насіў вас на крылах арліных і *прынёс вас да Сябе*. (Вых. 19:4, *курсіў аўтара*)

Аднак Яго жаданні не адлюстроўваліся ў словах народа Ізраіля: іх размова паказвае зусім іншы матыў: «Але ж ты не ўвёў нас у зямлю, якая ацякае малаком і мёдам, і ня даў нам на ўласнасьць палёў і вінаграднікаў» (Лікі 16:14). Іх

сэрцы былі засяроджаныя на тым *што*, а не на тым *Каго* яны павінны былі атрымаць у спадчыну.

Майсей неаднаразова тлумачыў Божае жаданне нашчадкам Абрагама; адзін з такіх каментарыяў быў запісаны:

Зайздросны імя Ягонае, Ён — Бог зайздросны (Вых. 34:14).

Бог абвясціў усяму Ізраілю: «Я палюбіў цябе». Але ў няведанні і жорсткасці сэрца яны адказалі: «У чым Ты палюбіў нас?» (Мал. 1:2) Сляпыя да таго, што Божае сэрца прагнула іх, яны памылкова ўспрынялі Яго спробы звярнуцца да іх як асуджэнне.

Нават пасля неаднаразовай непаслухмянасці ізраільцянаў Яго жаданне заставалася нязменным. У дні Ярэміі Бог усклікнуў: «Я прамаўляў да вас, прамаўляючы безупынна, а вы ня слухалі, і клікаў вас, а вы не адгукаліся» (Яр. 7:13). Ён даў зразумець, што імкнуўся прыцягнуць іх увагу такім чынам з таго дня, як вывеў іх з Эгіпта, і да гэтага моманту (гл. Яр. 7:25).

Пры ўсім гэтым Бог ніколі не вагаўся ў Сваёй любові, але найвялікшы доказ Яго ўсепаглынальнага жадання мець стасункі з намі адкрываецца ў Ісусе. Сам Ісус тлумачыць: «Я, Сын Чалавечы прыйшоў знайсьці і *збавіць* тое, што было загінуўшы» (Лк. 19:10, *курсіў аўтара*). Ён не толькі прыйшоў збавіць; Ён прыйшоў таксама знайсці, нават калі мы былі Яго ворагамі!

## Яго думкі пра кожнага з нас

Калі мы любім іншага чалавека, мы часта думаем пра яго. Мы заўважаем, што часта звяртаемся да яго ў думках на працягу дня, а часам нават і бачым у сне. Мы можам нават шчыра падзяліцца з іншымі, як часта мы прагнем іх

супольнасці і звяртаемся да іх у думках. Бог не выключэнне. Ён адкрываў Давіду Свае думкі пра нас. Давід распавядае пра цудоўныя разважанні, якія Бог мае адносна кожнага з нас:

> Якія каштоўныя для мяне думкі Твае, Божа, якая вялікая безьліч іх! Лічу іх, але іх больш, чым пяску. Я буджуся, і я ўсьцяж з Табою (Пс. 139:17–18).

Гэта складана зразумець, але Яго думкі пра кожнага з нас пераўзыходзяць колькасць ўсіх пясчынак на зямлі! Задумайцеся на хвіліну, уявіце пясчынкі, сабраныя з усёй планеты: з кожнага пляжу, пустыні, возера, мора і дна акіяна, і, вядома ж, з кожнага поля для гольфа. Калі Я гляджу толькі на адну пясчаную ямку на полі для гольфа, то не магу ўявіць сабе колькасць пясчынак у ёй адной. Тым не менш, Бог гаворыць пра кожную пясчынку на зямлі! Неспасцігальная колькасць! За апошні дваццаць адзін год у мяне было шмат прыемных думак пра жонку, але ўсе мае разважанні нават у самы багаты на ўражанні дзень наўрад ці напоўнілі б маленечкі слоік, не кажучы ўжо пра ўсю зямлю!

## Вы імкняцеся да таго, што цэніце

Такія думкі прызначаны для тых, каго вы любіце, прагнеце і з кім жадаеце блізкасці! Ці пачынаеце вы разумець, наколькі Бог любіць вас? Ці знаходзілі вы калі-небудзь час паразважаць пра тое, колькі вы значыце для Бога? Робячы пакупкі, мы ходзім па крамах, дзе шмат тавараў з цэннікамі. Некаторыя тавары са зніжкай, іншыя — дарагія; кожны мае кошт у адпаведнасці з каштоўнасцю. Але калі мы будзем мудрымі пакупнікамі, мы заўсёды купім рэчы, кошт якіх для нас такі ж або большы за тое, што мы за іх плацім.

Усё ў жыцці мае пэўную каштоўнасць. Гэтая каштоўнасць вызначаецца ўспрыманнем пакупніка. Некалькі гадоў таму ў ЗША на продаж быў выстаўлены бейсбольны мяч. Але гэта быў не проста нейкі мяч, а той самы, які выбіў Марк МакГвайр у сваім сямідзясятым хоум-ране. У той момант ён усталяваў рэкорд вышэйшай лігі па колькасці хоум-ранаў, адбітых за сезон. Мяч прадалі за 2,7 мільёны долараў! Нават калі б я меў такія грошы, я б дакладна не заплаціў столькі за той мяч. Чаму? Таму што ён не быў для мяне такім каштоўным. Тым не менш, я чытаў, што некаторыя людзі, маючы магчымасць, заплацілі б за яго яшчэ больш. Але цяпер рэкорд па хоум-ранах пабіты і наўрад ці б хто заплаціў нават долю названай сумы за калісьці вельмі жаданы мяч. Яго каштоўнасць знізілася.

Такім чынам, пытанне не ў тым, наколькі вялікая наша каштоўнасць для грамадства. Яна можа быць рознай. Нават каштоўнасць чалавечага жыцця для розных людзей розная, бо ёсць мільёны бацькоў, якія забіваюць сваіх ненароджаных дзяцей. Нязручнасці для іх важнейшыя за жыццё дзіцяці. Ёсць мужы, якія пакідаюць жонак і дзяцей, бо не лічаць адносіны вартымі свайго часу і энергіі. Іх уласны камфорт і задавальненне значна больш каштоўныя для іх, чым жыццё іх жонкі або дзяцей. Ёсць тыя, хто прадае сваё цела ў прастытуцыі. Спіс бясконцы, у ім мільёны параненых у нашым грамадстве. Ёсць тыя, хто адчувае сябе нелюбімым або нежаданым, бо яны ўбачылі сваю каштоўнасць вачыма іншых.

## Наша каштоўнасць для Бога Айца

У чым наша каштоўнасць для Бога? Менавіта ў ёй мы знаходзім сваю сапраўдную каштоўнасць. Бог, а не людзі, устанаўлівае стандарт каштоўнасці ў гэтым свеце. Бо «што

вельмі высока ў людзей, тое агіда перад Богам» (Лукі 16:15).

Ісус сказаў: «Бо якая карысьць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь сьвет, а душы сваёй пашкодзіць? Або што дасьць чалавек у выкуп за душу сваю?» (Мц. 16:26) Падумайце на хвіліну пра ўсе багацці ў гэтым свеце. Падумайце пра асабнякі, што каштуюць мільёны; пра каштоўныя камяні і каштоўныя металы; пра цудоўныя аўтамабілі, яхты і самалёты; пра найноўшую электроніку, і гэта толькі некаторыя з «прыемных» рэчаў. У свеце ёсць яшчэ так шмат скарбаў, што гэта немагчыма ўявіць. Нядаўнія даследаванні ацэньваюць валавы сусветны прадукт у 35,8 трыльёнаў долараў ЗША. Гэта 35 800 000 000 000 долараў. Якое вялікае багацце, і гэта яшчэ не ўлічваючы нерухомасць! Тым не менш, Ісус кажа нам, што чалавек, які абменьвае сваё жыццё на ўсё гэта багацце, заключае дрэнную здзелку!

Калі наша сапраўдная каштоўнасць, вызначаная Богам, большая за ўсё багацце ў гэтым свеце, то якая наша каштоўнасць для Яго? Мы чытаем: «Бо так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго Адзінароднага аддаў» (Ян 3:16). Праз грэх Адам аддаў нас пад уладу злога князя Люцыфера (гл. Лк 4:6). Непаслушэнства Адама распаўсюдзілася на ўсіх нас, і мы былі рабамі граху, сферы, над якой валадарыць Люцыфер. Ён заявіў правы на нас і не адпускаў нас. Нашым прызначэннем была вечная цемра без надзеі на вызваленне. Адзіны спосаб вызваліцца — быць выкупленымі, але надзвычай высокую цану не мог заплаціць ніводзін чалавек.

Бог аддаў Ісуса як выкуп за нас. Ніхто і нішто іншае не магло б стаць такім выкупам, бо Госпад кажа: «Ніхто выбавіць брата ня можа і даць за яго выкуп Богу, бо вельмі дарагая цана за душу ягоную» (Пс 49:8). Бог так высока цэніць нашы душы, што Ён адкупіў нас Самім Ісусам. Павел кажа: «Бо вы

купленыя дарагою цаною» (1 Кар. 6:20). Апостал паўтарае, што зрабіў нам Айцец, «у Якім маем адкупленьне праз кроў Яго, … паводле багацьця ласкі Яго» (Эф.1:7).

Для Бога Айца ў гэтым свеце няма нікога і нічога больш каштоўнага, чым Ісус, Яго Сын. Праз адкупленне Бог вызначыў нашу каштоўнасць параўнальнай з Яго найвялікшым скарбам. Вось што дзіўна: калі б наша каштоўнасць для Бога была хоць на адзін цэнт меншая, чым каштоўнасць Ісуса, Айцец ніколі б не аддаў Яго, бо Бог ніколі не заключае нявыгадных здзелак! Няўдалая купля або абмен адбываецца, калі вы аддаяце нешта больш каштоўнае за менш каштоўнае. Вось так! Бачыце, наколькі вы важныя для Айца? Ісус пацвярджае гэта, кажучы: «І славу, якую Ты даў Мне, Я даў ім, каб яны былі адно, як Мы адно. Я ў іх, і Ты ў-ва Мне; каб былі злучаны ў адно, і каб пазнаў сьвет, што Ты паслаў Мяне і палюбіў іх, *як палюбіў* Мяне» (Ян 17:22–24, *курсіў аўтара*). Ісус ясна заяўляе, што Айцец любіць нас гэтак жа моцна, як Ён любіць Ісуса! Вы чулі гэта? Вы бачыце сваю сапраўдную каштоўнасць? Вы бачыце, чаму Ён шукае вас?

## «Так, але я толькі адзін з многіх»

Некаторыя могуць запярэчыць: «Так, Бог зрабіў гэта для ўсяго чалавецтва, але хто я такі сярод усіх астатніх?» Вось адказ на гэтае пытанне: нават калі б вы былі адзіным, Ён усё роўна шукаў бы вас і выкупіў бы за такую вялікую цану, што выразна відаць у служэнні Ісуса. Ён цэлы дзень вучыў натоўпы пра Валадарства Божае. Ён быў стомлены, але справы не маглі чакаць. Пад кіраўніцтвам Святога Духа Ісус кажа вучням сесці ў лодку і пераплыць Галілейскае мора. Пасярод мора ўзнялася бура, якая пагражала іх жыццю, але Ісус быў настолькі знясілены, што спаў. У страху вучні будзяць

Яго і кажуць пра небяспеку; Ісус адказвае, загадваючы хвалям і ветру супакоіцца.

Значную частку ночы яны пераплывалі неспакойнае мора. Цяпер, калі яны на другім беразе, магчыма, нарэшце яны змогуць трохі адпачыць. Але як толькі яны выходзяць на бераг, іх сустракае апантаны дэманамі вар'ят, што жыве сярод магіл і яго нельга стрымаць нават ланцугамі. Увесь дзень і ўсю ноч ён блукае сярод магіл, крычыць і б'е сябе камянямі (гл. Мк. 5:3–5).

Жыві ён сёння, яго змясцілі б у псіхіятрычную бальніцу, хутчэй за ўсё, у адзіночную палату. Яму б далі лекі і пакінулі на самоце. Большасць лічыла б яго ізгоем, але яго пакінулі б жывым, бо законы не дазваляюць яго забіваць. Такога чалавека лічылі б нікчэмным цяжарам для грамадства, каштоўнасць якога блізкая да нуля. Вельмі мала хто імкнуўся б пазнаёміцца з ім.

Тым не менш, гэты вар'ят меў вялікую каштоўнасць для Айца, Ісуса і Духа Божага. Ісус магутна служыў яму. Яго вызваленне было настолькі поўным, што ў той жа дзень ён сядзеў побач з Ісусам, апрануты і ў здаровым розуме. А цяпер самае дзіўнае: Ісус, паслужыўшы яму, вярнуўся ў лодку і «зноў пераправіўся ў чаўне на другі бок» (Мк. 5:21). Я ніколі не забуду той дзень, калі Бог паказаў мне гэта. Уражаны, я зусім разгубіўся: Ісус, знясілены цяжкім днём, перасёк бурнае мора, толькі каб дапамагчы апантанаму ізгою, якога грамадства лічыла нікчэмным, а потым вярнуўся ў човен і паплыў назад. Ісус зрабіў усё гэта дзеля аднаго чалавека!

Убачыўшы гэта, я зразумеў: калі б я быў адзіным, Ён усё роўна знайшоў бы мяне і заплаціў бы за мяне выкуп, каб я мог мець стасункі з Ім. Нядзіўна, што ў вечар Яго нараджэння нябесныя анёлы спявалі, святкуючы мір на зямлі і ў людзях

упадабанне! Перад усім светам разгарнуўся Божы пошук, і Бог шукаў нас!

## Як Ісус глядзіць на кожнага з нас

Адно з найвялікшых адкрыццяў, якія Госпад даў мне, прыйшло неўзабаве пасля таго, як я атрымаў збаўленне. Я размаўляў з Ім, калі ехаў у машыне, і нечакана Бог пачаў казаць тое, што наймацнейшым чынам змяніла маё мысленне. Я пачуў, як Ён прашаптаў мне ў сэрца: «Джон, ты ведаеш, што Я цаню цябе больш за Сябе?»

Я памятаю, пачуўшы гэтыя словы, на імгненне палічыў іх блюзнерскімі і натхнёнымі пеклам. Я разважаў пра іх як пра абсалютна саманадзейную і непаважлівую ідэю. Я ледзь не выпаліў: «Адыдзіся ад мяне, шатан!» Але ў глыбіні душы адчуў, што гэта голас Госпада. Таму я прыняў бяспечнае рашэнне. Я адказаў: «Госпадзе, мне вельмі цяжка ў гэта паверыць. Здаецца блюзнерствам, што Ты, Госпад Ісус, Які стварыў неба і зямлю, цэніш мяне, мізэрнага чалавека, больш за Цябе. Я змагу прыняць такую думку, толькі калі Ты дасі мне тры пацверджанні гэтаму з Новага Запавету».

Сказаўшы гэта, я адчуў Яго задавальненне і адразу пачуў у сваім сэрцы: «Што гаворыцца ў Лісце да Філіпянаў 2:3?»

Будучы знаёмым з гэтым вершам, я працытаваў яго ўслых: «Нічога ня [робячы] дзеля сварлівасьці ці дзеля пустое пахвальбы, але ў пакоры розуму шануючы адзін аднога як вышэйшых за сябе».

Госпад сказаў: «Гэта першае месца з Пісання».

Я запярэчыў: «Госпад, але тут Павел звяртаецца да філіпійскіх вернікаў, кажучы ім лічыць іншага вышэйшым за сябе. Гэта не пра Твае адносіны са мной».

Я адразу пачуў: «Сыне, я ніколі не кажу Сваім дзецям рабіць тое, чаго не раблю Сам!» Тады Ён паказаў мне, што гэта праблема многіх сем’яў. Бацькі чакаюць ад дзяцей паводзінаў, якіх самі не маюць. Госпад ніколі не чакае ад нас таго, чаго не робіць Сам.

Я зразумеў, але яшчэ не пераканаўся, што Бог цэніць мяне больш за Сябе. Я сказаў: «Госпадзе, гэта толькі адзін верш з Пісання, мне патрэбны яшчэ два». Я не быў непаважлівым, хутчэй, асцярожным.

Пасля Ён задаў мне пытанне, якое, нібы цвік, трапіла ў сэрца: «Джон, хто вісеў на крыжы, ты ці Я?»

Уражаны рэальнасцю, якая рабілася ўсё больш адчувальнай, я стрымана адказаў: «Ты, Ісус».

Ён працягнуў: «На тым крыжы павінен быў вісець ты, але Я панёс твае грахі, суд, хваробы, боль і беднасць. Я зрабіў гэта, таму што цаніў цябе больш за Сябе».

Я дрыжаў, слухаючы Яго словы. Мае сумневы знікалі перад тым, што Ён казаў. Я разважаў: Ён не заслужыў ані кроплі таго, што атрымаў. Ён быў праведны і бязгрэшны. Мне прыгадаўся верш з 1 Пятра 2:24: «Ён грахі нашыя Сам узьнёс у целе Сваім на дрэва, каб мы, памёршы дзеля грахоў, жылі ў праведнасьці; ранамі Ягонымі вы аздароўленыя».

Тады я зразумеў, што Ён сапраўды цэніць мяне больш за Сябе. Я пачаў плакаць і пакланяцца. Я ведаў, што трэці верш абавязкова знойдзецца, і Бог прамовіў у маё сэрца: «Што гаворыцца ў Рымлянам 12:10?»

Гэта быў яшчэ адзін знаёмы ўрывак з Пісання, і я зноў працытаваў яго: «*Братняя* любоў адзін да аднаго [няхай будзе] ад усяго сэрца, у пашане *адзін аднаго выпярэджвайце*».

Я пачуў, як Ён сказаў: «Хіба Я не Першародны паміж многімі *братамі* (Рым. 8:29)? Я аддаю перавагу Сваім братам і сёстрам і цаню іх больш за Сябе».

Я часта чуў, як Ісус любіць нас. Але калі Ён прамовіў гэта ў маё сэрца, для мяне стала рэальнасцю, наколькі асаблівыя мы для Яго як людзі. Бог называе членаў Сваёй сям'і Сваім скарбам. Ён кажа нам, што мы асаблівыя і вельмі каштоўныя. Паспрабуйце зразумець гэта: Ён радуецца за нас! Паслухайце гэтыя праўдзівыя і прыгожыя словы: «ГОСПАД, Бог твой, сярод цябе, Волат, Які збаўляе. Ён цешыцца з цябе ў радасьці, Ён супакоіць [цябе] любоўю Сваёй, Ён будзе радавацца з цябе з усклiканьнем» (Саф. 3:17).

## Што ёсць чалавек?

Анёлы з цікаўнасцю глядзяць на тое, як велічны і святы Бог звяртае такую ўвагу да простых людзей. Мы чытаем: «Калі я гляджу на неба Тваё, твор пальцаў Тваіх, на месяц і на зоркі, якія Ты паставіў, я думаю: «Што ёсьць чалавек, што Ты памятаеш пра яго, і сын чалавечы, што Ты наведваеш яго?» (Пс. 8:4–5). Хоць гэтыя словы напісаў Давід, я ўпэўнены, што Бог дазволіў яму пачуць думкі магутных анёлаў, якія атачаюць Яго трон. Гэтыя анёлы назіралі, як магутны Бог стварыў сусвет. Яны так захапляюцца Ім, што бесперапынна ўсклікаюць: «Святы, Святы, Святы», бо кожная хвіліна адкрывае новы аспект Яго славы. І ўсё, што яны могуць зрабіць, гэта ўсклікаць «Святы!» усю вечнасць. Іх голас такі гучны, што дрыжаць нават вушакі троннай залы (пакоя, які змяшчае не менш за дзесяць мільёнаў чалавек!) Тым не менш, яны здзіўляюцца, чаму велічны Бог так клапоціцца пра нас. Яны разумеюць, што Яго думкі любові і дабрыні да нас

немагчыма злічыць, бо іх больш за ўсе пясчынкі на зямлі. Яны ўражаны гэтым!

Мы — Яго каштоўны скарб, Яго жаданыя каштоўнасці, жывыя камяні, што складаюць скінію, дзе Ён жадае жыць. Чаму Бог так ставіцца да нас? Што мы зрабілі, каб заслужыць такую любоў? Уся праўда ў тым, што мы нічога не зрабілі, каб заслужыць Яго любоў і прагу стасункаў з намі. Калі мы былі яшчэ нямоглымі згубленымі грэшнікамі і Яго ворагамі, Ён шукаў нас. Бог бачыў у нас тое, што магла бачыць толькі Яго любоў. Ён бачыў скарбы сярод разбэшчанасці, граху і распусты. Ён купіў як каштоўнасць тое, што многія лічылі малавартасным або нават нікчэмным. Бог глядзеў шырэй, чым нас акрэсліваў наш стан, і заўважыў тое, што магла змяніць толькі Ягоная ласка.

Цяпер нам лягчэй зразумець словы Святога Пісання: «Вы купленыя дарагою цаною; не рабіцеся слугамі людзей» (1 Кар. 7:23). Навошта чалавек, якога настолькі любяць і шануюць, захоча вярнуцца ў сістэму, дзе ён быў рабом і лічыўся настолькі нязначным у параўнанні з яго сапраўднай каштоўнасцю?

Калі мы сапраўды разумеем, што Бог — самая выбітная істота ва ўсім сусвеце, і Ён горача імкнецца мець стасункі з намі, то як мы можам ігнараваць такое цудоўнае запрашэнне наблізіцца да Яго? Трагічная бяздзейнасць магчыма толькі праз няведанне, у іншым выпадку мы больш не можам адмовіць Яму.

*(Важная заўвага: Святое Пісанне сцвярджае, што, нават калі Бог шукае нас, мы павінны адказаць, каб усталяваць з Ім стасункі. Калі вы ніколі раней не прымалі Ісуса Хрыста як свайго асабістага Госпада і Збаўцу, вам трэба перайсці да Дадатку А ў канцы гэтай кнігі.)*

## Пытанні для вывучэння

1. Калі народ Ізраіля быў вызвалены з чатырохсотгадовага Эгіпецкага рабства, яны не разумелі асноўнай мэты Бога для іх вызвалення. Госпад абвясціў: «Я... прынёс вас да Сябе», але яны наракалі і скардзіліся, думаючы, што ўсё гэта для атрымання ў спадчыну абяцанай зямлі. Як сцвярджае аўтар, іх сэрцы былі засяроджаныя на рэчах, а не на Тым, Каго яны павінны былі атрымаць у спадчыну.

   Бог вызваліў вас з няволі граху, жадаючы прывесці да Сябе. Вы калі-небудзь наракалі ці скардзіліся? Ці здаралася вам шукаць дабраславенняў, а не Госпада? Як гэта адбылося?

2. У гэтым раздзеле было зададзена пытанне: «Навошта чалавек, якога так любяць і шануюць, захоча вярнуцца ў сістэму, дзе ён быў рабом?» Як бы вы адказалі на гэтае пытанне?

3. Аўтар падзяліўся размовай з Богам неўзабаве пасля таго, як атрымаў збаўленне, пра тое, наколькі высока ён цэніцца ў вачах Госпада. Як веданне таго, што вы — вельмі цэнная і «жаданая каштоўнасць», змяняе ваша жыццё і адносіны?

Раздзел 3

# АБАРАНЯЙ СВОЙ ГОЛАД

Мы будзем прагнуць таго, чым кормімся

Каб нязбаўлены чалавек наблізіўся да жывога Бога, трэба, каб Госпад яго прыцягнуў. А. У. Тозер піша: «Перш чым грэшнік зможа правільна падумаць пра Бога, у сэрцы павінна адбыцца праца прасвятлення» (*The Pursuit of God*, с. 11). Сам Ісус кажа нам: «Ніхто ня можа прыйсьці да Мяне, калі Айцец, Які паслаў Мяне, не прыцягне яго» (Ян 6:44). Вось чаму так важна заступніцтва за людзей, якія не маюць адносін з Богам праз Ісуса. Нягледзячы на тое, што Бог «хоча, каб усе людзі былі збаўленыя і прыйшлі да пазнаньня праўды» (1 Цім. 2:4) і паслядоўна імкнецца да гэтай мэты на працягу ўсёй гісторыі, Ён таксама прагне, каб Яго дзеці адчулі Яго любоў да загінулых і прасілі Яго за іх. Таму Ісус сказаў: «Сапраўды, жніво багатае, а работнікаў

мала. Дык прасіце Гаспадара жніва, каб выслаў работнікаў на жніво Сваё» (Мц. 9:37–38).

Калі мы атрымліваем збаўленне праз адкрыццё Ісуса, мы маем і запрашэнне ад Бога. Ён кажа Сваім: «Наблізьцеся да Мяне». Бог ужо зрабіў першы крок праз гэтае вечнае запрашэнне. Куст гарыць... Бог звяртаецца да нас па імёнах... Ён акурат каля лодкі! Чакае нашага адказу!

Неяк адзін вернік падзяліўся: «Джон, чым больш я жыву і служу Богу, тым больш разумею: наша набліжэнне да Яго залежыць ад таго, ці цягне Ён нас да Сябе».

Я запярэчыў: «Не, гэта няпраўда».

Тады ён працытаваў словы Ісуса: ніхто не можа прыйсці да Яго, калі спачатку Айцец не прыцягне яго.

Я адказаў: «Так, гэта праўда для няверуючых. Але Бог кажа, што мы Ягоныя і просіць: «Наблізьцеся да Мяне, і Я набліжуся да вас». Бог падкрэслівае: мы можам зрабіць гэты крок у любы момант».

Канечне, бываюць выпадкі, калі Госпад хоча сустрэцца з намі, і Ён пачынае гэта Сам. Аднак гэта не значыць, што мы не можам першымі рухацца да Яго. Мы маем адносіны з Ім, і, як і ў любых нармальных адносінах паміж бацькам і дзіцём, бываюць выпадкі, калі дзіця пачынае кантакт, а бывае наадварот: бацька кантактуе першы.

## Чаму большасць людзей не адгукаецца на Божае запрашэнне?

Складанае пытанне: чаму так шмат вернікаў маюць павярхоўныя адносіны з Богам? Чаму яны не абіраюць больш глыбокія, больш паслядоўныя адносіны з Ім? Што іх стрымлівае? Што магло б іх запаліць і натхніць адгукнуцца на

Божы заклік наблізіцца? Адказ не складаны: голад і смага па тым, каб пазнаць Яго. Давід усклікнуў:

> «Душа мая прагне Бога, Бога жывога! Калі ж я прыйду і ўбачу аблічча Бога? Сьлёзы мае былі хлебам маім дзень і ноч, калі да мяне гаварылі ўвесь дзень: «Дзе Бог твой?» Успамінаючы гэта, я душу маю выліваю». (Пс. 42:3–5)

Перш чым працягнуць, павольна перачытайце ўрывак і асэнсуйце кожнае слова. Звярніце ўвагу, Давід сказаў: «*Успамінаючы* гэта, я душу маю выліваю». Габрэйскае слова «*ўспамінаць*» — *zakar*. У. Э. Вайнз кажа, што адпаведнае грэцкае слова, як і англійскі аналаг, азначае больш, чым «прыгадваць» — яно азначае «захоўваць у думках». Такое значэнне тут дарэчы. Фактычна, Давід кажа: «*Калі я захоўваю жаданне Бога ў сваіх думках*, гэта прымушае мяне выліваць маю душу». Так ствараецца ненасытнае прагненне Бога! Такі голад заклікае нас наблізіцца да Бога, незалежна ад перашкодаў, з якімі мы сутыкаемся — духоўнымі, разумовымі ці фізічнымі. Таму нам важна абараняць і павялічваць наша прагненне Госпада!

## Госпадзе, павяліч мой голад!

Многія моляцца: «Госпадзе! Зрабі, каб я болей прагнуў Цябе!» Але гэта няправільна. Пачуццё голаду вызначаем мы, а не Ён. Амерыка напоўнена матэрыяльнымі даброццямі, забавамі, задавальненнямі і багаццем. Стварыць і падтрымліваць прагненне Бога можна толькі абараняючы сваю душу, выбіраючы, чым мы яе напаўняем. У Прыповесцях 27:7 гаворыцца: «Душа насычаная топчацца па мёдзе». Калі сказаць проста: душа, напоўненая клопатамі, задавальненнямі,

любоўю да багацця або жаданнямі гэтага свету, насычаецца, і вы пагарджаеце салодкім мёдам Божай супольнасці.

Падумайце пра Дзень падзякі. Большасць амерыканцаў збіраюцца з сям’ёй і сябрамі за святочным сталом. Многія прапускаюць сняданак, каб пазней з’есці больш. На святочным стале — вялізная начыненая індычка, бульба, гародніна, журавінавы соус, пірагі… Мы спажываем велізарную колькасць ежы, таму што наш апетыт павялічыўся. Пад канец вячэры мы стогнем, бо з’елі занадта шмат. Мы сытыя! Праз пару гадзін нас чакае іншы член сям’і, а таксама і ежа ва ўсёй сваёй красе! Рэцэпты больш вытанчаныя, але мы не прагнем выдатнай ежы, а гідліва адварочваемся. Мы настолькі сытыя пасля папярэдняга пасілку, што, кінуўшы адзін толькі позірк на святочны стол, разумеем: есці мы не зможам. Ужо не важна, што ежа значна лепшая; мы проста пагарджаем ёю. Менавіта пра гэта кажуць Прыповесці.

Каб пайсці далей у гэтай ісціне, трэба ўсвядоміць, што яна мае пэўныя ступені. Калі ваша душа абцяжарана жаданнямі гэтага жыцця, вы не будзеце пагарджаць святам, але паставіцеся да яго легкадумна. Калі вы не пераелі, а сціпла падсілкаваліся дзве гадзіны таму, вас пасадзяць за святочны стол, і вы не пагардзіце ім, а проста пакаштуеце тыя ці іншыя стравы. Калі я прыязджаю ў розныя гарады, мне прапануюць ежу ў добрых рэстаранах, але я не галодны, бо паеў некалькі гадзін таму, і ветліва адхіляю запрашэнне. Думка пра ежу не выклікае ў мяне агіды, як апісана ў сцэнарыі Дня падзякі вышэй, яна проста не прываблівае мяне. Такая ж прапанова чалавеку, які галадаў дзень ці два, выкліча зусім іншую рэакцыю. Чалавек будзе моцна прагнуць ежы, на якую вы глядзіце абыякава. Відавочна: ступень вашай насычанасці living рознымі рэчамі ў жыцці вызначае ваш адказ на Божы заклік.

Занадта часта людзі ў цэрквах абыякавыя да пошуку Бога. Яго прысутнасцю не пагарджаюць, але, у параўнанні з галодным чалавекам, вернікі абыякава ставяцца да святочнага стала. У рэшце рэшт, некалькі гадзін таму яны елі са стала свету і пачуваюцца задаволенымі. Я назіраў, як людзі кажуць, што хочуць Божай прысутнасці, але іх дзеянні супярэчаць словам. У вас ёсць гэтая кніга, таму я веру: вы хочаце больш Божай прысутнасці ў жыцці, але ці прагне ваша душа Бога? Калі вы падобны на чалавека, які не еў днямі, ці на алкаголіка, якому трэба выпіўка, або наркамана, якому патрэбна доза, — то менавіта такі голад патрэбны, каб рухацца наперад.

## Абыякавая Царква

Уважліва вывучыўшы словы Ісуса да апошняй царквы ў кнізе Адкрыцця, можна адкрыць дзівосны факт. Перш за ўсё зразумейце: Ісус даслаў сямі цэрквам у Азіі пасланні, прызначаныя не толькі гэтым гістарычным цэрквам, але і ўсім нам, інакш пасланні не ўвайшлі б у Біблію. Сам факт таго, што яны ёсць у Пісанні, азначае: яны маюць прароцкае вымярэнне і прамаўляюць да нас сёння.

Прарочыя пасланні могуць мець (і часта маюць) шмат прымяненняў, значэнняў або здзяйсненняў. Зварот да тых цэркваў не толькі прамаўляе да нас сёння, але, магчыма, яны стаяць апошнімі, бо тычацца царквы акурат перад вяртаннем Хрыста. Меркаванне мае сэнс, бо напрыканцы пасланняў Ян сказаў: «Пасьля гэтага ўбачыў я, і вось, дзьверы адчыненыя ў небе, і першы голас, які я чуў, як *трубы*, які гаварыў са мною, сказаў: “Узыйдзі сюды”» (Адкр. 4:1, *курсіў аўтара*). Звярніце ўвагу на слова «*труба*». Мы ведаем, што ў апошнія дні

Госпад прыйдзе па Сваіх, сышоўшы з неба «з абвяшчэньнем, з голасам арханёла і *трубой* Божай» (1 Фес. 4:16–17, *курсіў аўтара*). Я лічу, што пасланне гэтай царкве асабліва важнае для часу, у якім мы жывем.

Ісус назваў гэтую царкву цёплай; кажучы больш сучаснымі словамі, ім не хапала запалу, і яны легкадумна ставіліся да важных для Яго рэчаў. Яны рэдка рабілі ўсё магчымае, каб дагадзіць Ісусу. Што стала прычынай такіх паводзінаў? Памятайце, гэта не нейкая самаабвешчаная царква, якую не прызнае Бог, — іх ведае Сам Ісус. Адказ палягае ў іх поглядах на жыццё. Ісус кажа: «Бо ты кажаш: “Я багаты і ўзбагаціўся, і ня маю аніякае патрэбы”» (Адкр. 3:17). Такія словы выдаюць адсутнасць агня і запалу, бо іх душы задаволеныя; і, на жаль, не Госпадам, а рэчамі.

## Павярхоўны дыягназ

Некаторыя скажуць, што праблема той царквы была ў занадта вялікай колькасці грошай ці матэрыяльных рэчаў. Гэта — у лепшым выпадку — павярхоўная ацэнка словаў Ісуса. Напрыклад, Давід меў мноства слуг і вялікае багацце. Фактычна, ён перадаў Саламону «чатыры тысячы тон золата, амаль сорак тысяч тон срэбра і столькі жалеза і медзі», што немагчыма было ўзважыць (1 Лет. 22:14, сучасны пераклад). Тым не менш, апісваючы сябе, Давід кажа: «Прыхілі, Госпадзе, вуха Тваё, адкажы мне, бо я – *бедны і прыгнечаны*» (Пс. 86:1, *курсіў аўтара*), называючы сябе бедным і прыгнечаным! Мы ведаем: Давід не імкнуўся быць палітычна карэктным, бо нельга падманваць, калі ты натхнёны Богам. Ён сапраўды лічыў сябе бедным і прыгнечаным, нават маючы шмат срэбра! Яго патрэба была ў Самім Богу; таму што ён

прагнуў Яго. Услухайцеся ў яго заклік: «Прыхілі, Госпадзе, вуха Тваё, адкажы мне...». Давід адчайна чакае Божага адказу, прагне і смагне блізкасці! Вось чаму ў яго словах чуецца такі запал: «Сьлёзы мае былі хлебам маім дзень і ноч, калі да мяне гаварылі ўвесь дзень: “Дзе Бог твой?”» (Пс. 42:4).

Праблема Лаадыкійскай царквы была не ў матэрыяльных рэчах, а ў тым, што вернікі дазволілі матэрыяльным рэчам насыціць іх душы. Давід ніколі такога не дапускаў. Ён ніколі не дазваляў свайму вялікаму багаццю насычаць душу. Хутчэй за ўсё, члены царквы з кнігі Адкрыцця мелі значна менш, чым Давід, але насычаліся тым, што мелі, і былі задаволены. Гэта стрымлівала ў іх запал да Божай прысутнасці і еднасці.

## Рэзкі кантраст

За апошнія дваццаць гадоў я часта такое бачыў. Памятаю, як аднойчы ездзіў на поўнач Канады да індзейцаў кры, апошняга паўночнаамерыканскага племя, што перасялілася ў рэзервацыю. Усяго дваццаць гадоў таму гэтыя высакародныя людзі жылі ў тыпі, якія яны пераносілі па шляхах міграцыі ласей. Індзейцы былі простымі людзьмі і не мелі шмат рэчаў. Толькі ў апошнія дзесяць гадоў яны набылі тэлевізары для сваіх сціплых дамоў.

На служэнні збіралася прыкладна тысяча чалавек. Я быў там некалькі дзён і заўважыў цікавы момант. Амаль усе старэйшыя за дваццаць гадоў надзвычай прагнулі Божых рэчаў. Іх запал быў значна большым, чым у сярэднім у Паўночнай Амерыцы. Яны адчайна хацелі пазнаць Бога. Аднак тыя, каму было менш за дваццаць, былі абыякавымі і, здавалася, не адчувалі ніякага голаду.

На адной сустрэчы памазанне на вучэнне і пропаведзь

было надзвычай моцным. Людзі адкрываліся на Божае дзеянне. Раптам я заўважыў сумных маладых людзей у канцы намёта і вакол яго. Я ведаю, калі пропаведзь сумная, але зараз было не так: Дух Святы даваў моц абвяшчаць Яго Слова. Раптам, нават не паспеўшы падумаць, я пабег, мінаючы галодных, да моладзі ў канцы намёта. Я прасіў іх зайсці і паслухаць, але маладыя людзі паглядзелі на мяне як на вар'ята, які нічога не разумее ў жыцці.

Менавіта тады я заўважыў іх кашулі і бейсболкі — надпісы на іх нібы падсвяціліся і вылучыліся. Гэта былі назвы прафесійных баскетбольных і футбольных каманд. Святы Дух паказаў мне, што маладыя людзі ап'янелі і насыціліся тым, што паказвалі па тэлебачанні. На жаль, яны аддалі голад сваіх душ таму, што не прынесла ім карысці! Я зразумеў, што сталыя людзі не былі выхаваны на тэлебачанні. Вось адказ на маё здзіўленне адносна розніцы паміж тымі, каму больш і менш за дваццаць гадоў.

Зразумейце мяне правільна. Тэлебачанне не заўсёды шкоднае для нашага росту і голаду па Богу. Шкодным можа быць наша стаўленне да тэлебачання. У нашай сям'і ёсць тэлевізар, хоць, калі мы толькі пажаніліся, шмат год яго не было. Я глядзеў, натхняўся і адукоўваўся праз розныя перадачы. Тэлебачанне дапамагае сачыць за сусветнымі падзеямі. Аднак не яно мяне корміць і задавальняе. Гэта не маё захапленне. Я магу глядзець яго і прагнуць Божых рэчаў, і заставацца ў супольнасці Святога Духа. Нягледзячы на беднасць, гэтыя маладыя людзі аддалі свой апетыт таму, што не прыносіла карысці.

Неўзабаве пасля гэтай паездкі я паехаў на паўночны захад ЗША. Мяне папрасілі прапаведаваць у пятніцу ўвечары. Сустрэча была для ўсёй царквы, але, на маё здзіўленне, я

заўважыў: больш за пяцьсот з сямісот прысутных — падлеткі. Калі сустрэча скончылася, мяне атачылі некалькі дзясяткаў падлеткаў, якія задавалі пытанні пра духоўныя рэчы. Я зірнуў на гадзіннік: набліжалася поўнач. Пасля заканчэння служэння мы вельмі доўга размаўлялі пра Божыя рэчы. Нарэшце я выпаліў: «Мне гэта падабаецца! Вы ўсе так прагнеце Бога!»

Перш чым я сышоў, яны запрасілі мяне на абед на наступны дзень. Я не мог адмовіцца ад прапановы, яны замовілі вялікі пакой наверсе ў рэстаране, і размова працягнулася. Гэта было цудоўна і незвычайна! Іронія заключалася ў тым, што маладыя і заможныя людзі на паўночным захадзе ЗША прагнулі Бога, хаця ў іх было значна больш маёмасці, чым у моладзі ў індзейскім племені.

У царкве паўночнага захаду людзі, старэйшыя за дваццаць гадоў, былі не такімі галоднымі, як моладзь. Чаму яны не прыйшлі з пытаннямі? Чаму падлеткаў на служэнні было значна больш, чым усіх астатніх узроставых груп разам узятых? Я думаю, што сэрцы дарослых былі абцяжараныя клопатамі і радасцямі жыцця. Божыя рэчы былі часткай іх жыцця, але яны імі не гарэлі, нават нягледзячы на тое, што вызнавалі ўладу Ісуса.

Пасля сустрэчы з першым і моладзевым пастарамі царквы я зразумеў: старэйшыя людзі ў царкве наследавалі першага пастара, а падлеткі і моладзь — моладзевага пастара. Мне ўспомніўся ўрывак з Осіі 4:9: «Якія святары, такі і народ — калі святары бязбожныя, народ таксама бязбожны» (новы пераклад). Гэтак жа лёгка можна было б прачытаць: «Які пастар, такі і народ — калі пастару не хапае запалу, народ таксама абыякавы». Бог дабраславіў моладзевага пастара, поўнага бачання і агню, і цяпер ён памазана служыць у іншым горадзе.

## Лекі для абыякавай царквы

Менавіта пра апатыю, так распаўсюджаную ў царкве, казаў Ісус у Сваім звароце да царквы ў Азіі. Паслухайце Яго словы:

> «Вось, стаю пры дзьвярах і грукаюся; калі хто пачуе голас Мой і адчыніць дзьверы, Я ўвайду да яго і буду вячэраць з ім, і ён — са Мною». (Адкр. 3:20)

Мяне здзіўляе, што служыцелі часта выкарыстоўваюць гэты ўрывак з Пісання як заклік да нязбаўленых, але зусім не пра тое казаў Ісус. Ён звяртаецца да царквы; Ён звяртаецца да вернікаў, якім не хапае запалу. Звярніце ўвагу, Ён сказаў: «Калі хто пачуе...» Што перашкаджае чуць Яго голас? Ужо насычаная душа! Бог паслаў Майсея далёка ў пустыню, далей ад таго, што забірала ўвагу ў Эгіпце, бо Ён Сам хацеў прыцягнуць яго ўвагу. У першую ж сустрэчу Бог захапіў Майсея, і той больш ніколі не губляў увагі да Госпада, дзе б ні знаходзіўся, нават калі вярнуўся ў Эгіпет! Ісус сказаў: калі хто пачуе Яго голас і адчыніць дзверы душы, Ён увойдзе і пераломіць з ім хлеб. Ён падасць «хлеб жыцця» нашай душы — Ён і ёсць Хлеб жыцця. Адзін пераклад гучыць так: «Калі вы пачуеце, як Я клічу, і адчыніце дзверы, Я ўвайду, і мы падзелімся ежай як сябры» (сучасны пераклад). Мне гэта падабаецца, таму што ў ранейшыя часы сумесная ежа азначала больш высокі ўзровень сацыяльнай блізкасці, чым сёння. Падчас падарожжаў мне падабаецца мець хаця б адзін пасілак або з тым, хто праводзіць канферэнцыю, або з пастарам, бо ў гэты час ёсць магчымасць сапраўды пазнаёміцца. Знаёмства і абмен ведамі за ежай адбываецца лепш, чым у любой іншай абстаноўцы. Вось чаму Павел кажа нам не есці з тым, хто называе сябе вернікам, але жыве ў

пастаянным граху (гл. 1 Кар. 5:11). Мы адкрываем сэрца і збліжаемся за ежай, і калі мы збліжаемся з тым, хто жыве ў відавочным бунце, то абмен духоўна нездаровы.

## Мы будзем прагнуць таго, што спажываем

Голад — ключавы элемент таго, ці будзем мы імкнуцца да блізкасці з Богам. Таму нам трэба памятаць: мы, а не Бог, кантралюем наш апетыт. Пытанне ў наступным: якія апетыты і жаданні мы развіваем? Ёсць духоўны прынцып, які ніколі не змяняецца:

*Мы будзем прагнуць таго, што спажываем.*

Я нарадзіўся звыш у 1979 годзе, калі жыў у студэнцкім гарадку. Аднойчы ўвечары я шукаў ежу на студэнцкай кухні, калі пачуў, як Госпад сказаў: «Тваё цела — гэта Мой храм, беражы яго!»

У той час я быў фанатам нездаровай ежы. Я думаю, што тут дарэчны нават тэрмін «*наркаман*», бо ён апісвае чалавека, які падсеў на што-небудзь. Я еў нездаровую ежу проста таму, што яна задавальняла мой апетыт. Я любіў газіроўку, цукеркі, фастфуд, пончыкі, тлустую ежу ўсіх відаў, вырабы з мукі вышэйшага гатунку — вы ведаеце спіс. Усё нездаровае, што падабалася на смак, было маім улюбёным. У маім уяўленні, добрай ежай былі Біг Мак, кола і бульба фры.

Калі Бог сказаў гэта, я зразумеў, што цела — гэта складаная адзінка, якая змяшчае і Яго, і мой дух. Мне падумалася: калі б у мяне быў дарагі новы аўтамабіль, я ніколі б не заліваў у яго брудны бензін або перапрацаваную нафту. Я запраўляў бы яго толькі найлепшым бензінам, каб ён працаваў лепш і служыў даўжэй. Разважыўшы, што мне дадзена толькі

адно фізічнае цела, якое нельга замяніць, — у адрозненне ад дарагога аўтамабіля, — я неадкладна змяніў харчовыя звычкі. Я пачаў чытаць і задаваць пытанні, каб даведацца, што патрэбна майму арганізму для максімальнага функцыянавання і працяглага жыцця. Гэта быў працэс, але праз некалькі гадоў мае харчовыя звычкі змяніліся.

Усё гэта было выдатна, і меўся прыемны пабочны эфект, пра які я не здагадваўся. Калі я толькі пачаў харчавацца здаровай ежай, мне не падабаўся яе смак, але я еў яе, таму што яна была карыснай для мяне. Потым, праз некаторы час, мае густы змяніліся. Раней, калі мне прапаноўвалі на выбар фастфуд і салат з зяляніны з рыбай і цэльназернавым хлебам, я, не задумваючыся, браў бургер і круціў носам ад рыбы і салату. Але сёння з гэтых двух варыянтаў я выбіраю здаровы, і нават не думаю пра шкодны. Насамрэч, часта падчас падарожжаў, калі быў даступны толькі фастфуд, я абыходзіўся без ежы. Я лепш заставаўся галодным, але не еў тое, чаго прагнуў раней. У мяне больш няма ні апетыту, ні густу да гэтага! Мне гэта нават не падабаецца!

Той жа прынцып справядлівы і для нашых душ. Нашы душы жадаюць таго, чым мы іх кормім. Калі мы пастаянна займаемся спортам, мы будзем любіць спартыўныя каналы. Калі мы пастаянна харчуемся фільмамі і галівудскімі плёткамі, мы будзем прагнуць тэлеканалаў, часопісаў і размоў, якія задавальняюць наш апетыт. Калі мы жывём светам бізнесу і бягучымі падзеямі, мы будзем прагнуць ежы такога смаку.

Калі мы насычаемся інфармацыяй пра дамы, машыны, адзенне і так далей, тады мы будзем загарацца, абмяркоўваючы пакупкі, новую машыну або ідэі дэкору, а духоўныя размовы для нас стануць нецікавымі. Нам будзе

цяжка чытаць Святое Пісанне або заставацца ў малітоўным пакоі. Аднак, калі мы пастаянна сілкуемся Словам Божым, нам лёгка вылучыць час для малітвы, а размовы пра духоўныя рэчы стануць лёгкімі і натуральнымі. Мы будзем прагнуць прысутнасці Бога і жадаць блізкасці з Ім.

## Нездаровая крайнасць

Аднак можа з’явіцца нездаровая крайнасць. Мы маем фізічныя целы. Перыядычна нам патрэбны адпачынак і здаровыя забавы. Калі я вучыўся ў біблейскай школе, я працаваў сорак гадзін на тыдзень і меў шмат заняткаў. Аднойчы ў выходныя мой сусед па пакоі запрасіў мяне пагуляць у тач-футбол з групай сяброў. Я адмовіўся ад прапановы, каб вывучаць Святое Пісанне. Як толькі ён сышоў, я дастаў сваю Біблію, каб чытаць і маліцца, але не мог нічога зразумець. Я не мог чуць Бога. Здавалася, я проста чытаў словы, якія не мелі сэнсу. Майго суседа па пакоі не было ўжо амаль гадзіну, і я закрычаў: «Госпадзе, чаму мне так цяжка што-небудзь зразумець з Пісання ці пачуць Твой голас? Што здарылася? Я зрабіў што-небудзь кепскае ці зграшыў?»

У адказ я пачуў: «Ідзі і гуляй у футбол».

Я адхіснуўся; потым спытаў: «Што? Гуляць у футбол? Гэта не ўмацоўвае веру і не набліжае мяне да Цябе! Як Ты можаш казаць мне рабіць гэта?»

Госпад нагадаў мне верш, які раптам ажыў для мяне: «…складаньню шматлікіх кнігаў няма канца, і *доўгае вучэньне — стома для цела*» (Экл. 12:12, *курсіў аўтара*). Ён сказаў: «Сынок, ты жывеш у фізічным целе (частка яго — мозг), і яму патрэбныя розныя формы адпачынку. Калі ты не дасі яму патрэбнага адпачынку, ты фактычна заблакуеш здольнасць

чуць Мяне і расці». Затым Бог паказаў мне: пасля таго, як вучні паслужылі многім, Ісус запрасіў іх: «Ідзіце адны ў пустыннае месца і супачыньце крыху» (Мк. 6:31). Проста кажучы, Ісус казаў: «Адпачні, каб не разваліцца».

Я пайшоў гуляць у футбол. Пазней у той жа дзень, калі я зноў сеў чытаць Біблію, Пісанне адкрылася мне, і я зноў адчуў жыццё Бога, якое ўлівалася ў мяне, калі я меў адносіны са Святым Духам, вывучаючы Божае Слова.

## Занадта заняты

Яшчэ адна памылка, якую ў наш час робяць не многія, — выдаткоўваць вельмі шмат часу на вучобу, ігнаруючы адпачынак, патрэбны душы і целу. Хутчэй за ўсё, найвялікшы злодзей, які крадзе нашу прагу да Бога, — гэта наш напружаны лад жыцця. Многія вернікі з добрымі намерамі трапілі ў гэтую пастку і замянілі час, прысвечаны Богу, насычаным хрысціянскім ладам жыцця. Сюды можна ўключаць і падманлівую і бесперапынную працу служэння.

Давайце зададзім простае пытанне: чаму мы спажываем фізічную ежу? Вядома ж, каб даць харчаванне і сілу нашаму целу. Ці можаце вы ўявіць, што вы не ясце і працягваеце жыць на поўнай хуткасці? Калі б у якасці эксперыменту на некалькі дзён мы перасталі есці, але працягвалі шмат гадзін працаваць фізічна без дадатковага сну — што б здарылася? Проста задумайцеся на хвіліну. Мы б зваліліся без сіл!

Але мы лёгка згаджаемся на такое ў духоўнай сферы. Вось прычына, чаму мы так трываем у духоўнай, а не фізічнай сферы. Калі мы занадта доўга абыходзімся без ежы, нашы страўнікі неаднаразова даюць пра сябе знаць. Яны становяцца ўсё гучнейшымі і крычаць ад болю. Усё наша

цела стогне: «Я галодны, накармі мяне!» Але наш дух так не крычыць. Здаецца, адбываецца акурат адваротнае: з цягам часу голас ўнутранага чалавека становіцца цішэйшым. Але прычына ў тым, што мы яго не чуем. Наш дух слабее, а наша плоць становіцца мацнейшай.

Калі мы не ямо доўгі час, то губляем апетыт. Калі вы абыходзіцеся без ежы больш за пяць дзён, фізічны голад сціхае. Ежа перастае цікавіць, і кавалак стэйку выглядае гэтаксама прывабна, як і абутак. Ваш апетыт знікае і не вернецца, пакуль усе ўнутраныя рэзервы не вычарпаюцца і не наступіць голад.

Я заўважыў: калі я дазваляю насычанаму ладу жыцця замяніць мой час з Госпадам, адбываецца тое ж самае. Спачатку мая цікавасць да Святога Пісання змяншаецца, потым знікае маё жаданне маліцца. Калі я малюся або чытаю час ад часу, я не адчуваю, як жыццё ўліваецца ў мяне. Біблія не прамаўляе да мяне так, як тады, калі я рэгулярна чытаю Святое Пісанне.

Я абыходзіўся без фізічнай ежы да такой ступені, што мой апетыт знікаў, і адзіным спосабам вярнуць яго было прымусіць сябе есці. Тое ж самае тычыцца і духоўнага жыцця. Калі я страціў духоўны апетыт, я адкрываю Біблію, раскайваюся ў ляноце, а потым з нецярпеннем імкнуся пачуць голас Бога. Я працягваю чытаць, пакуль нейкі ўрывак не прамовіць да мяне! Звычайна гэта не займае шмат часу; калі я працягваю шукаць Бога, Ён заўсёды верна адказвае мне. Яшчэ адзін спосаб аднавіць сувязь з Богам — гэта з'ехаць на дзень ці два і проста чытаць і маліцца, пакуль Бог не напоўніць мяне.

## Ваш духоўны тэрмометр

Гэта неабходная ўсім нам дысцыпліна. Адступленне пачынаецца не тады, калі чалавек апынаецца ў ложку з чужой жанчынай або выяўляе, што зноў прагне алкаголю ці парнаграфіі. Яно пачынаецца не тады, калі ён пагарджае тымі, каго любіць, і занядбоўвае сваіх дзяцей. Гэты спіс можна працягваць. Не, адступленне пачынаецца, калі мы адчуваем сябе абыякавымі да Пісання і Божых рэчаў. Яно адбываецца, калі мы адчуваем, што больш захапляемся свецкімі рэчамі, чым справамі Божымі.

Голад — гэта ваш духоўны тэрмометр. Падумайце пра гэта з пазіцыі фізічных рэчаў. Што першае знікае, калі чалавек хварэе? Апетыт. Калі вы хварэлі на грып, вы памятаеце: есці проста не хочацца. Паглядзіце на пацыентаў, якія знаходзяцца на апошніх стадыях невылечнай хваробы: яны худнеюць да 30-35 кілаграмаў і мусяць атрымліваць унутрывеннае харчаванне. Хворыя не жадаюць есці. Вы чулі, як кажуць: «У яго здаровы апетыт». У духоўным плане сітуацыя такая ж: прыкметай духоўнага здароўя з’яўляецца апетыт да Божага Слова. Прыкметай духоўнай хваробы ёсць страта апетыту да Божых рэчаў.

Я сустракаў святароў, якім цікавей гаварыць пра будаўнічую праграму, новую машыну, спартыўныя каманды і гэтак далей, чым пра Божыя рэчы. Калі вы згадваеце справы Госпада або тое, што Ён казаў вашаму сэрцу, яны паводзяць сябе так, быццам вы завялі прафесійную размову. Яны запальваюцца, калі гавораць пра новы дом, які толькі пабудавалі. Я назіраю за імі ў пакланенні: яны азіраюцца, размаўляюць з іншымі або пераглядаюць нататкі для падрыхтаванай казані замест таго, каб узняць рукі і

засяродзіцца на Тым, Хто павінен быць ім такім дарагім. Гэта сімптом больш глыбокай праблемы.

У такіх цэрквах я заўважыў недахоп прысутнасці Бога. Калі я заклікаю да пакаяння і запрашаю наблізіцца да Бога, Святы Дух прыходзіць, і яны здзіўляюцца. Яны ўспамінаюць, адкуль упалі, альбо адкідаюць гэта як асаблівы дар нашага служэння. Некаторыя нават супраціўляюцца таму, што адбываецца. У любым выпадку, калі ў іх ёсць хоць невялікае жаданне, прысутнасць Бога зноў абуджае іх голад.

Ісая кажа нам: «Лёну, які дыміцца, не патушыць» (Іс. 42:3). Гэтая фраза літаральна адносіцца да кноту свяцільні: калі алей дагарае, полымя саступае месца слабому дыму. Бог заўважае слабое, малое, тонкае, кволае і далікатнае. Ён не патушыць паміраючае вуголле, але дапаможа яму хутчэй разгарэцца. Памятайце, Ён шукае нас, нават калі мы дымім, як маленькі вугалёк. Наколькі лепш, калі мы супрацоўнічаем і рэагуем, бо Ён не будзе навязвацца нам!

Я назіраю такое вельмі часта. Назіраю, як Госпад раздзімае агонь, які ў многіх ужо згасаў. У цэрквах і на канферэнцыях я неаднаразова чую ад вернікаў, што яны нават не ўсведамлялі, як нізка ўпалі, пакуль полымя не разгарэлася зноў і іх жаданне шукаць Бога не запалілася. Яны разумелі, што не ахоўвалі сэрца і страцілі апетыт духоўна здаровага чалавека.

## Беражы самае каштоўнае

Мы чытаем: «З усёй стараннасьцю захоўвай сэрца тваё» (Прып. 4:23). Сэрца – самае важнае, што трэба ахоўваць, абараняць і за чым трэба сачыць! Калі я разважаю над гэтымі словамі, я думаю, як людзі ахоўваюць каштоўныя рэчы. Мы ўсе бачылі каштоўныя камяні, выстаўленыя ў вітрынах з

небіткага шкла. Яны знаходзяцца ў кантраляваным асяроддзі, адчувальным да любых змен вагі або тэмпературы, дзе ад найменшага парушэння спрацуе сігналізацыя і зачыняцца дзверы. Існуюць фотаэлектрычныя сэнсары-прамяні, якія пры знікненні аб’екта імгненна выклікаюць узброеную ахову на месца здарэння. Людзі плацяць ахоўнікам, каб яны кругласуткава сачылі за каштоўнымі прадметамі. На ахову і абарону камянёў выдаткоўваюцца тысячы долараў!

Бог кажа, што самая каштоўная маёмасць на зямлі — гэта нашы сэрцы, а не камяні. Тым не менш, вернікі аддаюць сэрцы таму, што не толькі не прыносіць карысці, але нават шкодзіць. Мы глядзім і чытаем практычна ўсё, калі гэта не ўтрымлівае празмернай аголенасці або лаянкі. Мы не распазнаем дух свету, які варагуе з Духам Божым.

Людзі ж гэтага свету значна мудрэйшыя, бо старанна ахоўваюць тое, што найбольш цэняць. Вернікі бесклапотна ідуць па жыцці, не ахоўваючы сэрцы ад пажадлівасці і жаданняў, якія крадуць іх голад па Тым Адзіным, Хто можа сапраўды задаволіць. Госпад «насыціў душу спрагнёную і душу галодную напоўніў дабром» (Пс. 107:9). Ён чакае таго, каб узрадаваць нас, але Яго дабрыня не насыціць, калі мы ўжо насыціліся іншымі рэчамі. Давайце будзем падтрымліваць голад у нашых сэрцах і не будзем легкадумна ставіцца да Яго закліку. Бо Ён абяцаў наблізіцца да нас, калі мы наблізімся да Яго!

## Пытанні для вывучэння

1. У Прыповесцях 27:7 гаворыцца: «Душа насычаная топчацца па мёдзе». Разважаючы над гэтым вершам, падумайце: якія клопаты, жаданні і задавальненні ўяўляюць для вас найбольшую спакусу? Як яны могуць

прытупіць вашу прагу да «салодкага мёду» Божай супольнасці?

2. У гэтым раздзеле аўтар дзеліцца назіраннямі за людзьмі старэйшымі і малодшымі за дваццаць гадоў у двух розных цэрквах адносна іх запалу — іх прагі — да Бога. Калі вы паглядзіце на жыццё вашай царквы, як вы ахарактарызуеце апетыт вашай духоўнай сям'і — задаволеныя, галодныя, ці абыякавыя?

3. У святле заклiку ў Прыповесцях 4:23 «З усёй стараннасьцю захоўвай сэрца тваё», якія крокі вы можаце зрабіць сёння, каб абараніць сваё сэрца? Ці ёсць у вашым рацыёне нейкая духоўная «нездаровая ежа», якую трэба выключыць або замяніць?

Раздзел 4

# ЛЮБОЎ ДА ЯГО ПРЫСУТНАСЦІ

Мы чуем слова з Яго вуснаў, калі знаходзімся ў Яго прысутнасці

За апошнія дваццаць гадоў служэння я пабываў на ўсіх кантынентах, акрамя Антарктыды, навучаючы Божаму Слову ў цэрквах і на канферэнцыях. Мне пашчасціла працаваць у двух царкоўных калектывах сем гадоў, перш чым я стаў прысвячаць час падарожжам для служэння. У гэты перыяд я зразумеў: у царкве ёсць дзве асноўныя групы людзей, і з набліжэннем прыходу Госпада разрыў паміж імі ў мысленні, здаецца, расце. Першыя — тыя, хто шукае Бога дзеля таго, што Ён можа зрабіць; а другія – дзеля таго, Хто Ён.

## Асноўная матывацыя Ізраіля

Такі кантраст назіраецца паміж Майсеем і дзецьмі Ізраіля. Давайце даследуем гэта больш падрабязна. Ізраіль палка жадаў вызваліцца ад прыгнёту і ўсклікаў да Бога, прызнаючы Яго вызваліцелем. Гэтых нашчадкаў Абрагама можна параўнаць з групай, якая шукае Бога дзеля таго, што Ён можа зрабіць. У царкве ёсць людзі, якія не хочуць няволі, што суправаджае сістэму свету; аднак яны, самі таго не ведаючы, усё яшчэ знаходзяцца ў палоне. Яны вызнаюць Ісуса як Госпада і спадзяюцца на Яго вызваленне і забеспячэнне. Тым не менш, як і ў выпадку з дзецьмі Ізраіля, іх сэрцы бачныя праз іх жаданні, учынкі, словы і свецкія пачуцці.

Сотні гадоў Ізраіль плакаў, чакаючы Божага вызвалення. Потым Бог з’явіўся Майсею і сказаў, што час прыйшоў. Госпад даў слова, якое Майсей мусіў выканаць. Перад тым, як ісці да фараона, Майсей сустрэўся са старэйшынамі Ізраіля і абвясціў Божае абяцанне пра вызваленне. Пачуўшы добрую вестку, «паверыў народ, і яны пачулі, што ГОСПАД наведаў сыноў Ізраіля і ўбачыў прыгнёт іхні, і схіліліся, і пакланіліся» (Вых. 4:31).

Уявіце сабе эмоцыі сходу! Усё жыццё старшыні чулі пра будучага Божага вызваліцеля. Абяцаная надзея на свабоду і зямлю, якая ацякае малаком і мёдам, перадавалася ім ад бацькоў і дзядоў. На іх вачах продкі памерлі, так гэтага і не ўбачыўшы. Старшыні змагаліся з пытаннем: ці ўбачаць яны выкананне абяцання пры жыцці, ці памруць раней, чым яно споўніцца? І вось перад імі былы прынц Эгіпта, падрыхтаваны лідар, якога суправаджаюць цудоўныя знакі Божай рукі. Той, хто мусіў імі кіраваць, цяпер стане іх вызваліцелем. Толькі Бог мог зрабіць такі цуд! Іх сэрцы поўныя трымцення і радасці. Старшыні славяць Бога ў пакланенні і дзякуюць Яму.

Майсей пакідае іх і сустракаецца з фараонам. Але эгіпецкі цар зусім не ўражаны Божым словам пра вызваленне. Ён смяецца з Майсея і нашчадкаў Абрагама і павялічвае цяжар працы настолькі, што яе немагчыма выканаць. Як хутка ўсё мяняецца! Тыя самыя старшыні кідаюцца на Майсея і сварацца. Пра пакланенне яны забыліся; яны настолькі расчараваныя і засмучаныя Майсеем, што заклікаюць на яго суд! (гл. Вых.5:21)

Але пступова Бог у Сваёй міласэрнасці вызваляе іх з дапамогай многіх знакаў і цудаў. Калі фараон нарэшце дае загад адпусціць народ, зноў адбываецца рэзкая змена ў стаўленні. Яны напаўняюцца радасцю і выходзяць з вялікай славай і дабраслаўленнем. Уявіце сабе атмасферу вызвалення, калі ізраільцяне выходзілі з Эгіпта, купаючыся ў Божай дабрыні і вернасці. Яны не толькі вольныя, але і маюць вялікія скарбы — золата і срэбра, а таксама здароўе і сілу, якія атрымалі, калі елі пасхальнае ягня. Гэтыя ўчорашнія рабы ўдзячныя Богу, іх давер да Майсея – найвышэйшы.

Пасля выхаду з Эгіпта Бог накіроўвае Майсея весці народ да Чырвонага мора. Яны азіраюцца назад і разумеюць, што фараон даганяе. Ізноў іх стаўленне мяняецца. Ізраільцяне горка скардзяцца і наракаюць на Майсея: «Ці ж не было магілаў у Эгіпце, што ты ўзяў нас паміраць у пустыні? Што гэта ты зрабіў нам, што вывеў нас з Эгіпту? Ці ня гэтае слова гаварылі мы табе ў Эгіпце, кажучы: “Пакінь нас, і мы будзем служыць у Эгіпцянаў”? Бо *лепш нам* служыць у Эгіпцянаў, чым паміраць у пустыні» (Вых. 14:11–12, *курсіў аўтара*). Калі ў Эгіпце ўсё пайшло не так, яны сказалі Майсею пакінуць іх; цяпер яны зноў незадаволеныя некампетэнтным кіраўніком і паўтараюць скаргу. Яны думалі, што наракалі на Майсея і Аарона, але Майсей сказаў ім: «Не на нас нараканьне

вашае, але на ГОСПАДА» (Вых. 16:8). Прагненне таго, што было ў іх інтарэсах, пераважыла жаданне выканаць Божую волю. Звярніце ўвагу на словы *«бо лепш нам».* Ізраільцянам не хапала гарачага жадання ведаць сэрца Бога, хоць іх паглынула любоў да ўласнага жыцця.

Бог зноў з’явіў Сваю міласэрнасць, раздзяліўшы Чырвонае мора і перавёўшы іх па сушы. Потым у адзін момант Бог знішчыць наймагутнейшае войска на зямлі, войска краіны, якая прыгнятала ізраільцян больш за чатырыста гадоў. Цяпер народ у захапленні! Яны радуюцца і танчаць перад Госпадам. Мы чытаем: «І ўзяла Мірыям прарочыца, сястра Аарона, бубен у руку сваю, і выйшлі за ёю ўсе жанчыны з бубнамі і танцамі» (Вых. 15:20). Ці можаце вы ўявіць сабе ад васьмісот тысяч да мільёна жанчын, якія танчаць і іграюць на бубнах? Вось гэта служэнне хвалы! Яны ніколі не ведалі такой радасці. Але яна была нядоўгай, бо ўсяго праз тры дні ў іх скончылася вада. Народ зноў горка скардзіцца, і зноў Бог адказвае на іх патрэбу.

Праходзіць яшчэ некалькі дзён, і паўстае новая праблема — адсутнасць ежы. Ізраільцяне скардзяцца: «Лепш бы мы памерлі ад рукі ГОСПАДА ў зямлі Эгіпецкай, калі мы сядзелі пры катлах з мясам, калі мы елі хлеб да насычэньня! Бо вы вывелі нас у гэтую пустыню, каб памерла з голаду ўся царква гэтая» (Вых. 16:3).

Вы бачыце заканамернасць? Народ шчаслівы і ўдзячны, пакуль Бог робіць тое, што яны хочуць і калі яны хочуць; і няшчасны, калі Бог не робіць тое, што яны хочуць, у патрэбны ім час. Іх асноўная матывацыя праяўляецца ў паводзінах і словах пад ціскам абставін; усё павінна быць для іх. Ізраільцяне ставяць свае жаданні вышэй за Божае сэрца ці прысутнасць.

## Асноўная матывацыя Майсея

Так паўтараецца зноў і зноў, пакуль нават Богу гэта не надакучыла. Ён кажа Майсею:

> І прамовіў ГОСПАД да Майсея: «Ідзі, узыйдзі адгэтуль ты і народ, які ты вывеў з зямлі Эгіпецкай, у зямлю, пра якую Я прысягаў Абрагаму, Ісааку і Якубу, кажучы: “Насеньню твайму дам яе”. І Я пашлю перад абліччам тваім анёла, і выганю Хананейца, Амарэя, Хета, Пэрэзэя, Хівея і Евусэя. І ўвядзе ён вас у зямлю, дзе цячэ малако і мёд, бо Сам Я не пайду сярод цябе, бо ты — народ з цьвёрдым каркам, каб Я не выгубіў вас у дарозе» (Вых. 33:1–3).

Бог сказаў, што Майсей можа прывесці народ у абяцаную зямлю, якой яны так доўга чакалі, і Ён нават пашле з імі анёла, каб выгнаць ворагаў і зямля стала бяспечнай; аднак Ён Сам (Яго прысутнасць) не пойдзе з імі!

Добра, што Бог сказаў гэта Майсею: калі б Ён прапанаваў гэта народу Ізраіля, яны б з радасцю прынялі яе, павесяліліся, сабраліся і пайшлі! Чаму я так лічу? Падумайце: калі народ быў гатовы вярнуцца ў Эгіпет без анёла ці Бога, толькі каб ўцячы ад нягод пустыні, я ўпэўнены: яны б згадзіліся на абяцаную зямлю з анёлам. Але паслухайце адказ Майсея на прапанову Бога:

> Калі ня пойдзе абліччa Тваё, не выводзь нас адгэтуль (Вых. 33:15).

Трэба памятаць, што ён акрэсліў словам «адгэтуль» — пустыня, месца цяжкасцей; зямля, пазбаўленая камфорту

і прыемнасцяў! Там не было багацця, задавальняліся толькі штодзённыя патрэбы, і нават гэта часта адбывалася звышнатуральна. У той зямлі не было садоў, прыродных рэсурсаў і бяспекі. Ніякіх дамоў, рэк, вінаграднікаў, палёў ці фруктовых дрэў, плады якіх можна есці. Ніякіх пакупак, адпачынку ці забаў. (Хіба што вам падабалася назіраць, як вашых блізкіх кусаюць змеі). Вакол вас толькі засуха і штодзённая руціна. Няма нічога прыгожага, але Майсей заяўляе: «Я лепш бы бачыў Тваю прысутнасць у некамфортным і нязручным месцы, чым быў бы ў багатай і прыгожай зямлі без Тваёй прысутнасці!»

Чаго прагнула сэрца Майсея? Божай прысутнасці! Ён жадаў самога Госпада больш, чым абяцаных Ім дабраслаўленняў. Ён цаніў блізкасць з Богам вышэй за любыя скарбы, якія мог даць Бог. Гэта аддзяляла Майсея ад народа Ізраіля. Яны шукалі Бога дзеля таго, што Ён рабіў, а Майсей шукаў Бога дзеля Яго Самога! Такая матывацыя нават сёння падзяляе вернікаў на дзве групы. Падзел выходзіць за канфесійныя межы. Некаторыя вернікі не ведаюць, што Бога можна шукаць не толькі дзеля Яго абароны, забеспячэння і падтрымкі; не ведаюць, што можа прыняць Яго такім, Які Ён ёсць, і блізка спазнаць. Чым такое стаўленне адрозніваецца ад стаўлення жанчыны, якая выходзіць замуж дзеля грошаў? Яна выходзіць замуж не дзеля спазнання мужа, а дзеля таго, што той можа зрабіць для яе. Пры такой дамоўленасці абое губляюць, бо такая матывацыя не спрыяе блізкасці.

## Узнагарода

Я наведаў некаторыя з самых прыгожых месцаў у свеце і бачыў бязмежна раскошныя дамы і будынкі, але яны нічога

для мяне не значаць, бо ў іх няма прысутнасці Бога. Я таксама быў у непрыемных месцах, поўных Божай прысутнасці: турмы, краіны трэцяга свету і вельмі бедныя дамы. Скажу шчыра: лепш я буду ў тых цяжкіх, нязручных месцах, дзе жыве Дух Божы, чым у асабняках, напоўненых скарбамі, але пазбаўленых Божай прысутнасці.

Мне пашчасціла гуляць у тэніс, даходзіць да плэй-оф Асацыяцыі тэніса ЗША (USTA), выступаць у юніёрскіх матчах Кубка Дэвіса і выйграць тытул чэмпіёна нашага штата. Я дасягнуў акадэмічных узнагарод, сацыяльнага статусу і павагі аднагодкаў, лідараў і кіраўнікоў бізнесу. Я сустракаўся з прыгожымі і папулярнымі дзяўчатамі. Гэта ўвасабляе жаданні большасці людзей, да якіх яны імкнуцца ўсім сэрцам. Па праўдзе кажучы, слава і задавальненне ад усяго гэтага разам узятага ніколі не пераўзыдзе каштоўнасці ўсяго толькі трыццаці секунд у прысутнасці Бога. Параўнаць дзве гэтыя рэчы немагчыма! Паслухайце, як Пісанне характарызуе Майсея:

> Вераю Майсей, стаўшыся дарослым, адмовіўся называцца сынам дачкі фараона і выбраў лепш пакутаваць з народам Божым, чым мець часовую прыемнасьць грэху, зьнявагу Хрыстовую палічыўшы большым багацьцем, чым скарбы эгіпецкія; бо ён на нагароду ўглядаўся (Гебр. 11:24–26).

Звярніце ўвагу, Майсей вырашыў цярпець пакуты. Яго становішча было іншым, чым становішча дзяцей Ізраіля; у іх не было выбару. Аднак скардзіліся яны, а Майсей — не! Па ўласнай волі ён пакінуў лепшае, што мог прапанаваць свет, а таксама найвышэйшы статус, якога чалавек мог дасягнуць. Чаму? Ён шукаў іншай узнагароды. Яго ўзнагародай была не абяцаная зямля, а абяцанне Божай прысутнасці. Пасля ўсяго

адной сустрэчы ля куста Майсей хацеў толькі аднаго: блізка спазнаць Бога.

Я прапаведаваў тысячам людзей на канферэнцыях і ў цэрквах; мне цяжка было такое ўявіць. Калі б мне давялося выбіраць, я, не вагаючыся, абмяняў бы відавочны поспех, які даў Бог, на Яго яўную прысутнасць. Няма нічога лепшага за яе. Адчуваць Яго блізкасць, чуць Яго голас, які кажа мне ў сэрца цудоўныя таямніцы, значна лепш, чым прапаведаваць натоўпам і прадаваць мільёны кніг. Слава Яго прысутнасці значна большая за ўсё астатняе!

Маё сэрца разрываецца, калі я назіраю, як святары імкнуцца да поспеху, бо лічаць, што менавіта там знойдуць задавальненне. Іх нявыказаная мэта — быць паважанымі і прызнанымі. Я назіраў, як тыя, хто шукае сваёй значнасці і рэалізацыі праз дасягненні ў служэнні, становяцца ахвярамі роспачы, а ўрэшце – і цемры. Яны будуюць велізарныя служэнні, але заканчваюць амаральнасцю або трапляюць у пастку прагнасці, не ўсведамляючы пустату.

Я бачыў яшчэ большую колькасць вернікаў, якія ніколі не мелі поспеху, але скончылі таксама трагічна, расчараваўшыся, што не змаглі пабудаваць царкву больш за дзвесце, пяцьсот, тысячу, пяць тысяч чалавек або іншую колькасць, на якую настроіліся. Продажы кніг не дасягнулі чаканых мэтаў, іх не запрашалі на «вялікія» канферэнцыі, дзе яны хацелі выступіць. Яны шукалі рэалізацыі там, дзе яе нельга было знайсці. Гэта нічым не адрозніваецца ад тых, хто шукае статусу і дасягненняў на свецкім рынку. Такія вернікі прапускаюць сапраўдную мэту, для якой створаныя.

І наадварот, я сустракаў мужчын і жанчын з вялікім служэннем, якія дасягнулі поспеху, але іх сэрцы прагнуць большага ад Бога. Яны гатовы з радасцю адмовіцца ад усяго

і заняцца іншым служэннем або працай, калі так захоча Бог. Большасць з іх ніколі не імкнуліся да пасады, якую займаюць. Яны прызнаюць: Бог паставіў іх туды, і ўсё, чаго яны хочуць, — гэта дагадзіць Яму. Я бачыў іх шчырасць у размовах, і назіраў гэта ў іх учынках; яны ў нечым падобныя на Давіда, які дасягнуў вялікага поспеху, але назваў сябе бедным і ўбогім чалавекам.

Я таксама сустракаў вернікаў, што мелі невялікія служэнні, але хадзілі у супакоі і дабраслаўленні, бо ведалі: яны робяць тое, да чаго пакліканы. Яны прагнуць не колькасці людзей або знешняга поспеху, а хутчэй таго, каб бліжэй пазнаць Бога і хадзіць у Яго яўнай прысутнасці. Так павінна быць ў жыцці кожнага чалавека. Мы ўсе створаныя для Бога, і можам знайсці сапраўднае шчасце толькі ў веданні Яго і ў Яго прысутнасці. Менавіта ў гэтым ёсць сапраўдны супакой і задавальненне.

## Дзве прысутнасці Бога

На гэтым этапе трэба пагаварыць пра два віды прысутнасці Божай, прадстаўленых у Пісанні. Па-першае, усюдыіснасць Бога. Давід кажа пра яе, калі піша: «Куды мне ісьці ад Духа Твайго і ад аблічча Твайго куды ўцячы?» (Пс. 139:7) Усюдыіснасць — гэта Яго прысутнасць паўсюль. Далей Давід кажа: «Калі б я ўзыйшоў на неба, Ты там; калі б паслаў сабе [ложак] у пекле, — вось, [і там] Ты!.. Калі б я сказаў: «Няхай цемра пакрые мяне, і ноччу няхай станецца сьвятло вакол мяне», дык і цемра ня будзе цёмнай для Цябе, і ноч заясьнее, як дзень; цемра, як сьвятло» (вершы 8, 11–12). Гэта сведчыць пра абяцанне Госпада ніколі не адпускаць і не пакідаць нас (Гебр. 13:5). Хоць мы не адчуваем такую прысутнасць, гэта не

адмаўляе яе. Мы проста яе не ўсведамляем.

Другі від прысутнасці Святое Пісанне вызначае як Яго *яўную прысутнасць*. Слова «яўны» азначае «прынесці з нябачнага, нячутнага або невядомага ў бачнае, чутнае або вядомае». Майсей вельмі жадаў яўнай прысутнасці Госпада, калі Бог адкрывае Сябе не толькі нашаму духу, але калі і наш розум і пачуцці таксама ўсведамляюць Яго блізкасць. Тады Божыя веды адкрываюцца нашаму розуму. Менавіта пра такую прысутнасць Ісус казаў:

> «Я палюблю яго і зьяўлю яму Сябе» (Ян 14:21).

Псалміст таксама згадвае: «Шчасьлівы народ, які ведае трубны голас Твой. ГОСПАДЗЕ, яны ходзяць у сьвятле аблічча Твайго!» (Пс. 89:15). У дзень Пяцідзясятніцы Пётр заклікаў галодных Духам: «Дык навярніцеся і вярніцеся, каб сьцерліся грахі вашыя, каб прыйшлі часы асьвяжэньня ад *аблічча* Госпада» (Дз. 3:19, *курсіў аўтара*).

Бог можа з’яўляць Сваю прысутнасць па-рознаму. У Пісанні некаторыя бачылі Яго, іншыя чулі Яго голас, не бачачы Яго, а іншыя адчувалі Яго блізкасць і адразу даведваліся нешта, дзякуючы Яго адкрыццю. Але адно можна сказаць дакладна: вы зразумееце і адчуеце, калі Бог прыйдзе.

## Шукаеце Госпада ці праяваў?

Я бачыў людзей, якія, адчайна жадаючы адчуць Яго прысутнасць, былі ўведзены ў зман, бо шукалі праявы, а не асобы Госпада. Калі Бог прайшоў каля Іллі, адбылося некалькі вялікіх праяваў. Спачатку — вялікі і магутны вецер, але там не было Госпада; потым — землятрус, але Пісанне ясна паказвае, што Госпада не было ў землятрусе; потым — агонь,

але, зноў жа, і там не было Бога. Пасля агню пачуўся ціхі, лёгкі голас; менавіта тады Ілля зразумеў, што знаходзіцца ў Божай прысутнасці.

Я назіраў, як вернікі шукаюць праявы, думаючы, што праз іх знойдуць Бога. Яны не шукаюць Госпада сэрцам, каб адчуць Яго яўную прысутнасць. Часта пасля пераканаўчага і натхнёнага Богам паслання я заклікаю людзей выйсці на сустрэчу з Богам. Бываюць выпадкі, калі вернікі моляцца так, што гэта трывожыць або адцягвае ўвагу і супярэчыць таму, што адбываецца. Іншыя смяюцца, дрыжаць або дэманструюць іншыя знешнія праявы. Прычына вось у чым: калісьці яны шукалі Бога і дрыжалі, плакалі або смяяліся ў Яго прысутнасці, таму цяпер яны падсвядома робяць тое самае ў надзеі знайсці Бога ў гэтых праявах, але Яго там няма. Шмат разоў я супакойваў людзей, кажучы нічога не рабіць, проста заставацца спакойнымі і звяртацца да Яго ў сэрцы, шукаючы Самога Ісуса. Калі ёсць праявы, выдатна! Але не трэба шукаць Бога праз праявы. Мы павінны шукаць Самога Госпада!

Я памятаю сустрэчу ў Азіі, дзе многія адгукнуліся на заклік да пакаяння. Нават не хапала месца ўсім выйсці наперад, таму я сказаў маліцца і шукаць Бога, застаючыся на месцах. Пасля малітвы я заклікаў людзей звярнуцца да Госпада там, дзе яны стаялі. Божая прысутнасць цудоўным чынам напоўніла залу. Цудоўна назіраць, як Госпад пачынае весці сустрэчу і з’яўляе Сябе. Я адчуваў гэта шмат разоў, але да такога нельга прызвычаіцца. Часта вы можаце адчуць Яго лепей, чым людзі вакол. Як толькі з’явілася Яго прысутнасць, многія людзі пачалі смяяцца, але я адчуў смутак, і гэта пацвердзілася; значна хутчэй, чым Бог увайшоў у будынак, Ён сышоў, нягледзячы на тое, што людзі працягвалі смяяцца і ўзвышаць галасы, быццам Ён усё быў там.

Я спыніў іх і дакараў, разумеючы: яны паўтараюць тое, што адбылося ў Божай прысутнасці некалькі месяцаў таму, калі іх наведваў евангеліст. Служэнне евангеліста мае вельмі моцную праяву таго, што многія называюць «святым смехам». Я веру, што бываюць часы Божага наведвання, калі людзі смяюцца. Насамрэч, я адчуваў гэта асабіста, а таксама бачыў і на сваіх служэннях. Аднойчы ў Інданезіі Дух Божы сышоў на служэнне, і на працягу дзвюх гадзін мы з перакладчыкам назіралі, як людзі качаюцца ад смеху. Усё пачалося з пяці жанчын, якія плакалі, і ператварылася ў вясёлы смех усёй супольнасці. Людзі ніколі не адчувалі чагосьці падобнага. Яны шукалі Бога!

Аднак тут было інакш. Яны прагнулі праявы, а не Самога Госпада. Вернікі прыйшлі да высновы: без праявы смеху няма Божай прысутнасці. Я часта быў у Божай прысутнасці і адчуваў Яго моцна, не маючы ніякіх знешніх праяў. Часам у Яго прысутнасці я неспынна плакаў, але я разумею, што гэта толькі вынік пошуку і прыходу ў Яго прысутнасць.

Каб зразумець, разгледзім просты прыклад апранання штаноў. Апранаючы штаны, я магу іх паправіць, засунуўшы рукі ў пярэднія кішэні, і знайду там стодоларавую купюру. Канечне, я апранаў штаны не для таго, каб атрымаць грошы, наадварот: апранаючыся, атрымаў прыемную нечаканасць — знайшоў грошы. Мы шукаем не праявы, а асобы Госпада. Усё астатняе — гэта прыемны бонус.

Дакарыўшы азіяцкую супольнасць, я сказаў ім, што разумею іх прагу Божай прысутнасці і папярэдзіў іх не замяняць Самога Бога досведам. Пасля гэтага закліку прысутнасць Госпада вярнулася ў святым захапленні. На гэты раз многія плакалі, а не смяяліся, але ўсе, хто шукаў Яго, глыбока перажылі Яго цудоўную прысутнасць, незалежна ад таго, плакалі яны ці не.

## Праявы не задавальняюць

Не забывайце: манна ніколі не задавальняла народ Ізраіля. Бог даў манну ў пустыні, каб практычна паказаць іх адчайную патрэбу ў чымсьці большым — Яго прысутнасці. Майсей сказаў:

> І памятай увесь шлях, якім вёў цябе ГОСПАД, Бог твой, сорак гадоў праз пустыню, каб зьмяніць цябе і выспрабаваць цябе, і даведацца, што ў сэрцы тваім… Ён выпрабоўваў цябе голадам і карміў цябе маннай… каб даць зразумець табе, што ня толькі хлебам жыве чалавек, але кожным [словам], якое *выходзіць* з вуснаў ГОСПАДА, будзе жыць чалавек (Другазаконне 8:2–3, *курсіў аўтара*).

Уважліва даследуйце слова «*выходзіць*». Майсей не сказаў «*выйшла*», але *выходзіць*; гэта цяперашні час, а не прошлы. Слова чуваць, калі мы знаходзімся ў Яго прысутнасці! Ілля не захапіўся праявамі Бога, праходзячы міма; але чакаў ціхага голасу Яго прысутнасці, перш чым адказаць. Вернікі з Азіі ў маім прыкладзе захапіліся праявамі таго, што Бог рабіў раней, але Бог пайшоў далей. Яго не было ў тых праявах, Ён пайшоў да чагосьці новага, а вернікі засталіся, спрабуючы знайсці Бога там, дзе Ён быў калісьці.

Як манна не задавальняла народ Ізраіля, так і праявы не даваліся для задавальнення нашых глыбокіх жаданняў; праявы — не самамэта. Імкненне да праяваў прывядзе нас да незадаволенасці, якая не скончыцца, пакуль мы не адвернемся ад таго, што не можа нас насыціць, і будзем шукаць блізкасці, якая зыходзіць ад Госпада.

## Задаволенасць адносінамі розуму

Калі вернікі ставяць праявы вышэй за пошук Госпада дзеля Яго Самога, адбываецца яшчэ адна сумная рэч, якая адштурхоўвае многіх ад сапраўднай прысутнасці Бога. Расчараваныя рознымі незвычайнымі паводзінамі тых, хто шукае праявы, людзі будуць стрыманыя і задаволяцца адносінамі розуму з Богам. Гэта трагічна, бо мы былі створаны для значна большага. А. У. Тозер пісаў, што ў апошнія дні вучэнне пра апраўданне верай:

> ... інтэрпрэтуецца многімі такім чынам, што фактычна забараняе людзям пазнанне Бога. Уся справа рэлігійнага навяртання стала механічнай і бездухоўнай... Чалавек «выратаваны», але ён не галодны па Богу і не прагне Яго. На самай справе, яго наўмысна вучаць быць задаволеным і заахвочваюць задавальняцца малым («*Імкненне да Бога*», с. 12–13).

Інтэлектуальныя адносіны з Богам механічныя і бездухоўныя. Мы былі створаны, каб жыць з Ім у рэальнасці, а не толькі ў тэорыі. Пакуль мы не адчуем паўнаты, мы не мусім задаволіцца. Ісус памёр, каб знішчыць заслону, што аддзяляла нас ад прысутнасці Бога. Вось што кажа псалміст:

> Як умілаваныя сялібы Твае, ГОСПАД Магуцьцяў! Прагне і тужыць душа мая па панадворках ГОСПАДА; сэрца маё і цела маё весяляцца ў Богу Жывым. Нават птушка адшукала дом, ластаўка — гняздо для сябе, дзе птушанятак сваіх укладае: каля ахвярнікаў Тваіх, ГОСПАД Магуцьцяў, Валадар мой і Бог мой! Шчасьлівыя [радасныя, якім зайздросцяць] тыя, што

> жывуць у Доме Тваім, заўсёды яны [ўзносяць] хвалу Табе. Сэлях! (Пс. 84:2-5)

У Новым перакладзе караля Якуба другі верш гучыць так: «Сэрца маё і цела маё клічуць да Бога жывога». Далей аўтар кажа: верабей і ластаўка знайшлі сабе прытулак, і прызнае, што застаўся бяздомным, бо шукаў панадворкаў Бога. Месца, дзе можна знайсці прысутнасць Божую, становіцца для псалміста жаданым домам. Заўважце, ён кажа: «Шчасьлівыя, удачлівыя, вартыя зайздрасці тыя, што жывуць у Доме Тваім». Вось мэта тых, хто любіць Бога! Яны прагнуць яўнай Божай прысутнасці. Чым бліжэй мы да Бога, тым мацней яна становіцца, і тым больш уплывае на нас.

## Пытанні для вывучэння

1. У пачатку раздзела аўтар піша: «За гэты час я зразумеў, што ў царкве ёсць дзве асноўныя групы людзей... Першыя — тыя, хто шукае Бога дзеля таго, што Ён можа зрабіць; а другія – дзеля таго, Хто Ён». Шчыра паразважайце, у якой групе вы сябе бачыце.
2. Пасля вызвалення з эгіпецкага палону ізраільцяне часта то хвалілі Бога і пакланяліся Яму за Яго забеспячэнне, то наракалі і скардзіліся, бо Ён не даў ім таго, што яны хацелі. Узгадайце «пустынны досвед» у вашым жыцці: у чым ваша стаўленне падобна да стаўлення народа Ізраіля?
3. Магчыма, вы чытаеце гэтую кнігу, таму што зараз перажываеце «пустынны досвед». Калі так, то чаму вас вучыць досведу Іллі з праявамі ветру, землятрусу і агню?

Раздзел 5

# ЗА ЗАВЕСАЙ

«Прысутнасць Бога аддзяляе нас ад усіх астатніх на зямлі».

Прысутнасць Госпада заўсёды прыносіць большае адкрыццё пра тое, хто Ён, і з кожнай сустрэчай мы змяняемся раз і назаўжды. У Бібліі мы бачым: больш разумелі Божыя шляхі тыя, хто шукаў і перажываў Яго прысутнасць.

## Фактар падзелу

У папярэднім раздзеле мы бачылі, як Майсей атрымаў і адхіліў прапанову Бога. Госпад даў яму абяцанні, але пазбавіў Сваёй прысутнасці. Майсей хутка адрэагаваў: «Калі ня пойдзе абліччa Тваё, не выводзь нас адгэтуль» (Вых. 33:15). Майсей усталяваў прэцэдэнт: блізкасць з Богам важнейшая, чым

абяцанні без Яго прысутнасці. Паслухайце цяпер аргументы Майсея наконт адмовы ад анёльскага суправаджэння:

> Калі ня пойдзе аблічча Тваё, не выводзь нас адгэтуль. Бо з чаго я спазнаю, што знайшоў ласку ў вачах Тваіх, я і народ Твой? Ці не з таго, што Ты пойдзеш з намі? *І будзем аддзеленыя я і народ Твой ад усіх народаў, якія на абліччы зямлі* (Вых. 33:15–16, курсіў аўтара).

У адказе Майсея раскрываецца магутная праўда: менавіта Божая прысутнасць аддзяляе нас ад усіх астатніх на зямлі. Не той факт, што мы вызнаём хрысціянства; наведваем цэрквы, якія вераць у Біблію; ці з'яўляемся добрымі людзьмі, што калісьці маліліся малітвай пакаяння з сябрам або ў адказ на заклік ў царкве. Менавіта Божая прысутнасць адрознівае нас і робіць нас святымі (аддзеленымі для Бога). Менавіта Яго прысутнасць робіць гэта відавочным для тых, хто жыве на зямлі.

Чаму ж тады так шмат людзей змірыліся з інтэлектуальнымі адносінамі з Богам? Чаму мы задаволіліся хрысціянствам без прысутнасці Хрыста? Як мы навучыліся быць задаволенымі без блізкасці з Ім? Навошта мы вучылі хрысціянству так, што гэта не выклікае ў людзей жадання наблізіцца да Яго прысутнасці і заставацца ў ёй? У адказ А. У. Тозер піша:

> Бог хоча, каб мы ўвайшлі ў Яго прысутнасць і пражылі там усё жыццё. Гэта павінна быць нашым свядомым досведам. Гэта не проста дактрына; гэта жыццё, у якім мы атрымліваем асалоду ад кожнай хвіліны кожны дзень («*The Pursuit of God*», с. 34).

Многія задаволіліся інтэлектуальным спазнаннем

прыналежнасці Богу, не імкнучыся да канкрэтнага ўзаемадзеяння з Ім. Канцэпцыя збаўлення ўкаранілася настолькі глыбока, што мала хто ідзе далей. Чалавек памаліўся, некалі памрэ і пойдзе да Госпада. Аднак рэальнасць Хрыста застаецца незаўважанай, і губляецца магутнае адкрыццё пра тое, што Бог жадае хадзіць з намі. Гэта не аднаразовы ці абстрактны досвед, а вельмі рэальнае Божае жаданне трывалай супольнасці. Давайце разам падарожнічаць па Пісанні, каб гэта даследаваць.

## Хто перажываў Божую прысутнасць?

Мы бачым: яўная прысутнасць Бога прасочваецца ва ўсёй Бібліі. У садзе Адам і Ева хадзілі з Богам, пакуль непаслушэнства не прымусіла іх схавацца «ад аблічча ГОСПАДА Бога» (Быц. 3:8). У гэты момант чалавек аддзяліўся ад Божай прысутнасці. Праз зацвярдзелае сэрца іх сын Каін яшчэ больш аддаліўся ад прысутнасці Госпада.

Тым не менш, Бог не здаваўся і ўсё яшчэ жадаў блізкасці з людзьмі, якіх Ён любіў. У рэшце рэшт, такія людзі, як Энох і Ной, адгукнуліся на Яго заклік і, у сваю чаргу, кранулі сэрца Бога нястомным імкненнем да Яго. У выніку яны наблізіліся да Яго больш, чым іншыя людзі іх тысячагоддзя з часоў Адама ў Эдэмскім садзе.

Абрагам часта адчуваў Яго яўную прысутнасць на працягу жыцця. Адна з такіх сустрэч адбылася, калі Бог прыйшоў абмеркаваць з Ім будучыню Садома і Гаморы. Пасля суду над гарадамі мы чытаем: «і ўстаў Абрагам раніцаю на тое месца, дзе стаяў перад абліччам ГОСПАДА» (Быц. 19:27). Гэта толькі адзін з шматлікіх выпадкаў, калі Абрагам цешыўся адносінамі з Богам у Яго прысутнасці. Насамрэч, у старасці Абрагам

звярнуўся да свайго слугі з наступнымі словамі: «ГОСПАД, перад абліччам Якога я хадзіў, пашле анёла Свайго з табою і дасьць посьпех на шляху тваім» (Быц. 24:40).

Мы чытаем пра Самуэля: «І рос Самуэль, і ГОСПАД быў з ім. І з усіх словаў ягоных ніводнае ня ўпала на зямлю» (1 Сам. 3:19). Як магло быць, што ўсе словы спраўдзіліся? Адказ знаходзім у наступным вершы: «І паспагадаў ГОСПАД Ганьне, і яна зачала, і нарадзіла трох сыноў і дзьве дачкі. А юнак Самуэль рос пры ГОСПАДЗЕ» (1 Сам. 2:21). Зноў бачым: Госпад адкрываецца менавіта праз Яго прысутнасць. Калі мы спазнаём Яго, мы будзем казаць тое, што Ён кажа, і нашы словы спраўдзяцца.

Давід, які любіў і перажываў прысутнасць Бога гэтак жа моцна, як і многія іншыя ў Старым Запавеце, за выключэннем, магчыма, Майсея, усклікнуў: «А дом слугі Твайго Давіда будзе моцна стаяць перад абліччам Тваім» (2 Сам. 7:26). Як і Майсея, Давіда не цікавіў поспех замест Божай прысутнасці. Пазней, здзейсніўшы цяжкі грэх чужалоства і забойства, Давід горача каяўся перад Госпадам: «Не адкінь Ты мяне ад аблічча Твайго і Духа Сьвятога Твайго не забірай у мяне!» (Пс. 51:13). Ён ведаў, што без Божай прысутнасці жыццё стане пустым і бессэнсоўным! Словы «Ты дасі мне ведаць шлях жыцьця; перад абліччам Тваім поўня радасьці, праваруч Цябе — раскоша заўсёды» (Пс. 16:11) Давід прысвяціў менавіта Госпаду.

Псіхолагі кажуць, нас як асобу фармуюць нашы адносіны за апошнія пяць гадоў. З гэтым цяжка не пагадзіцца, бо Пісанне кажа: «Не падманвайце сябе: благія таварыствы псуюць добрыя звычаі» (1 Кар. 15:33); і зноў: «Хто ходзіць з мудрым, будзе мудрым» (Прып. 13:20). А як жа Давід? Ён быў адзін у пустыні, калі «сабраліся да яго ўсе пакрыўджаныя,

і тыя, што мелі даўгі, і засмучаныя ў духу, і ён стаўся іх правадыром. І было з ім каля чатырох сотняў чалавек» (1 Сам. 22:2). Вось гэта натоўп! Правесці з ім больш за дзесяць гадоў? Пакрыўджаныя, засмучаныя і ў даўгах! Яны злыя, напружаныя і, хутчэй за ўсё, грубыя і нячулыя. Ці фармавалі яны асобу Давіда? Не! Чаму? Таму што Давід праводзіў столькі часу ў прысутнасці Бога, што захоўваў валадарскую паставу, і, адпаведна, выхаваў іх вялікімі лідарамі, вядомымі на працягу многіх пакаленняў!

Адзін з маіх любімых вершаў Пісання — адказ Давіда на вялікае запрашэнне Бога. Ён напісаў:

> «Пра Цябе кажа сэрца маё: «Шукайце аблічча Маё!» Я буду шукаць, ГОСПАДЗЕ, аблічча Тваё!» (Пс. 27:8)

Такім было жыццё Давіда: ён праводзіў так шмат часу з Госпадам, што не толькі паўплываў на чатырыста сварлівых мужчын, але і на ўвесь народ. Ён быў уплывовай асобай, таму што праводзіў час з Крыніцай усёй мудрасці, ведаў і разумення. Але Давід рабіў гэта не для таго, каб «атрымаць» Божую мудрасць; ён імкнуўся да Бога, бо прагнуў Яго сэрца. Давід любіў Бога больш за іншых людзей ці рэчы, бо правёў з Богам вельмі шмат часу.

Хацелася б, каб Саламон, сын Давіда, пераняў у бацькі такое гарачае жаданне. Саламон двойчы бачыў Бога Ізраіля і быў мудрэйшым за ўсіх, хто жыў да і пасля яго, але не змог усвядоміць важнасць знаходжання ў Божай прысутнасці. У канцы жыцця, калі яго час заканчваўся, Саламон піша сумную кнігу Эклезіяста. Нягледзячы на мудрасць, незлічонае багацце, найпрыгажэйшых жанчын на зямлі, а таксама славу і ўплыў на ўвесь свет, ён мог толькі ўздыхаць: «Марнасць… Усё

марнасць!» Калі б Саламон меў сэрца Давіда, свайго бацькі, гісторыя Ізраіля была б зусім іншай.

Насамрэч, значная частка біблейскай гісторыі была б іншай, калі б розныя людзі ведалі важнасць імкнення да прысутнасці Бога. На жаль, нямала людзей адчула Яго прысутнасць, але не змагло ўсвядоміць, што яны паспыталі. Вернікі не зразумелі, што ў прысутнасці Бога ёсць трывалае задавальненне, а даўгалецце можна знайсці толькі ў пастаянным пошуку Госпада. Адным з такіх людзей быў далёкі нашчадак Давіда, цар Узія. Змалку ён шукаў Бога і ў выніку дасягнуў вялікага поспеху, але пазней забыўся, адкуль прыйшоў гэты поспех. У сваёй ганарыстасці ён больш не шукаў Госпада, і ў выніку памёр у адзіноце пракажоным (гл. 2 Лет. 26).

## Найвялікшая трагедыя

Прыклады можна знайсці ва ўсім Старым Запавеце, але адна з найвялікшых трагедый адбылася за шмат гадоў да Давіда, калі яго продкі, нашчадкі Абрагама, выйшлі з Эгіпта. У папярэднім раздзеле мы даведаліся, што Бог жадаў вызваліць народ, каб прывесці яго да Сабе. Ён хацеў наблізіцца да яго, каб з’явіць Сваю прысутнасць, але з сумам чытаем: калі Бог так зрабіў: «І стаяў народ *здалёк*, а Майсей *наблізіўся* да імглы, туды, дзе Бог» (Вых. 20:21, *курсіў аўтара*). Як трагічна. Бог адкрывае Сябе, а яны адступаюць! Толькі Майсей меў жаданне падысці і наблізіцца. Праз такую рэакцыю ізраільцянаў Бог мусіў прызначыць святароў, якія будуць стаяць перад Ім дзеля народа. Каб Бог мог быць сярод іх за завесай, патрабавалася Сяліба. Калі яе пабудавалі ў адпаведнасці з Божымі ўказаннямі, мы чытаем:

> І закрыла воблака Намёт Спатканьня, і *слава* ГОСПАДА напоўніла Сялібу. І ня мог Майсей увайсьці ў Намёт Спатканьня, бо ляжала на ім воблака, і слава ГОСПАДА напаўняла Сялібу (Вых. 40:34–35, *курсіў аўтара*).

## Розныя ступені Божай прысутнасці

На гэтым этапе трэба крыху адхіліцца і абмеркаваць розныя ступені Божай прысутнасці. Звярніце ўвагу на слова «слава» (у анг. перакладзе «слаўная прысутнасць» — заўвага перакл.) у вершах вышэй. Калі Сяліба была ўзведзена, Божая прысутнасць была настолькі слаўнай, што Майсей, чалавек, які размаўляў з Богам твар у твар, як сябар, не мог увайсці. Ці ўяўляеце вы сілу Яго велічнасці ў той момант — прысутнасць адначасова цудоўную і жахлівую?

Гадамі пазней, у часы Гэлія, суддзі, святара і далёкага нашчадка Аарона, прысутнасць Госпада ў Сялібе была незаўважнай. Фактычна, у Сялібу можна было не проста ўвайсці, але і рабіць відавочны грэх побач з тым месцам, куды Майсей не адважваўся зайсці. Мы чытаем: «І слова ГОСПАДА было рэдкім у тыя дні, і відзежаў не было» (1 Сам. 3:1). Чаму слова Госпада было рэдкім? Зноў жа, адкрыццё Бога, у тым ліку Яго слова, знаходзіцца ў Яго прысутнасці. Дзе няма прысутнасці, там няма адкрыцця, дзе ёсць толькі невялікая мера Яго прысутнасці, там адкрыццё рэдкае, а дзе ёсць моцная прысутнасць, там вялікае адкрыццё! У гэтым раздзеле мы чытаем, што лямпа Божая (Яго прысутнасць) згасала і магла вось-вось згаснуць (няма прысутнасці). Так адбылося ў канцы часоў Гэлія, калі каўчэг быў захоплены філістынцамі. У апошні дзень яго жыцця абвесцілі імя Іхавод, што азначае «слава адышла».

У адрозненне ад часоў Гэлія, калі прысутнасць Бога была рэдкай і незаўважнай праз грэх, бываюць абставіны, дзе Яго прысутнасць хоць і не слаўная, як у час пабудовы Сялібы, але застаецца вельмі рэальнай, і адкрыццяў шмат. У такія часы Бог набліжаецца не так заўважна, вырашыўшы не з'яўляць Сваю славу. Мы бачым гэта на прыкладзе Якуба. Ён змагаўся з Богам і бачыў Яго тварам у твар, але відавочна не ў Божай славе. Аднак у выніку сустрэчы Якуб перамяніўся і ўзрос у адкрыцці Бога (Быц. 32:24–30). Егошуа ўбачыў Госпада і нават не зразумеў, што размаўляў з князем войска Госпада. З іншага боку, Майсей прасіў убачыць твар Госпада, і атрымаў адказ: «Ня зможаш паглядзець на аблічча Маё, бо ня можа глядзець на Мяне чалавек і застацца жывы» (Вых. 33:20). Мы бачым, што Майсей жадаў убачыць Бога ва ўсёй Яго славе, але не змог; аднак Егошуа і іншыя ўбачылі твар Госпада і засталіся жыць. Чаму? Яны не бачылі Госпада ў паўнаце Яго славы.

## Святло Яго Аблічча

Спачатку давайце коратка паразмаўляем пра славу Госпада. Некаторыя уяўляюць яе як туман, воблака ці нешта падобнае. Адсюль і выказванні накшталт: «О, слава Божая сышла на служэнне ўчора ўвечары». Але гэта абмяжоўвае і азмрочвае Божую раду неразумнымі словамі (гл. Ёва 38:2).

Па-першае, слава Божая — гэта не воблака. Вы можаце спытаць: «Тады чаму воблака згадваецца амаль кожны раз, калі Божая слава з'яўляецца ў Пісанні?» Прычына ў тым, што Бог хаваецца ў воблаку. Ён занадта велічны, каб мы маглі бачыць Яго, таму воблака закрывае Яго аблічча, інакш усе людзі вакол згараць ды імгненна памруць. Памятайце, Бог сказаў Майсею: ніхто не можа ўбачыць Яго твар і застацца

жывым. Тады паўстае пытанне: як Ісая, Эзэкіэль і апостал Ян маглі ўбачыць славу Госпада, выжыць і напісаць пра яе? Адказ просты: яны былі ў духу і па-за целам. Смяротнае цела не можа стаяць у прысутнасці Святога Госпада ва ўсёй Яго славе. Госпад — агонь, які паглынае, у якім няма цемры (Гебр. 12:29, 1 Ян 1:5). Павел піша пра Ісуса:

> …шчасьлівы і адзіны магутны Валадар тых, хто валадарыць, і Госпад тых, якія пануюць, Адзіны, Які мае несьмяротнасьць, жыве ў сьвятле недаступным, Якога ніхто з людзей ня бачыў і бачыць ня можа. Яму пашана і ўлада вечная (1 Цім. 6:15–16).

Ісус жыве ў недасяжным святле, Якога ніхто з людзей не бачыў і не можа бачыць. Псалміст сцвярджае, што Госпад носіць святло як шаты (гл. Пс. 104:2). Павел мог лёгка напісаць гэтаксама, бо перажыў недасягальнае святло слаўнай Божай прысутнасці па дарозе ў Дамаск. Ён распавёў пра гэта цару Агрыпе наступным чынам:

> …пасярод дня, валадару, убачыў я на шляху сьвятло з неба, ярчэйшае за зьзяньне сонца, якое асьвяціла мяне (Дз. 26:13).

Павел не бачыў твар Ісуса; ён бачыў толькі святло, якое зыходзіла ад Яго і зацямніла яркае сонца Блізкага Усходу! Павел быў у прысутнасці Божай славы. Гэта было не ранішняе ці пасляабедзеннае сонца, а хутчэй сонца апоўдні. Дванаццаць гадоў я жыў у «сонечным штаце», Флорыдзе, але ніколі не быў *вымушаны* насіць сонечныя акуляры. Аднак некалькі гадоў таму я падарожнічаў з Лізай на Блізкі Усход; там я быў *вымушаны* насіць сонечныя акуляры! У сухім пустынным

клімаце сонца было нашмат ярчэйшым, а блізкасць да экватара павялічвала яркасць у шмат разоў. Сонечнае святло можна было вытрываць ранняй раніцай і пасля абеду, але з адзінаццаці да дзвюх гадзін яно было вельмі яркім. Тым не менш, Павел сказаў: святло Ісуса ярчэйшае за самае яркае сонца Блізкага Усходу! Прыгадайце апошні раз, калі вы спрабавалі паглядзець проста на паўдзённае сонца. Гэта цяжка, калі яно не схавалася за хмарамі. Слава Госпада пераўзыходзіла такі бляск у шмат разоў.

Становіцца зразумела, чаму Ёэль і Ісая казалі, што ў апошнія дні, калі адкрыецца слава Гасподняя, сонца ператворыцца ў цемру. «Вось, дзень ГОСПАДА надыходзіць, зоркі нябесныя і сузор'і іхнія ня будуць сьвяціць сьвятлом сваім, сонца зацемрыцца пры ўзыходзе сваім і месяц ня будзе зьзяць сьвятлом сваім» (Іс. 13:9–10).

Дазвольце растлумачыць далей. Што мы бачым у чыстым начным небе? Зоркі! Яны паўсюль. А што адбываецца, калі раніцай узыходзіць сонца? Куды знікаюць зоркі? Хіба яны хаваюцца перад узыходам сонца, а вечарам спяшаюцца вярнуцца на месца са схованкі пад гарызонтам? Адказ відавочны: не. Што ж тады адбываецца? Слава зорак мае адзін ўзровень, але слава сонца настолькі большая, што пасля яго ўзыходжання зоркі цямнеюць у параўнанні з ім. Зоркі на месцы, проста іх нельга ўбачыць. Падобным чынам, калі Ісус вернецца, Яго слава будзе настолькі большай за сонца, што зацьміць яго. Сонца стане нябачным, хоць і не знікне! Вось так! Ці разумееце вы, чаму Павел піша: «Якога ніхто з людзей ня бачыў і бачыць ня можа»?

Слава Госпада пераўзыходзіць усё іншае святло. Ён — дасканалае і ўсепаглынальнае святло. Вось чаму падчас Яго другога прышэсця народы зямлі «ўвойдуць у пячоры ў скале

і ў ямы ў парахне ад страху перад ГОСПАДАМ і перад *бляскам велічы Ягонай*» (Іс. 2:19, *курсіў аўтара*). Ян апісвае гэта так:

> І валадары зямныя, і магнаты, і багатыры, і тысячнікі, і магутныя, і кожны слуга, і кожны свабодны схаваліся ў пячорах і ў горных скалах, і кажуць горам і скалам: «Упадзіце на нас і схавайце нас *ад аблічча* Таго, Які сядзіць на пасадзе, і ад гневу Ягняці!» (Адкр. 6:15–16, *курсіў аўтара*).

## Што такое слава Божая?

Давайце адкажам на пытанне: што такое слава Госпада? Каб адказаць, вернемся да размовы Майсея з Богам. Майсей прасіў не толькі прысутнасці Бога, але і бачыць Яго славу.

> І сказаў [Майсей]: «Пакажы мне, прашу, *славу* Тваю» (Вых. 33:18, *курсіў аўтара*).

Габрэйскае слова, якое азначае *славу*, — *кабоўд*. У Біблійным слоўніку Стронга «кабоўд» вызначаецца як «вага чагосьці толькі ў пераносным сэнсе са станоўчай ацэнкай, бляск, багацце і гонар». Майсей прасіў Бога «паказаць Сябе ва ўсёй Сваёй велічы». Уважліва паглядзіце на Божы адказ:

> Я правяду перад абліччам тваім усю *добрасьць* Сваю, і назаву імя ГОСПАДА перад табою (Вых. 33:19, *курсіў аўтара*).

Майсей прасіў Бога паказаць усю Сваю славу, а Бог адказаў словамі пра «ўсю добрасьць Сваю». Габрэйскае слова, якое азначае добрасць, — *туўб*. Яно азначае «добрае ў шырэйшым сэнсе». Іншымі словамі, нічога не ўтойваецца.

Тады Бог кажа: «І назаву імя Госпада перад табою». Перад уваходам зямнога валадара ў тронную залу, яго імя абвяшчае герольд. Абвяшчэнне суправаджаецца гукамі труб, калі валадар велічна ўваходзіць у тронную залу. Веліч цара напаўняе ўсё, і ў сярод яго двара няма ніякіх сумневаў, хто ёсць цар. Велічная прысутнасць валадара напаўняе людзей захапленнем. Але што здарыцца, калі гэты ж манарх выйдзе на вуліцы горада ў звычайным адзенні і без світы? Відавочнае пры двары знікне звонку: многія жыхары горада не пазнаюць, хто гэта такі. Прысутнасць манарха на вуліцы не ўразіць і не будзе такой заўважнай, як у славе троннай залы. Па сутнасці, менавіта так Бог зрабіў для Майсея, сказаўшы: «І назаву Маё імя і праваду перад абліччам тваім усю добрасьць Сваю».

У Новым Запавеце мы чытаем: слава Госпада адкрываецца ў абліччы Ісуса Хрыста (2 Кар. 4:6). Многія, хто быў у прысутнасці Госпада, сведчылі, што бачылі Ісуса і глядзелі на Яго твар. Гэта цалкам магчыма, але я скажу вам наступнае: яны не бачылі ўсёй Яго славы.

Іншыя могуць сумнявацца, што вучні глядзелі на твар Ісуса пасля Яго ўваскрасення з мёртвых. Таксама правільнае меркаванне, але гэта не было адкрытым з’яўленнем Яго славы. Як я ўжо згадваў, былі тыя, хто бачыў і адчуваў прысутнасць Госпада ў Старым Запавеце, але не ў адкрыцці Яго славы. Госпад з’явіўся Абрагаму каля дубравы Мамрэ, але не ў Сваёй славе (Быц. 18:1–2). Якуб змагаўся з Богам, а Егошуа (Егош. 5:13–15) нават не пазнаў Яго.

Калі Егошуа перад уварваннем у Ерыхон паглядзеў на аблічча Божае, Госпад выглядаў як воін. Не разумеючы, хто Ён такі, Егошуа спытаў: «Ты за нас ці за нашых ворагаў?» Тады Госпад адкрыў сябе як князь войска Госпада і загадаў Егошуа зняць абутак, бо зямля была святая! Якуб змагаўся з Госпадам

усю ноч і, нарэшце, на світанні закрычаў: «Скажы, калі ласка, Тваё імя!» (Быц. 32:29) Вернемся да прыкладу манарха ў звычайным адзенні, якога многія не пазналі. Гэта ілюструе, што здарылася з Егошуа і Якубам, але яны ўсё роўна атрымалі вялікае адкрыццё пра Бога.

Тое ж самае можна сказаць і пра Уваскрасенне. Першым, з кім размаўляў Ісус, была Марыя Магдалена, і яна падумала, што гэта садоўнік (Ян 20:15–16). Вучні елі рыбу з Ісусам на беразе мора (Ян 21:9–10) і спачатку не пазналі Яго і Яго голас. Яны пазналі Ісуса толькі калі Той зрабіў нешта знаёмае. Зноў жа, пасля ўваскрасення Ісус ішоў з двума вучнямі, якім было сказана перад Яго смерцю, што адбудзецца, але яны не заўважылі Ісуса, бо «вочы іх былі стрыманыя» (Лк 24:16). Таксама вучні не пазналі Яго твар, постаць і голас. Яны ўсе бачылі твар Ісуса, адчувалі Яго прысутнасць, хоць і не ў адкрытай прояве Яго славы, але ўсе яны атрымалі адкрыццё ад Яго прысутнасці.

Наадварот, апостал Ян бачыў Ісуса ў духу, знаходзячыся на востраве Патмас, але меў зусім іншую сустрэчу, чым сняданак ля мора, бо там Ян убачыў Ісуса ў Яго славе. Ян так апісаў Ісуса: «…твар Ягоны — як сонца, якое сьвеціць у сіле сваёй. І калі я ўбачыў Яго, я ўпаў ля ног Ягоных як мёртвы» (Адкр. 1:16–17). Слаўная прысутнасць Госпада была настолькі моцнай, што Ян упаў як мёртвы.

Слава Госпада — гэта ўсё, што робіць Бога Богам. Усе Яго характарыстыкі, улада, сіла, мудрасць — літаральна Яго невымерная вага і веліч, дзе нічога не схавана і не ўтоена! Гэтую слаўную прысутнасць можна адчуць, незалежна ад таго, ці бачны Бог часткова, як у выпадку Майсея (толькі ногі і спіна), ці, як гэта было ў выпадку з Саўлам па дарозе ў Дамаск, — ніякага аблічча, толькі моцнае святло і голас.

## Яго жытло

Вернемся да нашчадкаў Абрагама. Калі Бог упершыню праявіў Сваю прысутнасць на гары Сінай, ізраільцяне адхіснуліся і закрычалі: «Вось, зьявіў нам ГОСПАД, Бог наш, *славу Сваю* і веліч Сваю. Мы чулі голас Ягоны з сярэдзіны агню… Але цяпер навошта мы маем паміраць? Бо праглыне нас гэты агонь вялікі; калі мы яшчэ будзем слухаць голас ГОСПАДА, Бога нашага, мы паўміраем» (Друг. 5:24–25, *курсіў аўтара*). Людзі не маглі вытрымаць Яго слаўнай прысутнасці, таму што іх сумленне было заплямлена эгаістычнымі паводзінамі.

Затым была ўзведзена Сяліба, і Бог пасяліўся ва ўнутранай частцы, якая называлася «Святое святых». Менавіта сюды раз на год уваходзіў першасвятар. У гэтым выпадку святар уваходзіў спачатку на панадворак, дзе на медным ахвярніку прыносілася крывавая ахвяра, каб адкупіць перад Богам яго грахі і грахі народа. Пасля гэтага святар мыўся ў мыцельніку, што прылягаў да ахвярніка. Затым ён уваходзіў у Святое праз заслону. У гэтае месца не пранікала натуральнае святло. Адзінае святло ішло ад залатога падсвечніка, які сімвалізаваў Ісуса, наша святло (Ян 9:5). Таксама тут знаходзіўся хлеб, які сведчыў пра Ісуса як пра Хлеб жыцця (Ян 6:48). Трэцім прадметам у гэтым месцы быў ахвярнік каджэння, які сімвалізаваў жыццё бесперапыннай малітвы і пакланення.

Патрапіўшы у Святое, святар усё яшчэ не апынуўся у месцы Божай прысутнасці. Заставалася яшчэ адна заслона, якая аддзяляла Святое ад Святога святых. Тут, над накрыўкай каўчэга, і знаходзілася яўная прысутнасць Бога. Гэтая заслона была разарваная, калі Ісус аддаў дух: «…заслона ў бажніцы была разьдзёртая надвое ад верху да нізу» (Мц. 27:51). Звярніце ўвагу, што яна разарвалася ад верху да нізу, а не наадварот. Бог,

а не чалавек, разарваў гэтую заслону, бо Ён выходзіў з-за яе! Ён рыхтаваў новае месца жыхарства, жытло, пра якое Ён заўсёды марыў, — сэрцы Сваіх адроджаных дзяцей. Калі гэта адбылося? Праз пяцьдзясят тры дні, у дзень Пяцідзясятніцы, Бог пасяліўся ў Сваёй доўгачаканай сялібе. Мы чытаем:

> І стаўся раптам шум з неба, быццам ад наляцеўшага гвалтоўнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. І паказаліся ім падзеленыя языкі, быццам агнявыя, і паселі на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі гаварыць іншымі мовамі, як Дух даваў ім прамаўляць (Дз. 2:2–4).

Божая прысутнасць з’явілася толькі калі Майсей *скончыў* працу над Сялібай. Гэтаксама, калі Ісус сказаў: «*Зьдзейсьнілася*!» і, схіліўшы галаву, аддаў дух» (гл. Ян 19:30), Госпад пераехаў у Сваё новае жытло, падрыхтаванае крывёю вечнага Ягняці.

> Дык, браты, маючы адвагу ўваходзіць у сьвятыню праз кроў Ісуса Хрыста, шляхам новым і жывым, які Ён усталяваў для нас праз заслону,.. будзем *падыходзіць* са шчырым сэрцам, у поўні веры, пакрапіўшы сэрцы, [каб ачысьціць] ад сумленьня злога, і абмыўшы цела чыстай вадою. Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі, бо верны Той, Які абяцаў (Гебр.10:19-23, *курсіў аўтара*).

Мы маем адвагу *набліжацца* да Таго, хто жыве ў Святым Святых! Гэта месца не ў намёце ці храме, гэта цяпер нашы целы! Так, Бог перамясціўся ў сэрцы людзей, якія былі асвячоныя ахвярай Ісуса. Часта, калі мы звяртаемся да Бога, мы ўяўляем сабе, як уваходзім у далёкую тронную залу за

мільёны кіламетраў. Не, Яго жытло — гэта нашы сэрцы! Мы яшчэ не навучыліся звяртацца ўнутр; мы ўсё яшчэ глядзім навонкі! Новы Запавет ясна кажа нам: «Не кажы ў сэрцы тваім: “Хто ўзыйдзе ў неба?”» (каб знайсці Хрыста і Яго дапамогу) (Рым. 10:6).

Так, у Бога ёсць фізічная тронная зала, размешчаная на трэцім небе. Тым не менш, Ён так прагнуў блізкасці да Свайго народа, што ў часы Старога Запавету стварыў жытло ў намёце на зямлі, каб там знаходзілася Яго яўная прысутнасць. Цяпер Ён стварыў для сябе яшчэ адно жытло ў сэрцах тых, хто аддаў жыццё Ісусу і пажадаў напоўніцца Яго Духам. Бог знайшоў найбліжэйшае месца да аб’екта Сваёй любові і прыхільнасці. Калі мы набліжаемся да Таго, хто ў нашых сэрцах, мы таксама ўваходзім у тронную залу за мільёны кіламетраў адсюль. Як гэта магчыма? У Духу Божым няма адлегласці. Быць у Яго прысутнасці — значыць быць у троннай зале з Ісусам і Айцом, таму што Ён ёсць Дух Хрыста і Бога! (Гл. Рым. 8:9)

Звярніце ўвагу, аўтар кажа: «Будзем трымацца няўхільна вызнаньня *надзеі*, бо верны Той, Які абяцаў». Таксама далей гаворыцца:

> (Гэтую) «надзею … маем, як якар душы, пэўны і трывалы, які ўваходзіць ва *ўнутранае* за заслону (Гебр. 6:19, *курсіў аўтара*).

Разарваная заслона адкрыла шлях, каб кожны вернік у свеце мог увайсці ў прысутнасць Бога новым і жывым шляхам. Заслона цяпер становіцца нашым целам. Калі мы можам прайсці праз панадворак цела, ўкрыжаваўшы або адракаючыся ад яго (гл. Гал. 5:24), мы ўваходзім у новае «Святое святых» сэрца, дзе дасяжна бесперапынная

супольнасць з Богам. Яго прысутнасць становіцца пастаяннай рэальнасцю. Бог гарантаваў: калі мы наблізімся са шчырым сэрцам, Ён з’явіць Сваю прысутнасць! Ён не казаў, што з’явіцца на абмежаваны або вызначаны час! Як у скініі Яго прысутнасць была пастаяннай, калі народ быў верны Яму, гэтаксама Яго прысутнасць пастаянная ў сялібе нашых сэрцаў.

Зноў паслухайце словы Якуба: «Набліжцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас». Якую надзею, якую чыстую ўпэўненасць абяцае Бог, бо як «Богу хлусіць немагчыма, [каб] вялікае пацяшэньне мелі мы, якія прыбеглі ўхапіцца за надзею, што перад намі ляжыць» (Гебр. 6:18). Што гэта за надзея? Калі мы наблізімся, Ён наблізіцца да нас! Ён гарантаваў гэта!

Дык чаму ж многія не карыстаюцца Яго яўнай прысутнасцю? А. У. Тозер піша:

> Калі заслона знялася праз прабітае цела Ісуса, калі нішто з боку Бога не перашкаджае нам увайсці, чаму мы застаемся звонку? Чаму мы згодны ўсе дні знаходзіцца за межамі Святога святых і не ўваходзіць, каб паглядзець на Бога? Мы чуем, як Жаніх кажа: «Пакажы мне выгляд твой, дай мне пачуць голас твой, бо голас твой салодкі, і выгляд твой прывабны» (Песн. 2:14). Мы адчуваем, гэта заклік да нас, але ўсё ж не можам наблізіцца, і гады праходзяць, і мы старэем і стамляемся ў панадворках Сялібы. Што нам перашкаджае? («*The Pursuit of God*», с. 41)

Пытанне застаецца: што нам перашкаджае? Чаму мы змагаемся сваімі сіламі, не дасягаючы мэты праз уласную слепату? Чаму так шмат незадаволеных і сумных вернікаў, калі ў нас ёсць такая цудоўная надзея, падмацаваная Яго непарушным абяцаннем? Далей мы даведаемся, што

перашкаджае цудоўным адносінам супольнасці, якія Бог адкрывае кожнаму верніку.

## Пытанні для вывучэння

1. У пачатку гэтага раздзела задаюцца наступныя пытанні: «Чаму ... так шмат людзей змірыліся з інтэлектуальнымі адносінамі з Богам? Чаму мы выбралі хрысціянства без прысутнасці Хрыста? Як мы навучыліся быць задаволенымі без блізкасці з Богам?» Як бы вы адказалі на гэтыя пытанні?
2. Аўтар згадвае меркаванне псіхолагаў пра тое, што нашу асобу фармуюць адносіны, якія мы мелі за апошнія пяць гадоў. Ён таксама сцвярджае, што Пісанне падтрымлівае такое меркаванне: «Благія таварыствы псуюць добрыя звычаі» (1 Кар. 15:33) і «Хто ходзіць з мудрым, будзе мудрым» (Прып. 13:20). Ці былі ў вашым жыцці перыяды, калі праяўлялася тая ці іншая крайнасць? Якія былі вынікі?

# MessengerX

***Ваша праграма для штодзённага вучнёўства***




## Цалкам бясплатна!

Проста спампуйце праграму на вашу мабільную прыладу і карыстайцеся! Або выкарыстоўвайце вэб-версію на сайце:

**MessengerX.com**

## 130+ моваў, і гэта яшчэ не ўсё

- Праглядайце і запампоўвайце матэрыялы на больш чым 130 мовах.
- Дзяліцеся рэсурсамі з сябрамі або пачніце групу па вывучэнні.
- Мы пастаянна дадаём новыя матэрыялы.

## Глядзіце. Чытайце. Слухайце.

Даследуйце вялікую бібліятэку матэрыялаў, якія вы можаце глядзець, чытаць і слухаць: курсы, электронныя кнігі, аўдыякнігі, кароткаметражныя фільмы і многае іншае.






## Рост у самых важных сферах

Даследуйце такія тэмы, як сям'я, здаровыя адносіны, мэта жыцця, свабода ад парнаграфіі, умацаванне веры, адносіны з Богам, лідарства ў бізнесе і многія іншыя!

## Шлях да вашага росту

Мэта **MessengerX** – дапамагчы зрабіць наступны крок, таму мы распрацавалі сістэму вучнёўства і надзейныя інструменты, якія дапамогуць вам застацца на гэтым шляху.




## Больш выдатных функцый, якія вам спадабаюцца!

- Простыя і лёгкія інструменты, якія дапамогуць вам дзяліцца матэрыяламі і ствараць групы для іх вывучэння.
- Chromecast і AirPlay для прагляду на вашых любімых смарт-тэлевізарах.
- Захоўвайце ваш прагрэс на ўсіх прыладах. Захоўвайце ўпадабаныя матэрыялы ў бібліятэку для хуткага доступу.
- Спампоўвайце матэрыялы на свае прылады для прагляду афлайн.
- Магутны пашукавік і фільтры, каб знайсці менавіта тое, што вы шукаеце.
- Аўтаматычнае прайграванне наступных раздзелаў аўдыякніг, аўдыяБібліі і нават пакланення на вашай мове!

# MessengerX - проста як 1-2-3!




**1** Спампуйце праграму **MessengerX** з App Store ці Google Play.

**2** Стварыце ўліковы запіс і карыстайцеся праграмай на вашай мове.

**3** Праглядайце, чытайце, глядзіце, слухайце, спампоўвайце ўлюбёныя матэрыялы і дзяліцеся імі.

## Станьце вучнямі, рыхтуйце вучняў

Як частка **MessengerX,** вы дапамажаце нам забяспечыць людзей па ўсім свеце перакладзенымі матэрыяламі.

***Бо кожны варты таго, каб ведаць!***

**MessengerX.com**

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

</> Даступна ва ўсіх браўзэрах

Раздзел 6

# СЯБРЫ БОГА

Бог прапанаваў народу супольнасць, але той, па ўласным выбары, не мог яе мець

Калі я пішу гэтыя раздзелы кнігі, у маім сэрцы гарыць прагненне і голад па Богу. Размовы пра Яго распальваюць полымя і павялічваюць маё жаданне імкнуцца да Таго, Хто так цудоўна любіць нас. Бог паслядоўна шукаў кожнага з нас ва ўсе стагоддзі. Аднак Той, Хто варты нашага пошуку, не ёсць «лёгкай здабычай» сам па сабе. Ён святы і вялікі Цар, і патрабуе пашаны. Таму, безумоўна, немагчыма гаварыць пра «набліжэнне», не закрануўшы пытанне «святога страху».

## Разыходжанне шляхоў

На гэтым этапе «пасланні шукальнікам» і праўда часта разыходзяцца. Такія пасланні можна знайсці ў любой

дэнамінацыі і любым асяроддзі. У іх гаворыцца пра Бога, Які шукае людзей і прагне дабраславіць іх. Памылка заключаецца ў тым, што не згадваецца Божая святасць. Часта так робіцца з добрых намераў; некаторыя вернікі бачылі або перажылі трагедыю законніцтва; а іншыя проста хочуць любіць людзей і пра іх клапаціцца. Некаторыя пасланні, на жаль, наўмысна прапаведуюцца няпоўна, каб прыцягнуць большую колькасць паслядоўнікаў.

Тыя, хто ўцёк з абдымкаў законніцтва і прапаведуе толькі любячага, разумеючага Бога, Які кампенсуе наша беззаконне і любоў да свету, не мяняюць свае матывы і тактыку. Іх парада не абапіраецца на тое, каб самім прыйсці ў прысутнасць Бога і пачуць Яго Слова. Зрабіўшы так, яны б зразумелі: да Бога можна наблізіцца толькі шляхам святой любові і страху Гасподняга.

Гэтыя пасланні «лёгкага Госпада» нівеліруюць мэту, якую спрабуюць дасягнуць. Адмаўляючыся ад страху Гасподняга, яны, па сутнасці, закрываюць Яго прысутнасць ад людзей.

## Шанаванне

Існуе вечная, нязменная праўда пра знаходжанне ў Божай прысутнасці. Яна падсумавана ва ўрыўку з Пісання:

> Бог гэтак страшлівы на нарадзе сьвятых, і і шануецца ўсімі вакол Яго (Пс. 89:7, сучасны пераклад).

Давайце яшчэ раз прачытаем другую частку верша. «Бог... шануецца усімі вакол Яго». Сапраўды, Бог ніколі не з’яўляе Сваю прысутнасць у атмасферы, дзе Яго не шануюць. Ён не наблізіцца туды і не будзе жыць там, дзе Яго не шануюць, не цэняць і не паважаюць. Няважна, наколькі добрыя там

спевы або «пакланенне», наколькі добрыя казані і вучэнне, і наколькі малітва адпавядае Пісанню. Калі Яго не баяцца, Ён не наблізіцца, каб адкрыць Сябе. Прыгадайце Гэлія і яго сыноў.

Многія гады я ўваходжу ў розныя залы, дзе збіраюцца сотні ці тысячы вернікаў, і нямала разоў, на жаль, не было нават намёку на прысутнасць Бога. Прычына — адсутнасць святога страху сярод вернікаў, а часам і сярод лідараў. Можна мець выдатныя групы хвалы і пакланення, махаць сцягамі і танчыць, мець умелых музыкаў і спевакоў. Служэнні могуць быць інавацыйнымі і высокатэхналагічнымі з аб’явамі ў СМІ. Мерапрыемствы можна праводзіць крэатыўна і забаўляльна, з гумарам і цікавымі тэмамі, але чагосьці будзе не хапаць. Атмасфера пазбаўленая Божай прысутнасці. Маё сэрца разрываецца, таму што большасць прысутных не ўсведамляе ўсю ступень пустаты. (Дазвольце тут заўважыць: інавацыйныя спосабы камунікацыі самі па сабе не зло, яны ніякім чынам не перашкаджаюць з’яўленню прысутнасці Бога. Я быў у месцах, дзе выкарыстоўваюцца найноўшыя тэхналогіі, і атрымліваў асалоду ад глыбіні Божай прысутнасці. Яго прысутнасць не мае нічога агульнага з тэхналогіямі або іх адсутнасцю, бо адлюстроўвае стан сэрца.)

У такіх сітуацыях Госпад натхняе дзяліцца словам пра паслухмянасць і страх Гасподні, і кожны раз, калі гучыць заклік да пакаяння, я бачу, як адгукаецца большасць вернікаў, часта і самі лідары супольнасці. Амаль заўсёды перад малітвай з’яўляецца прысутнасць Бога, і людзі пачынаюць плакаць. Чаму так адбываецца? Бог набліжаецца да тых, хто Яго любіць, шануе і баіцца. Таму Якуб кажа:

> «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас. Ачысьціце рукі, грэшнікі, выпраўце сэрцы, двудушныя!» (Як. 4:8)

На першы погляд, у гэтым вершы Якуб звяртаецца да нязбаўленых, бо звычайна «грэшнікамі» называюць неадроджаных. Тым не менш, пятнаццаць разоў у пасланні Якуб кажа слухачам *«браты»*, значыць, ён звяртаецца да народжаных звыш.

Давайце паглядзім на слова, якое азначае «грэшнік»: яно паходзіць ад грэцкага *«hamartolos»* і літаральна азначае «той, хто прамахваецца». Гэтае слова можа адносіцца да нязбаўленага чалавека, але таксама выкарыстоўваецца ў дачыненні да хрысціяніна. У нашым кантэксце называе верніка, які памыляецца ў думках, а гэта, у сваю чаргу, выклікае рэгулярныя няправільныя дзеянні або паводзіны. Якуб працягвае: «Выпраўце сэрцы, двудушныя», і гэтыя словы ўказваюць на корань таго, чаму вернікі не трапляюць у цэль.

Самае важнае, каб мы разумелі: страх Госпада пачынаецца ў сэрцы і праяўляецца ў дзеяннях. У нейкі момант Бог сказаў пра Сваіх дзяцей — і звярніце ўвагу на слова «набліжаецца»:

> …народ гэты *набліжаецца* да Мяне [толькі] вуснамі сваімі і славіць Мяне губамі сваімі, а сэрца ягонае далёка ад Мяне, і страх іхні перада Мною — [толькі] прыказаньне чалавечае, якое вывучылі яны (Іс. 29:13, *курсіў аўтара*).

Набліжэнне да Бога заўсёды пачынаецца ў сэрцы, якое баіцца і любіць Бога больш за каго-небудзь ці што-небудзь іншае. Набліжэнне — гэта не толькі дзеянні, але і матывацыя сэрца. Таму, вызначаючы страх Госпада, трэба спачатку разгледзець стаўленне сэрца.

Пачнём: баяцца Бога — гэта шанаваць, цаніць і мець Яго ў найвышэйшай павазе; а таксама ўзносіць Яго, быць у

захапленні і паважаць. Таксама гэта азначае трымцець ад найвялікшай павагі да Бога, Яго прысутнасці і прыказанняў, а таксама жаданняў. І гэта толькі пачатак.

## Прыйсці да Бога з непавагай

Часам, каб штосьці добра зразумець, трэба ведаць, чым гэта не з'яўляецца. Яскравы прыклад набліжэння да Божай прысутнасці без святога страху мы бачым у жыцці двух сыноў Аарона.

Перад завяршэннем будаўніцтва Сялібы Госпад загадаў Майсею: «І ты наблізь да сябе Аарона, брата твайго, і сыноў ягоных з ім спасярод сыноў Ізраіля, каб яны былі сьвятарамі Маімі: Аарона і Надава, Абігу, Элеазара і Ітамара, сыноў Аарона» (Вых. 28:1).

Гэтыя людзі былі аддзелены і навучаны служыць Госпаду і стаяць у праломе за народ. Ім было дазволена набліжацца да Божай прысутнасці. Яны мелі канкрэтныя абавязкі і патрабаванні да пакланення — Госпад даў праз Майсея падрабязную інструкцыю. Пасля падрыхтоўкі сыны Аарона былі асвячоныя, затым Божая прысутнасць напоўніла Сялібу, і пачалося іх служэнне.

Але яно цягнулася нядоўга; нават пасля таго, як слава Госпада з'явілася ў Сялібе. Вось што было трохі пазней:

> І ўзялі сыны Аарона, Надаў і Абігу, кожны кадзільніцу сваю, і набралі ў іх агонь, і паклалі на яго кадзіла і ахвяравалі перад абліччам ГОСПАДА *іншы* агонь, а ня той, што быў ім загаданы (Ляв. 10:1, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу: Надаў і Абігу прынеслі іншы, *нячысты* агонь у прысутнасць Госпада. Адно з вызначэнняў слова

«*нячысты»* ў слоўніку Вэбстэра наступнае: «Які дэманструе непавагу або пагарду да святых рэчаў; непаважлівы». Гэта значыць ставіцца да таго, што Бог называе святым, як да звычайнага. Двое мужчын схапілі кадзілы, аддзеленыя для пакланення Госпаду, і напоўнілі іх агнём і ладанам па ўласным выбары, а не так, як патрабаваў Бог. Нядбайнасць адносна святога прывяла сыноў Аарона да непаслушэнства.

Яны наблізіліся да прысутнасці Госпада, прыносячы непаважлівую, непрымальную ахвяру, ставячыся да святога як да звычайнага. Паглядзіце, што адбылося:

> І выйшаў агонь ад ГОСПАДА, і спаліў іх, і яны памерлі перад аблічам ГОСПАДА (Ляв. 10:2).

Сыны Аарона былі імгненна асуджаныя за непаважлівасць і памерлі. Непавага адбылася ў прысутнасці Бога, і, хоць яны былі святарамі, усё адно аддаваць Богу пашану было іх абавязкам. Яны зграшылі, наблізіўшыся да святога Бога як да кагосьці звычайнага! Яны занадта звыкліся з Яго прысутнасцю! Прачытайце словы Майсея адразу пасля Божага суду і звярніце ўвагу на словы *«да Мяне»*:

> І сказаў Майсей Аарону: «Вось што сказаў ГОСПАД: “Я зьяўлю сьвятасьць Маю тым, якія *набліжаюцца да Мяне*, і зьяўлю славу перад усім народам”». І замаўчаў Аарон (Ляв. 10:3, *курсіў аўтара*).

Вось вечны і ўніверсальны загад. Бог кажа: ніхто не можа *наблізіцца*, недаацэньваючы Яго або лічачы Яго звычайным. Бога трэба лічыць святым і паважаць Яго, знаходзячыся ў Яго прысутнасці.

Госпад выразна сказаў: непавага не выстаіць у Яго

прысутнасці, але Надаў і Абігу не звярнулі ўвагі. Сёння нічога не змянілася: Ён той самы святы Бог. Мы не можам чакаць, што Бог дапусціць нас у Сваю прысутнасць, калі мы ставімся да Яго непаважліва!

Сямейныя сувязі не даюць права на выключэнне. Гэтыя два святары былі сынамі Аарона і пляменнікамі Майсея. Але яны абодва ведалі, што лепш не сумнявацца ў Божым судзе, бо толькі Ён справядлівы. Майсей папярэдзіў Аарона і двух яго пазасталых сыноў, каб не аплаквалі памерлых ад суду Божага, бо памруць таксама. Аплакванне яшчэ больш зняславіла б Госпада, таму целы Надава і Абігу вынеслі за межы лагера і пахавалі.

Двое маладых мужчын легкадумна паставіліся да канкрэтных Божых настаўленняў. Яны прыйшлі ў непавазе і не мелі страху Божага, і такое стаўленне іх сэрца прывяло да ўчынкаў непаслухмянасці. Мы бачым, што корань граху — гэта адсутнасць страху Божага.

## Напалоханы Богам супраць страху Божага

Калі Бог з’явіўся народу Ізраіля на гары Сінай, людзі не маглі стаяць у Яго прысутнасці. Прычына была ў тым, што ім не хапала страху Госпада; бо як толькі яны адышлі ад Божай прысутнасці, Майсей звярнуўся да іх:

> Ня бойцеся, бо дзеля таго, каб выпрабаваць вас, прыйшоў Бог, і каб праз гэта страх Ягоны быў перад абліччам вашым, каб вы не грашылі (Вых. 20:20).

Майсей сказаў: «Не бойцеся», таму што Бог прыйшоў паглядзець, ці быў Яго «страх перад вамі [народам]». Здаецца, супярэчлівасць, але на самай справе яе няма.

Майсей адрозніваў боязнь, або напалоханасць перад Богам ад страху Госпада. Розніца велізарная. Напалоханы чалавек хавае штосьці ад Бога; ён не хоча набліжацца, бо чыстае святло Божай прысутнасці выявіць тое, што чалавек хавае. Павел кажа нам: «Але ўсё, дакаранае сьвятлом, робіцца яўным» (Эф. 5:13).

Бог хоча, каб мы не палохаліся Яго, але каб мы баяліся Яго. Павел піша: «Даў нам Бог ня духа палахлівасьці» (2 Цім. 1:7), а Ян гаворыць: «Страху няма ў любові, але дасканалая любоў прэч выганяе страх, бо ў страху ёсьць мучэньне; а хто баіцца, той у любові недасканалы» (1 Ян 4:18). У гэтых вершах аўтары кажуць пра дух страху, а не страх Гасподні, бо і ў іншых месцах Новага Запавету мы чытаем: «са страхам і трымценьнем зьдзяйсьняйце збаўленьне сваё» (Флп. 2:12); і зноў Павел падкрэслівае: мы павінны «служыць Богу, падабаючыся [Яму], з сарамлівасьцю і багабойнасьцю, бо Бог наш — агонь, які паглынае» (Гебр. 12:28–29). Пётр гаворыць прамалінейна: «бо напісана: «Будзьце сьвятыя, бо Я — Сьвяты». І калі называеце Айцом Таго, Які судзіць кожнага паводле справаў ягоных, не ўзіраючыся на аблічча, са страхам праводзьце час вандраваньня вашага» (1 Пят. 1:16–17). Чытаючы гэтыя вершы, безумоўна, немагчыма выключыць святы страх як жыццёва важную частку хрысціянства Новага Запавету.

Звярніце ўвагу на словы Майсея да народа, калі прыходзіць Божая прысутнасць: «каб праз гэта страх Ягоны быў перад абліччам вашым, каб вы не грашылі». Не любоў да Бога, а страх Госпада засцерагае нас ад граху. Павел кажа: «Са страхам і трымценьнем зьдзяйсьняйце збаўленьне сваё», а не «з любоўю і дабрынёй». У іншым пасланні апостал нагадвае: мы маем абяцанне прысутнасці Бога сярод нас, і таму «ачысьцім сябе ад усякага бруду цела і духа,

зьдзяйсьняючы сьвятыя рэчы ў страху Божым» (2 Кар. 7:1). Звярніце ўвагу: Павел не сказаў «у любові Божай».

Я ніколі не забуду візіт да вядомага служыцеля, які сядзеў у турме за махлярства.

Я спытаў: «Калі вы разлюбілі Ісуса?» Ён паглядзеў на мяне і без ваганняў сказаў: «Я не разлюбіў Яго!»

Здзіўлены, я адказаў: «А як наконт махлярства і чужалоства?»

Ён сказаў: «Джон, я любіў Бога ўвесь час, але не баяўся Яго». А потым ён сказаў тое, што мяне зачапіла: «Джон, ёсць мільёны амерыканскіх хрысціян, такіх, як я. Яны называюць Ісуса сваім Збаўцам і любяць Яго, але не баяцца Яго як Госпада ўсяго жыцця».

У гэты момант унутры мяне загарэлася святло. Я зразумеў: можна любіць вобраз «Ісуса», які мы стварылі з уласнага ўяўлення і разумення, але гэта не сапраўдны Ісус! Бо Пісанне кажа нам: страх Гасподні — гэта пачатак або адпраўная кропка для глыбокага пазнання Бога (гл. Прып. 1:7; 2:5). Я зразумеў: гэты чалавек любіў скажоны вобраз Ісуса.

## «Хто дасьць ім, каб яны баяліся Мяне»

Майсей вельмі выразна дае зразумець: менавіта страх Госпада ўтрымлівае нас ад граху, а грэх аддзяляе нас ад блізкасці з Богам. Госпад сказаў народу, з якім заключыў запавет: «Бо беззаконьні вашыя аддзялілі вас ад Бога вашага, і грахі вашыя схавалі аблічча Ягонае ад вас» (Іс. 59:2). Звярніце ўвагу: Бог гаворыць: нашыя грахі аддзялілі нас ад Яго, а не Яго ад нас. Кажучы так, Ён размаўляе са Сваім народам, а не з язычнікамі. Гэта мы аддзяляем сябе ад блізкасці з Богам, і корань такога стану — адсутнасць святога страху.

У адрозненне ад чалавека, які *напалоханы* Богам, чалавеку, які *баіцца* Бога, няма чаго хаваць. Ён ведае: яго жыццё — разгорнутая кніга перад Госпадам. Такі чалавек ставіць Божыя жаданні вышэй за ўсё астатняе. Яны важнейшыя за жаданні сяброў, сям'і ці нават яго ўласныя. Ён разумее, што самае прыемнае ў жыцці — слухацца Бога. Такі чалавек адрокся ад сябе, узяў свой крыж і ідзе за Ісусам. Ён жыве для Бога.

Жыццё Майсея можна апісаць так: ён баяўся Бога. Ізраіль гэтага не рабіў: яны ставілі свае жаданні, патрэбы і камфорт вышэй за тое, чаго жадаў Бог. Людзі не давяралі Богу, хоць і неаднаразова заяўлялі пра давер. Яны пастаянна сумняваліся, хоць казалі адваротнае. Яны не шанавалі Яго Слова, жаданні ці прыказанні вышэй за ўсё. Яны не баяліся Бога, і таму ніколі не маглі па-сапраўднаму любіць Яго. Чаму? Ізраільцяне ніколі не пражылі Яго сапраўднага адкрыцця. Вось чаму яны аддаліліся ад Божай прысутнасці. Былі рэчы, якія яны хацелі схаваць ад Божага святла. Народ ведаў: у нейкі момант Божае святло прымусіць іх разабрацца з гэтымі рэчамі і выбраць, каму служыць.

Ізраіль адступаў, а Майсей набліжаўся. Цяпер ён мусіў сказаць Госпаду: той самы народ, які Ён так магутна і цудоўна вызваліў з рабства і прывёў да Сябе, не хацеў падыходзіць да Яго бліжэй. Майсей баяўся гэтага моманту, але Бог ужо ведаў і здзівіў Майсея:

> Я чуў голас словаў народу гэтага, што яны казалі табе.
> Усё добра яны казалі (Друг. 5:28).

Я ўяўляю сабе шок Майсея. Яго зловілі на неўсведамленні таго, што Бог ведае словы народа (дзіўна, аднак мы

забываемся, што Бог ведае ўсё). Яшчэ большым шокам стала вестка, што дзеці Ізраіля нарэшце маюць рацыю ў тым, што кажуць! Тады Майсей выпаліў нешта накшталт: «Чаму яны не могуць наблізіцца да Цябе?»

У голасе Бога, Які тлумачыць, чаму людзі не могуць наблізіцца, адчуваецца смутак:

> Хто дасьць ім, каб засталося ў сэрцы іхнім, каб яны баяліся Мяне і захоўвалі ўсе прыказаньні Мае? (Друг. 5:29)

Адказ Бога дае выразна зразумець дзве рэчы. Па-першае, немагчыма наблізіцца да Бога, калі ў чалавека няма святога страху; і, па-другое, доказам гэтага страху з'яўляецца паслухмянасць Божым прыказанням. Народ Ізраіля ведаў, як гаварыць і выглядаць належным чынам, але іх сэрцы былі пазбаўленыя страху Божага. Адсутнасць Божага страху заўсёды пачынаецца ў нашым сэрцы і праяўляецца ў нашай непаслухмянасці!

Далей Госпад робіць адну з самых трагічных заяў у Старым Запавеце. Праз Майсея Ён перадае Свайму народу наступнае пасланне:

> Ідзі і скажы ім: «Вярніцеся ў намёты вашыя»
> (Друг. 5:30).

Сэрца Бога разбіта, а на сэрцы Майсея, калі ён вярнуўся, было вельмі цяжка. Я таксама перажываю гэты цяжар. Бог вывеў народ з Эгіпта па адной прычыне: каб прывесці іх да Сябе, але яны не зразумелі (гл. Вых. 19:4). Гэта і была Яго мэта ў вялікім вызваленні. Аднак, калі Бог зажадаў адкрыць Сябе народу, яны адступілі; яны не маглі стаяць у Яго прысутнасці,

бо не мелі Яго страху. Людзі мусілі вярнуцца ў намёты і заставацца аддзеленымі ад Яго прысутнасці і голасу. Бог прапанаваў ім Сваю блізкасць, аднак яны зрабілі выбар і не маглі яе мець.

## Сяброўства з Госпадам

З іншага боку, паслухайце, што Бог кажа Майсею пасля таго, як загадаў народу вярнуцца ў намёты:

А ты застанься тут са Мной, і Я скажу табе... (Друг. 5:31)

Ого! «Застанься тут, са Мной, і Я скажу табе». Якая асалода! Якая абсалютная радасць! Які неспасцігальны прывілей! Майсей запрошаны застацца і пачуць сэрца Бога! Няма нічога лепшага ва ўсім сусвеце! Быць запрошаным застацца ў прысутнасці Таго, Хто бясконцы ў любові, мудрасці, ведах і сіле. Стаяць побач з Тым, Каму пакланяецца і Каго прагне ўсё неба. Майсей атрымаў такое запрашэнне!

Майсей прыняў страх Гасподні і таму мог мець блізкія адносіны з Ім. Мы бачым доказ у словах псалміста: «Ён зрабіў вядомымі шляхі Свае Майсею, сынам Ізраіля – учынкі Свае» (Пс. 103:7). Майсей часта ведаў, што зробіць Бог, да таго, як Ён гэта рабіў, бо Госпад адкрываў Сваё сэрца Майсею, пакуль той заставаўся у месцы, куды народ не мог прыйсці.

Ізраіль ведаў Бога па Яго адказах на іх малітвы. Яны не ведалі Божых матывацыі, жаданняў, планаў ці іншых глыбіняў Божага сэрца. Людзі ведалі, што Ён робіць, але не ведалі прычынаў. Майсей ведаў Бога па тым, што было сказана ў таемным месцы. Адзін з маіх любімых вершаў Пісання наступны:

> «Таямніца ГОСПАДА — з тымі, што баяцца Яго, і запавет Свой Ён дае ім ведаць» (Пс. 25:14).

Не змяняючы кантэксту, можна сказаць: «Таямніцы сэрца Госпада — з тымі, што баяцца Яго, і Свой запавет Ён дае ім ведаць». Усе мы маем таямніцы (не абавязкова кепскія), але мы не дзелімся імі са знаёмымі, давяраючы толькі блізкім сябрам, тым, з кім адкрытыя і каму давяраем. Для гэтага ёсць важкая прычына: мы ведаем, што блізкія ніколі не выкарыстаюць дарагія нашаму сэрцу рэчы, каб нашкодзіць нам, і не скарыстаюцца намі. Мы ведаем, што яны асцярожна абыдуцца з каштоўнымі для нас рэчамі: не будуць няправільна інтэрпрэтаваць тое, чым мы дзелімся, і не будуць скажаць гэта дзеля ўласнай выгады. Блізкія ведаюць наша сэрца і думаюць пра нашы інтарэсы.

Бог не выключэнне. Ён не дзеліцца Сваімі таямніцамі з тымі, хто занадта заклапочаны ўласнымі задавальненнем і дабрабытам. Ён дзеліцца таямніцамі з людзьмі, якія маюць Яго сэрца і аддалі Яму жыццё — з тымі, каго называе сябрамі. Адзін пераклад пацвярджае гэта, абвяшчаючы: «Сяброўства з Госпадам захоўваецца для тых, хто баіцца Яго, з імі Ён дзеліцца таямніцамі Свайго запавету» (Пс. 25:14).

## Абрагам, сябар Божы

У Старым Запавеце ёсць чалавек, якога называюць сябрам Божым. Гэта Абрагам. Чаму ён быў сябрам Божым? Адказ мы знаходзім у найвялікшым выпрабаванні, з якім ён сутыкнуўся. Дваццаць пяць гадоў Абрагам чакаў Божага абяцання — сына, народжанага ад Сары, яго бясплоднай жонкі. Бог даў сына праз шмат гадоў пасля таго, як мінуў узрост мець дзяцей, і бацькі назвалі яго Ісаакам, што азначае *«смех»*. Гэты малады чалавек

прынёс у іх дом радасць, якую яны не маглі сабе ўявіць.

Бог уважліва назіраў за гэтай сям’ёй і бачыў, як узрастала пяшчотная любоў паміж Абрагамам і яго ўлюбёным сынам Ісаакам. Надышоў час выпрабавання, і Бог сказаў Абрагаму:

> «Вазьмі сына твайго, адзінага твайго, якога ты любіш, Ісаака; і ідзі ў зямлю Морыя, і там складзі яго ў ахвяру цэласпаленьня на адной гары, пра якую Я скажу табе» (Быц. 22:2, *курсіў аўтара*).

Ці можаце вы ўявіць сабе шок Абрагама пасля гэтай просьбы? Абяцанае дзіця; тое самае, якога ён цярпліва чакаў дваццаць пяць гадоў. Ізмаэля ўжо выгналі — Абрагам застанецца ні з чым! Чаму цяпер, калі сувязь любові была такой моцнай? Чаму Бог так доўга чакаў? Чаму не папрасіў пра гэта, калі Ісаак быў немаўлём? Многія біблеісты лічаць, што Ісааку ў той час было трыццаць тры гады.

Вы можаце ўявіць тую ноч? У душы Абрагама, напэўна, бушавала барацьба. Як Бог мог такое прасіць? Усё ішло па плане. Ісаак аднойчы ажэніцца, і яго нашчадкі народзяць народы і валадароў, як абяцаў Бог. Як Бог мог так рана папрасіць яго жыцця? Ці чуеце вы пытанні, якія віравалі ў яго душы: *чаму Ён увогуле даў мне Ісаака? Чаму Ён даў яго толькі для таго, каб забраць? Ці любіць Ён Ісаака так, як я? Чаму лепей не забраць маё жыццё?*

Аднак нешта ў Абрагаме пераўзышло ўсе гэтыя пытанні і развагі: яго страх перад Госпадам. Бог сказаў, і ён паслухаўся. Мы чытаем: «І ўстаў Абрагам *рана [наступнаю] раніцаю*, і асядлаў асла свайго, узяў двух юнакоў сваіх з сабою і Ісаака, сына свайго, і насек дроваў на цэласпаленьне, і ўстаў, і пайшоў на месца, пра якое сказаў яму Бог» (Быц. 22:3, *курсіў*

*аўтара*). Звярніце ўвагу на словы: «рана раніцаю». Ці чулі вы калі-небудзь людзей, якія кажуць: «Бог кажа мне пра гэта ўжо некалькі месяцаў — я проста яшчэ не зрабіў гэтага»? Яны дэманструюць недахоп страху Гасподняга.

Баяцца Бога — значыць трымцець перад Яго словам. Гэта азначае, што мы падпарадкоўваемся, нават калі мы не бачым прычыны або карысці, нават калі не разумеем. Мы слухаемся, нават калі нам балюча! Як пасланцы Евангелля, мы аказалі мядзведжую паслугу целу Хрыста. Занадта часта мы развіваем падыход да паслухмянасці толькі праз разуменне карысці. Мы кажам нешта накшталт: «Калі ты даеш, то Бог... », або «Калі ты молішся, то Бог...» або «Калі вы паслухаецеся, то Бог будзе…» Гучыць амаль як пасланне «Прыйдзіце да Ісуса, каб атрымаць». Ці веру я, што Ён дабраслаўляе? Безумоўна! Аднак дабраслаўленне ніколі не павінна быць матывам нашага служэння Богу. Мы павінны служыць, зыходзячы з таго, хто Ён ёсць, а не з-за таго, што Ён можа зрабіць для нас.

Абрагам адразу ж праявіў паслухмянасць, бо ён ішоў тры дні да гары, якую паказаў Бог. Чаму Бог не абраў месца бліжэй? Навошта трохдзённае падарожжа? Я веру, Ён даў Абрагаму час абдумаць сітуацыю, нават павярнуць назад. Адна справа пачаць рухацца, калі чуеш голас Бога, але як наконт наступных дзеянняў? Як наконт таго, калі тры дні вы нічога ад Яго не чулі, і цяпер глядзіце на гару, дзе павінны забіць самага важнага чалавека, мару вашага жыцця?

Тым не менш, Абрагам падняўся на вяршыню гары, пабудаваў ахвярнік, звязаў Ісаака і ўзняў нож. Але раптам Анёл Госпада паклікаў Абрагама:

> Не выцягвай рукі сваёй на хлопца і не рабі яму нічога,
> бо цяпер Я ведаю, што ты *баішся* Бога і не пашкадаваў

дзеля Мяне сына твайго, адзінага твайго (Быц. 22:12, *курсіў аўтара*).

Адкуль Бог ведаў, што Абрагам Яго баіцца? Бо той паслухаўся, нават калі не разумеў; нават калі яму было балюча; і нават калі гэта было яму не на карысць. Бог назіраў, як Абрагам ставіў жаданні Госпада вышэй за ўсё астатняе. Тады Бог убачыў: «Гэта чалавек, якому Я магу адкрыцца і падзяліцца Сваім сэрцам».

## Адкрыты аспект Бога

Адразу пасля гэтага Абрагам узняў вочы і ўбачыў барана, які заблытаўся ў зарасніках. З сэрца Абрагама вырваўся крык: «Госпад угледзіць!» («Госпад забяспечыць») Ён быў першым, хто спазнаў Бога ў такой якасці. Бог адкрыў гэты аспект Сваёй асобы, які ніхто раней не ведаў, у адказ на павагу і паслухмянасць Абрагама.

Вы можаце ведаць мяне як «Джона Бэвіра-аўтара». Некаторыя з вас могуць ведаць мяне як «Джона Бэвіра-прамоўцу». Але ёсць яшчэ адна, яе завуць Ліза, і яна ведае мяне як «Джона-мужа». Яна мая блізкая сяброўка, а таксама жонка, і я дзялюся з ёй сакрэтамі, якія ніхто больш не ведае. Ёсць сыны, якія ведаюць мяне як «Джона-тату». Я ўзаемадзейнічаю з імі так, як гэта робяць толькі бацька і сыны. У вас таксама ёсць такія людзі ў вашым жыцці. Бог не выключэнне.

Бог падзяліўся з Абрагамам тым, чаго не ведаў ніхто іншы. Госпад нават падзяліўся з ім Сваімі планамі і дазволіў пярэчыць Яго меркаванню. Адной з сітуацый, што яны абмеркавалі разам, былі Садом і Гамора. Бог сказаў: «Ці ж схаваю Я перад Абрагамам, што маю зрабіць?» (Быц. 18:17) Госпад звярнуўся да Абрагама, каб абмеркаваць сітуацыю,

і аціаніў і прыслухаўся да меркавання Абрагама. Садом быў бы выратаваны, калі б у ім жыло дзесяць праведнікаў. Але не знайшлося нават дзесяці!

## Не маючы разумення Божага плана

Дзіўна, што пляменнік Абрагама, Лот, якога Біблія называе «праведным» (гл. 2 Пятра 2:7), быў зусім іншым. Лот быў цялесным і не баяўся Бога. Яго гісторыя цалкам адрозная. Лот пачынаў разам з Абрагамам, але калі цела жыве разам з духам, у рэшце рэшт узнікне канфлікт. Абрагам, больш зацікаўлены ў Божых рэчах, чым у тым, што мог прапанаваць гэты свет, ставіць Лота перад выбарам. Абрагам возьме тое, што застанецца, і на выніку – чаго не ведалі ані Лот, ані Абрагам – гэтыя рэшткі стануць вельмі ўрадлівымі, бо гэта была зямля, якая цякла малаком і мёдам.

Мы чытаем: «І… Лот… убачыў усю ваколіцу каля Ярдану» (Быц. 13:10). У той час гэта была самая жаданая і ўрадлівая зямля. Чаму ён доўга на яе глядзеў? Ён ведаў, што гарады Садом і Гамора поўныя зла. Доўгі погляд, верагодна, азначаў спробу прыдумаць, як атрымліваць асалоду ад багацця гэтых гарадоў, не паддаючыся іх уплыву. Лот вырашыў паставіць намёт на раўнінах Садома, замест таго, каб жыць у горадзе. Такім чынам ён мог бы трымацца на адлегласці ад эпіцэнтра зла, але ўсё ж карыстацца багаццем гэтай зямлі. Мы чытаем: «Лот паставіў намёты аж да Садому» (Быц. 13:12). Аднак, як бы вы ні планавалі трымацца далей ад граху, калі вы не баіцеся Бога, то ў рэшце рэшт грэх вас прыцягне. Так адбылося і з Лотам: спачатку ён жыў у намёце на раўніне, але праз шэсць раздзелаў мы чытаем: дом Лота быў у самім Садоме (гл. Быц. 19:2).

Садом у той час квітнеў. Яго жыхары не ведалі, што ім заставаліся гадзіны – і іх горад будзе сцёрты з зямлі. І гэта нас не здзіўляе. Нас трывожыць тое, што Лот таксама пра гэта не ведаў. Бог паслаў анёлаў, пасланцоў міласэрнасці, каб яго папярэдзіць. У параўнанні з Абрагамам, які баіцца Бога і ведае Яго думку адносна Садома і Гаморы яшчэ да таго, як Бог прыме канчатковае рашэнне, Лот не мае пра гэта ніякага ўяўлення, як і грэшнікі Садома. Абрагам — сябар Бога, таму што ён баяўся Бога!

## Сапраўдны Ісус?

Разглядаючы жыццё Майсея і Абрагама ў святле страху Гасподняга, пашырым далей гэтае азначэнне. Страх Госпада ўключае любоў да таго, што любіць Бог, і нянавісць да таго, што Ён ненавідзіць. Тое, што важна для Яго, становіцца важным і для нас, а тое, што не так важна для Яго, не так важна і для нас. Божыя прыярытэты і жаданні становяцца нашымі. Праява страху Госпада — гэта непахісная паслухмянасць жаданням і волі Бога.

Згодна з Пісаннем, Бог набліжаецца, калі мы прымаем страх Гасподні. Як толькі мы сустракаемся з Ім блізка, інтэнсіўнасць нашай любові да Яго расце. Мы любім адкрытага нам сапраўднага і жывога Бога, а не проста ўяўленне пра Яго. Без глыбокага і нязменнага страху Госпада мы проста вызнаем любоў без сапраўднага блізкага ведання Бога. Мы ведаем пра Бога, але не ведаем Яго; таму наша прыхільнасць накіравана на вобраз «Ісуса», сфармаваны ў нашым уяўленні, а не на рэальнага Ісуса, Які сядзіць праваруч Айца.

Параўнаем гэта з тым, як фанаты ўспрымаюць галівудскіх зорак або вялікіх спартсменаў. Фанатам падабаецца вобраз

зорак, створаны ў СМІ і артыкулах. Іх імёны становяцца вядомымі ў амерыканскіх сем'ях. Я чуў, як фанаты кажуць пра іх, быццам знакамітасці — іх блізкія сябры. Я назіраў, як фанаты эмацыйна заангажаваныя ў асабістыя справы знакамітасцяў, быццам гэта члены іх сем'яў. Але, сустрэўшыся са знакамітасцю асабіста, яны палічаць рэальнага чалавека зусім не такім, як рэкламны вобраз. Адносіны паміж знакамітасцямі і фанатамі аднабаковыя. Сустрэўшыся, яны б не знайшлі нічога агульнага і не мелі б пра што пагаварыць, таму што яны не ведаюць адзін аднаго.

Я бачыў такія  сітуацыі і ў царкве. Многія гавораць пра Госпада так, быццам Ён вельмі блізкі, але, калі слухаеш іх размову, узнікае адчуванне: вернікі гавораць пра Таго, пра Каго яны чулі, але не ведаюць асабіста. Людзі чулі гутарку, але не Божы голас; ведаюць Божыя справы, але не Божыя шляхі; што Бог сказаў, але не тое, што Ён кажа.

Прыклад-крайнасць здарыўся са мной у мінулым годзе. Мы з сям'ёй адпачывалі на Гаваях. Я ўстаў рана з-за розніцы ў часавых паясах і пайшоў маліцца на пляж. Да мяне падышоў мужчына і пачаў гутарку. Ён быў так натхнёны востравам, што адразу выпаліў: «Дзяўчаты тут цудоўныя. Яны такія прыязныя і адкрытыя». Мужчына казаў пра вечарыну, на якой нядаўна быў, і іншыя цялесныя тэмы; увесь гэты час яго размова перамяжалася брыдкаслоўем.

Ён спытаў мяне, чым я зарабляю на жыццё, і я расказаў. Пачуўшы, што я святар, мой новы знаёмы ўзрадаваўся і загаварыў пра Госпада: распавёў пра свой удзел у служэнні, якое яго царква вяла для байкераў, а потым расказаў пра свайго пастара. Потым засведчыў, як прыйшоў да Ісуса, і нават даў мне брашурку, што была ў яго кішэні. Затым я даведаўся пра яго жонку і дзяцей, якія спяць у гатэлі (я адразу

ўзгадаў словы пра цудоўных дзяўчат на востраве). Маё сэрца балела: было відавочна, гэты чалавек верыў, што ведае Госпада, але яго жыццё паказвала адваротнае. Вось чаму Ісус кажа, што мы пазнаём вернікаў па іх пладах або ладзе жыцця, а не па іх словах або служэнні (гл. Мц. 7:20–23).

Гэта толькі адзін з прыкладаў, якія я магу прывесці. Я ўпэўнены, што вы сутыкаліся з такімі ж драматычнымі сітуацыямі. Ва ўсіх гэтых выпадках «веданне Бога» такімі хрысціянамі выглядае, як адносіны фанатаў з зоркамі. У такіх сітуацыях маё сэрца разрываецца. Вось людзі, якія жадаюць збаўлення, але любяць свет і ставяць задавальненні, планы і павестку дня вышэй за Божыя жаданні.

Ёсць і тыя, хто сапраўды збаўлены, як Лот, але цялесныя і заблытаныя ў справах свету. Яны хочуць служыць Богу, але паняволеныя ўласнымі прагненнямі. Яны не дазволілі крыжу перамагчы іх жыццё, бо супраціўляліся ачышчальнай працы Бога. Гэтыя людзі не шукаюць Божай волі і пашырэння Валадарства. Нягледзячы на збаўленне, ім не хапае блізкасці з Госпадам. Яны ўсё яшчэ жывуць у знешнім двары. Абмежаваныя заслонай уласнага цела, не могуць наблізіцца да новага і жывога шляху; блізкія да Яго прысутнасці, але ўсё ж так далёка ад яе.

Вернікі, што жывуць на знешнім двары, не разумеюць, чаму Бог вызваліў іх ад прыгнёту свету. Яны прапускаюць заклік да блізкага пазнання Бога. Ім падабаюцца пасланні пра Божую любоў, дабраславенні, абарону, забеспячэнне і багацце — і ўсё гэта праўда, але пазбягаюць таго, што тычыцца праблем сэрца. Такія вернікі выбралі тое, што не можа іх задаволіць, бо прамінулі крыніцу Жывой Вады ва ўласным сэрцы.

Мы павінны казаць, што Бог хоча блізкіх адносін з намі і што Ён святы і не дазволіць здзекаў з Сябе. Ён заплаціў вялізны кошт, каб прывесці нас да Сябе, дык як мы можам

заставацца сябрамі гэтага свету? Заклікаючы наблізіцца да Бога, Якуб папярэджвае нас: «Ці вы ня ведаеце, што сяброўства са сьветам ёсьць варожасьць супраць Бога?» (Як. 4:4). Апостал працягвае, кажучы: калі мы шукаем цялесных пажаданняў, то самі робім сябе ворагамі Бога! Памятайце, Якуб звяртаецца да вернікаў. Павел таксама выкарыстоўвае выразныя тэрміны: «Бо зьявілася ласка Божая, што дае збаўленьне для ўсіх людзей, якая навучае нас, каб, адрокшыся ад бязбожнасьці і пажадлівасьцяў сьвету, цьвяроза, праведна і пабожна жылі мы ў цяперашнім веку» (Ціт. 2:11–12). Зноў жа, менавіта таму Павел кажа нам са страхам і трымценнем працаваць над сваім збаўленнем.

## Сябры Ісуса

Часта мы чуем пасланні, якія абвяшчаюць, што ўсе, хто прымае Ісуса, становяцца Яго сябрамі. Спадзяюся, вы цяпер разумееце, што Бог — гэта не танны сябар для ўсіх вакол. Аднойчы падчас малітвы Ён усклікнуў: «Спытай у Майго народа, ці хочуць яны, каб Я быў ім такім жа верным, як яны былі верныя Мне?» Ісус не прыйшоў як Збаўца, каб кожны мог далучыцца да Яго «клуба народжаных звыш». Бог шукае адносін з тымі, хто любіць Яго гэтаксама, як і Ён палюбіў іх; і тут мы знаходзім Божае сяброўства. Гэта пацвярджаецца Яго ўласнымі словамі:

> Вы сябры Мае, калі робіце тое, што Я загадваю вам (Ян 15:14).

Існуюць параметры сяброўства з Ісусам. Ён не сказаў: «Вы ўсе сябры Мае, калі верыце, што Я Хрыстос». Хутчэй Ён сказаў: «Вы сябры Мае, калі выконваеце ўсё, што Я загадваю

вам». У гэтым раздзеле мы абмеркавалі, што сіла «выконваць усё, што Ён загадае» знаходзіцца ў страху Гасподнім.

Ісус сказаў гэтыя словы пасля таго, як Юда пайшоў выдаць Яго. Калі мы прачытаем наступны верш, то ўбачым, што Ісус звяртаецца да Адзінаццаці: «Я больш не называю вас слугамі» (Ян 15:15). Той факт, што Ён сказаў: «больш не» азначае, што быў час, калі Ён глядзеў на іх як на слуг, але цяпер пачынаўся новы ўзровень. Пасля Ісус працягвае:

> Бо слуга ня ведае, што робіць гаспадар ягоны; але Я назваў вас сябрамі, бо ўсё, што чуў ад Айца Майго, паведаміў вам (Ян 15:15).

Звярніце ўвагу, сябры Настаўніка ведаюць, што Ён робіць. Яны ведаюць Яго шляхі! Чаму іх называюць сябрамі цяпер, а не на пачатку адносінаў? Вось адказ: яны даказалі вернасць і паслухмянасць, калі ішлі за Ісусам праз выпрабаванні і цяжкія часы, а таксама радаваліся з Ім у цудоўныя і добрыя часы. Іх вернасць праявілася ў іх паслухмянасці.

Словы Ісуса тычацца ўсіх, хто заклікае Яго: «Вы сябры Мае, калі робіце тое, што Я загадваю вам». Звярніце ўвагу, Ён выразна падкрэслівае: сяброўства прызначана для тых, хто слухаецца Яго. Гэта адлюстроўвае думку, што мы бачылі ў кнізе Псальмаў: «Сяброўства з Госпадам – для тых, хто баіцца Яго».

Чаму Бог не адкрывае сяброўства для ўсіх? Я лічу, гэта робіцца, каб абараніць нас ад небяспекі фамільярнасці. Прыгадайце сыноў Аарона і заклік да іх бацькі Аарона: «Тыя, хто *набліжаецца да Мяне*, павінны ведаць, што Я – Святы».

Так паўтарылася ў Новым Запавеце, калі муж і жонка ўвайшлі ў прысутнасць святога Бога з нездаровай фамільярнасцю. Яны памерлі ў Божай прысутнасці

(гл. Дз. 5:1–11). «Вялікі страх» ахапіў царкву, калі яна пачала разумець сур’ёзнасць недахопу павагі. Зноў жа, Бог павінен шанавацца ўсімі, хто Яго акружае.

У мінулым годзе я адкрыў для сябе цудоўную таямніцу. Калі я пачынаў час малітвы, я ўстрымліваўся ад слоў і проста разважаў пра цудоўную веліч і прыгажосць майго Айца. Я думаў пра веліч Ісуса і пра слаўную бітву, якую Ён выйграў, каб я належаў Яму. Я разважаў пра Яго цудоўны Дух і пра тое, што Ён вырашыў жыць са мной. Як жа ўсё гэта ўражвае!

Я зразумеў, што такім чынам, яшчэ да таго, як я вымаўляў хоць слова, мяне ахінала прысутнасць Госпада. Здзіўлены тым, як лёгка мне было ўвайсці ў Яго прысутнасць, я спытаў пра гэта Святога Духа. Ён сказаў майму сэрцу: «Сыне, што Ісус сказаў вучням рабіць, калі вучыў іх маліцца?» Я прыгадаў малітву Госпада: «Ойча наш, Які ёсць у небе! Сьвяціся імя Тваё». Я быў шакаваны і ўсклікнуў ад радасці: «Вось яно, вось!» З самага пачатку Яго трэба лічыць святым: «Сьвяціся імя Тваё». Мы павінны ўвайсці ў Яго прысутнасць праз святую павагу! Шмат гадоў я чытаў гэтую малітву, не разумеючы, што насамрэч казаў Ісус!

## Ключ да скарбаў жыцця

Страх Госпада —ключ да блізкасці з Богам і падмурак жыцця. Ісая кажа нам:

> «Узвышаны ГОСПАД, бо жыве на вышынях, Ён напоўніць Сыён [царкву] судом і праведнасьцю. І будзе бясьпечны час твой, багацьцем збаўленьня [будзе] мудрасьць і веданьне. Страх ГОСПАДАЎ будзе скарбам ягоным» (Іс. 33:5–6) (*у анг. перакладзе: «Страх ГОСПАДАЎ будзе ключом да гэтага скарбу» — заўвага перакл.*).

Святы страх адмыкае скарбніцу збаўлення, мудрасці і веданняў. Чаму? Бо гэта падмурак для блізкасці з Богам, і ў гэтым месцы блізкасці адкрываюцца Яго скарбы. Страх Госпадаў разам з любоўю да Бога складае падмурак жыцця. Мы не можам сапраўды любіць Бога і атрымліваць асалоду ад блізкасці з Ім, пакуль не пачнём баяцца Яго.

## Пытанні для вывучэння

1. Апішыце сваімі словамі, што значыць баяцца Бога, а не быць напалоханымі Богам?

2. У гэтым раздзеле Абрагам, сябар Богу, супрацьпастаўляецца пляменніку Лоту, якога называлі «праведным». Калі Лот аглядаў жаданыя землі непадалёк ад бязбожных гарадоў Садома і Гаморы, ён, відавочна, шукаў спосаб атрымліваць асалоду ад багацця гарадоў, не паддаючыся іх уплыву. Ці былі вы калі-небудзь схільныя разважаць гэтаксама?

   Як належны страх перад Госпадам мог бы перашкодзіць такім памылковым разважанням?

3. Успомніце сустрэчу аўтара з чалавекам на гавайскім пляжы. Ці былі ў вас падобныя сустрэчы? Што вы тады рабілі?

   Незалежна ад таго, былі яны такімі ж выключэннямі, як узгаданы выпадак, ці не, ці здаралася вам самім «апынуцца чалавекам на пляжы», калі вашы размовы ці дзеянні выдавалі, дзе насамрэч было ваша сэрца ў той момант? Чаму вы навучыліся ці вучыцеся з падобных выпадкаў?

4. У святле Псалма 25:14 («Таямніца (у анг. перакл. – сяброўства) ГОСПАДА з тымі, што баяцца Яго»), аўтар адзначае, што Бог не дае Свайго сяброўства ўсім, каб абараніць нас ад небяспек фамільярнасці. Як вы разумееце «небяспекі фамільярнасці»?

Раздзел 7

# ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ САПРАЎДНАЙ БЛІЗКАСЦІ?

Падманутыя суцяшаюцца веданнем Бога,
якога ў іх проста няма.

Страх Госпада — аснова блізкасці з Богам. Гэта выразна тлумачыцца ў пачатку кнігі Прыповесцяў. Мы чытаем: «Страх перад Госпадам — пачатак [аснова] веданьня» (Прып. 1:7). Якога ведання? Праз некалькі вершаў аўтар кажа:

> Сыне мой, калі ты прыймеш словы мае і захаваеш у сябе прыказаньні мае, прыхіляючы вуха тваё да мудрасьці і схіляючы сэрца тваё да разважлівасьці, калі вось клікаць будзеш розум і голас твой уздымеш, заклікаючы развагу, калі шукаць яе будзеш як срэбра, і прагнуць яе будзеш як багацьця, тады зразумееш

страх перад ГОСПАДАМ і знойдзеш *пазнаньне Бога* (Прып. 2:1–5, *курсіў аўтара*).

Слова «*веды*» (або «веданне») вызначаецца ў «*Слоўніку біблейскіх моў*» (Dictionary of Biblical Languages) як «інфармацыя пра асобу з моцным намёкам на адносіны з гэтым чалавекам». У *Тлумачальным слоўніку Vines* (Vines Expository Dictionary) гаворыцца, што слова «*веды*» азначае «мець глыбокае веданне Яго (Бога) на досведзе». Далей аўтар слоўніка кажа: «Безумоўна, «ведаць» Бога — гэта тое самае, што і баяцца Яго».

У папярэднім урыўку з Пісання вы бачыце, што страх перад Госпадам значыць шанаваць Яго прыказанні. Гэта, у сваю чаргу, азначае прыхіляць вуха да Яго слова і з гатоўнасцю слухацца, незалежна ад абставін. Тых, каму не хапае такога святога страху, чакае адваротнае блізкасці. Якуб кажа, што мы «падманваемся» (Як. 1:22), калі ведаем Божую волю, але ўстрымліваемся ад яе выканання. Падман — страшная рэч, бо падманутыя вераць, што яны паслухмяныя, хоць на самай справе гэта не так. Падманутыя суцяшаюцца веданнем Бога, якога ў іх проста няма.

## Скажоны вобраз Госпада

Без страху Госпада мы не ведаем Бога. Няправільны вобраз фармуецца і ствараецца ў нашай душы ці нашым уяўленні. Нягледзячы на тое, што мы вызнаём адносіны з Ім і шануем Яго вуснамі, наша сэрца далёкае ад Яго, і наша жыццё не сінхранізавана з Яго жаданнямі — што і назіраем у народзе Ізраіля.

Як ужо ўзгадвалася, Майсей прывёў народ на сустрэчу з Богам каля гары Сінай, і ўсё ж «стаяў народ здалёк, а Майсей

наблізіўся» (Вых. 20:21). Як балюча, што людзі не маглі браць удзел у тым, што іх чакала. Хто ведае, што б здарылася? Народ мог пачуць словы Бога, сказаныя Яго ўласным голасам! Аднак, як ужо гаварылася, ізраільцяне не маглі вытрымаць Божай прысутнасці, бо іх сэрцы не баяліся Яго, і таму народ не мог выконваць Божыя прыказанні (Друг. 5:29).

Расчараваны, Бог ставіць пасярэдніка паміж Сабой і народам. Ён звяртаецца да Майсея: «Узыйдзі *ты і Аарон з табою*» (Вых. 19:24, *курсіў аўтара*). Бог паклікаў Майсея і Аарона да Сябе як пасярэднікаў — чуць Яго словы, звернутыя да народа, і перадаваць Яму тое, што адкажа народ. Як далёка ад першапачатковай блізкасці, якую Ён планаваў!

Чытаючы далей кнігу Выхад, мы знаходзім Майсея на гары, а Аарона — у табары. Здаецца, Аарон пайшоў на гару, але ў рэшце рэшт апынуўся сярод народа. Чаму? Бо адчуваў сябе больш камфортна ў прысутнасці людзей, чым у прысутнасці Бога. Яму не хапала страху перад Госпадам. Аарон баяўся чалавека больш, чым Бога, і таму служыў людзям; і ўрэшце даў людзям тое, што тыя хацелі. Зараз мы ўбачым, гэта не заняло шмат часу.

Майсей ужо амаль сорак дзён на гары, і мы чытаем:

> «І бачыў народ, што Майсей затрымліваецца, каб зыйсці з гары, і сабраўся народ перад Ааронам, і сказалі яму: «Устань, зрабі нам багоў, якія будуць ісьці перад намі, бо з гэтым Майсеем, гэтым чалавекам, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай, ня ведаем, што сталася з ім» (Вых. 32:1).

Аарон меў дар лідарства, адметнасць якога — прыцягваць людзей, як магніт. Лідар прыцягвае іншых, незалежна ад

таго, ён з Богам ці не. Вось тлумачэнне таму, як можна мець царкву, куды ходзяць тысячы людзей, пазбаўленую Божай прысутнасці, дзе Божыя жаданні прадстаўляюцца няправільна. Занадта часта лідар, якому не хапае страху перад Госпадам, выкарыстоўвае дадзеныя Богам дары, каб выконваць жаданні людзей, а не Госпада.

Людзі заклікалі Аарона: «Устань, зрабі нам багоў, якія будуць ісьці перад намі, бо з Майсеем, гэтым чалавекам, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай, ня ведаем, што сталася». Звярніце ўвагу, яны не сказалі: «Што да Бога, мы не ведаем, што з Ім стала». Яны не адмаўляюць Бога, а проста дыскваліфікуюць Майсея.

## Бог ці бог?

Вывучаючы арыгінальныя тэксты, я задаюся пытаннем: ці не адышлі перакладчыкі ад таго, што было сказана насамрэч. Яны выкарысталі слова «*багі*». Аднак габрэйскае слова для абазначэння *багоў — элахім*. Яно сустракаецца ў Старым Запавеце 2606 разоў і прыкладна 2350 раз (90 працэнтаў) адносіцца да Усемагутнага Бога, Якому мы служым. Гэта слова сустракаецца 32 разы толькі ў першым раздзеле кнігі Быцця, і кожны раз адносіцца да Госпада. Напрыклад, першы верш Бібліі гучыць так: «У пачатку Бог [элахім] стварыў неба і зямлю» (Быц. 1:1). Тут *элахім* перакладаецца як «Бог».

Прыкладна 250 разоў у Старым Запавеце слова *элахім* выкарыстоўваецца для апісання фальшывага бога. Таму трэба заўсёды ўлічваць кантэкст, каб зразумець правільна.

Аарон сказаў народу: «Зьніміце завушніцы залатыя, якія ў вушах жонак вашых, сыноў вашых і дочак вашых, і прынясіце да мяне» (Вых. 32:2). Народ зрабіў гэта: «І ён узяў [гэта] з рук

іхніх, і ўфармаваў яго разцом, і зрабіў з яго цяля літое» (32:4).

Калі Аарон зрабіў залатое цяля, усе людзі сказалі: «Вось бог твой, Ізраілю, які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай» (Вых. 32:4).

Габрэйскае слова, якое азначае *бог*, — гэта зноў *элахім*. Людзі кажуць: «Вось твой элахім, Ізраіль, які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай!» Ці разумееце вы, што адбываецца? Давайце працягнем, каб дакладна ведаць, што кажуць людзі.

> І ўбачыў Аарон, і збудаваў перад ім ахвярнік, і ўсклікнуў Аарон, і сказаў: «Сьвята для *ГОСПАДА* заўтра» (Вых. 32:5, *курсіў аўтара*).

Габрэйскае слова «*Госпад*» у гэтым вершы — слова «*Егова*» або «*Яхвэ*». «*Яхвэ*» — уласнае імя адзінага сапраўднага Бога, самае святое слова ў Старым Запавеце. У Старым Запавеце яго ніколі не выкарыстоўвалі, каб назваць ілжывага бога. Слова лічылася настолькі святым, што габрэйскія кніжнікі не запісвалі яго цалкам, абазначаючы чатырма зычнымі літарамі і вымаўляючы як «Яхвэ». Імя Госпада нельга было вымаўляць услых, яно ахоўвалася ад апаганьвання, магчымага ў штодзённым жыцці Ізраіля.

Аарон і народ Ізраіля зрабілі цяля, паказалі на яго і сказалі: «Вось Яхвэ, адзіны сапраўдны Бог, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай!» Яны не сказалі: «Вось Баал, той, хто вывеў нас з Эгіпта». Ізраільцяне не прыпісвалі вызваленне іншаму фальшываму богу, а назвалі залатое цяля імем Госпада.

## Пакланенне, за якім ішло патуранне

Народ не адмаўляў Бога відавочна, хутчэй, прынізіў Яго славу да вобраза цяляці. Людзі былі падманутыя ў ведах пра Бога, але ўсё яшчэ прызнавалі Яхвэ выратавальнікам і

вызваліцелем з Эгіпта. Народ не адмаўляў Яго гаючай сілы, а проста змяніў Яго вобраз! Далей мы даведваемся:

> І яны ўсталі рана назаўтра, і ахвяроўвалі цэласпаленьні, і прынесьлі ахвяры мірныя; і сеў народ есьці і піць, і ўсталі гуляць (Вых. 32:6).

Звярніце ўвагу: ізраільцяне прынеслі ахвяры. Навошта? Каб ушанаваць Яхвэ, Якому, паводле іх словаў, яны служылі! Пасля прынясення ахвяр або пакланення людзі сталі гуляць і аддавацца цялесным жаданням. Іншы пераклад кажа, яны «ўсталі, каб аддацца весялосці».

Ці адбываецца так сёння? Ці ёсць вернікі, вызваленыя ад свету збаўленчай Божай ласкай, якім не хапае святога страху, і яны заклікаюць Ісуса, якога прыдумалі самі? Увесь час моцна трымаюцца за вопыт нараджэння звыш, прымаюць і вызнаюць Ісуса як Госпада, калі прыходзяць у царкву, спяваюць песні вызвалення і свабоды, слухаюць казані, ахвяруюць грошы, але, выходзячы з царквы, хлусяць, каб нешта прадаць, і ўвесь час сведчаць пра тое, як Бог дабраслаўляе іх бізнес. Магчыма, яны пляткараць пра пастараў і іншых людзей у царкве, апраўдваючыся: «Гэта праўда, іншыя таксама гэта ведаюць»; распуснічаюць або робяць іншы грэх, а потым апраўдваюцца, што, хоць Ісус і збавіў іх, яны ўсё яшчэ жывуць у целе і маюць патрэбы! Спіс проста бясконцы.

Ці ведаюць такія вернікі Ісуса? Спытайце іх, і яны рашуча адкажуць: так! Ці падманутыя яны? Яны вызнаюць Таго, Хто сядзіць праваруч Вялікага Бога ў небе, ці Ісуса, створанага на ўласны вобраз і падабенства, які дасць ім тое, што яны хочуць? І, што яшчэ важней: ці пазналі мы ў гэтым прыкладзе сябе?

Вы ўбачыце: калі вернікам не хапае страху перад

Госпадам, яны клічуць да Яго, але цягнуцца да цялесных жаданняў. Цела ж варагуе з Богам, бо не падпарадкоўваецца волі Бога (гл. Рым. 8:5–7). Такія вернікі не паслухмяныя Яго жаданням, нават калі заклікаюць Яго імя, сцвярджаюць, што ведаюць Яго, і вераць, што Ён ухваляе іх паводзіны. Адсутнасць паслухмянасці вынікае з сэрца, якому не хапае святога страху. Вось корань усялякай непаслухмянасці — адсутнасць блізкай сувязі з Богам, ахінутая падманам «ведання Ісуса».

## Нічога схаванага

Падобныя сітуацыі можна ўбачыць ва ўсёй Бібліі. Першая здарылася з Каінам, сынам Адама, неўзабаве пасля грэхападзення. Калі бацькі Каіна зграшылі ў раі, з-за няведання яны прыкрыліся фігавым лісцем — плодам зямлі. Бог паказаў Сваю волю — прыносіць у ахвяру жывёл; і апрануў Адама і Еву ў тунікі са скуры жывёлы (асабіста я веру, што гэта было ягня).

Каін не быў невукам; ён ведаў ад бацькоў: Бог жадае ў ахвяру жывёл, а не плады зямлі. Тым не менш, мы чытаем: «І сталася, калі прайшлі дні, Каін прынёс з пладоў зямлі дар *ГОСПАДУ*» (Быц. 4:3, *курсіў аўтара*). Без сумненняў, ён спрабаваў служыць Богу, бо не гаворыцца, што Каін прынёс ахвяру фальшываму богу. Каін старанна працаваў, каб прынесці Богу ахвяру; аднак быў відавочна непаслухмяным.

У чым корань яго непаслухмянасці? Ні ў чым іншым, як у адсутнасці страху перад Госпадам. Гэта выразна відаць, калі Бог пытаецца пра месцазнаходжанне забітага брата. Адказ Каіна — выклік: «Ня ведаю. Ці ж я вартаўнік брата майго?» (Быц. 4:9). Зноў бачым, як і ў выпадку з Ізраілем

і цялём: праз недахоп страху перад Госпадам вобраз Бога змяншаецца, і змяняюцца стандарты таго, як Яму паслужыць. Падмануты Каін нават не задумваецца, ці можна ад Бога нешта схаваць, як ад чалавека. У вачах Каіна вобраз Бога зведзены да ўзроўню чалавека. Павел сур'ёзна папярэджвае нас: у апошнія дні мы таксама ўбачым гэтую заканамернасць: «Бо яны, пазнаўшы Бога, ня славілі [Яго] як Бога… і славу незьнішчальнага Бога замянілі на падабенства вобразу зьнішчальнага чалавека» (Рым. 1:21–23). Як і ў выпадку з Каінам, недахоп страху перад Богам зрабіў вернікаў уразлівымі да падману, і яны вераць, што Бог не заўважае іх непаслухмяных шляхоў.

Адказ Каіна паказвае: ён забыўся, што ад Бога нічога не схавана. Бог не чалавек; Ён бачыць і ведае ўсё. Калі мы губляем страх перад Госпадам, мы памяншаем духоўны здаровы сэнс, бо нават апошні грэшнік разумее: Бог ведае пра яго бунт. Тыя, хто маюць веды пра Бога, але не маюць Яго святы страх, суцяшаюць сябе словамі: «Госпад ня бачыць!» (Эз. 9:9), або, калі бачыць, то, безумоўна, разумее. Нават лідары могуць так памыляцца. Бог кажа: «Ці ты бачыш, сыне чалавечы, што робіць у цемры кожны са старшыняў дому Ізраіля… яны кажуць: "ГОСПАД ня бачыць нас"» (Эз. 8:12).

Няўжо мы забыліся пра настойлівыя словы Ісуса, каб мы баяліся Бога? Ён кажа нам: «Бо няма нічога прыхаванага, што б не адкрылася, і тайнага, пра што б не даведаліся» (Лк. 12:2). Губляючы страх перад Богам, мы прыніжаем Яго да свайго ўзроўню і падсвядома лічым, што можам нешта ад Яго схаваць. Калі такіх вернікаў спытаць пра ўсюдыіснасць Бога і Яго ўсёведанне, яны без ваганняў ўпэўнена пагодзяцца. Але глыбока ў душы яны страцілі ўсведамленне Яго велічы; бо, калі б яшчэ мелі яго, не імкнуліся б трымаць рэчы ў сакрэце.

Яны хаваюць рэчы ад пабожных людзей і часта паспяховыя ў гэтым, але забываюць, што «Вочы Госпада на кожным месцы, яны бачаць добрых і ліхіх» (Прып. 15:3).

## Вера, што ты паслухмяны, калі гэта не так

Але гэта яшчэ не ўсё. Наступны крок падману вядзе да веры ў паслухмянасць, калі на самай справе гэта не так. Вось прыклад аднаго з нашчадкаў Давіда, цара па імені Узія. Калі яму было шаснаццаць гадоў, памёр яго бацька Амазія, і Узія быў пастаўлены царом Юдэі. Калі табе ўсяго шаснаццаць і цябе паставілі царом, разумна будзе шукаць Бога, і Узія так і зрабіў. У выніку ён меў вялікі поспех. Гадамі ён карыстаўся багаццем і поспехам. Затым мы чытаем: «І разыйшлося імя ягонае далёка, бо ён меў [праз гэта] цудоўную дапамогу і стаўся моцным» (2 Лет. 26:15).

Але калі Узія быў моцным, яго сэрца ўзвысілася ад ганарлівасці. Ганарлівасць і страх перад Госпадам супярэчаць адно аднаму. Калі ў сэрцы няма святога страху, у ім расце ганарлівасць. Уважліва прачытайце, што адбылося:

> Але калі ён узмацніўся, заганарылася сэрца ягонае аж да загубы, і ён стаў няверным ГОСПАДУ, Богу свайму, і ўвайшоў ён у сьвятыню ГОСПАДА, каб кадзіць на ахвярніку каджэньня. І ўвайшоў за ім Азарыя сьвятар, і з ім восемдзясят сьвятароў ГОСПАДА, людзей мужных. І супраціваліся яны Узіі валадару, і сказалі яму: «Не табе, Узія, кадзіць ГОСПАДУ, бо гэта для сьвятароў, сыноў Аарона, якія пасьвячоныя для каджэньня. Выйдзі са сьвятыні, бо ты стаў няверным, і ня будзе табе славы ў ГОСПАДА Бога». І загневаўся Узія, а ў руцэ ягонай [была] кадзільніца для каджэньня. І калі

> загневаўся ён на сьвятароў, праказа закрасавала на чале ягоным перад абліччам сьвятароў у Доме ГОСПАДА каля ахвярніка каджэньня (2 Лет. 26:16–19).

Цяпер трэба задаць пытанне: калі сэрца Узіі заганарылася, стаў ён больш ці менш духоўным? Калі я задаю гэтае пытанне слухачам, большасць адказвае: Узія стаў менш духоўным. Аднак гэта няпраўда, бо ён увайшоў у храм для *пакланення*. Узія стаў больш духоўным (рэлігійным) у дзеяннях. Вельмі часта гіпердухоўнасць і ганарлівасць ідуць побач, рука аб руку, прыкрываючы адна адну. Ганарлівасць не дазваляе чалавеку прызнаць, што ён рэлігійны, а рэлігійнасць хавае ганарлівасць за духоўнымі манерамі. Абедзве з’яўляюцца праз недахоп страху Гасподняга і сапраўднай пакоры!

Звярніце ўвагу, Узія раз’юшыўся, сутыкнуўшыся з праўдай. Менавіта тое ж здарылася з Каінам, калі ён сутыкнуўся з праўдай. У Пісанні гаворыцца: «І вельмі загневаўся Каін, і пахілілася аблічча яго» (Быц. 4:5). Каін разгневаўся на Бога! Кожны раз, калі вы кажаце праўду чалавеку, які жыве ў непаслухмянасці з-за недахопу святога страху, ён злуецца. Чаму? Гэтыя людзі сапраўды вераць, што маюць рацыю! Яны падманутыя, а быць падманутым — значыць верыць, што ты маеш рацыю, калі ты памыляешся.

Навошта Узіі раз’юшвацца на святароў, калі ён не верыць, што мае рацыю? Ён увайшоў у храм, каб пакланіцца, але, як і сыны Аарона, занядбаў пашану да пастановаў Госпада і прынізіў Яго вобраз. Узія быў неўтаймаваны ў непаслухмянасці. Падавалася, што ён імкнуўся да блізкасці з Богам, але на самай справе яшчэ больш аддаліўся ад Таго, каму імкнуўся пакланяцца.

Ці адказвае гэта на пытанне, чаму ў царкве так шмат

вернікаў, што вызнаюць блізкасць з Богам, але не разумеюць Божых жаданняў? Без разумення прынцыпаў, якія мы абмеркавалі, вы збянтэжыцеся, назіраючы, як людзі дзеляцца тым, што Бог нібыта адкрыў ім, і гэтае адкрыццё супярэчыць праўдзе Святога Пісання. Як вернікі могуць выходзіць з малітвы і крытыкаваць лідараў, якіх Бог загадаў шанаваць? Калі вы адважыцеся паўтарыць тое, што кажа Святое Пісанне, на вас раззлуюцца. Яны лічаць, вы не разумееце іх і вы недухоўныя, хоць на самай справе гэта яны супрацьстаяць Божым шляхам.

Як лідар, я шмат разоў размаўляў з вернікамі, якія падзяліліся тым, што, на іх думку, адкрыў ім Бог, але мой дух быў неспакойны. Людзі былі перакананыя, што пачулі слова ад Бога, аднак пазбягалі любых слоў з Пісання, якімі я дзяліўся. Так яны робяць не толькі са мной, але і з усімі, хто спрабуе ім дапамагчы — выкарыстоўваюць урыўкі з Пісання па-за кантэкстам, каб апраўдаць свае словы, і не адкрываюцца на далейшае абмеркаванне. Пазней яны пазбягаюць мяне, ізалююцца ад усіх, хто спрабуе ім дапамагчы, бо мы ўжо не духоўныя ў іх вачах. Ідзе час, і плады іх шляхоў аказваюцца супрацьлеглымі Божай волі, або тое, чаго яны чакалі, не адбываецца. Можа быць, яны чулі зусім не Ісуса, а голас уласных уяўленняў? Няўжо яны шукалі блізкасці толькі для таго, каб знайсці падман?

## Звяртацца да Бога з сэрцам ідалапаклонніка

Ёсць спосаб пазбегнуць гэтага жудаснага падману, і ён зноў жа знаходзіцца ў страху перад Госпадам. Калі мы баімся Бога, мы павінны прыходзіць да Яго з нейтральным сэрцам, гатовымі пачуць як словы Яго настаўлення, так і Яго словы

выпраўлення. Мы не абапіраемся на ўласнае разуменне або эгаістычныя жаданні, але прагнем Яго волі.

Звяртацца да Госпада з моцнымі жаданнямі, якія не адпавядаюць Яго волі, адкрытай нам, можа быць вельмі неразумным і небяспечным, бо прывядзе нас да наступнага, самага страшнага ўзроўню падману. Такое здараецца, калі Сам Бог дасць або дазволіць нам мець тое, што мы прагнем: І было да мяне слова Гасподняе:

> І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы: «Сыне чалавечы, гэтыя людзі ўвялі ў сэрцы свае ідалаў сваіх і паставілі перад абліччам сваім тое, што было прычынаю грэху іхняга. Ці ж пытаючыся, будуць пытацца ў Мяне [парады]? (Езэк. 14:2–3)

Госпад засмуціўся, што Яго народ прыйшоў да Яго, каб папрасіць кіраўніцтва, парады ці мудрасці, маючы ў сэрцах ідалаў. Незразумела, ці цалкам людзі гэта ўсведамлялі; аднак, здаецца, праўда была схавана ад іх вачэй. Ідалы прымусілі народ прыйсці да беззаконня. Габрэйскае слова для *беззаконня* — «*авон*», і яно азначае наўмыснае ці ненаўмыснае злачынства супраць Божай волі.

Звярніце ўвагу: Бог не сказаў, што людзі паставілі ідалаў у дварах, гасцёўнях ці спальнях. Ідалапаклонства было ў сэрцах. Памятайце: ідалапаклонства не абмяжоўваецца тым, што заклікае чужога бога. Раней гаварылася: адна з формаў ідалапаклонства — зменшыць Бога да ніжэйшага вобраза; таго, хто дасць нам тое, што мы прагнем. Корань любога ідалапаклонства — прагнасць або хцівасць. Новы Запавет пацвярджае:

> Дык мярцьвіце члены вашыя, што на зямлі: распусту,

нячыстасьць, жарсьць, благое пажаданьне і *хцівасьць, якая ёсьць ідалапаклонствам* (Кал. 3:5, курсіў аўтара).

У Пасланні да Эфэсцаў 5:5 Павел зноў кажа, што хцівы чалавек — гэта ідалапаклоннік. Зразумела, ідалапаклонства характарызуецца як хцівасць; таму давайце дадзім азначэнне хцівасці. Слоўнік Вэбстэра кажа: хцівасць — «моцнае жаданне атрымаць нешта нібыта добрае і валодаць ім». У малітве я папрасіў Госпада патлумачыць. Ён адказаў: «Хцівасць — гэта жаданне нажывы».

Таму хцівасць не абмяжоўваецца жаданнем грошай. Яна ўключае ў сябе жаданне маёмасці, становішча, камфорту, прызнання, задавальнення, улады, сэксуальную пажадлівасць і гэтак далей. Хцівасць — гэта стан, у якім мы знаходзімся, калі мы незадаволеныя. Мы намагаемся мець нешта яшчэ, бо нам бракуе міру ці спакою ў тым, што даў Бог. Мы свядома ці несвядома супраціўляемся Яго плану і справам у нашым жыцці. Па гэтай прычыне сказана: «Ня будзьце срэбралюбныя, задавальняючыся тым, што маеце. Бо Ён сказаў: “Не адпушчу цябе і не пакіну”» (Гебр. 13:5). Калі мы жывём з упэўненасцю: «Перад абліччам Тваім поўня радасьці, праваруч Цябе — раскоша заўсёды» (Пс. 16:11), мы не будзем шукаць задавальнення па-за Яго прысутнасцю або планам для нас.

Хцівасць жыве сярод неспакою і падсілкоўваецца няспынным жаданнем. Выдатная ілюстрацыя — народ Ізраіля пасля выхаду з Эгіпта. Ізраільцяне пастаянна імкнуліся да таго, што лічылі найлепшым для сябе, нават калі Бог абвясціў Сваю волю. Ім не спадабаўся працэс, абраны Богам, каб падрыхтаваць іх да захопу абяцанай зямлі, і яны скардзіліся на ўмовы, ваду, ежу і гэтак далей. Ізраільцянам

не хапала святога страху, іх сэрцы былі гатовыя культываваць хцівасць. Калі Бог з’явіў Сябе, яны пабеглі хавацца, каб не выявілася праўда: таемнае прагненне задавальнення і нажывы пераўзышло іх жаданне Самога Бога.

Як толькі Госпад і Майсей адышлі, людзі ўвасобілі Бога ў вобразе таго, хто выканае іх прагныя жаданні. Цікава: усё круціцца вакол золата. Любоў да грошай праяўлялася ў адсутнасці пабожнай задаволенасці Божай воляй. Цяпер ізраільцяне дзейнічалі ў густым тумане падману.

(Дарэчы, хцівасць — корань іншых відаў ідалапаклонства. Усё чалавецтва створана з прыроджаным жаданнем пакланяцца Богу. Але многія не хочуць падпарадкоўвацца сапраўднаму Творцу, таму стварылі фальшывага бога. Хто спрычыніўся да з’яўлення гэтага фальшывага бога? Адказ: той, хто яго стварыў, — чалавек. Цяпер чалавек пакланяецца гэтаму фальшываму богу, які ў выніку дае тое, што чалавек жадае. І зноў жа, прычынай становіцца хцівасць).

Карацей кажучы, незалежна ад іх формы, усе ідалы – гэта крыніца. Яны займаюць месца, якога заслугоўвае толькі Бог. Ідал можа служыць крыніцай шчасця, камфорту, міру, забеспячэння і гэтак далей. Бог кажа: «Не рабіце сабе ідалаў» (Ляв. 26:1). Мы самі робім сабе ідалаў. Ідал — гэта любая рэч, якую у жыцці лічым важней за Бога. Ідал — гэта тое, што мы любім, што нам падабаецца, чаму давяраем, чаго жадаем або чаму надаём больш увагі, чым Госпаду. Ідал — гэта тое, адкуль чэрпаеце сілу або чаму аддаяце сілу. Вернік уцягваецца ў ідалапаклонства, калі дазваляе незадаволенасці ўзрушыць сэрца і шукае задавальнення па-за Божай воляй для жыцця. Зноў жа, галоўная прычына — гэта хцівасць.

## Адказ паводле хцівасці

Вернемся словаў, сказаных Богам да Эзэкіэля. Бог шкадаваў, што Яго ўласны народ прыйшоў па дапамогу з ідаламі ў сэрцы. Замест таго, каб шукаць Божай волі, ізраільцяне хацелі, каб Бог даў тое, што яны эгаістычна жадалі. Падобнае здараецца з падлеткамі: яны хочуць, каб бацькі пагадзіліся з іх ідэямі, пры гэтым іх не цікавіць мудрасць бацькоў, бо падлеткі не разумеюць, што бацькі мудрэйшыя і хочуць найлепшага для сваіх дзяцей.

Божы адказ Эзэкіэлю выклікае трывогу і прымушае задумацца. Бог вельмі канкрэтна кажа Эзэкіэлю, што будзе, калі Яго народ прыйдзе да Яго са хцівымі сэрцамі: «Я, ГОСПАД, адкажу яму адпаведна да ліку ідалаў ягоных» (Эзэк. 14:4). У Новай Амерыканскай стандартнай Бібліі гаворыцца так: «Я, Госпад, дам Яму адказ у гэтай справе з улікам мноства ягоных ідалаў». Гэта можна прачытаць так: «Я, Госпад, дам Яму адказ у гэтай справе паводле ягоных прагных жаданняў».

## Загуба для Божага чалавека

Так адбылося ў жыцці Білеама. Ён быў вялікім прарокам Яхвэ, не ідала, а Самога Госпада, Якому мы служым. Прароцкае служэнне Білеама было настолькі магутным, што пра яго пачулі цары. Адным з іх, у прыватнасці, быў Балак, цар Маава і Мадыяна.

Народ Маава і Мадыяна быў у жаху: Ізраіль толькі што знішчыў Эгіпет, наймагутнейшую нацыю ў свеце, і цяпер раскінуў лагер на раўнінах Маава. Людзі разважалі: калі ізральцяне так лёгка знішчылі Эгіпет, то яны без праблем зробяць тое самае і з маавіцянамі і мадыянцамі. Нястрымны

страх ахапіў народ і царскі двор.

У валадара быў план. Ён разумеў: той, каго дабраславіць вялікі прарок Білеам, будзе дабраславёны, а той, каго прарок пракляне, будзе пракляты. Валадар паслаў да Білеама вяльможаў з вялікімі дарамі і прасіў, каб Білеам прыйшоў і разам з ім пракляў Ізраіль з вышыняў Маава.

Білеам быў заінтрыгаваны: «Застаньцеся тут на ноч, і я прынясу вам слова, якое скажа мне ГОСПАД» (Лк. 22:8). Яго адказ гучыць падобна да адказу большасці вернікаў сёння: «Давай я памалюся і паслухаю, што скажа Госпад».

Госпад прыходзіць да Білеама і пытаецца: «Што гэта за людзі ў цябе?» Іншымі словамі: «Чаму табе наогул трэба маліцца пра гэта? Гэтыя людзі не ў запавеце са Мной і просяць праклясці Мой народ запавету! Навошта табе нават пытацца?»

У гэтым урок для ўсіх нас: ёсць рэчы, пра якія не трэба нават маліцца! Мы павінны ўжо ведаць Божае жаданне, перш чым папросім. Мне не падабаецца, калі мае сыны-падлеткі падыходзяць да мяне і просяць тое, на што адказам будзе «не». (І яны гэта ўжо ведаюць). «Чаму яны наогул пытаюцца?» — мармычу я сабе пад нос, даўшы адказ, які яны і так ведалі. Дзеці робяць гэта таму, што маё слова ўсё яшчэ закон або абмежаванне, а не асалода для іх у гэтай сферы жыцця.

Вернемся да Білеама. Я думаю, прапанаваная ўзнагарода была велізарнай, а таксама яго вельмі шанавалі б жыхары Маава і Мадыяна. Няўжо жаданне грошай і гонару засляпіла вочы Білеама і зрабіла няздольным успрымаць здаровую мудрасць?

Міласэрны Бог, напэўна, падумаў: *«Добра, Білеам, паколькі ты не зразумеў падказкі, ці не вельмі хацеў зразумець, Я патлумачу Сваю волю вельмі выразна».* Таму Госпад кажа: «Ты ня пойдзеш з імі, не праклянеш народ, бо ён дабраслаўлёны»

(верш 12). Гэта зразумела? Я часта бачу, што Бог гаворыць дакладна і зразумела; а мы ўсё блытаем і ўскладняем.

Білеам паслухаўся і наступнай раніцай адправіў пасланцоў са словамі: «Варочайцеся ў зямлю вашую, бо ГОСПАД не *дазволіў* мне ісьці з вамі» (верш 13, *курсіў аўтара*). Нягледзячы на тое, што ён паслухаўся Госпада, у яго словах чулася неахвота, асабліва ў словах «*не дазволіў*». Уявіце сабе: дачку-падлетка запрасіў на танцы вельмі папулярны малады чалавек, які, тым не менш, мае дрэнную рэпутацыю. Яна вельмі рада запрашэнню ад такога папулярнага хлопца і з энтузіязмам просіць у бацькі дазволу пайсці. З любові і клопату пра сваю дачку бацька мякка адмаўляе. Засмучаная дачка кажа маладому чалавеку: «Я не магу пайсці, мае бацькі не дазваляюць». Насамрэч яна кажа: мае бацькі сказалі «не», але я сказала б «так». Гэта яе бацькі адмовіліся даць ёй дазвол. Сама ж дачка жадае пайсці, і толькі слова бацькоў аддзяляе яе ад жаданага. На жаль, калі яна не прыме рашэнне бацькоў, то ў рэшце рэшт знойдзе спосаб быць разам з маладым чалавекам, і, хутчэй за ўсё, сутыкнецца з жудаснымі наступствамі.

Білеам — прарок, вельмі хцівы да грошай. Хцівасць гарэла ў яго сэрцы. Ён прагнуў лепшых рэчаў у жыцці, а таксама большага сацыяльнага ўплыву. Білеам падпарадкаваўся Богу, але неахвотна. Божае слова прыносіла абмежаванні, а не радасць, таму што не дазваляла дасягнуць таго, што ён сапраўды хацеў.

## У палоне ўласнага жадання

Старэйшыны Маава і Мадыяна вярнуліся да цара Балака і паведамілі: «Білеам адмаўляецца ісці з намі». Але гэта не

спыніла цара; ён неадкладна пасылае да Білеама людзей больш паважаных і больш высокага рангу з большай колькасцю грошай.

Чаму Балак так робіць? Я лічу, яго падштурхоўвалі дэманічныя сілы. Чаму так кажу? Біблія тлумачыць: «А кожны спакушаецца, захоплены і *прываблены ўласным пажаданьнем*» (Як. 1:14, *курсіў аўтара*). Звярніце ўвагу на дзве рэчы. Па-першае, словы «*ўласныя пажаданні*». Любое моцнае жаданне, што выступае супраць Божай волі, — гэта хцівасць, якая ёсць ідалапаклонствам. Па-другое, звярніце ўвагу на слова «*спакушаецца*». Справа ворага — спакушаць. Але паслухайце: вас нельга спакусіць тым, чаго вы не жадаеце. Калі вы прапануеце наркотык экстазі ў царкве, большасць людзей адмовіцца без ваганняў. Чаму? Яны не хочуць наркотык. Вас нельга спакусіць тым, чаго вы не жадаеце. Аднак вас могуць спакусіць жаданні, якія вы не паклалі пад крыж! Нас спакушаюць рэчы, якіх мы прагнем; ці, лепш сказаць, *моцна жадаем*.

Вораг ведаў: прарок любіць грошы і прызнанне, таму натхніў бязбожнага валадара зрабіць другую спробу і даслаць больш і аднаго, і другога. Царскія прадстаўнікі атрымалі паўнамоцтвы прапанаваць усё, што меў Балак, кажучы: «Усё, што скажаш мне, я зраблю». Вось гэта прапанова! Адна справа — атрымаць нешта ад суседа, многа ці мала; але зусім іншае — калі цар прапануе табе ўсё, чым валодае, асабліва калі маеш слабасць да таго, чаго ў валадара шмат. Тым не менш, паслухайце адказ Білеама:

> «Калі [нават] дасьць мне Балак поўны дом свой срэбра і золата, *не магу* (*у анг.перакл. – не мог бы – заўвага перакл.*) парушыць [слова] з вуснаў ГОСПАДА,

> Бога майго, каб зрабіць што малое, або вялікае» (Лк. 22:18, *курсіў аўтара*).

Большасць натхніцца паслухмянасцю Білеама. Але яшчэ раз звярніце ўвагу, як ён падбірае словы: *«не мог бы»*. Зноў слова Госпада абмяжоўвае Білеама ў тым, чаго ён на самай справе жадае. Прарок ведае тое, што ведае большасць людзей у царкве: нельга свядома не падпарадкоўвацца слову Госпада і быць дабраславёным. Таксама прарок ведае тое, што ведае прыкладна палова людзей у царкве: непаслухмяных чакае суд. Тым не менш, інфармацыі дастаткова, каб прывесці вас да праблем: раз немагчыма атрымаць жаданае па волі Бога, вы пашукаеце іншы спосаб, у межах «волі Бога», каб атрымаць тое, што хочацца. Для тлумачэння давайце разгледзім наступныя словы Білеама:

> А цяпер, прашу, застаньцеся таксама ў гэтую ноч, а я даведаюся, што зноў прамовіць да мяне ГОСПАД (Лк. 22:19).

Чуеце? «...што зноў прамовіць ГОСПАД». Няўжо прарок думае, што большая аплата зменіць меркаванне Бога? Няўжо думае, што Госпад забараніў у першы раз ісці з тымі людзьмі, бо хацеў, каб Білеам дачакаўся лепшай прапановы?

Навошта Білеаму зноў маліцца пра гэта? Вы бачыце, ён усё яшчэ спрабуе знайсці спосаб, каб атрымаць тое, што хоча? Яго гарачае жаданне пераўзыходзіць усе разумныя разважанні. Гэта нічым не адрозніваецца ад дзяўчынкі-падлетка, якая дакучае бацьку, пакуль не атрымае яго згоду на спатканне з папулярным хлопцам. Білеам упарты і не жадае выконваць Божае жаданне з радасцю, бо гэта супярэчыць яго хціваму сэрцу. Дакладней кажучы, «сэрцу

ідалапаклонніка». Пісанне пацвярджае: «Сваволя — як пакланенне ідалам» (1 Сам. 15:23). Паслухайце, што Бог адказаў Білеаму:

> І прыйшоў Бог да Білеама ўначы, і сказаў яму: «Калі прыйшлі гэтыя людзі паклікаць цябе, устань і ідзі з імі, але слова, якое Я прамоўлю да цябе, выканаеш» (Лк. 22:20).

Князі збіраліся паклікаць Білеама наступнай раніцай, таму што засталіся ночыць, спадзеючыся, што прарок вернецца з імі. Па сутнасці, Бог кажа: «Калі яны прыйдуць паклікаць цябе, ідзі з імі, але выканай слова, якое Я скажу табе». Дык, магчыма, мы памыліліся ў ацэнцы? Звярніце ўвагу, там не сказана: «І прыйшоў д’ябал да Білеама ўначы і сказаў: “Устань і ідзі з імі”», і не сказана: «І прыйшоў да Білеама ў тую ноч дух падману і сказаў...» Раней я жартаваў, але ў святле сказанага можа выглядаць так, быццам Бог прымусіў Білеама чакаць больш грошай, бо менавіта зараз Ён кажа «ідзі».

## Атрымаць тое, што хочам

Цяпер у Білеама ёсць слова Госпада, каб ісці. Прарок устае наступнай раніцай на досвітку, каб зрабіць, што напярэдадні ўвечары яму загадаў Госпад, і назіраць, што адбудзецца:

> І ўстаў Білеам раніцаю, і асядлаў асьліцу сваю і вырушыў разам з князямі Маавукавой. І *ўзгарэўся гнеў Бога, што ён паехаў* (Лк. 22:21–22, *курсіў аўтара*).

Пачакайце! Цяпер Госпад разгневаны, бо Білеам робіць тое, што напярэдадні ўвечары Бог сказаў зрабіць! Мы

ведаем, што Бог не шызафрэнік, дык як гэта растлумачыць? Адказ мы знаходзім у словах Бога да Эзэкіэля. Памятаеце, Госпад кажа, калі Яго народ прыходзіць да Яго з прагнасцю ў сэрцах: « Я, Госпад, дам Яму адказ у гэтай справе паводле ягоных прагных жаданняў».

Вось тое, што многія ў царкве не ведаюць і не разумеюць. Калі мы моцна чагосьці хочам, калі прагнем насуперак адкрытаму Богам жаданню, цалкам магчыма, што Бог дасць нам, нават калі гэта супраць Яго волі, і нават калі Ён ведае, што пазней нас чакае суд!

Вы будзеце шакаваныя, але падумайце пра Ізраіль, які хацеў валадара. Самуэль прадставіў іх просьбу Госпаду, і Бог даў ім зразумець: Ён не хоча, каб у іх быў валадар. Госпад сказаў Самуэлю, што валадар возьме лепшых сыноў, дачок, землі, вінаграднікі і гаі, а таксама абкладзе людзей падаткамі.

Самуэль перадаў словы Госпада народу. Прачытайце адказ: «І не хацеў народ слухаць голас *Самуэля*». Звярніце ўвагу, Біблія не кажа, што людзі адмовіліся слухаць голас Госпада. Зноў жа, як і ў выпадку з Майсеем, яны дыскваліфікавалі пасланца, захоўваючы *свой уласны вобраз Госпада*, каб мець тое, што хацелі. Сам-насам Бог суцешыў Самуэля: «…не ад цябе адварочваюцца яны, але ад Мяне» (гл. 1 Сам. 8).

У адказ Бог даў валадароў, нават выбраў іх, і першым быў Саўл. Як і было прадказана, валадары забралі лепшыя землі, сыноў і дачок і спагналі падаткі. Затым валадары, у рэшце рэшт, адвялі народ у бабілонскі палон. Бог даў ізраільцянам тое, што яны вельмі жадалі!

Уявіце сабе Ізраіль у пустыні. Людзі елі манну — найлепшую ежу, якую толькі еў чалавек. Ілля з’еў ўсяго дзве аладкі — і бег сорак дзён і начэй! Вось як насычае такая ежа!

Аднак Ізраіль стаміўся ад яе і прасіў мяса. Людзі прасілі

мяса ў Госпада, і мы чытаем, што Бог «даў ім тое, чаго хацелі» (Пс. 106:15). Зноў жа, быў дадзены станоўчы адказ на іх прагныя жаданні. Госпад выканаў іх цудоўным чынам:

> Ён рушыў вецер усходні ў небе і сілай Сваёю навёў вецер паўднёвы; і спаслаў дажджом на іх мяса, быццам пыл, і птушак крылатых — як пясок каля мора. І скінуў іх пасярод табару іхняга, навакол сялібаў іхніх (Пс. 78:26–28).

Ізраільцяне прасілі, і Бог даў ім гэта праз цуд («сілай Сваёю»). Ён прывёў у пустыню дастаткова перапёлак, каб накарміць тры мільёны чалавек! Які дзівосны цуд: перапёлкі не жывуць у пустыні! Больш за тое, у народа не было зброі і сабак! Які вялікі цуд! Але паглядзіце, што адбываецца:

> І елі яны, і насыціліся добра, і тое, што *яны жадалі*, Ён даў ім. Яшчэ не пазбавіліся яны жаданьня свайго, яшчэ спажыва іхняя была ў вуснах іхніх, як гнеў Божы ўзьняўся на іх, і забіў тлустых іхніх, і юнакоў Ізраіля паваліў (Пс. 78:29–31, *курсіў аўтара*).

Госпад цудоўным чынам задавальняе жаданне, але раней, чым ізраільцяне скончылі есці, на іх прыйшоў Божы суд. Ён адказаў ім паводле гарачага жадання іх сэрцаў.

Падумайце пра наступнае: малады чалавек сустракаецца з дзяўчынай. Яго бацькі занепакоеныя: «Сынок, нам непрыемныя гэтыя адносіны. Мы хочам, каб ты перастаў з ёй сустракацца». Моладзевы пастар падтрымлівае: «Я хачу паўтарыць словы тваіх бацькоў. Калі я малюся пра гэта, мне вельмі няёмка. Табе варта перастаць сустракацца з гэтай дзяўчынай». Але юнак у рэшце рэшт пярэчыць: «Я шмат маліўся, і Бог сказаў мне, што я магу

ажаніцца з ёй». Яны жэняцца, а пазней ён здзіўляецца, чаму іх праблемы такія невыносныя.

Уявіце сабе наступнае: мужчына кажа жонцы, што моліцца аб пэўнай працы. Жонка дзеліцца з ім: «Мне не падабаецца думка пра гэтую працу. Калі ты яе атрымаеш, то будзеш падарожнічаць больш за дзвесце дзён у год. Ты не зможаш хадзіць у царкву, хіба што раз на месяц, і будзеш прапускаць словы, якія Бог укладвае ў сэрца нашага пастара, не кажучы ўжо пра пакланенне і служэнне, якім ты займаешся...». Пастар мае падобныя думкі, але муж рашуча моліцца, пакуль не атрымае павышэння. Праз год ён задаецца пытаннем, як ён ён апынуўся ў гасцінічным нумары з незнаёмай жанчынай удалечыні ад сваёй сям'і?

Спіс бясконцы. Мы павінны ўсвядоміць: калі мы прагнем тое, што супярэчыць Божай волі для нас, Бог часта дае нам гэта; Яго адказ адпавядае ідалам, якія жывуць у нашым сэрцы. У рэшце рэшт, Ён робіць так, каб вярнуць нашы сэрцы.

> Я, ГОСПАД, адкажу яму адпаведна да ліку ідалаў ягоных, каб выявіць [намеры] сэрца дому Ізраіля, які адвярнуўся ад Мяне з прычыны ўсіх ідалаў сваіх (Эзэк. 14:4–5).

У іншым перакладзе гэта гучыць так: «Я зраблю гэта, каб вярнуць сэрцы народа Ізраіля». Госпад адчайна жадае вярнуць нас да Свайго сэрца. Памятайце, мы — Ягоныя, Ён прагне нас. Хоць Госпад хоча, каб ніхто не збіўся з шляху, Ён не будзе асаромлены. Яго сэрца належыць тым, хто цалкам аддаў Яму сваё. Па гэтай прычыне Бог імкнецца вызваліць нашы сэрцы з любой хцівасці, якая хаваецца ў іх, гэта значыць, з пакланення ідалам.

Калі марнатраўны сын папрасіў у бацькі спадчыну, ён прыйшоў як сын, не як чужынец ці слуга, а як адзін з сям’і. Відавочна, гэты сын не меў бацькавага сэрца, бо кіраваўся ўласнымі эгаістычнымі матывамі. Бацька не адмовіў у яго просьбе, хоць і ведаў, што сын пастуціць няправільна. Ён усё ж даў сыну вельмі вялікую суму грошай, і той у рэшце рэшт моцна пацярпеў, як і ведаў бацька. Добрая навіна ў тым, што сын урэшце апамятаўся і вярнуўся да бацькі. У гэтым уз’яднанні ён спазнаў сэрца бацькі, як ніколі раней.

Урэшце, Бог спадзяецца вярнуць кожнае дзіця, якое збілася са шляху праз недахоп святога страху. На жаль, як і ў выпадку з Білеамам, некаторыя так і не мяняюцца і не спазнаюць сэрца Госпада; калі вы прачытаеце астатнюю частку гісторыі пра Білеама, даведаецеся: ён рабіў далей прагныя справы, і ўрэшце быў асуджаны на меч.

Гэтае параўнанне пераносіцца і на Новы Запавет, дзе тыя, каму зараз не хапае святога страху, ставяцца ў адзін шэраг з народам Ізраіля, Каінам і Білеамам (усіх мы разгледзелі ў гэтым раздзеле). Мы чытаем папярэджанне:

> Я хачу нагадаць вам, якія аднойчы гэта даведаліся, што Госпад, вызваліўшы народ з зямлі Эгіпецкае, тых, што не паверылі, пасьля загубіў (Юды 5).

Далей Юда апісвае вернікаў Новага Запавету, якія вызнаюць Божую ласку, але вяртаюцца да жыцця хцівасці, пажадлівасці і непаслушэнства:

> Гора ім, бо яны пайшлі шляхам Каіна, паддаліся падману нагароды Білеама, і ва ўпартасьці загінулі, як Карах. Яны — небясьпека на вашых вячэрах любові; банкетуючы з вамі, пасуцца бяз страху (Юды 11–12).

Звярніце ўвагу: гэта небяспека здараецца на нашых вячэрах любові, якія сёння могуць значыць царкоўныя служэнні. Мы не павінны забываць, што Ісус прыходзіць за нявестай (Яго блізкай каханай), якая захавала сябе незаплямленай ад пажадлівасці свету. Але Юда кажа, што гэтыя вернікі, якія толькі называюць сябе вернікамі, банкетуюць з намі без страху. Яны жадаюць дабраславенняў і нават блізкасці да Госпада, але ім не хапае страху Божага. Яны падманутыя, і гэты падман будзе толькі расці, калі яны не вернуцца да сэрца Бога са святым страхам і любоўю.

## Папярэджваць і вучыць

Давайце паглядзім на гэта з другога боку. Аўтар Паслання да Гебраяў кажа: «Мы ж ня хісткія на загубу, але [стаім] у веры на здабыцьцё душы» (Гебр. 10:39). Я перакананы: прычына, па якой вы зараз чытаеце гэтую кнігу і жадаеце даследаваць сваё сэрца, заключаецца ў тым, што вы жадаеце не толькі хадзіць перад Богам, але дагаджаць Яму усім сэрцам у справах і праўдзе, а не толькі ў намерах і словах. Таму нам сказана:

> Так што, улюбёныя мае, як вы заўсёды слухаліся, ня толькі, калі я прыходзіў, але шмат больш цяпер, у адсутнасьць маю, са *страхам і трымценьнем* зьдзяйсьняйце збаўленьне сваё, бо Бог ёсьць Той, Які дзейнічае ў вас паводле ўпадабаньня [Свайго], каб вы і хацелі, і дзейнічалі (Флп. 2:12–13, *курсіў аўтара*).

Тыя, хто ходзіць у святым страху, будуць паслухмяныя, і калі адчуваюць Божую прысутнасць і калі яе не адчуваюць. Яны непахісныя, нават калі здаецца, што Бог пакінуў іх, чаго

Ён ніколі не зробіць! Госпад набліжаецца да тых, хто ходзіць у святым страху, і дае ім сілы не толькі хацець добрага, але і рабіць Яго дабро. Госпад заклікаў нас дамагацца збаўлення не з любоўю і радасцю, але са страхам і трымценнем. Зноў жа, страх перад Госпадам мае вырашальнае значэнне і выклікае безумоўную паслухмянасць у нашых сэрцах і дзеяннях.

Гэты раздзел складаны, аднак Павел кажа: каб прадставіць кожнага верніка дасканалым у Хрысце, мы павінны папярэджваць і вучыць (Кал. 1:28, у бел. перакл. – настаўляць і вучыць – заўв.перакл.). На першы погляд, папярэджанні не выглядаюць натхняльна, але ўрэшце ратуюць жыццё і прыносяць плён, калі да іх прыслухацца. Мне падабаецца чуць радасныя і аптымістычныя словы, але я таксама разумею, што многія будуць глядзець на святароў у Судны дзень і крычаць: «Чаму ты не папярэдзіў мяне?» Прапаведнікі будуць дрыжаць, калі абвяшчалі нованавернутым толькі прыязныя словы ці пасланні, і праз гэта засталіся з апырсканымі крывёю рукамі.

Я зрабіў такую заўвагу аднойчы на служэнні, і пасля да мяне падышоў раз’юшаны пастар: «Як ты смееш казаць, што руках пастара можа быць чыясьці кроў? Гэта ж старазапаветнае, а не Божая ласка». Я разгарнуў Біблію і паказаў словы Паўла:

> Дзеля гэтага сьведчу вам у сёньняшні дзень, што я чысты ад крыві ўсіх, бо не ўхіляўся абвяшчаць вам усю волю Божую. Дык сьцеражыце самі сябе і ўвесь статак, у якім Дух Сьвяты паставіў вас за епіскапаў пасьвіць царкву Божую, якую Ён здабыў уласнай крывёю (Дз. 20:26–28).

Я ніколі не забуду здзіўлены выраз яго твару, калі ён

прачытаў гэтыя словы. Пастар гадамі служыў у царкве і неаднаразова чытаў гэтыя вершы, але ў той дзень нібыта ўбачыў іх упершыню. Ён разважліва папрасіў прабачэння, і мы яшчэ некалькі хвілін пагаварылі пра важнасць таго, каб не трапіць у пастку аднабаковасці ў нашай пропаведзі, заўсёды падкрэсліваючы як станоўчае, так і адмоўнае. Мы павінны быць ураўнаважанымі і «папярэджваць», а таксама «настаўляць».

Ісус папярэджваў, што многія, у тым ліку выбраныя, могуць быць падманутыя; Ён сказаў, што падман будзе шырока распаўсюджаны. Нам трэба быць уважлівымі, дзе мы стаім, каб не ўпасці. Трэба набліжацца з сэрцам, поўным святога страху, а не з бесклапотным сэрцам, якое лёгка паддаецца падману. Наш любячы Айцец даў нам усё неабходнае для жыцця і пабожнасці. Ён даў нам ласку, праз нашага Госпада Ісуса, жыць паслухмяна Яго волі, і толькі праз гэты святы страх мы можам мець сапраўдную блізкасць з Богам!

## Пытанні для вывучэння

1. Аўтар сцвярджае, што «без страха перад Госпадам… няправільны вобраз фармуецца і ствараецца ў нашай уласнай душы ці нашым уяўленні». Гледзячы на вашу веру дагэтуль, ці можаце сказаць, што быў час, калі ваша ўяўленне пра Бога было няправільным? Калі так, то якім чынам быў скажоны вобраз Бога?

2. Аўтар адзначае: калі мы прагнем тое, што супярэчыць Божай волі адносна нас, Бог часта дае нам гэта. Шчыра паглядзіце на сваё малітоўнае жыццё: ці ёсць сярод вашых пастаянных просьбаў да Бога тое, што можна назваць хцівым жаданнем? Ці быў у вашым жыцці

выпадак, калі вы атрымалі тое, чаго горача жадалі, толькі каб потым пашкадаваць пра гэта?

3. У канцы першага раздзела гучала пытанне, што выклікала ваша жаданне прачытаць гэтую кнігу. Разважаючы пра тое, што вы атрымалі да гэтага часу, падумайце і пра тое, з якімі выклікамі вы сутыкнуліся? Якія змены вы пачынаеце бачыць у сваім уяўленні пра Бога і што значыць дагаджаць Яму на справе і ў праўдзе?

Раздзел 8

# САПРАЎДНАЕ ПАКЛАНЕННЕ

«Рэлігійнасць выкарыстоўвае Маё Слова
для выканання сваёй волі».

Калі вам не хапае страху перад Госпадам, вас чакае падман; калі ж вы сярод тых, хто набліжаецца да Яго ў святым страху, вас чакае блізкасць. Знешні доказ правільнай пазіцыі — безумоўная паслухмянасць Божым жаданням, калі мы не толькі падпарадкоўваемся і хочам выканаць Божую волю, але і выконваем яе. Такое часта назіраецца ў жыцці тых, хто хадзіў з Богам.

Сведчанне Эноха было ў тым, што ён дагадзіў Госпаду. Каб лепей зразумець, звернемся да працаў Клімента Рымскага, аднаго з першых айцоў царквы, спадарожніка апосталаў Пятра і Паўла.

Клімент пісаў: «Возьмем, напрыклад, Эноха, які, прызнаны

*праведным у паслухмянасці*, быў перaселены, і смерць не напаткала яго». Паслухмянасць Эноха — вось прычына Божай задаволенасці.

Ной –– наступны чалавек у Пісанні, які жыў у цесных адносінах з Богам. Адзін з перакладаў дае уяўленне пра яго жыццё:

> «Вось гісторыя Ноя і яго сям'і. Ной быў праведным чалавекам, адзіным беззаганным чалавекам, які жыў на зямлі ў той час. Ён *паслядоўна выконваў Божую волю* і меў блізкія адносіны з Ім» (Быц. 6:9, *курсіў аўтара*).

Як і ў выпадку Эноха, адметнай рысай жыцця Ноя было тое, што ён паслядоўна выконваў Божую волю. Іншымі словамі, быў паслухмяны Божым жаданням. Гэтыя героі — поўная супрацьлегласць Білеаму, які падпарадкоўваўся толькі дзеля клопату пра сябе. Ён разумеў, што нельга быць дабраславёным у відавочным непадпарадкаванні і што за такое ён будзе ўрэшце асуджаны. Білеам перакручваў Божае слова, бо шукаў у паслухмянасці ўласнай выгады, а не падпарадкоўваўся дзеля жадання выканаць волю Божую. Воля Госпада не была яго канчатковым жаданнем, а хутчэй законам.

Зусім не так было з Давідам. Пісанне сведчыць пра яго жыццё:

> І, адставіўшы яго, паставіў ім за валадара Давіда, пра якога і сказаў, сьведчачы: "Знайшоў Я Давіда, сына Есэя, мужа паводле сэрца Майго, які выканае ўсю волю Маю"» (Дз. 13:22).

Страх перад Госпадам — гэта калі мы не толькі

падпарадкоўваемся, але і цалкам выконваем Яго волю. Мы так імкнёмся выконваць Божыя жаданні, як быццам гэта нашы ўласныя. Мы прымаем жаданні Божага сэрца як свае. Вось сапраўдная паслухмянасць.

## Рэлігійны дух

Я ніколі не забуду, як падчас пакланення Госпаду Ён мякка прамовіў мне ў сэрца: «Джон, ты ведаеш, што такое рэлігійны дух?»

Калі Бог задае пытанне, Ён не шукае інфармацыі; хутчэй пытаецца толькі таму, што мы не ведаем, або каб пашырыць наша абмежаванае адкрыццё. Я пісаў і прапаведаваў пра паводзіны рэлігійнага чалавека, але мой адказ на пытанне быў: «Госпад, я не ведаю. Што такое рэлігійны дух?»

Затым Бог прамовіў да майго сэрца: «Рэлігійнасць выкарыстоўвае Маё Слова, каб выканаць сваю волю». Божыя словы глыбока адгукаліся ў маім сэрцы на працягу некалькіх дзён, пакуль я разважаў над многімі пытаннямі.

Менавіта так і рабіў Білеам: імкнуўся слухацца дзеля ўласнай карысці, а не для таго, каб выканаць глыбокае жаданне Бога. Таму анёл Гасподні сказаў яму: «*нядобрая* дарога [твая] перад табою» (Лк. 22:32, курсіў аўтара). У слоўніку Вэбстэра слова «*нядобры*» вызначаецца як «скажоны». Такім чынам, «*нядобры*» азначае скажэнне або перакручванне намеру Божага Слова і выкарыстанне яго ва ўласных інтарэсах.

## Сапраўднае пакланенне

Даследуючы жыццё Абрагама, Майсея, Ісуса Навіна, Давіда, Эстэр, Данііла і іншых людзей у Пісанні, якія мелі блізкія адносіны з Госпадам, вы знойдзеце нешта агульнае

ў іх жыцці. У аснове іх блізкасці з Богам ляжала шчырая паслухмянасць Яго жаданням. Божы заклік да кожнага чалавека, з якім Ён меў адносіны запавету да нараджэння Хрыста, быў такім:

> Бо просьбай прасіў Я бацькоў вашых ад дня, калі вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, аж да дня гэтага, ад раніцы ўмольваў іх, кажучы: “*Слухайце голас Мой*!” (Яр. 11:7, *курсіў аўтара*).

Госпад шкадаваў, што Яго народ не слухаецца Яго, а ідзе за дыктатам сваіх сэрцаў. Ізраільцяне не прымалі Яго сэрца; хутчэй, іх толькі стрымлівала тое, што Ён казаў. Як вынік, яны шукалі шляхоў для выканання сваіх жаданняў да тых уяўных межаў, якія Бог цярпеў бы, і таму не маглі мець блізкіх адносін з Ім. Для блізкасці з Богам абсалютна неабходная ідэальная паслухмянасць. У Новым Запавеце Ісус кажа нам:

> Але прыходзіць час, і ён ужо прыйшоў, калі сапраўдныя паклоньнікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе, бо гэткіх паклоньнікаў Айцец *шукае* Сабе. Бог ёсьць Дух, і тыя, якія пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і праўдзе» (Ян 4:23–24*, курсіў аўтара).*

У гэтых сказах так шмат думак. Па-першае, звярніце ўвагу, што Айцец шукае такіх паклоннікаў. Успомніце папярэдні раздзел, калі мы абмяркоўвалі, як моцна Ён прагне нашай любові і імкнецца да адносінаў з намі. Зноў жа, словы Ісуса падкрэсліваюць гэта.

Па-другое, Ён шукае тых, хто будзе пакланяцца Яму ў духу і праўдзе. Давайце абмяркуем пакланенне. Я ніколі не забуду момант, калі я чытаў Біблію і Святы Дух усклікнуў у

маім сэрцы: «Пакланенне — гэта не павольныя спевы!» Гэта адразу прыцягнула маю ўвагу.

Многія ўспрымаюць пакланенне менавіта як павольныя спевы. Разгледзім парадак тыповага служэння ў евангельскай царкве: мы прыходзім на служэнне і пачынаем з хвалы, потым ідзе пакланенне, далей аб'явы, ахвяраванні, казань і, нарэшце, заклік да малітвы каля алтара. Традыцыйныя цэрквы друкавалі парадак набажэнства, а мы, евангелісты, проста запомнілі свой парадак, хоць і хвалімся, што кіруемся Духам і маем свабоду. Што да пакланення, розніцу ведае кожны: хвала — гэта хуткія спевы, а пакланенне — павольныя. Даволі пацешна: мы вызваліліся ад гімнаў толькі для таго, каб быць прывязанымі да праектараў і вялікага экрана. Такім чынам, калі сказаць «*пакланенне*», большасць вернікаў адразу падумае пра павольныя песні на кампакт-дыску, у музычным відэакліпе або на служэнні.

Калі Госпад так сказаў, я адразу адсунуў Біблію і сказаў: «Госпад, я не ведаю, што такое пакланенне. Калі ласка, скажы мне, што гэта».

Тады Ён цвёрда сказаў: «Гэта жыццё!»

І адразу Бог прывёў прыклад. Ён сказаў: «Сынок, падумай вось пра што: ты ўстаеш раніцай, і Лізе патрэбна дапамога з падрыхтоўкай дзяцей да школы. Але ты кажаш, што занадта заняты. Крыху пазней раніцай ёй зноў патрэбна дапамога, і ты адказваеш тым жа. Потым яна пытаецца, ці можаш ты дапамагчы ёй прыгатаваць абед, але ты зноў гаворыш пра занятасць. Пасля абеду яна пытаецца, ці можаш ты забраць дзяцей са школы, але зноў атрымлівае ад цябе той самы адказ. Потым яна просіць дапамогі з вячэрай і прыборкай са стала; і зноў атрымлівае той самы адказ, што ты занадта заняты».

Госпад казаў далей: «Увечары, як дзеці пайшлі спаць, ты хочаш ад яе сэксу. Таму ты звяртаешся да яе з пяшчотнымі словамі: «Дарагая, я так цябе кахаю».

Потым Бог спытаў: «Як Ліза адрэагуе на твае словы пра каханне і пошук сэксуальнай блізкасці?»

«Напэўна, скажа: “Адчапіся, Джон!”»

«Ты маеш рацыю, а чаму так?», — спытаўся Госпад.

«Таму што блізкія стасункі пачынаюцца раніцай і дасягаюць кульмінацыі ўвечары сэксуальнымі адносінамі», — сказаў я.

Разважаючы далей, я зразумеў: у такім выпадку маё прызнанне ў каханні да жонкі было б толькі на словах, а не на справах і ў праўдзе. Муж, які пастаянна так ставіцца да жонкі, падманвае сябе.

Тады Госпад сказаў мне: «Сыне, у мяне шмат дзяцей, чыёй увагі Я шукаю ўвесь тыдзень, але яны ігнаруюць Мяне. Я спрабую заклікаць іх паслужыць суседу, але яны не слухаюць альбо адмаўляюцца, бо занятыя ці хочуць добра прабавіць час. Яны не слухаюць Мяне, калі Я прашу зрабіць ахвяраванне; паслужыць у царкве альбо ў супольнасці; паслужыць членам сям’і… Потым яны прыходзяць на служэнне, чакаюць ад Мяне *дабраславенняў* і спяваюць ціхія песні пра любоў да Мяне, называючы гэта пакланеннем. Але гэта не пакланенне! Гэта павольны спеў!»

Я быў шакаваны. Я зразумеў: у мяне скажонае ўяўленне пра пакланенне. Пазней я выявіў нешта дзіўнае, чаго раней не заўважаў. Дазвольце спытацца: дзе вы ўпершыню знаходзіце слова «*пакланенне*» ў Бібліі? Гэтае пытанне важнае, бо пры напісанні кнігі, калі вы ўводзіце новы тэрмін, не знаёмы большасці чытачоў, трэба альбо даць азначэнне тэрміна; або прапанаваць прыклад, які ілюструе значэнне;

або выкарыстоўваць слова такім чынам, каб паказаць яго значэнне. Упершыню слова «*пакланенне*» сустракаецца ў 22-м раздзеле кнігі Быццё:

> І сказаў Абрагам юнакам сваім: «Застаньцеся тут з аслом, а мы з хлопцам пойдзем аж туды, і *паклонімся*, і вернемся да вас» (Быц. 22:5, *курсіў аўтара*).

Абрагам не ішоў спяваць павольную песню з Ісаакам. Ён ішоў туды, каб аддаць на смерць найкаштоўнейшае ў жыцці проста таму, што Бог папрасіў так зрабіць! Такім чынам, як бачыце, пакланенне — гэта *жыццё ў паслухмянасці*. Становіцца зразумела, чаму Бог палка звяртаецца да народа, які спяваў Яму песні:

> Прыбяры ад Мяне голас сьпеваў тваіх, і гуку гусьляў тваіх Я ня буду слухаць. Але няхай суд цячэ, як вада, і праведнасьць — як магутны ручай (Ам. 5:23–24).

Я быў на столькіх служэннях, дзе музыка гучала сучасна і прыгожа, але яўнай прысутнасці Госпада не было. У такіх сітуацыях я спачатку старанна даследую сваё сэрца, пытаючыся ў Святога Духа: «Я пакрыўдзіў Цябе ці зграшыў?» Часцей за ўсё ў глыбіні майго сэрца ёсць упэўненасць, што я гэтага не зрабіў, таму я ведаю, што перашкода ў людзях. Тады я з упэўненасцю прапаведую пра страх перад Госпадам і паслухмянасць. У такой атмасферы амаль кожны раз я бачу, як больш за палову людзей адгукаюцца на заклік да пакаяння ў канцы казані. Калі я прыходжу на наступнае служэнне з тымі ж спевамі пакланення і той жа групай, амаль кожны раз цудоўна з’яўляецца прысутнасць Бога. Чаму так? Сапраўднае пакланенне — гэта жыццё ў паслухмянасці, і з гэтага жыцця

нараджаюцца спевы пакланення, якія радуюць сэрца Бога, а не адштурхоўваюць Яго, як у вершах з кнігі Амоса. Гэта нічым не адрозніваецца ад сэксуальнай блізкасці з жонкай пасля дня любові, а не ігнаравання.

## Пакланенне ў праўдзе

Ісус кажа нам, што Айцец шукае тых, хто будзе пакланяцца Яму ў духу і праўдзе. У наступных раздзелах мы падрабязна разгледзім аспект пакланення Богу ў *духу*. Давайце цяпер абмяркуем пакланенне Богу ў *праўдзе*. Грэчаскае слова, якое азначае праўда, — *алетэя (aletheia)*. Вайн дае слову наступнае азначэнне: «Рэальнасць, якая ляжыць у аснове знешнасці; праяўленая, сапраўдная сутнасць рэчы».

Мне падабаецца такое азначэнне: яно цудоўна падкрэслівае тое, што кажа Ісус. Госпад паказвае, што сапраўднае пакланенне ляжыць у глыбіні чалавека, у сэрцы. Каб растлумачыць, я назаву і дам азначэнні трох ўзроўняў камунікацыі.

Першы — самы нізкі узровень, вусная камунікацыя. Ісус гаворыць пра гэта на прыкладзе бацькі, які папрасіў двух сыноў працаваць у вінаградніку (Мц. 21:28–31). Адзін сын адказаў: «Вядома, тата», але не пайшоў. Другі сын адказаў: «Не пайду», але пайшоў. Затым Ісус растлумачыў: волю бацькі выканаў той, хто спачатку адмовіўся, а не той, хто сказаў «так». Такім чынам, дзеянні — гэта больш высокая форма камунікацыі, чым словы.

Якуб таксама паказвае, што вусная камунікацыя — гэта самы нізкі ўзровень, кажучы: «Калі брат ці сястра ня маюць адзеньня і не хапае ім ежы на дзень, а нехта з вас скажа ім: «Ідзіце ў супакоі, грэйцеся і насычайцеся», але ня дасьць ім

патрэбнага для цела, якая карысьць?» (Як. 2:15–16). Апостал Ян пацвярджае гэтую ісціну: «А хто мае маёмасьць у сьвеце, і бачыць брата свайго ў патрэбе, і зачыняе ад яго нутро сваё, дык як любоў Божая застаецца ў ім?» (1 Ян 3:17).

Гэта можна назіраць у безлічы прыкладаў. Адзін з іх — мужчына, які кажа жонцы, што кахае яе, але ніколі не праводзіць з ёй часу; або жанчына, якая кажа мужу пра павагу, але не слухае яго просьбы не перавышаць ліміт па крэдытных картах. Думаю, вы ведаеце: спіс бясконцы. Ян працягвае ў сваім пасланні:

> Дзеткі мае! Будзем любіць ня словам ці языком, але ўчынкам і праўдаю! (1 Ян 3:18)

У пашыраным перакладзе Бібліі напісана: «Дзеткі, будзем любіць не толькі словам, але і справай і праўдай». Мы павінны любіць словамі, калі ж справы і праўда не пацвярджаюць нашы словы, гэта крывадушша. Звярніце ўвагу, што Ян кажа «справа і праўда». Гэта апісвае два вышэйшыя ўзроўні камунікацыі.

Наступны ўзровень — *справа* або дзеянне; аднак гэта не найвышэйшы ўзровень камунікацыі, і ён лёгка ўводзіць у зман, бо дзеянні могуць супярэчыць праўдзе. Напрыклад, Павел кажа: «І калі я раздам усю маёмасьць маю, і аддам цела маё на спаленьне, а любові ня маю, няма мне ніякае карысьці» (1 Кар. 13:3). Дзеянні, апісаныя ў вершы, здаюцца найвышэйшым узроўнем любові, аднак Павел кажа: мы можам здзяйсняць, здавалася б, слаўныя справы без любові да Бога.

Вось мы і прыйшлі да найвышэйшага ўзроўню камунікацыі — *сэрца*. Гэта аснова чалавека. Гэта той узровень, які і Ян, і Ісус называлі праўдай. Думкі і намеры сэрца раскрываюць

праўду нашага пакланення, але іх нельга распазнаць па-за Словам Божым. Нам сказана старанна ахоўваць сэрца, бо з яго — крыніцы жыцця. Калі мы яго занядбаем, нас лёгка падмануць. Сэрца, пакінутае само сабе па-за радай Божага Слова і Яго Духа, вельмі падманлівае.

Бог абвяшчае Свайму народу: «Калі вы *скарыцеся* (у анг. перакл. – *гатовыя*, заўв. перакл.) і будзеце слухаць Мяне, будзеце спажываць даброцьці зямлі» (Іс. 1:19, *курсіў аўтара*). Звярніце ўвагу, Бог не кажа проста пра паслухмянасць, а хутчэй пра *гатоўнасць* і паслухмянасць. Гатоўнасць мае дачыненне да настрою сэрца. Я магу папрасіць сына нешта зрабіць, і ён можа адразу паслухацца і выглядаць пакорным, але ўвесь час наракаць у сэрцы. Вось рэальнасць: сын не паслухмяны ў праўдзе, а хутчэй, удае паслухмянасць. Ян кажа, што мы павінны любіць Бога і чалавецтва ўчынкам і праўдаю на ўзроўні сэрца: «І з гэтага даведаемся, што мы ад праўды, і супакоім перад Ім сэрцы нашыя» (1 Ян 3:19).

Я ніколі не забуду момант, калі Бог паказаў мне гэта. Я вельмі стараўся ўстрымлівацца ад любых скаргаў. Я зразумеў: скаргі — абраза Божага характару, бо яны кажуць Богу: «Мне не падабаецца, што Ты робіш, і на Тваім месцы я зрабіў бы інакш». Гэта адсутнасць святога страху, і Бог ненавідзіць такое стаўленне. Менавіта яно не дало народу Ізраіля ўвайсці ў Абяцаную зямлю. Таму я даволі доўга не скардзіўся. Але аднойчы раніцай, прачнуўшыся, я пачуў, як Святы Дух цвёрда сказаў: «Я чую скаргі твайго сэрца!» Я, прыгнечаны, быў у шоку, разумеючы, наколькі падмануўся ў сваёй ганарлівасці. Маё пакланенне Богу не было ў праўдзе, і спатрэбілася святло Яго Слова, каб выкрыць памылку майго сэрца. Я хутка пакаяўся і адчуваю палёгку, што з таго часу Госпад болей

мяне так не выпраўляў. Дзякуй Богу за Яго ласку!

У святле прыклада, паглядзім зноў на азначэнне слова «праўда» ў слоўніку Вайна. Там сказана: праўда азначае рэальнасць, што ляжыць у аснове знешнасці; праяўленую, сапраўдную сутнасць рэчы. Мы можам лёгка адысці ад праўды. Прывяду прыклад. Мы можам маліцца і спяваць Госпаду, але ніводнае слова не ідзе з нашага сэрца. Увесь час, пакуль мы спяваем, мы думаем пра тое, што мы галодныя, як дзеці сварыліся раніцай, які выдатны дзень мы запланавалі пасля служэння і гэтак далей. Мы можам маліцца і казаць: «Госпад, я так удзячны Табе». Аднак ўжо некалькі дзён скардзімся на складаную сітуацыю, у якой знаходзімся. Мы сапраўды ўдзячныя ці, глыбока ў сэрцы, вінавацім Госпада, што Ён зрабіў усё не так, як, на нашу думку, мусіў зрабіць? О, спіс бясконцы!

Пакланяцца Богу ў праўдзе — гэта не толькі Яго слухацца, але і радавацца таму, што Ён папрасіў вас зрабіць. Гэта значыць гаварыць Яму тое, што ў вашым сэрцы, а не толькі «правільныя» словы. Гэта значыць не быць двудушным перад Богам. Мне падабаюцца словы Давіда, калі ён кажа:

> На Яго спадзявайся ў кожны час, народзе! *Вылівайце перад абліччам Ягоным сэрцы вашыя*, бо Бог — прыстанішча нашае (Пс. 62:9, *курсіў аўтара*).

Я выявіў: калі я максімальна шчыры з Госпадам, Ён набліжаецца да мяне. Калі я нешта хаваю, гэта перашкаджае мне, і я не магу нічога зрабіць у малітве; яна становіцца змаганнем, бо я не магу адчуць Госпада. Ён шукае тых, хто набліжаецца ў чысціні сэрца, а не ўдае чысціню. Часам, назіраючы за людзьмі на служэннях, якія кажуць: «Дзякуй

Табе, Ісусе... Алілуя... слава Богу», я задумваюся: яны проста паўтараюць «хрысціянскі жаргон» або гавораць з глыбіні сэрца? Такія паводзіны нічым не адрозніваюцца ад паводзінаў мужа, каторы, каб супакоіць жонку, непераканаўча паўтарае: «Я кахаю цябе, дарагая». Зусім па-іншаму, з глыбокімі пачуццямі, тыя самыя словы гучалі падчас заручынаў.

З жыцця сапраўднага пакланення, з паслухмянасці, што ідзе з самай глыбіні сэрца, пальюцца спевы пакланення. У целе Хрыстовым ёсць мужчыны і жанчыны, якія маюць дар ствараць спевы хвалы і пакланення. Яны — сучасныя псалмісты. Адны вядуць жыццё сапраўднага пакланення, а іншыя — свецкія і пачуццёвыя. Апаганеныя светам усё яшчэ могуць ствараць цудоўныя песні дзякуючы свайму дару, але ім не хапае святой прысутнасці Госпада падчас спеваў; у той час як чыстыя нясуць слаўную прысутнасць Бога, служачы Яму і Яго народу з глыбіні сэрца.

## Абяцанне Ісуса з’явіць Сябе

Пакланяцца Богу ў праўдзе — гэта пакланяцца Яму ў чысціні сэрцаў. Гэта значыць баяцца і шанаваць Яго ў самым прамым сэнсе. Псалміст кажа:

> Шчасьлівы народ, які ведае трубны голас Твой. ГОСПАДЗЕ, яны ходзяць у сьвятле аблічча Твайго! (Пс. 89:15)

Бог шукае тых, хто пачуе Яго заклік да жыцця пакланення. Тыя, хто слухае, — гэта тыя, хто будзе хадзіць у Яго прысутнасці. Яны будуць ведаць Яго блізка, бо Ён з’явіць Сябе ім. Ісус кажа так:

> Яшчэ трохі, і сьвет ужо ня ўбачыць Мяне, а вы ўбачыце Мяне, бо Я жыву, і вы жыць будзеце. У той дзень даведаецеся, што Я ў Айцу Маім, і вы ў-ва Мне, і Я ў вас. Хто мае прыказаньні Мае і захоўвае іх, той любіць Мяне, а таго, хто любіць Мяне, будзе любіць Айцец Мой, і Я палюблю яго, і *зьяўлю яму Сябе*» (Ян 14:19–21, *курсіў аўтара*).

Той, хто мае Яго прыказанні і выконвае іх, — гэта той, хто пакланяецца Богу ў праўдзе, і Ён абяцаў, што такі чалавек убачыць Яго. Прыгадайце: «*з’явіць*» азначае вывесці з царства нябачнага ў бачнае; з невядомага ў вядомае. У Новым Амерыканскім перакладзе Біблії словы Ісуса гучаць так: «Я палюблю яго і адкрыю яму Сябе». У пашыраным перакладзе Біблії вершы запісаны наступным чынам:

> Яшчэ крыху, і свет ужо не ўбачыць Мяне, але вы ўбачыце Мяне... Хто Мае прыказанні захоўвае і выконвае іх, — гэта той, хто [сапраўды] любіць Мяне; а хто [сапраўды] любіць Мяне, таго палюбіць Мой Айцец, і Я [таксама] палюблю яго і яму пакажу (адкрыю, з’яўлю) Сябе. *[Я] дам яму Сябе выразна ўбачыць і зраблю Сябе сапраўдным для яго]* (Ян 14:19, 21, *курсіў аўтара*).

Толькі тыя, што пакланяюцца Ісусу ў праўдзе, *сапраўды* ведаюць Яго. Ён адкрывае Сябе ім, бо яны Яго блізкія сябры. Гэта шакавала апосталаў, таму адзін з іх сказаў:

> Кажа Яму Юда, не Іскарыёт: «Госпадзе! Што сталася, што Ты маеш зьявіць Сябе нам, а ня сьвету?» Адказаў Ісус і сказаў яму: «Хто любіць Мяне, той захоўвае слова Маё; і Айцец Мой палюбіць яго; і Мы прыйдзем

> да яго і зробім жытло ў яго. Хто ня любіць Мяне, не захоўвае словаў Маіх, а слова, якое вы чуеце, ня ёсьць Маё, але Айца, Які паслаў Мяне (Ян 14:22–24 AMP, *курсіў аўтара*).

Такім чынам, можна заўважыць: усё зводзіцца да паслухмянасці. Успомніце, што Бог сказаў ў маё сэрца: «Пакланенне — гэта жыццё ў паслухмянасці жаданням Божага сэрца». Калі мы сапраўды любім Яго, тады Ён прыходзіць да нас і не проста наведвае, а пасяляецца ў нас, і так адкрывае Сябе.

Ёсць шмат людзей, якія маюць дары ад Духа Божага, але яны не захоўваюць словы Настаўніка ўсім сэрцам. Такіх людзей лягчэй за ўсё падмануць. І вось прычына: прысутнасць Госпада будзе ў пэўнай ступені адчувацца ў іх дары пропаведзі, спеваў, малітвы ці іншай формы служэння. Яны нічым не адрозніваюцца ад Білеама, вельмі адоранага ў прароцтве. Прарок адчуваў прысутнасць Госпада кожны раз, калі выкарыстоўваў гэты дар, аднак Білеам быў далёкі ад сэрца Бога.

Падман у тым, што такія вернікі лічаць, што прысутнасць Госпада, якая дзейнічае на іх у служэнні, — гэта Божае ўхваленне іх ладу жыцця, і памылкова прымаюць такую прысутнасць за блізкасць з Богам. Такое стаўленне мала чым адрозніваецца ад добрага чалавека, які наняў кагосьці працаваць. Працаўнік можа памылкова думаць, што яго штодзённае знаходжанне побач з працадаўцам азначае блізкія адносіны з ім. Як вы ведаеце, такая пазіцыя няправільная. Ісус кажа: многія, што сцвярджаюць Яго веданне, застануцца звонку… стукаццца ў дзьверы, кажучы:

> “Госпадзе! Госпадзе! Адчыні нам!” І Ён *[Госпад]*, адказваючы, скажа вам: “Ня ведаю вас *[блізка]*, адкуль

> вы". Тады пачняцё гаварыць: "Мы елі і пілі *перад Табою*, і на вуліцах нашых навучаў Ты". І Ён скажа: "Кажу вам, Я ня ведаю вас, адкуль вы; адыйдзіце ад Мяне ўсе, якія робяць няправеднасьць" (Лк. 13:25–27, *курсіў аўтара*).

Калі прачытаць гэта разам са словамі Мацвея (Мц. 7:21–23), можна заўважыць: тыя, хто казаў гэта, рабілі цуды ў імя Ісуса. Яны былі адораныя, але палічылі прысутнасць Госпада, якая суправаджала адоранасць, роўнай Яго прысутнасці або блізкасці. Вы бачыце, як шакаваны тыя, што сцвярджалі, што ведае Госпада, але іх выгналі з Яго прысутнасці. Вельмі важна разумець: ёсць розніца паміж пастаяннай Божай прысутнасцю і Божай прысутнасцю, якая суправаджае служэнне.

Паглядзіце на адказ Ісуса Юдзе (не Іскарыёту) у вершы вышэй, дзе гаворыцца, што Ісус зробіць Сваё жытло ў тых, хто пакланяецца Яму ў праўдзе. Гэта выдатна, бо сведчыць пра Яго пастаянную прысутнасць. Мне падабаюцца словы, якія выкарыстоўвае Госпад: *дом, жытло, асаблівае жытло*. Словы выдатна паказваюць розніцу паміж святымі Старога і Новага Запаветаў. Святыя Старога Запавету не мелі прывілею стаць месцам пражывання Бога. Месцам пражывання Бога было Святое Святых у Сялібе або храме. Тым не менш, відочна паралель: у часы Гэлія Божая прысутнасць у Сялібе здаралася рэдка праз тое, што ён і народ імкнуліся задаволіць уласныя, а не Божыя жаданні. Тым не менш, Божая прысутнасць была моцнай у тыя дні, калі народ старанна слухаўся Бога.

Сёння сітуацыя такая самая. Вернікі, якія пакланяюцца Госпаду ў духу і праўдзе, слухаючыся Яго з імпэтам, — гэта тыя, што адчуваюць Яго нязменную прысутнасць. Такім вернікам Госпад адкрывае Сябе. О, якая цудоўная супольнасць нас чакае! Як можна верніку заігрываць з

непаслухмянасцю або светам, калі нас чакае такі скарб?

Бог абяцаў зрабіць Свой дом, жытло, асаблівае месца пражывання з намі, і тым самым Ён праявіць або адкрые, Які Ён ёсць на самай справе. Вось гэта задума! Якое цудоўнае абяцанне! І яно датычыцца не толькі будучыні, але і цяперашняга моманту! Адзін з маіх улюбёных урыўкаў з Бібліі кажа: слаўны Валадар жадае «з'явіць Сябе» нам, даць ведаць Сябе асабіста. У наступных раздзелах мы даследуем, як Госпад гэта робіць. А зараз абмяркуем яшчэ адну важную і неабходную цноту, якую Ён шукае ў тых, з кім Ён пасяліўся.

## Пытанні для вывучэння

1. Разглядаючы ў Пісанні жыццё Эноха, Ноя, Абрагама, Майсея, Давіда, Эстэр, Данііла ды іншых, вы выявіце: агульным у іх жыцці была шчырая паслухмянасць Божым, а не ўласным жаданням. Што адбудзецца ў вашым жыцці, калі вы сёння станеце такімі ж паслухмяным?
2. Чытаючы жартаўлівыя словы аўтара: «Хвала — гэта хуткія спевы, пакланенне — павольныя», ці пазналі сябе ў такой ацэнцы? Урэшце адносна пакланення аўтар атрымаў ад Госпада наступную думку: «Пакланенне — гэта жыццё». Якія змены неабходныя ў вашым жыцці адпаведна гэтым словам?
3. Разважаючы над словамі Ісуса ў Евангеллі паводле Лукі 13:25–27 і ў Евангеллі паводле Мацвея 7:21–23, як можна акрэсліць розніцу паміж пастаяннай Божай прысутнасцю і Божай прысутнасцю, якая суправаджае служэнне?

Раздзел 9

# З КІМ ЖЫВЕ БОГ

Магутныя блізняты Валадарства — гэта *страх перад Госпадам* і *пакора*.

У гэтым раздзеле мы разгледзім яшчэ адзін важны элемент набліжэння да Таго, хто так шчыра жадае стасункаў з намі. Наш асноўны ўрывак з Пісання заклікае:

> І дзеля гэтага кажа: «Бог пыхлівым працівіцца, а *пакорным* ласку дае»… Набліжцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас… *Панізьцеся* перад Госпадам, і Ён узвысіць вас (Як. 4:6–10, *курсіў аўтара*).

Крык Божага сэрца знаходзіцца паміж двума заклікамі да пакоры; і нездарма, бо Бог кажа:

> Бо гэта кажа Высокі і Узьнесены, Які жыве вечна, і Сьвятое імя Ягонае: «Я жыву на *вышынях* і ў сьвятасьці,

і [Я жыву] з тым, хто зламаны і *спакораны* духам, каб ажывіць дух *пакорных* (Іс. 57:15, *курсіў аўтара*).

Якуб кажа: калі мы ўпакорымся перад Богам, Ён узвысіць нас. Куды? Бог адказвае праз прарока Ісаю: на вышыні і ў святасць! Госпад шукае людзей, каб не проста іх наведваць, а стварыць у іх жытло. Якуб заклікае нас не проста сустракацца з Богам, а заахвочвае нас пастаянна знаходзіцца ў Божай прысутнасці, і, як кажа Ісая, гэта дасяжна толькі для пакорлівых.

## Наша няведанне пакоры

Многія ў целе Хрыстовым не разумеюць, што такое пакора і ў чым яе сіла. Часта для вернікаў пакора — гэта слабасць, кволасць, бесхрыбетнасць ці нават рэлігійнасць. Здараецца, пакорных памылкова прымаюць за ганарліўцаў! Уявіце сабе Давіда, што па просьбе бацькі наведвае старэйшых братоў, якія змагаюцца з філістымцамі. Ён прыходзіць і заўважае войска, у тым ліку і братоў, у дзіўнай баявой пазіцыі: яны хаваюцца за скаламі, баючыся волата Галіяфа. Давід даведваецца, што так працягваецца ўжо сорак дзён. Пасля пытаецца ў людзей не самым скораным голасам: «Хто ён, гэты неабрэзаны Філістынец, што так насьміхаецца з войска Бога Жывога?» (1 Сам. 17:26).

Пытанне раз’юшыла яго старэйшага брата Эліява. Хутчэй за ўсё, той думае: «*Мой малодшы брат не толькі нахабны, але і самаўпэўнены*». Таму Эліяў, у сваю чаргу, рэзка адказвае Давіду: «Я ведаю *пыху тваю* і ліхоту сэрца твайго» (1 Сам. 17:28, *курсіў аўтара*). У іншым перакладзе словы гучаць так: «Я ведаю, які ты *самаўпэўнены*».

Пачакайце, хто тут самаўпэўнены? Усяго раздзелам

раней прарок Самуэль прыйшоў у дом Есэя, каб памазаць наступнага валадара, але Бог абраў не першынца Эліява. І Есэй, і Самуэль меркавалі, што валадаром будзе Эліяў, бо той, верагодна, быў самым высокім, самым моцным і самым разумным з сыноў Есэя, але Бог цвёрда сказаў: «Я яго адкінуў» (1 Цар. 16:7). Ёсць толькі адна прычына, па якой Бог адкідае чалавека, — ганарлівасць, пыха. Пыха, у якой Эліяў абвінавачваў Давіда, была у сэрцы Эліява. Бог хваліўся пакорай Давіда, кажучы, што той быў чалавекам паводле Божага сэрца (Дз. 13:22). Давід не быў увасабленнем слабасці, кволасці або бесхрыбетнасці.

Давід адмахваецца ад гэтых словаў і сустракае волата з вялікай ўпэўненасцю, даючы яму зразумець, што той вось-вось страціць галаву. Далей Давід кіруецца да варожага лагера, забівае Галіяфа і адсякае яму галаву.

Дазвольце яшчэ раз даказаць, як часта мы сапраўды не разумеем пакоры. Кніга Лікаў, адна з першых пяці кніг Бібліі, належыць да *Пяцікніжжа*. У гэтай кнізе мы чытаем:

> А Майсей быў чалавекам пакорным, больш за ўсіх людзей, якія на зямлі (Лк. 12:3).

Ого, якое сцвярджэнне! Калі шчыра, мы хочам, каб пра нас так сказалі, але мы не адважыліся б так сказаць пра сябе! Чаму? Толькі пыхлівы чалавек скажа такое пра самога сябе. Але хто напісаў кнігу Лікаў? Адказ: Майсей! Ого!

Мы ніколі не лічым пакорным чалавека, які сам называе сябе пакорным, не кажучы ўжо пра тое, каб назвацца самым пакорным на зямлі! Уявіце святара, які пачынае канферэнцыю словамі: «Я пакорны, дазвольце расказаць

вам пра гэта». Яго высмеюць, назавуць ерэтыкам. Аднак паслухайце, што кажа Ісус:

> «Прыйдзіце да Мяне ўсе спрацаваныя і абцяжараныя,… і *навучыцеся ад Мяне*, бо Я — ціхі і *пакорнага* сэрца, і знойдзеце супачынак душам вашым» (Мц. 11:28–29, *курсіў аўтара*).

Па сутнасці, мы не разумеем сапраўднага сэнсу пакоры, калі думаем: пакора азначае ніколі не гаварыць пра сябе і жыць, як нявартыя чарвякі. Аднак такое разуменне вельмі далёкае ад праўды.

## Азначэнне пакоры

Пакора мае тры аспекты. Па-першае, наша паслухмянасць Богу; па-другое, наша поўная залежнасць ад Яго; і, па-трэцяе, наша ўяўленне пра сябе. Давайце коратка разгледзім кожны.

Па-першае, наша паслухмянасць. Адразу пасля словаў пра пакору Якуб дадае: «Дык падпарадкуйцеся Богу» (4:7). Гэта звязвае паслухмянасць і пакору. Госпад заўсёды дае Свайму народу абяцанні і адкрывае Свае планы. «Бо Я ведаю намеры, якія Я маю адносна вас, кажа ГОСПАД, намеры супакою, а ня гора, каб даць вам будучыню і надзею» (Яр. 29:11). Гэтыя абяцанні — Яго воля, і яны малююць у нас прароцкую карціну таго, куды мы павінны ісці. Мы шчыра жадаем іх выканаць, бо менавіта Бог укладвае такія жаданні ў нашы сэрцы (гл. Пс. 37:4). Наша сэрца разумее, куды Госпад нас вядзе, і гэта разуменне вызначае лагічны шлях, якім трэба ісці. Аднак даволі часта Бог вядзе нас у напрамках, якія здаюцца цалкам нелагічнымі. Сапраўдная пакора прызнае Божую мудрасць і кіраўніцтва вышэйшымі за нашы ўласныя

і вырашае слухацца, нават калі мы не ўсё разумеем. У Прыповесцях 3:5 гаворыцца: «Спадзявайся на ГОСПАДА ўсім сэрцам тваім і не абапірайся на розум твой».

Абрагам чакаў гадамі, пакуль спраўдзілася абяцанне — нарадзіўся Ісаак і стаў магчымым лагічны працяг: жаніцьба Ісаака і нараджэнне нашчадкаў. Абрагам назіраў абрысы абяцання, што ён стане бацькам мноства. Але аднойчы ўначы Бог сказаў яму адправіцца ў падарожжа на тры дні і прынесці ў ахвяру Ісаака! Абяцанне скасаванае? Просьба Бога не мела сэнсу! Уявіце, якой была барацьба Абрагама, каб застацца паслухмяным? У святле абяцання балючы загад не меў аніякага сэнсу! Тым не менш, з пакоры Абрагам вырашыў паслухацца, хоць і не разумеў.

У Бібліі шмат прыкладаў, як Бог дае загады або дазваляе прыйсці абставінам, якія супярэчаць той будучыні, што Ён нам абяцаў. Аднак праз паслухмянасць мы ўбачым выкананне Яго абяцання спосабам, які выходзіць за межы нашага разумення.

## Наша поўная залежнасць ад Бога

Па-другое, пакору можна вызначыць як нашу поўную і абсалютную залежнасць ад Бога. Давід падаваўся пыхлівым, але ён ведаў, што яго здольнасць – ад Бога. Вось яго словы: «ГОСПАД, Які выратаваў мяне з кіпцюроў льва і мядзьведзя, выратуе мяне і ад рукі Філістынца гэтага» (1 Сам. 17:37). Яго браты спадзяваліся на ўласныя здольнасці, таму, параўноўваючы сябе з Давідам, яны лічылі сябе старэйшымі і мацнейшымі. Сіла Давіда была ў яго веры і паслухмянасці.

Мы бачым гэта ў Халеве і Егошуа, дваіх сярод дванаццаці князёў, абраных агледзець абяцаную зямлю. Праз сорак

дзён дванаццаць вярнуліся, каб даць Майсею і народу справаздачу. Словы дзесяці князёў былі наступнымі: «І расказвалі ім, і сказалі: «Мы прыйшлі ў зямлю, у якую ты паслаў нас, якая сапраўды ацякае малаком і мёдам, і такія плады ейныя. Але народ, які жыве на ёй, дужы, і гарады вельмі вялікія і ўмацаваныя. Бачылі мы там таксама нашчадкаў Анака» (Лк. 13:27–28).

Як толькі гэтыя людзі загаварылі, грамада ўзрушылася. Тады Халеў супакоіў народ і з цвёрдай упэўненасцю заклікаў: «Пойдзем і здабудзем зямлю, бо мы [можам]авалодаць ёю» (верш 30).

Іншыя правадыры адрэзалі: «Ня зможам мы ваяваць з тым народам, бо ён дужэйшы за нас» (верш 31).

Далей у Пісанні гаворыцца: «І казала ўся грамада, каб закідаць іх [Халева і Егошуа] камянямі» (Лк. 14:10).

У вачах народа і іншых князёў Халеў і Егошуа былі занадта самаўпэўненымі і напышлівымі. Князі, якія казалі, што не могуць захапіць зямлю, былі рэалістамі. Яны ацанілі сітуацыю і ведалі, што ім, як былым рабам, было абсалютна немагчыма ўварвацца на такую магутную і ўмацаваную зямлю. У рэшце рэшт, яны проста абаранялі жонак і дзяцей (гл. Лікі 14:3). Гэтыя князі выглядалі пакорнымі, клапаціліся пра народ, у тым ліку пра жыццё старых і слабых. Халеў і Егошуа здаваліся настолькі самаўпэўненымі, што не клапаціліся пра дабрабыт бездапаможных.

Але паслухайце, адкуль узялася іх упэўненасць: «Не бунтуйцеся супраць ГОСПАДА і ня бойцеся народу той зямлі, бо яны як хлеб для нас. Адыйшла абарона іхняя ад іх, а з намі ГОСПАД. Ня бойцеся іх» (Лк. 14:9). Егошуа і Халеў цалкам разлічвалі на Божыя, а не на ўласныя здольнасці. Яны ведалі: Госпад жадаў, каб яны ішлі ў гэтую зямлю і заваявалі

яе. Яны маглі здавацца ганарлівымі, а іх калегі-лідары лічыліся рэалістамі. Але менавіта Бог аддзяліў пакорных ад ганарлівых.

Пакора, або поўная залежнасць ад Божай ласкі, праілюстравана ў жыцці Паўла. Ён кажа пра сябе:

> Не таму, што мы здольныя залічыць нешта сабе, нібыта праз сябе, але здольнасьць нашая ад Бога (2 Кар.3:5).

І яшчэ:

> Цяпер я рады хваліцца тым, які я слабы; я рады быць жывой дэманстрацыяй сілы Хрыста, замест таго, каб выхваляцца сваёй уласнай сілай і здольнасцямі (2 Кар. 12:9–10 пераклад TLB).

У жыцці Паўла была пэўная паслядоўнасць: чым даўжэй ён жыў, тым больш станавіўся залежным ад Божай ласкі, і тым менш спадзяваўся на ўласныя сілы, таленты ці здольнасці. Чым больш ён спустошваў сябе ў пакоры Хрысту, тым больш смелым і мацнейшым ён станавіўся ў рашучасці праслаўляць Госпада.

## Як мы ўспрымаем сябе

Гэта вядзе да трэцяга аспекту пакоры — як мы ўспрымаем сябе. Калі Павел атрымаў збаўленне, ён упакорыўся, адмовіўшыся ад усіх дасягненняў і статусу, што меў да сустрэчы з Ісусам; назваўшы іх смеццем. Большасці з нас не цяжка лічыць жыццё да пазнання Хрыста, смеццем.

А як наконт нашых дасягненняў у Хрысце пасля збаўлення? Часта тут зусім іншая гісторыя. Адносна гэтых

подзвігаў Павел сказаў: «Браты, я не лічу сябе, што дасягнуў, а толькі, забываючыся пра тое, што ззаду *[што Бог зрабіў праз яго пасля збаўлення]*, і імкнучыся да таго, што наперадзе» (Флп. 3:13, *курсіў аўтара*).

Праз гады пасля навяртання Павел быў далучаны да апосталаў (гл. Дзеі 13:1–4). Яму было дадзена мноства духоўных адкрыццяў і мудрасці, якія адкрылі магчымасць для поспеху. Павел пачынаў цэрквы па ўсёй Азіі і Усходняй Еўропе. Мы бачым яго пакору ў словах, з якімі Павел у 56 годзе ад Н.Х. звяртаецца ў пасланні да адной з першых цэркваў, заснаванай у Карынце. Яму заставалася дзесяць гадоў да смерці, дасведчаны чалавек у служэнні Ісусу. Але паслухайце яго словы:

> «Бо я — найменшы з апосталаў, які ня варты называцца апосталам» (1 Кар. 15:9).

Вы чуеце пакору ў гэтых словах? Я хачу адзначыць: гэта не фальшывая пакора. Фальшывая пакора ведае, як выкарыстоўваць паліткарэктныя словы, каб выглядаць пакорнай, але не мае пакоры сэрца ці розуму. Гэта падман. Але, складаючы Пісанне пад натхненнем Святога Духа, вы не можаце хлусіць! Бог не дазволіў бы Паўлу напісаць такія словы, калі б той не лічыў сябе такім. Таму, калі Павел сказаў, што ён быў найменшым з апосталаў, гэта не паліткарэктны жаргон, а сапраўдная пакора.

Паглядзіце на наступную заяву Паўла: «Я больш за іх усіх працаваў» (1 Кар. 15:10). Хто такія «ўсе»? Адказ — усе астатнія апосталы! Пачакайце. Павел хваліцца? Цяпер здаецца, быццам ён гаворыць супрацьлеглае. Як можна казаць, што ты найменшы з усіх апосталаў, а потым дадаваць:

«Я больш за іх усіх працаваў»? Гучыць напышліва, быццам Павел не меў на ўвазе сказанае напачатку, але гэта не так. Гэта папярэднічае яшчэ аднаму сказу пра залежнасць Паўла ад Бога:

> Дый ня я, але ласка Божая, якая са мною (1 Кар. 15:10).

Назваўшы сябе найменшым, Павел прызнаў: усё, што ён зрабіў, зроблена толькі па Божай ласцы. Апостал змог аддзяліць сябе ад усіх дасягненняў, усведамляючы, што ўсё, што дасягнуў, вынікала з Божай здольнасці дзейнічаць праз яго.

Цяжка прыняць, што Павел назваў сябе «найменшым з усіх апосталаў». Як у свой час, так і на працягу ўсёй гісторыі царквы ён лічыўся адным з найвялікшых апосталаў. Цяпер падумайце, што Павел сказаў эфэсцам праз сем гадоў, у 63 годзе ад Н.Х., за тры-чатыры гады да смерці. За гэтыя сем гадоў, з моманту паслання да Карынцянаў, ён дасягнуў самага значнага ў жыцці. Тут Павел характарызуе сябе:

> «Мне, *найменшаму з усіх сьвятых*, дадзена ласка гэтая — сярод паганаў дабравесьціць пра недасьледнае багацьце Хрыстовае» (Эф. 3:8, *курсіў аўтара*).

Сем гадоў таму ён назваў сябе «найменшым апосталам», а цяпер апісвае сябе як «найменшага з усіх святых»! Што?! Калі хто і мог пахваліцца, то гэта, безумоўна, быў Павел. І памятайце, што пры стварэнні Пісання немагчыма хлусіць; нельга пісаць рэлігійна правільным жаргонам. Павел сапраўды бачыў сябе такім!

Такая паслядоўнасць працягвалася, бо мы ведаем, што непасрэдна перад смерцю Павел напісаў ліст да Цімафея, у якім сказаў:

> Хрыстос Ісус прыйшоў у сьвет збавіць грэшнікаў, з якіх я — першы (1 Цім. 1:15).

Ён не найменшы з апосталаў, і нават не найменшы з усіх святых, але ён лічыць сябе першым з усіх грэшнікаў. Звярніце ўвагу, Павел не сказаў: «Я быў першым», а хутчэй «Я першы». І менавіта Павел меў адкрыццё, што ён — новае стварэнне ў Хрысце; старое мінула, і ўсё стала новым! (гл. 2 Кар. 5:17). Ён ніколі не забываў, наколькі вялікі доўг меў перад Збаўцам.

Чым даўжэй Павел служыў Госпаду, тым меншым ён лічыў сябе, бо яго пакора пастУпова расла. Дык ці можа гэта быць прычынай, што ласка Божая ўзрастала прапарцыйна яго ўзросту? Якуб кажа нам: Бог «дае ласку пакорным» (Як. 4:6). Магчыма, гэта і ёсць прычынай, чаму Бог настолькі блізка адкрываў Свае шляхі Паўлу, што гэта бянтэжыла апостала Пятра? Бог кажа праз Ісаю, што Ён жыве з тымі, хто пакорны, а не проста наведвае іх. Калі мы жывём з Богам, мы становімся блізкімі з Ім.

## Магутныя блізняты

Цяпер мы падыходзім да месца, дзе сустракаем блізнят улады Валадарства — *Страх перад Госпадам* і *Пакора*. Успомніце, у ранейшых раздзелах мы выразна адзначалі: то страх перад Госпадам — пачатак глыбокага пазнання Яго, а цяпер бачым: тое самае справядліва ў адносінах да пакоры. Псалміст абвяшчае:

> «Ён… навучыць *уціснаных* (у анг.перакл. – *пакорных*) шляху Свайму» (Пс. 25:9, *курсіў аўтара*).

Бог адкрывае Свае шляхі пакорным, але ўсяго праз некалькі вершаў чытаем:

> «Хто той чалавек, які *баіцца Госпада*? Яго Ён навучыць *шляху*, які [трэба] выбраць яму» (Пс. 25:12, *курсіў аўтара*).

Па сутнасці: той, хто баіцца Госпада, сапраўды пакорныя; а сапраўды пакорны баіцца Госпада. Успомніце: Майсей ведаў Божыя шляхі, а Ізраіль ведаў Госпада толькі па адказах на малітвы, па Яго справах. Майсей баяўся Госпада і быў вельмі пакорны. Бачыце сувязь? Ізраілю не хапала страху перад Госпадам (Друг. 5:29), а таксама пакоры (мы бачылі на прыкладзе з Егошуа і Халевам).

Псалміст непадзельна звязвае страх перад Госпадам з пакорай. Мы неаднаразова бачым гэта ў Пісанні. Вось толькі адзін з прыкладаў:

> *Страх перад ГОСПАДАМ* навучае мудрасьці, і *ўпакораньне* папераджае славу (Прып. 15:33, *курсіў аўтара*).

Царства цемры таксама мае сваіх магутных блізнятаў. Яны супрацьлеглыя страху Гасподняму і пакоры; гэта бунт і гонар. Мы бачым іх супрацьпастаўленне ў Прыповесцях:

> [Нагарода] за *пакору* і *страх перад ГОСПАДАМ* — багацьце, і слава, і жыцьцё. Церні і пасткі на шляху *крывадушнага*, а хто захоўвае душу сваю, той аддаляецца ад іх (Прып. 22:4–5, *курсіў аўтара*).

Бачыце, як знітаваныя пакора і страх перад Госпадам, а таксама як яны супрацьпастаўляюцца гонару і бунту? Ісус упакорыўся больш, чым кожны іншы чалавек ці анёл. Таму Ён быў высока ўзнесены, нашмат больш, чым нехта іншы (гл. Флп. 2:8–9). Ісус таксама цешыўся, больш за ўсе цноты,

страхам перад Госпадам; таму Дух Божай прысутнасці з Ім і на Ім быў без меры (гл. Іс. 11:2–3; Ян 3:34).

І наадварот, Люцыфер, цяпер вядомы як шатан, быў памазаным херувімам, узвысіўся праз гонар і стаў бунтаўніком больш, чым хто-небудзь да яго ці пасля яго. Таму Люцыфер зведзены ў «у пекла, на самае дно» (гл. Эзэк. 28:14–17; Іс. 14:12–15).

Зважайце, Пісанне неаднаразова паказвае, што месца пражывання Бога — вышыні, а месцам пражывання дэманічных сіл — ніжэйшыя часткі свету. Вы зноў і зноў будзеце бачыць у Пісанні гонар і бунт, звязаныя з нізам, і пакору і страх перад Госпадам з вышынёй. Быць узвышаным — значыць жыць у блізкасці з Богам!

## За кім гоніцца Бог

Бог супраціўляецца ганарлівым і бунтаўнікам (Як. 4:6), але Яго прыцягваюць тыя, хто баіцца Яго — сапраўды пакорныя. У Старым Запавеце былі людзі, што служылі і пакланяліся Богу, як загадана ў Пісанні. Яны прыносілі ахвяры ягнят і валоў, палілі кадзіла ў Святым месцы і складалі хлебныя ахвяры. Тым не менш, Бог сказаў: у Яго вачах іх ахвяры падобныя на забойства чалавека або да прынашэння Яму ў ахвяру свіной крыві; а іх кадзіла, праваобраз малітвы і хвалы, падобна на дабраслаўленне ідалаў! Далей Госпад растлумачыў, чаму гэта так:

> Бо Я клікаў, і ніхто не адказваў, гаварыў, а яны ня слухалі, і чынілі ліхоту на вачах Маіх, і тое выбіралі, што не падабалася Мне (Іс. 66:4).

Што не падабаецца Госпаду? Ахвяры, якія не суправаджаюцца паслухмянасцю! (Гл. 1 Сам. 15:22). Іншымі словамі,

любая форма пакланення, пазбаўленая страху перад Ім.

Госпад моцна ўдарыў гэтых «паклоннікаў». У іх падкасіліся ногі. Уявіце сабе шок тых людзей! Яны думаюць, што служаць і дагаджаюць Богу, і раптам выяўляюць: Богу агіднае іх пакланенне. Аднак працуючы са Сваім народам, Госпад ніколі не выкараняе там, дзе не збіраецца саджаць; ніколі не руйнуе там, дзе не збіраецца будаваць. Дык вось, Ён падбадзёрвае Свой народ, кажучы ім, што Яго прыцягвае:

> «Але Я гляджу (у анг.перакл. – *паважаю*) на таго, хто бедны і прыгнечаны духам і хто трымціць перад словам Маім» (Іс. 66:2).

Даведнік Стронга так вызначае габрэйскае слова «набат» («паважаць») — «уважліва глядзець; глядзець з задавальненнем, ласкай або клопатам». Па сутнасці, Бог кажа: «Гэта чалавек, на якога Я гляджу з задавальненнем, ласкай і звяртаю пільную ўвагу». Іншымі словамі, Госпад кажа: «Я імкнуся да такога чалавека; ён той, за кім Я ганюся». Томі Тэні, сучасны аўтар і настаўнік, напісаў кнігу з найлепшай, на маю думку, назвай кнігі для нашага пакалення — «Пагоня за Богам». Назва ідэальна апісвае сэрцы тых, хто любіць Бога. Адна справа — гнацца за Богам. Аднак зусім іншая — бачыць, як Бог гоніцца за табой! Але менавіта пра гэта кажа Бог.

Падумайце пра Давіда. Бог настаўляе Самуэля, старэйшага прарока ў Ізраілі, ісці ў дом Есэя. Госпада не бянтэжыць пратэст Самуэля, які баіцца гневу Саўла. Бог усё роўна загадвае ісці, бо шукае аднаго з сыноў Есэя. Прарок распавядае пра сямёра старэйшых сыноў, і, нарэшце, Госпад коратка кажа: «Не, Самуэль, не гэтыя старэйшыя сыны, а той

маленькі румяны, што ў полі з авечкамі. Вось той, за якім Я ганюся!» (перафраз аўтара)

Чаму Бог гнаўся за Давідам, а не за яго братамі ці за ўсімі іншымі мужчынамі Ізраіля? Адказ знойдзем у прыведзеным вышэй вершы. Бог аддае перавагу тым, хто пакорны, скрышаны духам і дрыжыць перад Яго Словам. Скрышаныя духам — гэта тыя, хто хутка каецца, бо жадае падпарадкавацца Божай уладзе. У іншым перакладзе верш гучыць так: «Я задаволены тымі, хто пакорны і раскаяны, хто баіцца Мяне і слухаецца Мяне». Скораны дух — яшчэ адна форма сапраўднай пакоры і страху перад Госпадам. Госпад кажа, што гоніцца за тымі, хто пакорны і баіцца Яго; за тымі, хто ходзіць у сіле магутных блізнят улады Валадарства! Вось чаму нам сказана:

> Ён сьмяецца з насьмешнікаў, а пакорным ласку дае (Прып. 3:34).

І яшчэ:

> Якая вялікая добрасьць Твая, якую Ты захоўваеш для тых, што баяцца Цябе, і якую ўчыняеш тым, што маюць надзею ў Табе насуперак сынам чалавечым!... Пад заслонай аблічча Твайго Ты хаваеш іх (Пс. 31:20-21).

Вось чаму ў Новым Запавеце нам сказана «апраніцеся ў пакорнасьць» (1 Пят. 5:5) і «са страхам праводзьце час вандраваньня вашага» (1 Пят. 1:17). Бог заклікае ў словах Пятра ўвайсці ў прыемную супольнасць з Ім, чаго і прагне Яго сэрца для нас, Яго дарагіх дзяцей.

Выбар за намі. Бог праклаў шлях, каб мы ішлі з Ім, і даў нам Сваю ласку. Якому цудоўнаму Богу і Айцу мы служым!

Цяпер ад нас залежыць, ці пачуем і ці прыслухаемся да Яго закліку ўвайсці ва ўнутраны пакой, дзе Ён адкрывае Сябе. У наступных раздзелах мы абмяркуем, як Ён гэта робіць.

## Пытанні для вывучэння

1. У гэтым раздзеле падкрэсліваецца: хаця і пакора звычайна няправільна разумеецца як слабасць і бесхрыбетнасць, сапраўды пакорных часта памылкова лічаць ганарлівымі. Разважаючы пра гэта, узгадайце людзей, якіх вы палічылі ганарлівымі, а на самай справе яны былі пакорнымі? Чаму вас вучыць такая няправільная ацэнка?
2. Паразважайце над трыма аспектамі пакоры — паслухмянасць Богу, поўная залежнасць ад Яго, ваш погляд на самога сябе — і біблейскімі прыкладамі кожнага з аспектаў. Які з аспектаў з’яўляецца вашай найбольшай праблемай?
3. У кнізе Ісаі (раздзел 66) група людзей служыла і пакланялася Богу паводле літары закону — прыносячы належныя ахвяры, палячы кадзіла і складаючы патрэбныя хлебныя ахвяры. Тым не менш, Госпаду не спадабалася іх пакланенне з-за адсутнасці паслухмянасці. Якім чынам наша пакланенне можа не падабацца Богу, нават калі яго вядуць адораныя, таленавітыя лідары?

Раздзел 10

# БЛІЗКАСЦЬ СА СВЯТЫМ ДУХАМ

Я лічу, што Святы Дух — адна з самых ігнараваных асобаў у царкве.

Урэшце мы падыходзім да раздзела кнігі, які я вельмі чакаў: якім чынам Госпад набліжаецца да нас. Перш за ўсё, дазвольце паўтарыць: Бог прагне вас мацней, чым вы Яго. Успомніце словы Майсея: «Зайздросны імя Ягонае, Ён — Бог зайздросны» (Вых. 34:14).

Нядаўна, глыбока пагрузіўшыся ў малітву, не да канца усвядоміўшы, што кажу, я ўсклікнуў: «Госпадзе, калі я не магу мець блізкіх адносін з Табой тут, на зямлі, калі ласка, вазьмі мяне дадому ў нябёсы!» Словы выліліся з майго сэрца, у мяне нават калені задрыжалі. Я ведаў, што меў на ўвазе тое, што сказаў. Аднак мой розум адразу закрычаў: «Што ты просіш?» Розум сумняваўся, ці варта такое прасіць.

Праз некалькі гадзін я ўжо быў у самалёце на Фенікс, штат Арызона. Я заняў месца, дастаў з партфеля Біблію і проста разгарнуў яе. Першы верш, на які я глянуў, гучаў наступным чынам:

> «Да Цябе, ГОСПАДЗЕ, я клічу. Скала мая, не маўчы на мой [кліч], каб праз маўчаньне Тваё ня стаўся я падобным да тых, якія зыходзяць у магілу» (Пс. 28:1).

Я ледзь не падскочыў. Якія былі шанцы выпадкова разгарнуць менавіта гэты ўрывак Пісання? Ён тычыўся акурат таго, пра што я разважаў усяго некалькі гадзін раней. Маё сэрца моцна стукала, я зразумеў: гэта слова ад Бога.

Давід кажа, мы не лепшыя за грэшніка, які ідзе ў пекла, калі Бог не размаўляе з намі. Я карыстаюся Бібліяй у Новым Жывым перакладзе (New Living Translation), таму верш з псальма гучыць так: «Бо калі Ты маўчыш, я магу здацца і памерці» і супадае з ранішняй малітвай. Менавіта так я казаў Богу. Колькі разоў я чытаў гэты верш і ніколі не бачыў яго ў такім святле!

Я адразу зразумеў, што праз Святога Духа маліўся паводле Божай волі. Вось новае пацверджанне: Бог не хоча маўчаць; наадварот, Ён шчыра жадае мець з намі адносіны. Адзін з маіх любімых урыўкаў Пісання — наступныя словы Давіда:

> «Пра Цябе кажа сэрца маё: «Шукайце аблічча Маё!» Я буду шукаць, ГОСПАДЗЕ, аблічча Тваё!» (Пс. 27:8).

Вы чуеце жаданне Божага сэрца? Ён запрашае кожнага з нас: «Падыдзі бліжэй, Я хачу мець адносіны з табой, адкрыць Сваё сэрца і паказаць табе вялікія і магутныя рэчы, якія ты не ведаеш!»

Словы «Наблізьцеся да Бога» павінны апісваць жыццё кожнага верніка. Калі мы набліжаемся да Бога, гэта гарантыя, што «Ён наблізіцца да вас». Мы вызначаем узровень нашай блізкасці, а не Госпад. Ён ужо адчыніў дзверы, што вядуць у Яго асабістыя пакоі; Ён чакае, кліча нас прыйсці. Ад нас залежыць, ці адгукнёмся мы. І чым бліжэй мы падыходзім, тым больш Ён адкрывае Сябе і Свае жаданні. Зноў жа, паглядзіце на словы Якуба непасрэдна перад гэтым вялікім запрашэннем:

> Ці вы думаеце, што надарма кажа Пісанне: «Да рэўнасьці прагне Дух, Які жыве ў нас»? (Як. 4:5)

Госпад прагне нас да рэўнасці. У апошніх раздзелах кнігі мы бачылі: Бог не будзе дзяліць нас з хцівымі жаданнямі свету. Па гэтай прычыне Якуб кажа: «Ці вы ня ведаеце, што сяброўства са сьветам ёсьць варожасьць супраць Бога? Дык хто хоча быць сябрам сьвету, той робіцца ворагам Богу» (Як. 4:4). Гэтаксама жонка кажа нявернаму мужу: «Не можаш мець мяне і палюбоўніцу; выбірай! Калі ты выбіраеш яе, ты адкінуў мяне, і я сыходжу». Госпад робіць гэтак жа. Ён не будзе дзяліць нас са светам. Нашы сэрцы павінны прагнуць Бога, інакш Ён не адкрые нам Сябе.

## Дух, Які жыве ў нас, прагне

Раней мы падрабязна абмяркоўвалі тугу Бога па нас; цяпер жа нам трэба засяродзіцца на слове «Дух». Вельмі важна, што ў Пісанні сказана: «прагне Дух, Які жыве ў нас...» Звярніце ўвагу, там не гаворыцца: «прагне Ісус, Які жыве ў нас...» Ісуса няма тут, на зямлі, Ён сядзіць праваруч Бога на вышынях ужо амаль дзве тысячы гадоў. У дзень, калі Ісус

сышоў, анёлы звярнуліся да Яго вучняў: «Мужы Галілейскія! Чаго вы стаіцё, гледзячы ў неба? Гэты Ісус, узяты ад вас у неба, прыйдзе гэтак сама, як вы бачылі Яго, што ідзе ў неба» (Дз. 1:11). На вачах вучняў Ісус фізічна быў узяты ў воблаку. Нам абяцана, што Ён вернецца гэтак жа.

Зразумейце мяне правільна: цудоўны Збаўца Ісус прагне нас, але пасля Яго сыходу сярод нас знаходзіцца менавіта Святы Дух — канкрэтная асоба Боства, вызначаная ў гэтым вершы. Тым не менш, тыя, хто заклікае імя Ісуса, у многіх адносінах ігнаруюць Святога Духа. Я лічу, што Святы Дух — адна з самых ігнараваных асобаў у царкве. Уявіце: вы едзеце дваццаць хвілін з чалавекам у машыне і не кажаце яму ніводнага слова! А як часта мы робім так са Святым Духам! Разважаем пра дзень, слухаем хрысціянскую музыку ці радыёстанцыі і вельмі часта не звяртаем увагі на Яго прысутнасць. Мы не зважаем на Яго прысутнасць дома, у офісе і ў безлічы іншых месцаў, якія займаюць наш час; але, спытайся нас, і мы абавязкова прызнаем Яго існаванне і Яго жытло ў нашых сэрцах.

## Наш вобраз Святога Духа

Адна з прычын, чаму мы не зважаем на Яго прысутнасць і супольнасць — наш вобраз Святога Духа. Дзякуючы творам і казаням хрысціянаў, вобраз Святога Духа стаў містычным. Калі б я атрымліваў долар кожны раз, калі чую, як пра Духа Божага кажуць як пра неадушаўлёную рэч, я б разбагацеў. На жаль, многія лічаць Яго «святой сутнасцю», а не Найсвяцейшай Асобай, якая жадае быць самым блізкім сябрам. Паразважаўшы над Пісаннем, мы зразумеем: Святы Дух мае розум (Рым. 8:27), а таксама волю (1 Кар. 12:11)

і эмоцыі, якія апісваюцца як Яго любоў да нас (Рым. 15:30). Ён гаворыць (Гебр. 3:7) і робіць гэта выразна (1 Цім. 4:1). Ён вучыць (1 Кар. 2:13), як кожны чалавек, Святы Дух можа засмуціцца (Эф. 4:30), Яго не трэба абражаць (Гебр. 10:29), а таксама мы не маем права хлусіць перад Ім.

Думаючы пра Яго, мы звычайна ўяўляем голуба. Адкуль такое ўяўленне? Ён ніколі не з'яўляўся як голуб! Ва ўсіх чатырох Евангеллях запісана, што Ян Хрысціцель бачыў Духа Божага, які сыходзіў на Ісуса, «як голуб» (Мц. 3:16; Мк. 1:10; Лк. 3:22; Ян 1:32). Такое параўнанне не робіць Яго голубам. Я чуў, як пра мужчын і жанчын казалі: «яна бегла як вецер», або «ён моцны як бык». Параўнанне не робіць жанчыну ветрам, а мужчыну – быком. Мужчына і жанчына застаюцца людзьмі.

Хтосьці скажа: «Так, аднак апостал Ян убачыў Божы пасад і Святога Духа як агністыя лямпы». Гэта праўда, бо апостал пісаў: «І з пасаду выходзяць маланкі, і грымоты, і галасы; і сем лямпаў агністых гараць перад пасадам, якія ёсць сем духаў Божых» (Адкр. 4:5); але той самы Ян таксама напісаў: «І я ўбачыў, і вось... сярод старостаў Ягня стаіць, быццам забітае... Тады чатыры жывёлы і дваццаць чатыры старосты… сьпяваюць новы сьпеў, кажучы: «Ты годны ўзяць кнігу і адчыніць пячаткі яе, бо Ты быў забіты, і Ты Крывёю Сваёю адкупіў нас Богу з кожнага калена, і мовы, і племені, і народу» (гл. Адкр. 5:6–9). Цалкам зразумела, што гаворка ідзе пра Ісуса, але мы не ўспрымаем Яго як жывёлу! Мы, безумоўна, ведаем, што Ісус — гэта асоба, на вобраз Якой мы створаны; мы не створаны на вобраз жывёлы!

Святы Дух — гэта асоба, і мы створаны на Яго вобраз. Менавіта так: на Яго вобраз! У кнізе Быцця чытаем: «І сказаў Бог: «Зробім чалавека на вобраз Наш, як падабенства

Нашае» (Быц. 1:26). Там не сказана: «Я ствару чалавека паводле вобразу Майго». Айцец, Сын і Святы Дух стварылі чалавека ў адзінстве. Мы добра ўсведамляем ролю Айца і Сына ў стварэнні, аднак Пісанне таксама выразна кажа: «Дух Божы ўчыніў мяне» (Ёў 33:4), і зноў: «Ты пашлеш Дух Твой, і яны створаныя» (Пс. 104:30). Такім чынам, калі Бог сказаў: «Зробім чалавека на вобраз Наш», Святы Дух, безумоўна, таксама меўся на ўвазе. Мы створаны паводле вобразу Айца, Сына і Святога Духа. Ён — асоба, трэцяя асоба Боства, а не містычны вецер ці птушка.

Як Марыя магла нарадзіць дзіця ад Святога Духа, калі мы не створаны паводле Яго вобразу? Пісанне кажа: «па заручынах маці Яго Марыі з Язэпам, раней, чым яны зыйшліся, выявілася, што яна цяжарная ад Духа Сьвятога» (Мц. 1:18). Пазней анёл Гасподні сказаў Язэпу: «Тое, што нарадзілася ў ёй, ёсьць ад Духа Сьвятога» (Мц. 1:20). Калі Святы Дух быў «рэччу», то як у Марыі мог утварыцца чалавек? Яна была аплоднена Духам Божым. Дзеці з’яўляюцца толькі ў жывых істотаў, а не ў рэчаў.

Спадзяюся, вы бачыце: Святы Дух — гэта асоба, на самай справе вельмі цудоўная асоба. Па гэтай прычыне Павел кажа вернікам:

> Ласка Госпада Ісуса Хрыста, і любоў Божая, і *супольнасьць Сьвятога Духа* з усімі вамі. Амэн (2 Кар. 13:13, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу, Павел кажа: «Супольнасць Сьвятога Духа хай будзе з вамі». Гадамі я вывучаў слова «супольнасць», таму што блізкае пазнанне Бога — маё вялізнае жаданне. Я шукаў гэтае слова ва ўсіх грэчаскіх слоўніках, якія ўдалося

знайсці. Вось некаторыя з асноўных тлумачэнняў:

- Таварыства
- Дзяленне або сацыяльныя адносіны
- Партнёрства або сумесны ўдзел
- Цесная ўзаемасувязь
- Блізкасць

Ёсць і іншыя словы, выкарыстаныя для вызначэння супольнасці, але яны вельмі падобныя на прыведзеныя вышэй, таму я выбраў гэтыя. Давайце разгледзім кожнае з іх асобна і паразважаем над імі.

## Адзінства, непарыўнасць

Першае слова, *«таварыства»*, у слоўніку Вэбстэра вызначаецца як *адзінства* або *кампанія,* таксама *якасць або стан тварыскасці*. Мы не чакаем, што таварышы будуць устрымлівацца ад узаемадзеяння адзін з адным; яны кажуць адзін аднаму, што робяць або што плануюць рабіць. Яны збліжаюцца, і паміж імі існуе пастаянная камунікацыя. Такія адносіны паміж Святым Духам і слугамі Божымі зноў і зноў ілюструюцца ў кнізе Дзеяў. Ніжэй прыведзены ўзор аднаго з выказванняў Паўла:

> «І вось цяпер, зьвязаны Духам, іду я ў Ерусалім, ня ведаючы, што там сустрэне мяне, адно Дух Сьвяты сьведчыць *па гарадах*, кажучы, што чакаюць мяне путы і прыгнёт» (Дз. 20:22–23, *курсіў аўтара*).

Адсюль вынікае пастаянная сувязь паміж Паўлам і Святым Духам. Яны былі таварышамі ў жыцці, падарожжах і служэнні.

Тое самае можна сказаць і пра кожнага слугу Госпада

ў Новым Запавеце. Куды б яны ні ішлі, Сьвяты Дух быў іх спадарожнікам і прамаўляў да іх, калі яны звярталіся да Яго. Філіп, яшчэ адзін вучань, пакінуў гарадское набажэнства і адправіўся ў пустыню, але ён не быў адзін і ведаў, што рабіць, бо «Дух сказаў Філіпу: “Падыйдзі і прыстань да калясьніцы гэтай”» (Дз. 8:29).

Пётр, спрабуючы зразумець бачанне, не мусіў спадзявацца на ўласныя веды Сьвятога Пісання, бо чуў голас Духа: “Што Бог ачысціў, ты не называй нячыстым”. Затым ішлі ўказанні: «...*Сказаў яму Дух*: “Вось, тры мужы шукаюць цябе. Дык, устаўшы, зыйдзі і ідзі з імі, нічога не сумняваючыся, бо Я паслаў іх”» (Дз. 10:19–20, *курсіў аўтара*).

Вы бачыце, як Дух Сьвяты суправаджаў усю каманду Паўла, бо Лука піша: «Прайшоўшы ж праз Фрыгію і Галятыйскую краіну, *забараніў ім Сьвяты Дух* гаварыць слова ў Азіі. Прыйшоўшы ў Мізію, спрабавалі ісьці ў Бітынію; *і не дазволіў ім Дух*» (Дз. 16:6–7, *курсіў аўтара*).

Я мог бы прывесці яшчэ некалькі прыкладаў. Галоўная думка ў тым, што слугі Новага Запавету добра ўсведамлялі пастаянную блізкасць Духа Божага; узаемадзеянне з Ім ніколі не было чымсьці страшным ці незвычайным. Яны чакалі Яго ўдзелу ў сваім жыцці гэтаксама, як і мы чакаем удзелу і дапамогі ад тых, з кім жывём 24/7.

Людзі пытаюцца ў мяне, ці стамляюся ад гасцінічных нумароў падчас падарожжаў. Я адказваю: «Шчыра кажучы, мне ніколі не бывае сумна». Я бываў у найпрыгажэйшых гарадах свету і не хацеў аглядаць славутасці, бо атрымліваю такую асалоду ад адносін з Духам Сьвятым, што не хачу губляць час. Раней, перш, чым зразумеў і перажыў супольнасць Сьвятога Духа, я вельмі не любіў быць адзін. Мне пастаянна былі патрэбны людзі побач. Цяпер я адчуваю, што прагну адзіноты,

каб лёгка слухаць Святога Духа і размаўляць з Ім.

Ягонае прагненне — мець адносіны з вамі! Знайдзіце хвілінку, заплюшчыце вочы і падумайце пра Святога Духа як вашага спадарожніка або таварыша. Бо Слова Божае абвяшчае: «Няхай супольнасць Святога Духа будзе з вамі». Або паразважайце над гэтым: «Няхай таварыства Святога Духа будзе з вамі». Або зноў: «Няхай кампанія Святога Духа будзе з вамі». Хай гэтыя словы растуць у вашым сэрцы, каб адкрыць дзверы блізкасці паміж вамі і вашым Творцам.

## Дзяленне

Другое азначэнне — *дзяленне* або *сацыяльныя адносіны*, апісвае абмен думкамі або пачуццямі. Найлепшыя часы, якія я праводжу з блізкім колам сяброў, — калі мы пачынаем размовы і дзелімся адзін з адным самымі глыбокімі або схаванымі думкамі сэрцаў. Тады мы становімся ўразлівымі і дзелімся тым, што людзі, якія нас не ведаюць, могуць няправільна зразумець або высмеяць. Аднак мы ведаем, што нашы дарагія сябры гэтага не зробяць, бо ведаюць наша сэрца і не будуць няправільна інтэрпрэтаваць тое, чым мы дзелімся. Павел ілюструе падобныя адносіны са Святым Духам, калі піша: «Праўду кажу ў Хрысьце, не хлушу, сьведчыць мне сумленьне маё ў Духу Сьвятым» (Рым. 9:1). Святы Дух ведаў сэрца Паўла, як Павел ведаў Яго сэрца. Паміж імі нарадзілася блізкасць і вырасла з таго, што яны дзяліліся сваімі глыбокімі думкамі і пачуццямі.

Гэта зноў нагадвае, чаму страх Гасподні такі важны. Госпад не будзе дзяліцца Сваімі самымі глыбокімі думкамі з тымі, хто не шануе іх, як і мы не кідаем свае жамчужыны перад тымі, хто іх патопча. Проста кажучы, мы ніколі не падзелімся

глыбінёй нашага жыцця з тымі, хто не мае падобнага з нашым сэрца. Бог зробіць тое самае.

Адзін са святых Старога Запавету ўсклікае: «Ці можаш дайсьці да межаў Усемагутнага?» (Ёў 11:7) Але Новы Запавет адчыняе дзверы для блізкасці са Святым Духам, і таму Павел з хваляваннем кажа: «А нам Бог адкрыў *праз Духа Свайго*, бо Дух усё дасьледуе, і *глыбіні* Божыя» (1 Кар. 2:10, *курсіў аўтара*). Звярніце ўвагу, гаворка ідзе пра Святы Дух. Ён — асоба Троіцы, якая дзеліцца з намі патаемнымі або глыбокімі думкамі Бога! Хіба гэта вас не хвалюе?

Зноў спыніцеся, заплюшчыце вочы і паразважайце: Святы Дух жадае такой блізкасці з вамі. Ён прагне паказаць вам Свае самыя глыбокія думкі і пачуцці і пачуць вашы. Бо Слова Божае кажа: «Няхай *дзяленне думкамі і пачуццямі* Святога Духа будзе з вамі».

## Партнёрства

Трэцяе азначэнне, *партнёрства* або *сумесны ўдзел*, цудоўна ілюструецца сведчаннем кіраўнікоў ранняй царквы. Яны пісалі ў сваім лісце:

> «Бо надумалася Духу Сьвятому і нам» (Дз. 15:28).

Тут выразна паказаны погляд — іх і Святога Духа — на канкрэтную сітуацыю. Гэта быў сумесны ўдзел у прыняцці рашэння; яны былі партнёрамі ў справе Валадарства. Тое самае бачым і ў Старым Запавеце, калі Бог прыйшоў да Абрагама абмеркаваць Свае планы адносна Садома. Абрагаму было дазволена ўмяшацца, і Бог канчаткова прыняў рашэнне пасля таго, як выслухаў параду Абрагама.

Некалькі разоў так здаралася і з Майсеем. Госпад у Сваім

гневе быў гатовы знішчыць народ Ізраіля і зрабіў бы так, калі б не парада Майсея, які нагадаў Богу пра абяцанні і рэпутацыю. Пра вынік умяшальніцтва Майсея мы чытаем у адным з аповедаў: «І пашкадаваў ГОСПАД рабіць ліха, пра якое Ён казаў, што ўчыніць яго народу Свайму» (Вых. 32:14). Майсей і Абрагам былі партнёрамі Бога, але ў іх не было бесперапыннай супольнасці, якую сёння мы атрымалі паводле Новага Запавету. Толькі падумайце, наколькі гэта ашаламляльна!

Мы бачым выразныя доказы ролі Святога Духа як нашага старэйшага партнёра, калі чуем словы Паўла да кіраўнікоў Эфескай царквы:

> «Дык сьцеражыце самі сябе і ўвесь статак, у якім *Дух Сьвяты* паставіў вас за епіскапаў пасьвіць царкву *Божую*, якую Ён здабыў *уласнай крывёю*» (Дз. 20:28, *курсіў аўтара*).

Тут выразна сказана пра розныя асобы Троіцы і іх дасканалае адзінства. *Святы Дух* — першая асоба, пра якую гаворыцца, і Ён — Той, хто паставіў іх наглядчыкамі, або епіскапамі. Затым у фразе «*царква Божая*» згадваецца Айцец, і, нарэшце, мы бачым ролю Сына, бо менавіта Яго *ўласная кроў* адкупіла нас; тры розныя асобы, але адзін Бог. Цяжка зразумець, але ў нас ёсць прыродны прыклад для падрабязнай ілюстрацыі. Мы ведаем ваду ў трох розных формах: лёд, вадкасць і пара. Усё тры маюць аднолькавую хімічную формулу. Так і Троіца — тры розныя асобы, але дасканалае адзінства.

Цікава адзначыць: Святы Дух — асоба Троіцы, якая паставіла лідараў на іх пасады. Тое самае мы разумеем, калі

старэйшыны царквы ў Антыёхіі шукалі Госпада. Тады «сказаў Дух Сьвяты: “Аддзяліце Мне Барнабу і Саўла на справу, да якой Я паклікаў іх”». Старэйшыны памаліліся і ўсклалі рукі на гэтых двух мужчын, і мы чытаем: «Тыя ж, *выпраўленыя Сьвятым Духам*» (Дз. 13:2–4, *курсіў аўтара*). Дух быў асобай Троіцы, якая працавала з тымі людзьмі, каб праславіць Ісуса.

З названых прыкладаў бачнае партнёрства, дзе Сьвяты Дух з’яўляецца лідарам або старэйшым партнёрам. Мушу яшчэ раз падкрэсліць: Яго жаданне — каб вы і я былі Ягонымі супрацоўнікамі! Так-так, партнёрамі! Пра гэта выразна чытаем у пасланні Паўла да Карынфянаў: «Бо мы – супрацоўнікі Божыя» (1 Кар. 3:9). *Супрацоўнік* азначае *таварыш* або *памочнік*. Пераклад «Бібліі караля Якуба» падкрэслівае гэта яшчэ больш выразна, кажучы: «Бо мы працуем разам з Богам». І зноў я запытаюся: вы ведаеце таварышаў, якія не ўзаемадзейнічаюць і не працуюць разам?

Падумайце яшчэ некалькі хвілін пра жаданне Сьвятога Духа быць вашым старэйшым партнёрам. У Слове Божым гаворыцца: «Няхай *партнёрства* Сьвятога Духа будзе з вамі» або, зноў жа: «Няхай Сьвяты Дух ва ўсім *ўдзельнічае* з вамі *сумесна*».

## Цесная ўзаемасувязь

Наступнае азначэнне — цесная ўзаемасувязь. Яе лепш за ўсё апісаць, расказаўшы пра сустрэчы з выдатнымі мужамі і жонкамі Божымі. Я памятаю, як упершыню сустрэў доктара Дэвіда Чо, пастара адной з найбуйнейшых цэркваў у свеце, што знаходзіцца ў Сеуле. Гэта быў яго першы візіт у маю родную царкву. У той час я быў памочнікам пастара і адказваў за перавозку гасцей. Я служыў ужо некалькі гадоў,

і за гэты час сустрэў каля сотні служыцеляў, бо ў нашу царкву прыязджала шмат гасцей.

Аднак тут усё было інакш. Калі доктар Чо сеў у маю машыну, яе напоўніла прысутнасць Госпада. Адразу я пачаў плакаць, слёзы проста ліліся з вачэй. Я маўчаў, бо не хацеў турбаваць яго перад служэннем, але ў рэшце рэшт адчуў сябе абавязаным нешта сказаць. Я ўрачыста і ціха сказаў: «Доктар Чо, Бог тут, у нашай машыне». Ён усміхнуўся і кіўнуў. Пазней я падумаў, колькі гэты чалавек напісаў і прапаведаваў пра супольнасць, якую мае са Святым Духам. Потым я ўспомніў іншых служыцеляў, якіх вазіў і якія таксама падкрэслівалі цесныя адносіны са Святым Духам і жылі ў іх. Хоць я перавозіў каля сотні служыцеляў, я узгадаў толькі некалькіх, сутыкнуўшыся з якімі, адразу адчуў прысутнасць Святога Духа. Адной з іх была жанчына па імені Джыні Уілкерсан, служыцельніца, якая гадамі малілася за іншых, а цяпер ужо пайшла да Госпада. Калі яна села ў царкоўны аўтамабіль, я, напэўна, быў у шоку ўсю паездку. Я не мог засяродзіцца на кіраванні і зразумеў, што знаходжуся ў прысутнасці жанчыны, якая не толькі ведала пра Бога, але і сапраўды блізка ведала Яго. Джыні Уілкерсан шмат гаварыла пра Святога Духа, і Яго прысутнасць была відавочнай і моцнай кожны раз, калі я быў побач з ёй.

Нядаўна я выступаў у амерыканскай царкве, у якой чатыры тысячы вернікаў. Я прапаведаваў пра Святога Духа на ранішнім служэнні ў нядзелю, а ўвечары мне трэба было выйсці за кафэдру праз сорак пяць хвілін пасля пачатку служэння. Аднак я ўзяў мікрафон толькі праз дзве гадзіны пасля пачатку служэння, таму што ў Святога Духа былі іншыя планы. Ён так цудоўна служыў столькім людзям! Нарэшце, перш чым я выйшаў за кафедру, пастар (яго не назавеш

чуллівым слабаком, бо ён можа штурхнуць больш за 225 кілаграм), падышоў да мяне і са слязамі сказаў: «Джон, за восем гадоў, што я служу ў гэтай царкве, ніколі не адчувалася такой моцнай прысутнасці Бога!»

Я адразу адказаў: «На тое ёсць прычына: мы гаварылі пра Святога Духа сёння раніцай, а Ён з'яўляецца кожны раз, калі мы гаворым пра Яго».

Такую цесную ўзаемасувязь можна ўбачыць у шлюбах. Некаторыя пастары часта гавораць пра сваіх жонак у казанях або ў размовах. Яны разам са сваімі жонкамі не толькі дома, але і на вачах іншых. Таму, думаючы пра служыцеля, мы таксама ўспамінаем і пра яго жонку. (Тое самае справядліва, і калі жонка — служыцель.) Мяне часта пытаюцца пра Лізу, калі яе няма са мной, бо я часта пра яе гавару і пішу. Аднак ёсць і іншыя служыцелі, якія, хоць і жанатыя, рэдка ўзгадваюць пра жонак, і вы рэдка бачыце іх разам. Узгадаўшы такога служыцеля, вы не адразу скеміце, з кім яны жанатыя.

Тое самае тычыцца і Святога Духа. Ёсць дзеці Божыя, якія маюць цесную ўзаемасувязь з Духам Божым. Калі вы кажаце пра іх, то думаеце пра Святога Духа, таму што гэтыя мужчыны ці жанчыны свядома служаць як Яго малодшыя партнёры: пастаянна прызнаюць Яго, таму Ён праяўляецца ў іх служэнні. У выніку Ісус атрымлівае большую пашану, бо Дух Божы праслаўляе Ісуса.

Святы Дух хоча быць у цеснай узаемасувязі з вамі. Калі вы будзеце шанаваць Яго, то Ён праявіцца, але калі гэтага не рабіць, сітуацыя будзе такой жа, як у пастара, які не мае блізкасці з жонкай. Ён і яго жонка будуць далёкімі адзін ад аднаго, і гэта будзе бачна іншым. Таму падумайце над словамі: «Няхай цесная узаемасувязь са Святым Духам будзе з вамі».

## Блізкасць

Апошняе азначэнне ў спісе вышэй — слова *блізкасць*. Гэта слова найлепш вызначае супольнасць, бо яно абагульняе чатыры папярэднія пункты, якія мы абмяркоўвалі. Фактычна, адно з вызначэнняў *супольнасці* ў слоўніку Вэбстэра — гэта *блізкая сувязь або ўзаемаразуменне, камунікацыя*. Блізкасць можа развівацца толькі праз камунікацыю, якая вядзе да моцнага сяброўства. У адным з перакладаў Новага Запавету гэта гучыць так: «Блізкае сяброўства Святога Духа будзе з усімі вамі» (*The Message*).

Зноў жа, усё зводзіцца да сяброўства -- канчатковай мэты супольнасці. Дух Божы жадае быць вашым сябрам. Ён прагне вашай супольнасці. Ён жадае навучыць вас таму, што ведае, і Яго веды бясконцыя! Ён — Бог; для Яго няма нічога схаванага ці таямнічага. Ён валодае ўсімі ведамі, як кажа Ісая:

> «Хто ўзважвае *Дух ГОСПАДА*? І які чалавек Яму даваў параду сваю? З кім Ён раіўся і хто настаўляў Яго, і хто вучыў Яго сьцежцы суду, і вучыў Яго веданьню, і шляху розуму навучаў Яго?» (Іс. 40:13–14, *курсіў аўтара*).

Адказ: ніхто, бо Ён — Бог!

Паўтару яшчэ раз: Ён — Бог! Яго мудрасць, веды і разуменне бязмежныя, і Ён прагне навучыць вас таму, што ведае. Падумайце: калі вы ведаеце нешта вельмі каштоўнае, вы горача жадаеце падзяліцца гэтым з блізкімі і любімымі людзьмі. Бог дзейнічае гэтаксама. Ён хоча падзяліцца з вамі тым, што ведае! Вось што дасяжна вам! Магчыма, вы нешта ўпусцілі, бо не імкнуліся да асобы Троіцы, якая жыве ў вас. Магчыма, вы спрабавалі развіваць свае адносіны з Ісусам асобна ад Святога Духа?

Вельмі часта вернікі спрабуюць наблізіцца да Ісуса асобна ад блізкіх адносін са Святым Духам. Нядаўна я разважаў пра гэта, і мне прыйшла думка: у часы зямнога служэння Ісуса габрэі часта хацелі адносін з Богам асобна ад Ісуса. Яны заяўлялі: «Мы не з распусты народжаныя; аднаго Айца маем, Бога» (Ян 8:41) і «Мы вучні Майсея. Мы ведаем, што з Майсеем гаварыў Бог» (Ян 9:28–29). Людзі былі ўпэўненыя ў сваіх адносінах з Богам, якіх насамрэч не мелі. Упэўненасць паходзіла з таго, што яны ведалі Божае Слова (Пісанне), дадзенае праз Майсея. Але ці ведалі яны Слова? Габрэі адмовіліся прымаць парады таго самага Слова, якое сталася целам і жыло сярод іх.

Нягледзячы на гэта, сёння многія вернікі жадаюць мець адносіны з Ісусам асобна ад Святога Духа. Але менавіта Дух Святы жыве сярод нас, і ніхто не пазнае Ісуса асобна ад Яго. Сітуацыю ўскладняе тое, што нам лягчэй ігнараваць Духа Божага, чым габрэям – Ісуса, таму што Дух не з'яўляецца плоцццю і крывёю, як Ісус.

Ісус кажа: «Калі б вы пазналі Мяне, пазналі б і Айца Майго» (Ян 14:7). Ісус проста казаў: «Айца няма тут, Ён на нябёсах; але калі вы пазнаеце Мяне, вы пазнаеце і Майго Айца, бо Мы адно». Тое самае можна сказаць і пра Святога Духа. Ісуса больш няма тут, Ён на нябёсах; калі вы пазнаеце Святога Духа, вы пазнаеце Ісуса, бо яны адно! Вось чаму Святы Дух таксама вядомы як «Дух Хрыста» (1 Пят. 1:11; Рым. 8:9).

## Яшчэ адзін, падобны да Мяне

Перад тым, як пакінуць вучняў, Ісус сказаў ім:

> Калі любіце Мяне, захоўвайце прыказаньні Мае. І Я ўпрашу Айца, і Ён дасьць вам другога Абаронцу, каб

заставаўся з вамі на вякі, Духа праўды, Якога сьвет ня можа прыняць, бо ня бачыць Яго і не пазнаў Яго, а вы пазналі Яго, бо Ён з вамі застаецца і ў вас будзе. Не пакіну вас сіротамі, прыйду да вас (Ян 14:15–18).

Якi глыбокі сэнс змяшчаюць гэтыя словы! Па-першае, зноў звярніце ўвагу: Ісус кажа пра паслухмянасць: «Захоўвайце Мае прыказанні», а далей абяцае: «І Я ўпрашу Айца, і Ён дасць вам...» супольнасць Святога Духа. Ісус звязвае атрыманне Святога Духа непасрэдна з паслухмянасцю Яго Слову, адсюль і страх перад Госпадам. Пётр пацвярджае: «І сьведкі Ягоныя на словы гэтыя — мы і Дух Сьвяты, Якога Бог *даў тым, што слухаюцца Яго*» (Дз. 5:32, *курсіў аўтара*). Зноў жа, звярніце ўвагу на партнёрства. Былі ўзгаданы два розныя сведкі: вучні і Святы Дух. Пётр кажа: Бог дае Святога Духа тым, хто слухаецца Яго. Мы зноў бачым, што падмурак блізкасці — страх перад Госпадам. Чаму б не прапаведаваць пра гэта больш?

Вернемся да Яна 14. Ісус кажа, што Айцец дасць тым, хто баіцца Бога, «*другога* Абаронцу». У Новым Запавеце ёсць два грэчаскія словы, перакладзеныя як *другі (англ. слова “another”)*. Даследаваўшы іх, мы даведаемся больш пра Святога Духа. Першае грэчаскае слова *allos* азначае «яшчэ адзін такога ж роду». Другое слова — *heteros* азначае «яшчэ адзін іншага роду».

Розніцу паміж імі ілюструе наступны прыклад: уявім, вы просіце фрукт, і я даю вам персік. З’еўшы яго, вы просіце яшчэ адзін фрукт, і тады я даю вам яблык. Вы атрымалі яшчэ адзін плод, але іншага гатунку. Калі я дам вам яшчэ адзін персік, гэта фрукт такога ж гатунку — ён дакладна такі самы, як і той, што я даў вам раней. Так можна патлумачыць розніцу паміж *heteros* і *allos*.

Ісус выкарыстоўвае слова *allos* — яшчэ адзін *такога ж роду*. Ён кажа: «Святы Дух падобны да Мяне». Грэчаскае слова *parakletos*, якое азначае «Памочнік» (у бел. перакл. – Абаронца), паходзіць ад *para (*на баку) і *kaleoo (*клікаць). Такім чынам, слова *parakletos* азначае «*той, хто паклікаavы на бок іншага, каб дапамагчы яму*». Першапачаткова яно выкарыстоўвалася ў судзе для абазначэння памочніка юрыста, адваката абароны, абаронцы; пазней – для таго, хто абараняе чужую справу, заступніка або абаронцы. Цікава, што ў пасланнях *parakletos* выкарыстоўваецца толькі адзін раз для абазначэння Ісуса (1 Ян 2:1). Такім чынам, як Ісус заўсёды жыве, каб быць нашым абаронцам або заступнікам, так і Святы Дух таксама з'яўляецца нашым абаронцам і пакліканы дапамагаць нам.

Ісус кажа вучням: «Менавіта так, як Я быў з вамі, і Ён будзе з вамі». Я часта чую, як вернікі кажуць: «О, калі б я толькі мог хадзіць з Ісусам, я б задаў столькі пытанняў». Ці задалі б? Такія словы сведчаць пра адсутнасць блізкасці са Святым Духам у жыцці такіх людзей. Калі яны не маюць адносін з Духам Божым, то па якой прычыне думаюць, што зробяць інакш у прысутнасці Ісуса? Ісус сказаў вучням словы, якія здзіўляюць:

> «Але Я праўду кажу вам» (Ян 16:7).

Дазвольце зазначыць: такі ўступ да Яго заявы заўсёды мяне здзіўляў. Ісус хадзіў з вучнямі тры з паловай гады і ніколі не хлусіў і не выказваў падманлівых думак. Усё сказанае Ім за гэтыя гады заўсёды спраўджвалася. Але Ісус збіраецца падзяліцца з вучнямі чымсьці настолькі нечаканым, што Яму даводзіцца пачаць словамі: «Хлопцы! Тое, што Я збіраюся

сказаць, не хлусня, а праўда!» Давайце заглыбімся ў гэтую ашаламляльную заяву:

> Карысьней для вас, каб Я адыйшоў; бо калі Я не адыйду, Абаронца ня прыйдзе да вас, а калі пайду, пашлю Яго да вас (Ян 16:7).

Спыніцеся і падумайце над гэтымі словамі. Ісус кажа: для іх лепш, каб Ён пайшоў. Цяпер вы разумееце, чаму Ён пачаў словамі: «Але Я праўду кажу вам». За гэты час Ісус навучыў вучняў надзвычай глыбокім рэчам пра Валадарства. Ён ацаляў хворых, уваскрашаў мёртвых, аплачваў рахункі ды падаткі, выганяў духаў, якія мучалі людзей. І гэта быў толькі пачатак. Але цяпер Ён кажа, што для іх лепш, каб Ён пайшоў! Чаму? Вось Яго адказ: калі Ён пойдзе, то пашле нам Абаронцу.

Падумайце: калі б Ісус застаўся на зямлі і мы хацелі б мець адносіны з Ім ці задаць Яму пытанні, нам давялося б сесці на самалёт у Тэль-Авіў, потым арэндаваць машыну, каб дабрацца да вёскі ў Галілеі, пасля знайсці Яго. Гэта было б проста, бо вакол Ісуса збіраліся б тысячы. Перш чым падысці і задаць пытанне, прыйшлося б пачакаць, пакуль тысячы сыдуць. Потым трэба было б пачакаць, пакуль змоўкне гаваркі Пётр. Яшчэ ёсць таксама не маўклівыя Якуб і Ян, Сыны Грому. Побач стаяць іншыя вучні, таксама чакаючы магчымасць задаць пытанні, што ў іх на сэрцы. Апроч усяго, Ісусу трэба спаць шэсць-восем гадзін у суткі, клапаціцца пра Свае асабістыя патрэбы і перыядычна есці.

Але прыгажосць Святога Духа, які жыве ўнутры нас, заключаецца ў тым, што Яму не трэба спаць. Вы можаце размаўляць з Ім у любы час дня і ночы, і вам не трэба чакаць, пакуль скончаць іншыя. Яго поўная і непадзельная

ўвага належыць вам увесь час. Адначасова з Ім могуць шчыра размаўляць дзясяткі тысяч людзей! Ён здольны мець асабістыя адносіны з кожным, хто прагне Яго. І гэта яшчэ не ўсё. Далей будзе яшчэ лепш, бо Ісус працягвае:

> Яшчэ шмат што маю сказаць вам, але вы цяпер ня можаце перанесьці. Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, то будзе весьці вас да ўсякае праўды, бо не ад Сябе гаварыць будзе, але будзе гаварыць тое, што пачуе, і абвесьціць вам, што мае прыйсьці. Ён праславіць Мяне, бо з Майго возьме і вам абвесьціць. Усё, што мае Айцец, ёсьць Маё; таму Я сказаў, што з Майго возьме і вам абвесьціць (Ян 16:12–15).

Калі Святы Дух гаворыць з намі, па сутнасці, з намі гаворыць Ісус, бо Ён – Слова Айца да нас. Так-так, хаця гэта тры розныя асобы — кожная мае розум, волю і эмоцыі — усе яны адно. Паміж імі не бывае нязгоды: Айцец, Сын і Дух заўсёды адзіныя ў мэце, плане і выкананні волі. Успомніце выразнае сцвярджэнне Святога Пісання: «Слухай, Ізраіль! ГОСПАД, Бог наш, — ГОСПАД адзіны!» (Друг. 6:4).

## Тры ўзроўні ўзаемаадносін

Ва ўрыўку вышэй Ісус сказаў вучням, што хацеў яшчэ шмат адкрыць, але яны не маглі вынесці. Вучні не маглі зразумець больш глыбокія рэчы Бога праз пачуцці.

Узгадайце ўваскрасенне Ісуса з мёртвых: Ён з’явіўся дзесяці вучням, а Тамаша з імі не было. Пачуўшы сведчанні іншых пра жывога Ісуса, Тамаш сказаў: «Калі ня ўбачу на руках Ягоных ранаў ад цьвікоў і ня ўткну пальца майго ў раны ад цьвікоў, і не ўлажу рукі маёй у бок Ягоны, не паверу» (Ян 20:25).

Пазней Ісус з’явіўся ўсім і адразу прапанаваў Тамашу ўкласці палец у Яго руку, а руку – у бок Ісуса, і паверыў. Тамаш усклікнуў: «Госпад мой і Бог мой!» Тады Ісус сказаў Тамашу тое, што я доўга не разумеў:

> «Ты паверыў, Тамаш, таму што ўбачыў Мяне. Шчасьлівыя тыя, якія ня бачылі і паверылі» (Ян 20:29).

Раней мне здавалася, што Ісус быў строгі да Тамаша, не даўшы надзеі пасля таго, як той ужо пакаяўся і ўсклікнуў: «Госпад мой і Бог мой!» Мае разважанні былі няправільнымі з-за няведання і няправільнага разумення. Пазней Святы Дух прынёс святло адносна таго, што меў на ўвазе Ісус. Ён не быў строгі да Тамаша; хутчэй Ён проста канстатаваў факты. Ісус казаў: тыя, хто ведае Яго праз фізічныя пачуцці, ніколі не змогуць пазнаць Яго так глыбока, як тыя, хто ведае Яго духам, таму апошнія больш шчаслівыя.

Паглядзіце на апостала Паўла. Ён ніколі не хадзіў з Ісусам, як Пётр і іншыя; хутчэй ён спазнаў Ісуса праз адкрыццё Святога Духа. Павел пісаў:

> Паведамляю ж вам, браты, што Эвангельле, якое я дабравесьціў, ня ёсьць ад чалавека; бо я не праз чалавека прыняў яго і быў навучаны, але праз адкрыцьцё Ісуса Хрыста… Калі ж спадабалася Богу, Які аддзяліў мяне ад улоньня маці маёй і паклікаў ласкай Сваёй, адкрыць у-ва мне Сына Свайго, каб я дабравесьціў Яго сярод паганаў, я адразу не зьвярнуўся да цела і крыві і не ўзыйшоў у Ерусалім да апосталаў, якія былі раней за мяне, але пайшоў у Арабію і зноў вярнуўся ў Дамаск (Гал. 1:11–17).

З цягам часу Павел змог дасягнуць такой глыбіні адносін з Госпадам, якой не дасягнуў ніхто з першых апосталаў. Пётр нават згадаў пра гэта, напісаўшы:

> І доўгацярплівасьць Госпада нашага ўважайце за збаўленьне, як і ўлюбёны брат наш Павал, паводле дадзенай яму мудрасьці, напісаў вам, як ён кажа пра гэта ў-ва ўсіх пасланьнях, *у якіх ёсьць нешта складанае да разуменьня* (2 Пт. 3:15–16*, курсіў аўтара*).

Ого! Пётр хадзіў з Самім Настаўнікам тры з паловай гады, а Павел – не, аднак менавіта Павел у такой ступені разумее прыроду і шляхі Ісуса, што нават Пятру гэта было цяжка зразумець. Чаму? Хутчэй за ўсё, Пётр пастаянна перажываў успаміны пра тое, што бачыў і чуў, і гэта перашкаджала паглыбіцца ў блізкасць з Ісусам. Вось чаму Ісус сказаў: «Колькі яшчэ хачу сказаць вам, але цяпер вы не вытрымаеце. Калі прыйдзе Дух праўды, Ён накіруе вас на ўсю праўду».

У якасці ілюстрацыі (яна часткова праясняе прычыну) паглядзім на людзей, якія знаходзяць каханне праз інтэрнэт, ніколі не сустракаючыся асабіста. Так здараецца часта, і сяброўства можа лёгка ператварыцца ў больш моцнае каханне, чым у тых, хто знаёмы асабіста.

Такія адносіны могуць нават разбурыць шлюб, і я ведаю адпаведныя прыклады. Аднойчы ўвечары пасля служэння я падышоў да мужчыны, у якога відавочна было цяжка на сэрцы. На руках ён трымаў двух немаўлят. Занепакоены, я спытаў: «Усё ў парадку?»

Ён сказаў: «Не, мая жонка нядаўна кінула мяне і ўцякла з мужчынам, з якім пазнаёмілася ў інтэрнэце».

Аказалася, жонка сышла ад яго і шасцярых дзяцей дзеля

мужчыны, з якім ніколі не сустракалася асабіста. Яны моцна закахаліся праз інтэрнэт, і пачуццё так захапіла яе, што жанчына пакінула ўласных дзяцей.

Вяртаючыся да пазітыву, зазначу: часам я назіраў, як тыя, што пачалі адносіны на адлегласці, праз інтэрнэт, мелі больш глыбокі ўзровень блізкасці, чым тыя, хто пастаянна сустракаўся асабіста. Прычына зноў жа ў тым, што яны змаглі выйсці за межы фізічнага і зблізіліся душой. Часта, калі людзі сустракаюцца асабіста, яны атрымліваюць перавагу ад фізічных аспектаў, а прыгажосць ці знешнія манеры не даюць ім убачыць сапраўднага чалавека.

Мы ўжо гаварылі, што існуюць тры ўзроўні камунікацыі: словы, учынкі і сэрца. Таксама існуюць тры ўзроўні адносін або пазнання іншага чалавека. Самы першы — натуральны або фізічны ўзровень. На жаль, менавіта ён матывуе многія шлюбы, і як толькі фізічнае цела губляе прывабнасць, сужонкі аддаляюцца. Ён часта паглыбляецца ў спорт, хобі, служэнне і г.д., а яе вабіць шопінг, сябры, служэнне і г. д. Гэта вельмі сумна.

Далей ідзе душа або асоба чалавека. Гэта ўзровень адносін паміж Давідам і Ёнатанам. Мы чытаем: «Душа Ёнатана прыхілілася да душы Давіда» (1 Сам. 18:1). Давід, аплакваючы яго смерць, усклікнуў: «Цяжка мне, бо [няма цябе], браце мой Ёнатан! Ты быў вельмі дарагі для мяне. Твая любоў для мяне даражэй за любоў жаночую» (2 Сам. 1:26). Давід не меў сексуальных адносінаў з Ёнатанам, паміж імі не было фізічнага прыцягнення; але іх звязваў больш высокі ўзровень, чым фізічны. Заява Давіда паказала: любоў Ёнатана ён цаніў вышэй за жаночую. Сябры ведалі адзін аднаго на больш высокім узроўні, на ўзроўні душы. Разуменне, што ўзровень душэўных адносін вышэйшы за фізічны, тлумачыць, чаму людзі могуць пакідаць сем'і дзеля знаёмых, якіх

знайшлі па тэлефоне, па перапісцы або ў інтэрнэце.

Аднак найвышэйшы ўзровень пазнання кагосьці — гэта духоўны ўзровень. Вось чаму Павел кажа:

> «Дух усё дасьледуе, і глыбіні Божыя. Бо хто з людзей ведае, што ў чалавеку, акрамя духа чалавечага, які ў ім? Гэтак і таго, што ў Бога, ніхто ня ведае, акрамя Духа Божага. А мы атрымалі ня духа сьвету, але Духа, Які ад Бога, каб ведаць, што падаравана нам ад Бога» (1 Кар. 2:11–12).

На гэтым узроўні Павел спазнаў Ісуса. Хоць Пётр таксама ведаў Госпада на гэтым узроўні, але ён, хутчэй за ўсё, вярнуўся да ўспамінаў пра веданне Ісуса на тых узроўнях, калі яны хадзілі разам у целе. Таму Павел дарэчна заўважае:

> Так што мы адгэтуль нікога ня ведаем паводле цела; а калі і ведалі Хрыста паводле цела, дык цяпер ужо ня ведаем (2 Кар. 5:16).

Калі мы хочам дасягнуць глыбокага пазнання Бога, трэба ўсвядоміць: найвялікшае дабраславенне, якое Ён нам даў, — адкрыццё Сябе не праз цела, а праз Дух.

Ого! Вы ўсхваляваны? Якому цудоўнаму Госпаду мы служым. Ён прагне, каб мы глыбока Яго ведалі. Ён першым пажадаў такой блізкасці. Ваша сэрца гэтага прагне ?

## Пытанні для вывучэння

1. Вы калі-небудзь маліліся: «Калі ласка, вазьмі мяне дадому ў Нябёсы, каб я быў з Табой»? Пры якіх абставінах?

2. Многія ў царкве спрабуюць наблізіцца да Ісуса, мінаючы блізкія адносіны са Святым Духам, хаця пры гэтым ведаюць, што без Святога Духа ніхто не спазнае Ісуса. Чаму? Ці пераканаліся вы ў тым, што Ісуса ў вашым жыцці можна спазнаць толькі праз Святога Духа?

3. Паразважайце пра партнёрскую ролю Святога Духа: як Яго прысутнасць уплывае на вашу ўпэўненасць у тым, каб адкрываць сваё сэрца Богу? Ці ёсць тое, што вы можаце не адкрываць Яму?

Раздзел 11

# АБЯЦАННЕ АЙЦА

Вы ніколі не будзеце дабраслаўлёныя тым,
у што не верыце.

Я паверыў у Хрыста як Збаўцу ў 1979 годзе. Мне сведчыў брата са студэнцкага таварыства ва ўніверсітэце. Я ведаў: пакінуўшы старое жыццё і прызнаўшы Ісуса Хрыста Госпадам, я стаў належаць да Валадарства Божага. Пісанне кажа: «Бо калі ты вуснамі тваімі вызнаеш Ісуса Госпадам і ў сэрцы тваім будзеш верыць, што Бог уваскрасіў Яго з мёртвых, будзеш збаўлены, бо сэрца верыць дзеля праведнасьці, а вусны вызнаюць дзеля збаўленьня» (Рым. 10:9–10).

Не было ніякіх сумневаў, што я быў збаўлены. Пра гэта сведчыла маё сэрца, і гэта пацвярджала Пісанне. Але ў новым жыцці чагосьці не хапала, і некалькі месяцаў я не

мог зразумець, чаго менавіта. Госпад здаваўся далёкім, хоць я ведаў, што я — Яго дзіця. Хоць я вельмі старанна чытаў Пісанне, здавалася, я быў у воблаку; было цяжка зразумець, і я атрымліваў толькі абмежаваную колькасць разумення, нягледзячы на тое, што я чытаў яго старанна. Мне таксама не хапала здольнасці жыць ў перамозе над неспрыяльнымі абставінамі: я быў бездапаможным перад моцным ціскам аднагодкаў ва ўніверсітэце.

З часам мне сустракаліся людзі, якія мелі больш прыгожыя і асабістыя адносіны з Госпадам, чым я. Гэта мяне бянтэжыла. Што яны прапусціў? Чаму Бог даў ім такую блізкасць, якую я, падавалася, не мог знайсці? Мае знаёмыя мелі сілу і разуменне шляхоў Госпада, а ў мяне так не атрымлівалася. Вывучаючы Біблію, я зразумеў: ёсць яшчэ адзін досвед пра Госпада, які я не перажыў.

## Абяцанне Айца

Давайце паглядзім, што я даведаўся з Пісання. Вось падзеі непасрэдна перад тым, як Ісус быў узяты на неба:

> І, сабраўшы іх, *загадаў* ім: «Не адыходзьце з Ерусаліму, але чакайце на абяцаньне Айца, пра якое вы чулі ад Мяне, што Ян хрысьціў вадою, а вы праз некалькі дзён будзеце ахрышчаны Духам Сьвятым». А яны, зыйшоўшыся, пыталіся ў Яго, кажучы: «Госпадзе, ці ня ў гэты час Ты адновіш валадарства Ізраіля?» (Дз. 1:4–6, *курсіў аўтара*)

Ісус сказаў тым, хто паверыў, нікуды не ісці, не прапаведаваць, не засноўваць цэрквы і не выконваць сваё пакліканне, пакуль яны не атрымаюць «Абяцанне Айца»,

якое, паводле Яго слоў, было хрышчэннем Святым Духам. Слова «ахрышчаны», якое Ісус выкарыстоўвае ў вершы, паходзіць ад грэчаскага слова *baptizo* і азначае «апускаць, пагружаць; рабіць перапоўненым». Ісус меў на ўвазе пагружэнне ў Святога Духа, якога вучні яшчэ не перажывалі, хаця яны верылі ва ўваскрасенне Ісуса, вызнавалі Яго Госпадам, былі Яго вернымі паслядоўнікамі і ішлі ў нябёсы.

Першае, што мяне ўразіла: атрыманне Святога Духа не было прапановай, выбарам ці рэкамендацыяй. Гэта быў *загад*! Загад даецца для нашай карысці, абароны або дабра Валадарства. Мы не павінны легкадумна ставіцца да Божых прыказанняў як дзеля нас, так і дзеля Валадарства.

Вучні яшчэ не ведалі, што абяцанне Айца, якое было загадана атрымаць, споўніцца толькі праз дзесяць дзён пасля таго, як Ісус узнясецца на неба. Цікава, што пасля ўваскрэсення з мёртвых Ісус з’явіўся пяцістам вернікам (1 Кар. 15:6), але толькі сто дваццаць былі ў залі праз дзесяць дзён пасля Яго ўзнясення. Я цвёрда перакананы: большасць з пяціста чакала Абяцання, але з цягам часу сышла праз нецярплівасць, сумневы, нявер’е ці іншыя прычыны, пакуль не засталася толькі малая частка. На жаль, амаль восемдзесят працэнтаў вучняў не зрабілі так, як загадаў Ісус.

Тыя, хто застаўся, былі аднадушныя. Яны памерлі для ўласных справаў, не ставіліся легкадумна да загаду Ісуса. Я цвёрда перакананы: вучні былі гатовы заставацца там столькі, колькі спатрэбіцца, бо Настаўнік сказаў застацца. Калі засталіся толькі тыя, хто сур’ёзна ўспрыняў загад Ісуса, адбылося наступнае:

> І калі надыйшоў дзень Пяцідзясятніцы, былі ўсе аднадушна разам. І стаўся раптам шум з неба, быццам

ад наляцеўшага гвалтоўнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. І паказаліся ім падзеленыя языкі, быццам агнявыя, і паселі на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі гаварыць іншымі мовамі, як Дух даваў ім прамаўляць (Дз. 2:1–4).

Той дзень называўся «Пяцідзясятніца». Гэтая назва – не новазапаветны тэрмін, а адно з галоўных святаў Ізраіля. Звярніце ўвагу: вучні былі *напоўнены* або *ахрышчаны* Святым Духам, як і казаў Ісус. Так абяцаў Айцец, і абяцанне суправаджалася гаварэннем на *іншых мовах*.

Для некаторых людзей сёння тэрмін *«мовы»* незразумелы ці здаецца таямнічым выключна з-за няведання. Калі Пісанне кажа пра «*мовы*», як буду рабіць і я, то маецца на ўвазе гаварэнне на незразумелай для вас мове. Мы выкарыстоўваем гэты выраз таксама і па-за біблійным кантэкстам. Калі вы размаўляеце з іншаземцам на замежнай мове, вы пытаецеся, якая яго *родная мова*. Гэта значыць, вы цікавіцеся, на якой мове ён упершыню пачаў гаварыць у дзяцінстве.

Шум наляцеўшага моцнага ветру быў знакам Святога Духа, які ўпершыню ўвайшоў у храмы, дзе заўсёды хацеў жыць. Зноў жа, Пісанне не кажа, што Дух — вецер; хутчэй, вецер быў праявай Яго прыходу.

## Супрацьлеглыя шляхі

Цяпер дазвольце зрабіць цікавае назіранне. Шатан і яго паплечнікі заўсёды робяць так, каб сказіць Божыя шляхі. Кожны раз, калі Святы Дух прыходзіць кудысьці ўпершыню, Ён з’яўляецца так, што гэта немагчыма прапусціць. Людзі *бачылі* і *чулі* праяўленне Духа, калі Ён напаўняў іх — так паўтараецца не аднойчы ў кнізе Дзеяў. Калі Святы Дух

сыходзіць, Ён робіць гэта ціха. Успомніце: Даліла сказала Самсону, што філістымцы напалі на яго, і той ускочыў і сказаў:

> «Пайду як раней і вызвалюся», *ня ведаючы*, што ГОСПАД адыйшоў ад яго (Суд. 16:20, курсіў аўтара).

Самсон не ведаў, што Госпад адышоў, таму што Божы Дух заўсёды сыходзіць ціха. Дэманы прыходзяць ціха, а сыходзяць з нейкім праявамі (вы ўбачыце гэта ва ўсіх Евангеллях).

## Абяцанне для ўсіх

Цяпер вернемся да дня Пяцідзесятніцы. Габрэі з розных краёў зямлі наведвалі Ерусалім на свята. Горад пачуў шум ветру, і натоўпы людзей пайшлі туды, дзе былі вучні. Вандроўнікі былі ў шоку, пачуўшы, як неадукаваныя вучні гавораць пра цудоўныя справы Бога на зразумелых ім, вандроўнікам, мовах. Здзіўленыя, яны закрычалі: «Што гэта значыць?»

Пётр скарыстаўся іх збянтэжанасцю і прапаведаваў пра Ісуса ўсім прысутным. Пад канец пропаведзі ён сказаў:

> Гэтага Ісуса ўваскрасіў Бог, і ўсе мы — сьведкі гэтага. Дык узьнесены правіцаю Бога і ўзяўшы ад Айца абяцаньне Сьвятога Духа, Ён выліў тое, што вы цяпер *бачыце* і *чуеце* (Дз. 2:32–33, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу, Пётр сказаў, што яны маглі *бачыць* і *чуць* абяцанне Святога Духа. Скажыце сабе: «бачыць і чуць». Важна, каб мы памяталі пра гэта, чытаючы наступныя вершы.

Натоўп быў крануты і спытаў, што рабіць.

> Пётар адказаў: «Навярніцеся, і няхай кожны з вас будзе ахрышчаны ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэньня грахоў, і возьмеце дар Сьвятога Духа. Бо *абяцаньне* для вас, і для дзяцей вашых, і *для ўсіх, якія далёка, каго пакліча Госпад, Бог наш*» (Дз. 2:38–39, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу: абяцанне, якое яны бачылі і чулі, *належыць усім, хто далёка, каго пакліча Госпад Бог наш*. Тое, што вучні атрымалі ў залі, было абяцана кожнаму, хто заклікае Госпада, у тым ліку вам і мне!

А зараз я хацеў бы коратка прайсціся па кожнай узгадцы пра чалавека, які атрымліваў Святога Духа ў Новым Запавеце. Звярніце ўвагу на дзве рэчы. Па-першае, ва ўсіх сітуацыях, акрамя адной, гэта быў досвед, адрозны ад прыняцця Ісуса Хрыста як Госпада. Па-другое, ва ўсіх выпадках сведкі маглі бачыць і чуць знешнюю праяву таго, што іншыя людзі напаўняюцца Святым Духам.

## Самарыя

Філіп пайшоў у адзін з гарадоў Самарыі і абвяшчаў Ісуса. Натоўпы людзей выходзілі яго паслухаць. Адбываліся велізарныя цуды, «бо з многіх, якія мелі духаў нячыстых, яны выходзілі, крычучы моцным голасам, а шмат спаралізаваных і кульгавых былі аздароўленыя» (Дз. 8:7). Евангелле было магутным, і вялікая радасць напаўняла горад. Мы чытаем:

> А калі паверылі Філіпу, які дабравесьціў пра Валадарства Божае і імя Ісуса Хрыста, былі ахрышчаны як мужчыны, так і жанчыны. Дый Сымон і той паверыў, і, ахрысьціўшыся, трываў пры Філіпе. А бачачы знакі і цуды вялікія, што рабіліся, дзівіўся (Дз. 8:12–13).

## АБЯЦАННЕ АЙЦА

Людзі паверылі ў добрую вестку пра Ісуса Хрыста і ахрысціліся ў вадзе. Згодна з Пісаннем, яны адрадзіліся ў Валадарстве Божым. Аднак, чытаючы далей, мы знаходзім:

> Апосталы ж, што былі ў Ерусаліме, пачуўшы, што Самарыя прыняла слова Божае, паслалі да іх Пятра і Яна, якія, прыйшоўшы, памаліліся за іх, каб атрымалі Духа Сьвятога, бо Ён ня быў на нікога з іх зыйшоўшы, а толькі былі яны ахрышчаны ў імя Госпада Ісуса (Дз. 8:14–16).

Дадатковае пацверджанне, што яны ўжо нарадзіліся ў Валадарстве Божым, даецца ў словах «былі яны ахрышчаны ў імя Госпада Ісуса». Няма сумненняў, што тыя людзі вызваліліся з царства цемры і цяпер належалі да сям'і Бога. Але нягледзячы на тое, што яны сталі народжанымі звыш вернікамі, яны ўсё яшчэ не былі ахрышчаны Святым Духам.

Вы можаце спытацца, як яны маглі быць збаўлены, бо Пісанне ясна кажа: «ніхто ня можа назваць Ісуса Госпадам, як толькі ў Духу Сьвятым» (1 Кар. 12:3). Гэта праўда, мы не можам вызнаваць панаванне Ісуса без уплыву Святога Духа, але гэта зусім не тое ж самае, што быць напоўненым Духам. У момант навяртання мы асвячаемся і запячатаныя Духам Святым, які селіцца ў нас (гл. 1 Пт. 1:2; Эф. 1:13; Рым. 8:9–11), але мы не напоўнены Яго прысутнасцю, пакуль не папросім Айца ў імя Ісуса. Бо Пісанне кажа:

> «Дык вось, калі вы, будучы злымі, умееце добрыя дары даваць дзецям вашым, тым больш Айцец Нябесны дасьць Духа Сьвятога тым, што просяць у Яго!» (Лк. 11:13).

З Яго слоў «Айцец Нябесны» мы бачым: такое абяцанне дадзена толькі тым, хто ўжо з’яўляецца Яго дзецьмі. У тым жа ключы Ісус пазней кажа, што «сьвет ня можа прыняць» Духа праўды (Ян 14:17). З гэтых слоў мы разумеем, што гэта асобны вопыт, адрозны ад нараджэння звыш у Валадарстве.

Працягнем пра жыхароў Самарыі:

> Тады яны ўсклалі на іх рукі, і яны атрымалі Духа Сьвятога. Сымон жа, *пабачыўшы*, што праз ускладаньне рук апосталаў даецца Дух Сьвяты, прынёс ім грошы, кажучы: «Дайце і мне гэткую ўладу, каб той, на каго ўскладу рукі, атрымаў Духа Сьвятога» (Дз. 8:17–19, *курсіў аўтара*).

Вернікі атрымалі Святога Духа ўжо пасля таго, як былі выратаваны. Нам не сказана канкрэтна, ці гаварылі людзі на іншых мовах; аднак чаму Сымон прапаноўваў ім грошы? Пісанне кажа: Сымон *убачыў*, што яны атрымалі Святога Духа. Было відавочнае праяўленне, і гэта яўна было гаварэнне на іншых мовах, бо адпавядае перажыванням падчас напаўнення Духам у Новым Запавеце.

Разглядаючы гэты біблейскі аповед пра Самарыю, па-першае, мы бачым, што атрыманне Божага Духа было адрозным ад пакаяння досведам, і, па-другое, яно суправаджалася знешнімі праявамі.

## Эфес

Апостал Павел і яго каманда прыйшлі ў Эфес і знайшлі некаторых вучняў. Першае пытанне, якое Павел ім задаў, было:

## АБЯЦАННЕ АЙЦА

«Ці прынялі вы Духа Сьвятога, паверыўшы?» (Дз. 19:2)

Гэта павінна быць і нашым першым пытаннем да тых, хто нядаўна паверыў у Госпада. Чаму мы хочам, каб людзі жылі хаця б гадзіну без блізкасці з Госпадам і без сілы быць сведкамі Ісуса (гл. Дз. 1:8)?

Тыя вучні не чулі пра Святога Духа, яны толькі былі ахрышчаны ў вадзе Янам Хрысціцелем. Таму Павел і яго спадарожнікі расказалі ім пра збаўленне, якое прыходзіць праз Ісуса Хрыста. Далей мы чытаем:

> Пачуўшы ж, яны былі ахрышчаныя ў імя Госпада Ісуса (Дз. 19:5).

Згодна з Пісаннем, яны, безумоўна, народжаныя звыш у Валадарства Нябеснае, бо вызналі ўладу Ісуса і былі ахрышчаны вадой. Далей мы знаходзім:

> І, як усклаў Павал рукі на іх, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, і гаварылі мовамі, і прарочылі (Дз. 19:6).

Зноў людзі пачалі гаварыць на іншых мовах і прарочыць, як толькі Дух Божы напоўніў іх, і зноў тыя, хто стаяў побач, маглі *бачыць* і *чуць* праяўленне ў тых, хто прыняў дар Духа.

Прарочыць азначае «гаварыць пад Божым натхненнем». Пётр прарочыў у дзень Пяцідзесятніцы, калі прамовіў бліскучае пасланне, якое прывяло тысячы ў Валадарства Нябеснае. Ён абвясціў Слова Божае без якой-небудзь падрыхтоўкі або папярэдняга вывучэння; Пётр прамаўляў пад натхненнем. Людзі ў Эфесе мала разумелі шляхі Божыя, пакуль не прыйшоў Святы Дух, а пасля, напоўненыя ім, яны натхнёна прамаўляюць Слова Божае.

Тое самае адбываецца з кожным, хто напоўнены Духам Божым. *Настаўнік* прыходзіць да нас жыць, і Божыя рэчы становяцца больш зразумелымі. Слова і шляхі Божыя да хрышчэння Духам былі для мяне невыразнымі. Пасля ўсё змянілася: Біблія адкрылася мне асабіста. Я бачыў шмат людзей, што доўгі час верылі, не маючы Святога Духа, але пасля напаўнення казалі: «У мяне было так шмат пытанняў, і цяпер на іх ёсць адказы», а таксама: «Біблія стала для мяне такой яснай».

Падобныя каментары адносна вернікаў, напоўненых Духам, і іх ведання Пісання я чуў і ад старанных даследчыкаў Бібліі, якія былі народжаныя звыш, але не напоўненыя Святым Духам. Такія даследчыкі могуць вывучаць Пісанне ў разы болей, але вернік, напоўнены Духам, разумее Пісанне лепей за іх. У адказ на іх здзіўленне я проста кажу: «Гэта зразумела: той, хто не напоўнены Духам, не мае поўнага святла Святога Духа». Але яны могуць яго атрымаць, таму што быць напоўненым Духам — гэта Божае абяцанне ўсім, хто заклікае імя Ісуса! Бог такі добры да нас!

Такім чынам, як і ў выпадку з жыхарамі Самарыі, вернікамі Эфеса атрымалі Божы Дух асобна ад навяртання, і зноў сведкі ўбачылі знешнюю праяву.

## Апостал Павел

У Дзеях 9 Саўл, якога мы ведаем як Паўла, ехаў па дарозе ў Дамаск, каб пераследаваць вернікаў. Непадалёк ад горада ён убачыў асляпляльнае святло з неба і пачуў голас Госпада, які пытаўся:

> «Саўле, Саўле, чаму ты перасьледуеш Мяне?» Саўл адразу спытаў, хто гэта, і Госпад адказаў: «Я – Ісус».

> Тады Саўл спытаў: «Госпадзе, што хочаш, каб я рабіў?» Госпад сказаў яму ісці ў Дамаск і там чакаць.

Я веру, што ў гэты момант Саўл нарадзіўся звыш. І вось дзве прычыны: па-першае, пасля таго, як Госпад сказаў: «Я — Ісус», Саўл назваў Яго «Госпад». Па-другое, Саўл пасціўся і маліўся тры дні, потым Ананія прыйшоў да яго і выразна сказаў:

> «Саўле, *браце*, Госпад паслаў мяне, Ісус, Які зьявіўся табе на дарозе, па якой ты ішоў, каб ты зноў бачыў і *напоўніўся Духам Сьвятым*» (Дз. 9:17, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу на слова «*браце*». Саўл быў вернікам у Ісуса Хрыста, вызнаў Яго Госпадам і маліўся тры дні. Пасля таго, як Саўл нарадзіўся звыш, Ананія маліўся, каб той напоўніўся Святым Духам.

Тут не гаворыцца, што Саўл гаварыў на мовах. Аднак ён сам выразна кажа ў пасланні да Карынцянаў: «Дзякую Богу майму, больш за ўсіх вас гаворачы мовамі» (1 Кар. 14:18). Калі ён пачаў гаварыць на мовах? Калі Ананія усклаў на яго рукі і памаліўся (Дз. 9:17).

## Карнэль і яго сям’я

У Дзеях апісаны рымскі афіцэр Карнэль. Ён, яго сям’я і сябры сталі першымі язычнікамі, якія нарадзіліся зноў. Карнэль часта пасціўся і маліўся, і аднойчы днём яму з’явіўся анёл і сказаў паклікаць Пятра.

Калі праз некалькі дзён Пётр прыйшоў, Карнэль сабраў блізкіх, каб паслухаць добрую вестку. Пётр прапаведаваў пра Ісуса, і перш чым ён скончыў, мы чытаем:

> Калі Пётар яшчэ гаварыў словы гэтыя, зыйшоў Дух Сьвяты на ўсіх, якія слухалі слова. І дзівіліся верныя з абрэзаных, якія прыйшлі з Пятром, што і на паганаў выліты дар Сьвятога Духа, бо чулі іх, як гаварылі мовамі і ўзьвялічвалі Бога (Дз. 10:44–46).

Габрэі не хацелі мець нічога агульнага з язычнікамі ў рэлігійных і амаль усіх сацыяльных пытаннях. Язычнікі былі выключаны з запаветаў абяцання, жылі без надзеі і без Бога (гл. Эф. 2:12). Тое, што адбылося, узрушыла габрэяў, якія былі з Пятром. Яны здзівіліся, бо язычнікі атрымалі збаўленне і Святога Духа.

Гэта адзіны выпадак у Бібліі, калі людзі адначасова атрымалі і збаўленне, і Святога Духа. Вы можаце не згадзіцца, але я асабіста лічу: Бог зрабіў так, бо ведаў, што габрэі не маліліся б, каб Карнэль і яго блізкія збавіліся і атрымалі Святога Духа. Збаўленне язычнікаў габрэі ставілі пад сумнеў. Падумайце: няма ніякіх непасрэдных цудоўных знешніх доказаў таго, што чалавек нарадзіўся звыш. Нават калі б гэтыя людзі прынялі Слова і, як прапаведаваў Пётр, вызналі Ісуса, габрэі не паверылі б, што тыя навярнуліся да Госпада.

Аднак калі Бог напоўніў Карнэля і яго блізкіх Святым Духам і яны пачалі гаварыць на мовах, як і самі габрэі, то апошнія ўжо не маглі адмаўляць, што Бог выліў Сваё збаўленне на язычнікаў.

Гэты выпадак адназначна паказвае: рэальнасць таго, што чалавек атрымаў паўнату Святога Духа, выяўляецца праз гаварэнне на мовах. У іншым перакладзе напісана: «дар Святога Духа быў выліты і на язычнікаў. І не магло быць ніякіх сумневаў у гэтым, бо яны чулі іх, як яны гаварылі на розных мовах і славілі Бога» (Дз. 10:45–46). Як яны ведалі? «Бо яны чулі...» Яны бачылі і чулі абяцанне Айца!

## Мовы змоўкнуць

Вы можаце задацца пытаннем: так, усё гэта праўда для першых вучняў, але хіба ў Бібліі не гаворыцца, што мовы змоўкнуць, калі прыйдзе дасканалае? Так, гаворыцца. Але ці прыйшло дасканалае? Некаторыя кажуць: «Так, дасканалае – гэта Біблія, і цяпер мы яе маем і мовы не патрэбныя». Давайце паглядзім, што кажа Пісанне наконт правільнасці такога тлумачэння. Павел піша:

> «Любоў ніколі ня зьнікне, калі нават прароцтвы зьнікнуць, *калі мовы змоўкнуць*, калі веданьне зьнішчыцца. Бо мы часткова ведаем і часткова прарочым; а калі прыйдзе дасканалае, тады тое, што частковае, зьнікне» (1 Кар. 13:8–10, *курсіў аўтара*).

Па-першае, нам сказана: калі прыйдзе дасканалае, не толькі мовы знікнуць, але і веды (дакладней, *адкрытыя* веды) знікнуць. Такога, безумоўна, яшчэ не адбылося. Таму чытаем далей, каб дакладна даведацца пра час, калі «прыйдзе дасканалае».

> Бо цяпер мы бачым праз [мутнае] шкло, невыразна; *а тады* — аблічча да аблічча; цяпер я разумею часткова, *а тады* пазнаю [гэтаксама], як я сам пазнаны (1 Кар. 13:12, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу, Павел двойчы кажа: «а тады». Гэта адносіцца да часу, калі прыйдзе дасканалае. Дзве рэчы вызначаюць той час. Па-першае, мы ўбачым Госпада *аблiччам да аблiчча*. Вы бачыце Яго аблiччам да аблiчча? Вы бачыце Яго ўваскрослым, Яго твар ззяе, як сонца, вочы — як полымя агню, а валасы — белыя, як воўна? Другі паказчык:

«Я пазнаю, як і я пазнаны». Вы ведаеце Яго, як Ён ведае вас? Відавочна, адказ на гэтыя пытанні — не! Павел кажа пра час, калі мы будзем з Госпадам у нашых праслаўленых целах. Менавіта тады прыйдзе дасканалае.

Паколькі дасканаласць яшчэ не прыйшла, то і мовы яшчэ не змоўклі. Далей вы даведаецеся, што адна з галоўных прычын моваў — гэта большая блізкасць з Богам на гэтай зямлі!

## Ці ўсе гавораць мовамі?

Хтосьці спытаецца: «Я веру ў мовы, але не кожны вернік здольны іх прыняць, бо нават Пісанне пытаецца: «Ці ўсе гавораць мовамі?», і адказ на гэтае пытанне — не». Зноў жа, гэта грубае неразуменне таго, пра што кажа Павел. Каб адказаць на пытанне, якое столькіх пазбавіла Божага абяцання, мы павінны высвятліць, што Новы Запавет гаворыць пра чатыры розныя катэгорыі моў. Першыя дзве прызначаны для публічнага служэння, а наступныя — для асабістых адносін з Богам. Давайце каротка разгледзім кожную з іх, каб належным чынам адказаць на пытанне: *ці ёсць воля Бога, каб усе Яго дзеці гаварылі мовамі?*

## Мовы, якія з'яўляюцца знакам для няверуючых

Першая катэгорыя моў прызначана для *публічнага* служэння. Выкарыстоўваючы тэрмін «публічны», я маю на ўвазе служэнне іншаму чалавеку або групе людзей. Павел піша:

> «Так што мовы ёсьць на знак не для тых, якія вераць, але для бязьверных» (1 Кар. 14:22).

Такія мовы з’яўляюцца, калі Святы Дух пераўзыходзіць наш інтэлект і дае нам здольнасць размаўляць на іншай мове, якую мы раней не вывучалі і не ўмелі на ёй размаўляць. Мовам даецца па жаданні Божага Духа; мы не можам проста вырашыць на ёй гаварыць, часцей за ўсё мы не ўсведамляем, як гэта адбываецца. Мы проста разумеем, што гаворым на мовах, але не ўсведамляем, што гаворым на нейкай мове нашай зямлі.

Дазвольце прывесці прыклад. Неяк я прапаведаваў у вялікай царкве ў Каларада. Адна з маіх супрацоўніц была на сустрэчы і сядзела ў канцы залі. Яна шмат часу праводзіць у малітве і заступніцтве і адчувала, што Госпад хоча, каб яна малілася за мяне, пакуль я прапаведую. Усё служэнне яна, як сама думала, проста ціха малілася на невядомых мовах (да якіх я хутка вярнуся). Пасля службы джэнтльмен, які сядзеў перад ёй, павярнуўся і сказаў: «Вы вельмі добра размаўляеце па-французску, нават без акцэнта».

Супрацоўніца адказала, што не размаўляе па-французску.

Тады ён, здзіўлены, сказаў: «Я выкладчык французскай мовы. Увесь час, пакуль прапаведаваў гэты чалавек, вы маліліся за яго на ідэальнай французскай мове, у малітве цытавалі Пісанне. Адразу пасля таго, як вы называлі цытату, прапаведнік казаў адкрыць у Бібліі менавіта тое месца, якім вы маліліся!»

Зразумела, джэнтльмен быў вельмі крануты, а супрацоўніца — вельмі ўсхваляваная. Гэта быў знакам, што мая пропаведзь — сапраўды Слова Божае.

Такія мовы праявіліся ў вучняў у дзень Пяцідзесятніцы. Пісанне гаворыць:

> Былі ж у Ерусаліме спыніўшыся Юдэі, мужы пабожныя, з усякага народу пад небам. А як стаўся голас гэты,

> зыйшлося мноства і ўстрывожылася, бо кожны чуў, што яны гавораць ягонай мовай. Усе ж дзівіліся і зьдзіўляліся, кажучы адзін аднаму: «Вось, усе гэтыя, што гавораць, ці ж не Галілейцы? І як мы чуем кожны сваю мову, у якой нарадзіліся?... [далей даецца спіс народаў, якія я апусціў] ... чуем іх, што гавораць нашымі мовамі пра веліч Божую?” (Дз. 2:5–11)

Зноў жа, гэтыя мовы — знак для няверуючага. Яны былі знакам для настаўніка французскай мовы, а таксама для адукаваных людзей з усяго свету, пра якіх гаворыцца ва ўрыўку. Такі знак прыцягнуў увагу і адкрыў іх сэрцы для Слова Божага.

Я чуў пра шматлікія выпадкі, калі вернікі размаўлялі Словам Божым з людзьмі на замежных мовах, якіх яны ніколі не вывучалі, і гэта знак, які пацвярджае пасланне Божай любові. У кожным выпадку такі цудоўны знак прыводзіць да велізарнага служэння.

## Мовы, дадзеныя для тлумачэння

Другая катэгорыя моў таксама прызначана для грамадскага служэння. Гэтыя мовы — нябесныя мовы; на зямлі такіх няма. Тое самае тычыцца і астатніх катэгорый, якія я збіраюся вызначыць.

Вы можаце сумнявацца, што на нябёсах існуе больш за адну мову або дыялект. Разгледзьце такую магчымасць: кніга Адкрыцця кажа, што на нябёсах Ісус дасць пераможцу «каменьчык белы, і на каменьчыку імя новае напісанае, якога ніхто ня ведае, толькі той, хто атрымаў» (Адкр. 2:17). Таксама там гаворыцца пра самога Ісуса, што «вочы Ягоныя — як полымя агню, і на галаве Ягонай шмат дыядэмаў. Ён мае імя напісанае, якога ніхто ня ведае, апрача Яго Самога» (Адкр.

19:12). Такім чынам, калі ніхто іншы не ведаў імёнаў, гэта можа значыць толькі тое, што на нябёсах ёсць розныя мовы.

Гэтыя мовы адносяцца да адной з дзевяці катэгорый дароў Святога Духа, пералічаных у дванаццатым раздзеле Першага паслання да Карынцянаў. Там напісана наступнае:

> ... іншаму — разнастайныя мовы, а іншаму — тлумачэньне моваў (1 Кар. 12:10).

Звярніце ўвагу: мовы павінны мець тлумачэнне, а не пераклад. Чаму? Таму што гэта нябесныя мовы, не вядомыя прыроднаму свету.

Я ўспамінаю служэнне ў Сінгапуры. Мяне ўпершыню запрасілі наведаць адну з найбуйнейшых цэркваў краіны. Перад тым, як мяне запрасілі да кафедры, увесь вялізны натоўп у царкве раптам змоўк. Нечакана нейкі чалавек пачаў гаварыць на нябеснай мове. Нават без мікрафона яго голас гучаў вельмі гучна і чыста. Чалавек быў недзе на балконе велізарнай залі, але ўсе адчулі выразнасць і аўтарытэт у яго голасе. Было адчуванне, быццам неба ўзмацняла яго.

Калі ён гаварыў, мой унутраны чалавек скакаў ад радасці, а мой знешні чалавек застыў у пашане. Здавалася, усё цела слухала яго, а сэрца неслася наперад ад радасці ў гэтай святой атмасферы. Як толькі ён скончыў, прыйшло тлумачэнне. Слова Госпада, дадзенае на гэтай мове, казала акурат тое, пра што я збіраўся прапаведаваць у той вечар. Я быў уражаны. Не толькі мне, але і ўсяму сходу Бог даў пацверджанне, што маё пасланне было ад Яго.

Такія мовы і іх тлумачэнне падобныя да прароцтва. З гэтай прычыны Павел кажа: «хто прарочыць, большы за таго, хто гаворыць мовамі, хіба што ён будзе і тлумачыць, каб царква

атрымала збудаваньне» (1 Кар. 14:5). Зноў жа, з урыўка відаць, што такія мовы дадзены для публічнага служэння царкве; і яны ёсць той катэгорыяй моў, пра якую пытаўся Павел: «Ці ўсе гавораць мовамі?» Давайце прачытаем гэты верш у кантэксце:

> І адных Бог паставіў у царкве, па-першае, апосталамі, па-другое, прарокамі, па-трэцяе, настаўнікамі; пасьля — [тых, хто мае] сілы, пасьля — дары аздараўленьня, дапамаганьня, гаспадараваньня, разнастайныя мовы. Ці ўсе апосталы? Ці ўсе прарокі? Ці ўсе настаўнікі? Ці ўсе сілы? Ці ўсе маюць дары аздараўленьня? Ці ўсе гавораць мовамі? Ці ўсе тлумачаць? (1 Кар. 12:28–30)

Вы заўважылі, што Павел гаворыць пра дары служэння, якія Бог паставіў у царкве? Вядома, *не ўсе* апосталы, ці прарокі, ці настаўнікі, ці пастыры, ці маюць дар рабіць цуды і аздараўляць, і *не ўсе* маюць дар гаварэння на іншых мовах або тлумачэння нябесных моў. Чаму так? Адказ можна знайсці далей:

> Так што мовы *[мовы як знак]* ёсьць на знак не для тых, якія вераць, але для бязьверных… Дык калі ўся царква зыйдзецца разам, і ўсе будуць гаварыць мовамі *[мовамі для тлумачэння]*, а ўвойдуць да вас [людзі] простыя ці бязьверныя, ці ня скажуць яны, што вы вар’яцееце? (1 Кар. 14:22–23, *курсіў аўтара*)

Перш чым я адкажу на наша пытанне, дазвольце адзначыць: гэтыя два вершы ясна паказваюць розніцу паміж дзвюма публічнымі мовамі. Спачатку Павел піша, што мовы — гэта знак для няверуючых. Так выкарыстоўваюцца мовы

нашай зямлі, якія мы ніколі не вучылі. Няверуючы, які ведае гэтыя мовы, ясна бачыць: няма ніякай магчымасці гаварыць, акрамя як праз цудоўнае дзеянне Госпада. Такім чынам, гэта знак для няверуючага.

Затым Павел кажа пра ўсю царкву, якая збіраецца разам і адначасова гаворыць на розных мовах. Гэта відавочна нябесныя мовы. Я ведаю гэта таму, што ўсе вучні ў дзень Пяцідзесятніцы гаварылі на розных зямных мовах пра цудоўныя справы Бога. Іх не трэба было тлумачыць, бо няверуючыя ведалі, што яны кажуць. У гэтым вершы Павел кажа пра размову з царквой на нябеснай мове, якую трэба тлумачыць. Калі не патлумачыць, то ніхто не зразумее. Як бачыце, няма патрэбы ўсім гаварыць на розных мовах, інакш неінфармаваныя ці няверуючыя падумаюць, што мы звар'яцелі.

Такім чынам, незразумелы многім адказ на пытанне «Ці ўсе гавораць на розных мовах?» становіцца просты. Калі гаворка ідзе пра дары служэння, якія Бог дае царкве, Ён выбірае, бо не ўсім трэба ў іх рухацца. Але Госпад *не* перадузяты, і паўтаруся, Ён не выбірае, што дае кожнаму з нас, вернікаў, для нашага асабістага шляху. Наступныя дзве катэгорыі ахопліваюць дар моў у дачыненні да нашых асабістых адносін з Ім.

## Мовы для асабістай малітвы

Наступныя дзве катэгорыі моў прызначаны для асабістай малітвы і з'яўляюцца абяцаннем Айца кожнаму хрысціяніну. Мы можам бачыць іх у наступных вершах:

> Бо, калі я малюся [незнаёмай] моваю, дух мой моліцца, а розум мой бяз плоду. Дык што? Буду маліцца духам, буду маліцца і розумам; буду сьпяваць духам, буду сьпяваць і розумам (1 Кар. 14:14–15).

Звярніце ўвагу, што Павел канкрэтна вызначае гэтыя мовы як малітву, а не мовы, якія служаць царкве. У гэтым раздзеле нам таксама гаворыцца: «Бо хто гаворыць [незнаёмай] моваю, той гаворыць ня людзям, але Богу» (1 Кар. 14:2). Калі мы гаворым на адной з дзвюх публічных моў, мы гаворым з няверуючымі (мовы як знак) або з царквой (мовы як тлумачэнне); але калі мы молімся на мовах, мы гаворым з Богам, а не з людзьмі. Ці бачыце вы розніцу?

У вершы вышэй Павел распавядае пра два розныя спосабы малітвы: адзін — розумам, які для мяне была б англійская мова. Другі спосаб — маліцца на мовах, гэта значыць, мой дух моліцца пад кіраўніцтвам Святога Духа. Тое ж самае тычыцца і спеваў пакланення: «Я буду спяваць духам і буду спяваць розумам». Юда вызначае асабістую малітву на мовах, кажучы:

> «А вы, улюбёныя, будуючы сябе найсьвяцейшай верай вашаю, молячыся ў Духу Сьвятым» (Юды 20).

Звярніце ўвагу, калі мы молімся на мовах, мы ўмацоўваем сябе, а калі мы гаворым на мовах з царквой і тлумачым, мы ўмацоўваем або збудоўваем царкву (1 Кар. 14:5). Бог жадае таго і другога, і абодва дары вельмі важныя.

У наступным раздзеле я падрабязней раскажу пра гэтую катэгорыю моў. Вы ўбачыце, што блізкае хаджэнне з Госпадам жыццёва важнае. Я называю гэтую катэгорыю моў «мовай блізкасці».

## Мовы для заступніцтва

Апошняя з чатырох катэгорый моў — гэта заступніцтва, калі мы стаім у праломе ў малітве, молячыся за таго, хто мае патрэбу.

## АБЯЦАННЕ АЙЦА

> Гэтаксама і Дух дапамагае ў слабасьцях нашых, бо мы ня ведаем, пра што маліцца, як трэба, але Сам Дух заступаецца за нас стагнаньнямі невымоўнымі. А Той, Які дасьледуе сэрцы, ведае, што за думка ў Духа, Які паводле [волі] Бога заступаецца за сьвятых (Рым. 8:26–27).

Бываюць часы, калі мы не ведаем, пра што маліцца. Пераклад Новага Жыцця найлепш паказвае гэта, кажучы: «Бо мы нават не ведаем, аб чым маліцца і як маліцца».

Я не ведаю ўсяго, што адбываецца з маімі блізкімі ці іншымі, хто мае патрэбу, але Дух Божы ведае. Мая маці жыве ў Флорыдзе, а я жыву ў Каларада. Дапусцім, яна знаходзіцца ў сітуацыі, якая патрабуе Божай дапамогі, але не ўсведамляе гэтага або не можа звязацца са мной. Як я магу ведаць, пра што маліцца, не кажучы ўжо пра тое, што ёй патрэбна малітва?

Упершыню я ўбачыў рэальнасць гэтага ўрыўка з Пісання яшчэ ва ўніверсітэцкія часы. Я быў вернікам толькі два гады, але так хацеў расказаць іншым пра Ісуса; таму пачаў вывучэнне Бібліі для студэнтаў ва ўніверсітэцкім гарадку. На занятках прысутнічала каля шасцідзесяці чалавек. Аднойчы ўвечары я выкладаў пра Святога Духа. Я проста прайшоўся па Пісанні і паказаў волю Божую. На сустрэчы была дзяўчына, якую вучылі, што яна атрымала Святога Духа аўтаматычна, калі нарадзілася звыш, і што мовы ўжо не актуальныя. Як сумна, што яе настаўнікі не верылі Пісанню, а верылі сваім настаўнікам, якія таксама былі сляпымі. Тым не менш, у той вечар, калі яна ўбачыла, што пра гэта гаворыцца ў Бібліі, яна паверыла і напоўнілася Святым Духам адразу ж, разам з некалькімі іншымі людзьмі.

Вельмі рана на наступны дзень мяне разбудзіў сігнал дамафона. Да мяне прыйшоў госць. Я хутка апрануўся і

выйшаў у вестыбюль. Там была тая самая дзяўчына, яе інтэрнат знаходзіўся праз дарогу. Яна свяцілася ад шчасця: «Джон, прабач, што буджу цябе! Я не магла дачакацца, каб расказаць табе, што здарылася сёння раніцай».

Яна распавяла, што Дух Святы разбудзіў яе а пятай раніцы, і яна адчула неадкладную патрэбу маліцца. Было зразумела, што нешта здарылася, таму яна знайшла адасобленае месца і пачала маліцца на мовах. Малітва станавілася ўсё больш інтэнсіўнай, і дзяўчына ўсведамляла, што гэта нейкая бітва. Таму яна спытала ў Госпада, за каго яна заступаецца. У сэрцы яна зразумела, што гэта пажылы мужчына, жыццё якога ў небяспецы. Дзяўчына малілася гадзіну, а потым адчула, што прыйшоў спакой.

Праз некалькі хвілін яе суседцы па пакоі, таксама верніцы, пазванілі. Суседка даведалася, што яе дзед, якога яна вельмі любіла, а пятай гадзіне раніцы перанёс сур’ёзны сардэчны прыступ, і яго жыццё цудоўным чынам выратавалі. Дактарам удалося стабілізаваць стан здароўя менавіта тады, калі мая знаёмая адчула, што можа перастаць маліцца.

Дзяўчына ззяла. Усё хрысціянскае жыццё яна чула, што мовы змоўклі, бо не патрэбныя больш. Колькі яна страціла толькі таму, што хтосьці не верыў Пісанню? Цяпер яе немагчыма было пераканаць у адваротным. Яна назаўжды запэўнілася: малітва на мовах — гэта неабходнасць для нас, вернікаў.

Я назіраў падобнае незлічоную колькасць разоў. Адзін з найлепшых прыкладаў заступніцтва на мовах — сітуацыя, што здарылася з Эстэр, нашым менеджарам офіса ў Аўстраліі, выдатнай малітоўніцай і служыцельніцай. У дзевяностых гадах яна вучылася ў біблейскай школе. Аднойчы раніцай, займаючыся хатнімі справамі, яна проста ўзняла рукі і сказала: «Госпадзе, мне сёння няма пра што маліцца, таму, калі я Табе патрэбна, я тут».

Раптам на яе абрынуўся велізарны цяжар малітвы. Эстэр стала на калені ў гасцінай і стала горача маліцца на мовах. У духу яна ўвесь час бачыла кітайца. Ён стаяў на каленях на бруднай падлозе і вадзіў рукамі па коле, быццам штосьці чысціў. Пакуль Эстэр малілася, ёй хацелася закрычаць: «Устань! Устань! Устань!» Пасля доўгай малітвы прыйшла палёгка, і жанчына вярнулася да хатніх спраў.

Прыкладна праз пяць месяцаў у іх біблейскую школу прыехаў мужчына з Новай Зеландыі. Ён служыў місіянерам і распавёў гісторыю пра знаёмага пастара, які знаходзіўся ў турме на мацерыковым Кітаі. Аднойчы сукамернік сказаў гэтаму пастару, што Бог вызваліць яго з турмы. Потым пачаліся штодзённыя турэмныя справы па прыборцы.

Неўзабаве пасля гэтага ахоўнік вырашыў адправіць усіх зняволеных назад у камеры, акрамя пастара. Той застаўся адзін у пакоі, дзе мыў падлогу, і раптам пачуў голас, які казаў: «Устань! Устань! Устань!» Не ў сілах ігнараваць голас, пастар устаў і падышоў да дзвярэй. Дзіўна, але дзверы былі незамкнёныя, таму пастар адчыніў іх і выйшаў незаўважаным з турмы. Калі ён апынуўся на вуліцы, перад ім стаяла таксі. Пастар сеў і паехаў.

Эстэр з радасцю падумала, што, магчыма, менавіта пра гэта яна малілася некалькі месяцаў таму. Яна падышла да місіянера (з якім ніколі раней у жыцці не сустракалася) пасля яго выступу, і даведалася: гэта быў менавіта той дзень, калі яна малілася ў сваёй гасцінай.

Таксама да Эстэр і місіянера падышоў адзін з кіраўнікоў біблейскай школы. Ён таксама ўспомніў цяжар, які Святы Дух усклаў на яго некалькі месяцаў таму — маліцца за чалавека ў патрэбе. Калі ён маліўся на мовах, таксама выразна ўбачыў кітайца ў турме. Місіянер дастаў агульны фотаздымак

кітайскай царквы, і кіраўнік біблейскай школы паказаў на чалавека, якога бачыў падчас малітвы. Канечне, гэта быў старшы пастар, вызвалены з турмы!

Эстэр і кіраўнік біблейскай школы параўналі запісы ў сваіх малітоўных дзённіках і высветлілі, што гэта быў адзін і той жа дзень! Бог пацвердзіў, што, дзякуючы паслухмянасці ў малітве, яны адыгралі вялікую ролю ў вызваленні пастара.

## Як мы паверым?

А калі б Эстэр вучылі, што мовы зніклі пасля з’яўлення Бібліі? Калі б яе вучылі, што мовы не для ўсіх? Колькі людзей мяркуюць гэтаксама, бо вераць не Бібліі, а вучэнню людзей?

Адна з найбольшых трагедый, якія я назіраў за гады служэння, палягае ў тым, што шмат хрысціян інтэрпрэтуюць Слова Божае праз свае перажыванні замест таго, каб дазволіць Слову Божаму вызначаць іх перажыванні. Бог не абмяжоўваецца нашым вопытам; Ён значна большы!

У пошуках напаўнення Святым Духам я сустрэў мноства хрысціян, якія з добрымі намерамі спрабавалі адгаварыць мяне ад гаварэння на мовах. Праз некалькі месяцаў пасля прыняцця Ісуса як Госпада мяне запрасілі на сустрэчу лідараў універсітэцкага служэння. Я заўсёды буду ўдзячны гэтай групе, бо яна надрукавала матэрыялы, прачытаўшы якія, я атрымаў збаўленне.

Аднак на сустрэчы мяне чакаў шок. Чалавек, які яе праводзіў, папрасіў кожнага лідара падзяліцца галоўнай малітоўнай просьбай на семестр. Адзін малады чалавек сказаў, што моліцца пра добры сярэдні бал. Іншы падзяліўся, што моліцца пра збаўленне суседа па пакоі. Потым чарга дайшла да мяне, і я проста сказаў: «Я хацеў бы атрымаць

Святога Духа, як вучні ў Бібліі, калі гаварылі на новых мовах».

Як толькі я сказаў гэтыя словы, той чалавек хутка і нервова сказаў: «Джон, пагаворым пра гэта пасля».

Мы так і не пагаварылі. Аднак той брат, які прывёў мяне да Госпада, сказаў мне пасля сустрэчы: «Джон, ён не верыць у гаварэнне на іншых мовах».

Як нованавернуты, я здзіўлена паглядзеў на яго і сказаў: «Ён не верыць таму, што напісана ў Бібліі?»

Мне ўзгадалася мінулае, бо мая папярэдняя царква таксама грунтавалася на вучэнні людзей, а не на Пісанні. Нас заахвочвалі не чытаць Пісанне, а дазваляць нашаму пастару тлумачыць нам Біблію. Я наведваў царкву дзевятнаццаць гадоў і думаў, што іду на нябёсы, хаця на самай справе я ішоў у пекла. Таму, калі адзін брат у інтэрнаце патлумачыў мне Пісанне і Божы план выратавання, я вырашыў, што буду верыць у Слова Божае незалежна ад таго, разумею яго ці не! Гэта страх перад Госпадам, а страх перад Ім — пачатак мудрасці (гл. Пс. 111:10).

## Шчаслівы ці невук

У мяне ёсць добрая навіна: воля Бога ў тым, каб вы былі напоўнены Яго Духам і маліліся на нябесных мовах! Вы можаце пачуць памкненне Божага сэрца адносна вас:

> «Хачу, каб вы ўсе гаварылі мовамі» (1 Кар. 14:5).

Вы можаце сказаць: «Гэта словы Паўла да Карынцянаў».

Не, нам выразна сказана: «разумеючы спачатку, што ніякае прароцтва з Пісаньня ня мае адвольнага тлумачэньня» (2 Пт. 1:20), і што «усё Пісаньне натхнёнае

Богам» (2 Цім. 3:16). Папросту кажучы, гэта не словы Паўла да Карынцян, а словы Госпада да нас, бо Слова Божае «трывае на вякі» (1 Пт. 1:23). Бог кажа Сваім дзецям: «Хачу, каб вы ўсе гаварылі мовамі!»

Вы ніколі не будзеце дабраслаўлёныя ў тым, у што не верыце. Я хачу паўтарыць зноў: Бога не кранаюць нашы разважанні, патрэбы ці пачуцці. Яго кранае наша вера. Вы будзеце назіраць зноў і зноў, як Ісус кажа людзям: «Хай вам станецца паводле вашай веры ». Вера ўпэўнена: Бог зробіць тое, што кажа. Вера прыходзіць праз слуханне Божых слоў, а не няправільных перакананняў чалавека.

Вельмі важна, каб мы прапаведавалі і верылі ў праўду, а не ў досвед. Досвед — цудоўнае пацвярджэнне праўды, але ён не павінен быць настаўнікам праўды. Святы Дух — наш Настаўнік, і Ён не будзе гаварыць насуперак напісанаму Слову Божаму. Калі мы верым Слову Божаму, тады мы ўбачым і адчуем. Многія разумеюць гэта наадварот: яны хочуць адчуць, а потым паверыць, як мы бачылі ў словах Ісуса да Тамаша. У нас ёсць выбар: грунтаваць сваю веру на досведзе іншых людзей або на Слове Таго, пра каго напісана:

> Бог — гэта не чалавек, каб Ён падманваў, і ня сын чалавечы, каб памыляўся. Ці ж Ён кажа і ня робіць? Ці ж Ён прамовіў і ня споўніў? (Лк. 23:19)

У заключэнне, Святы Дух кажа ўсім нам адносна малітвы на мовах: «Не хачу, каб вы ня ведалі» (1 Кар. 12:1). Затым Ён абмяркоўвае тое, пра што мы гаварылі ў гэтым раздзеле, і нават болей за гэта. Урэшце, завяршаючы, Дух ясна кажа:

> А калі хто не разумее, няхай не разумее (1 Кар. 14:38).

Іншымі словамі, Дух кажа нам праз Паўла: «Я абвясціў вам Маю волю адносна моў. Калі вырашыце заставацца ў няведанні, вы будзеце ў няведанні і не будзеце дабраславёныя Маім дарам». Я ўпэўнены, што Ён смуткаваў, калі падштурхнуў Паўла так сказаць, бо прадбачыў: знойдуцца людзі, якія пазней зробяць гэта прадметам абмеркавання (такое пытанне не ўзнікала ў часы ранняй царквы).

Зноў жа, святы Дух з сумам кажа нам: мы можам заставацца ў сваім няведанні, але калі так зробім, Яго апошні каментар наконт гэтага пытання наступны:

І не забараняйце гаварыць мовамі (1 Кар. 14:39).

Вось папярэджанне: калі вы пачуеце, як хтосьці нападае на іншыя мовы, ён не паслухмяны Госпаду. Бог ведаў: у апошнія дні некаторыя па няведанню альбо па ўпартасці скажуць Яго авечкам, што гаварэнне на іншых мовах мінула альбо што яно не ад Бога.

Я малюся, каб чытаючы наступны раздзел, вы ўбачылі цудоўнае забеспячэнне, якое Бог даў Сваім дзецям, і адкрылі для сябе цудоўную мову блізкасці, якую Святы Дух дае тым, хто верыць.

*(Заўвага: калі вы не атрымалі напаўнення Святым Духам, звярніцеся да Дадатку Б. Я хацеў бы весці вас у малітве, каб вы атрымалі гэты дар).*

## Пытанні для вывучэння

1. У пачатку раздзела аўтар разважае пра сваю веру ў маладосці, калі быў студэнтам. Ён апісвае новае жыццё і адчуванне таго, што яму чагосьці не хапала, нягледзячы

на стараннае чытанне Пісання. Ці можаце вы прыгадаць такую сітуацыю ў мінулым, ці, магчыма, нават у цяперашнім жыцці?

2. Якія з вашых перакананняў аспрэчваюцца даследаваннем таго, што значыць гаварыць на мовах? Як на вас уплывае навіна, што воля Бога палягае ў тым, каб вы былі напоўнены Яго Духам і маліліся на нябесных мовах?

3. Вы чытаеце гэтую кнігу нездарма — пэўныя досвед ці падзея падштурхнулі вас даследаваць, што значыць наблізіцца да Бога. Можа быць, Ён даў вам магчымасць наблізіцца да Сябе праз тое, што вы зараз вывучаеце? Магчыма, дар моў для асабістай і заступніцкай малітвы стане наступным крокам у вашым хаджэнні з Госпадам?

Раздзел 12

# МОВА БЛІЗКАСЦІ

Божыя мудрасць і парада — як глыбокая вада, часта таямнічыя для чалавечага розуму.

Я ўзгадваў гэта некалькі раз, але, каб пераканацца, што думка трапіць у самую глыбіню вашага сэрца, я паўтару яшчэ раз: Бог прагне блізкасці з вамі і вашай супольнасці. Ён не проста жадае ўзаемадзейнічаць з вамі, але хоча, каб такое ўзаемадзеянне было насычаным і багатым.

## Адносіны з Богам на Яго ўзроўні

Каб такія багатыя адносіны сталі рэальнасцю, Госпад даў магчымасць мець з Ім супольнасць на Яго ўзроўні! Дазвольце растлумачыць з дапамогай Пісання:

> Бо хто гаворыць [незнаёмай] моваю, той гаворыць ня людзям, але Богу; бо ніхто ня чуе, [як] ён тайны духам гаворыць (1 Кар. 14:2).

Мы ведаем: Павел мае на ўвазе мовы, якія людзі не ведаюць, але гавораць на іх, абвяшчаючы такім чынам Слова Божае. У гэтым урыўку з Пісання Павел кажа пра нашы малітвы або размовы з Богам. Калі мы молімся на мовах, мы размаўляем непасрэдна з Богам, а не з людзьмі. Павел таксама пісаў: «Гэтаксама і Дух дапамагае ў слабасьцях нашых, бо мы ня ведаем, пра што маліцца, як трэба, але Сам Дух заступаецца за нас стагнаньнямі невымоўнымі» (Рым. 8:26). Зноў жа, ёсць дзве розныя перашкоды для адносін з Богам: часта мы не ведаем, пра што маліцца; або як гэта рабіць.

Вось ілюстрацыя. Калі б я зайшоў у кабінет прэзідэнта Злучаных Штатаў, ці мог бы я мець адносіны з ім на яго ўзроўні? Відавочна, не. Прэзідэнту прыйшлося б апусціцца да майго ўзроўню разумення. Ён ведае значна больш, чым я, пра справы нацыі, у тым ліку пра ўсе пытанні бяспекі, не даступныя грамадскасці. Прэзідэнт ведае пра многія планы і праекты нацыі, а таксама валодае інфармацыяй, якую трэба трымаць у сакрэце; бо, патрапіўшы ў рукі няправільных людзей, гэта створыць пагрозу нацыянальнай бяспецы.

Параўнаем з гэтым мой уваход ў залу Валадара Сусвету — Яго тронную залу. Калі я малюся толькі розумам, то наша адносіны абмежаваныя! Я не магу размаўляць з Госпадам на Яго ўзроўні, бо Ён ведае значна больш за мяне. Адзіны спосаб, каб мець адносіны са мной, — гэта спусціцца да майго ўзроўню разумення. Як і ў нашым прыкладзе вышэй, Госпад ведае значна больш за мяне пра справы Сусвету, у тым ліку і розныя таямніцы, якія лепей трымаць у сакрэце. Гэта выразна відаць з настаўлення Паўла:

> «…але гаворым мудрасьць Божую, якая ў тайне, схаваную, якую прадвызначыў Бог перад вякамі на славу нашую, якое ніхто з князёў веку гэтага не зразумеў, бо калі б зразумелі, дык не ўкрыжавалі б Госпада славы (1 Кар. 2:7–8).

Хаця і тут канкрэтна гаворыцца пра мудрасць укрыжавання і ўваскрасення Госпада Ісуса і славу, якая прыйшла пасля, гэта толькі адзін прыклад, як Бог сочыць, каб Яго мудрасць не трапіла ў чужыя рукі. Але ёсць і іншыя (гл. Мц. 7:6.) Пісанне кажа: мы знаходзімся ў стане вайны, і ворагі, з якімі мы змагаемся, — гэта начальствы, улады, дзяржаўцы цемры і духі зласлівасці ў нябёсах (Эф. 6:12). У звычайнай вайне паміж супольнікамі павінна быць таемная сувязь. Тое ж самае тычыцца і Военачальніка войска Господняга і воінаў Яго царства. Госпад даў Сваім дзецям цудоўную таемную сувязь дзеля дабра Валадарства і нашай абароны. Вораг не мае ніякага ўяўлення, пра што мы просім Айца, калі гаворым на мовах. Дэманічныя сілы могуць распрацоўваць план нападу на нас ці на нашых блізкіх, але, калі мы молімся на мовах, раптам, на здзіўленне дэманаў, з’яўляецца шквал анёльскай дапамогі. У выніку дэманы, жахліва напалоханыя, уцякаюць раней, чым іх атакі дасягнуць поспеху.

## Галоўная мэта

Наша малітоўная мова дадзеная нам не толькі для таго, каб не дапусціць траплення важных ведаў у чужыя рукі. Яе галоўная мэта — блізкасць. Мы з жонкай так доўга разам і сталі настолькі блізкімі, што развілі ўнікальныя для нас адносіны. Яна можа сказаць мне тое, што ніхто іншы не зразумее. Мы развілі мову блізкасці. Гэта тычыцца не толькі

мужоў і жонак, але і ўсіх, хто мае блізкія адносіны. Такая мова існуе паміж людзьмі, што сябруюць, працуюць ці змагаюцца разам усё жыццё. Карацей, фарміруецца ўнікальная для сяброў мова камунікацыі.

Падобным чынам Бог даў нам спосаб блізкай камунікацыі і адносін з Ім на глыбокім узроўні; узроўні, якога нашы чалавечыя неадкупленыя розумы ніколі не маглі дасягнуць. Псалміст прадбачліва напісаў: «Бяздонне гукае бяздонню пры шуме Тваіх вадаспадаў» (Пс. 42:8). Гэтая камунікацыя параўноўваецца з жыццём. Ісус кажа, што з нашых сэрцаў «…пацякуць рэкі вады жывое». Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго» (Ян 7:38–39). Наша блізкая супольнасць з Госпадам падобная да плыні жывой вады. Вось што даў нам Святы Дух! Якую здольнасць Ён нам даў! Нават думкі пра яе дзівяць!

Давайце даследаваць далей, бо будзе яшчэ лепш. Павел працягвае пра верніка, які моліцца на мовах:

> …бо ніхто не чуе (*у анг.перакл. – не разумее – заўв.перакл.*) яго, [як] ён тайны духам гаворыць (1 Кар. 14:2).

Што Павел мае на ўвазе, кажучы *тайна (*грэчаскае слова *musterion)*? У.Э. Вайн, эксперт па грэчаскіх тэрмінах Новага Запавету, піша: «У Новым Запавеце гэта слова абазначае не штосьці таямнічае (як у англійскай), а тое, што знаходзіцца за межамі чалавечага разумення, можа стаць зразумелым толькі праз боскае адкрыццё і становіцца зразумелым ці вядомым толькі тым, хто напоўнены Божым Духам. У звычайным сэнсе «тайна» азначае ўтоенае веданне; яе біблейскае значэнне — гэта адкрытая праўда».

Вось першая са шматлікіх пераваг малітвы на мовах.

Бог Святы Дух ведае, што на думцы ў Ісуса і Айца, бо яны ўсе Адно. Ён таксама ведае, чаго нам не хапае, бо Ён наш пастаянны Спадарожнік. Таму Ён пасярэднічае, даючы нам словы на мове нябёсаў, каб мы маглі прасіць, шукаць або мець адносіны дасканалым чынам. О, як цудоўна! Вы падумаеце: але я не разумею, што кажу, калі малюся на мовах. Так, і таму Павел кажа:

> Дзеля гэтага той, хто гаворыць [незнаёмай] моваю, няхай моліцца, каб тлумачыць. Бо, калі я малюся [незнаёмай] моваю, дух мой моліцца, а розум мой бяз плоду (1 Кар. 14:13–14).

Такім чынам, што б гэта ні было: просьба, заступніцтва ці проста адносіны з Богам -- калі я папрашу Святога Духа адкрыць разуменне таго, за што Ён дае майму духу маліцца, Ён зробіць гэта! Цяпер не толькі мой дух атрымлівае асалоду ад адносін, але і мая душа.

## Распараджэнне адкрытымі таямніцамі

Часта пры такіх адносінах адкрыцці Госпада прыходзяць з Пісання, якое раптам ажывае, і гэта тыя ісціны, пра якія я пісаў і вучыў на працягу гадоў служэння. Аднак ёсць яшчэ шмат таго, пра што я яшчэ не вучыў.

Вы здзівіцеся, чаму я пра гэта не вучыў. Прычына ў тым, што яшчэ не прыйшоў час альбо Бог хацеў, каб Яго народ пачуў нешта іншае. Калі мы гаворым як паслы Валадарства, трэба памятаць: мы гаворым як прарокі Бога, і ёсць рэчы, якія Ён хоча, каб былі сказаныя, а таксама ёсць рэчы, якія нельга казаць у пэўны час.

Я ніколі не забуду свой горкі досвед на гэты конт. Я

сустракаўся з вельмі вядомым чалавекам Божым. Я быў начуты пра яго служэнне, захапляўся ім і прагнуў сустрэчы. Пастар арганізаваў для нас сустрэчу. Я быў вельмі ўзрадаваны. Мы сустрэліся на вячэру — пастар, чалавек Божы і нашы жонкі. На вячэры я падзяліўся самымі глыбокімі адкрыццямі, якія Бог даў мне, зрабіўшы так, каб уразіць чалавека Божага. (Я не думаў пра гэта свядома ў той час, але, азіраючыся назад, ведаю, што гэта быў мой матыў — якая няспеласць!)

Пазней пастар адвёз нас назад у гатэль. Мы з жонкай былі знясіленыя. Аднак, нягледзячы на тое, што я быў стомлены, у маёй душы было вельмі непрыемнае пачуццё. Я ведаў: Госпад хоча, каб я памаліўся, таму сказаў жонцы ісці спаць без мяне. Я выйшаў на балкон. Як толькі мая нага пераступіла парог, я пачуў, як Святы Дух строга сказаў у маім сэрцы: «Сёння ўвечары валадар паказаў усе скарбы ў сваім доме!»

Маё сэрца скочыла ў пяткі, мне стала вельмі сорамна. Святы Дух меў на ўвазе памылку Эзэкіі. Аднойчы яго наведвалі людзі, якіх ён хацеў уразіць, і мы чытаем:

> І ўсьцешыўся з іх Эзэкія, і паказаў ім дом скарбаў сваіх: срэбра, золата, пахошчы, каштоўны алей і ўсе каморы свае, і ўсё, што знаходзілася ў сховішчах ягоных. Не засталося рэчы, якой бы не паказаў ім Эзэкія ў доме сваім і ў-ва ўсім валоданьні сваім (Іс. 39:2).

Пасля таго, як Эзэкія паказаў ім усе свае скарбы, прарок Ісая перадаў валадару дакор ад Госпада. Я адчуваў тое самае. Я ведаў: у той вечар я адкрываў ісціны (скарбы, якія Бог паказаў мне), каб уразіць чалавека.

Тады Бог цвёрда сказаў: «Сыне, Я адкрыў Мае каштоўныя ісціны не для таго, каб ты казаў іх, калі табе захочацца. Яны

не для таго, каб уражваць іншых! Ты — распарадчык праўды, якую Я адкрываю табе, і ты не павінен казаць, пакуль Я цябе не падштурхну».

Я хутка пакаяўся і папрасіў прабачэння. Цяжар сышоў, і я адразу ж лёг спаць у супакоі. Божая міласэрнасць дзівосная!

Калі мы мудрыя, мы выбіраем наша блізкае кола сяброў — гэта тыя, хто не будзе неасцярожна дзяліцца нашымі перажываннямі з кім заўгодна. Блізкія сябры мудра ставяцца да таго, што ведаюць адзін пра аднаго. Калі сябар зноў і зноў здраджвае таямніцы, мы вымушаны адмовіцца ад таго, каб дзяліцца з ім, ведаючы: гэта больш не каштоўнасць для яго. Тое самае і з таямніцамі Госпада. Калі мы жадаем, каб Ён адкрыў нам Свае сэрца, мы павінны быць уважлівымі, чым і калі Ён дазваляе нам дзяліцца.

## Разуменне Божай парады

Калі я малюся або размаўляю з Богам на мовах, я заўважаю: ідэі, адкрыцці, мудрасць або вучэнні проста прыходзяць мне ў галаву. Лепшы спосаб гэта апісаць — яны ўздымаюцца, як паветра, вызваліўшыся з глыбінь мора, і падымаюцца на паверхню. Ідэі ўздымаюцца з глыбіні майго ўнутранага чалавека і ўсплываюць у маім розуме ці разуменні. Пісанне кажа:

> Сьветач ГОСПАДАЎ — дух чалавечы, ён дасьледуе ўсе сховы нутра (Прып. 20:27).

Трэба памятаць: Святы Дух гаворыць не з нашым розумам, але з нашым духам. Ён асвятляе менавіта гэтую нашу частку. Калі мы молімся ў Духу і просім тлумачэння, мудрасць ці

парада Бога падымаецца з нашых сэрцаў у сферу нашага разумення ці розуму. Пісанне гаворыць:

> «Намеры ў сэрцы чалавека — глыбокія воды, але разумны чалавек вычэрпвае іх» (Прып. 20:5).

Што такое парада або намеры? Гэта мудрасць, што ўжываецца ў канкрэтнай сітуацыі. Чаму людзі ідуць да кансультантаў? Каб атрымаць патрэбную ў пэўных абставінах мудрасць, якая для іх з’яўляецца загадкай.

Звярніце ўвагу: адзіны, хто можа атрымаць раду Божую, якая параўнаецца з жывой вадой, што цячэ з глыбокай крыніцы, — гэта чалавек, які мае разуменне, або той, хто ведае шляхі Дарадцы. Святы Дух ведае ўсе таямніцы (неадкрытую раду, веды і мудрасць) Валадарства. Звернемся да слоў Ісуса:

> «Хто верыць у Мяне, як сказана ў Пісаньні, у таго з жывата пацякуць рэкі вады жывое». Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго (Ян 7:38–39).

Згодна з Прыповесцямі, вада, якая цячэ з нашага сэрца, — гэта рада або таямніцы Бога, і Ісус выразна кажа, што яе крыніца — Дух Божы. Ён — крыніца жывой вады (гл. Яр. 2:13). Цяпер уважліва прачытайце, што кажа Павел:

> «…але гаворым мудрасьць [або *раду*] Божую, якая ў тайне... каб ведаць, што падаравана нам ад Бога». І гэта мы гаворым ня словамі, якім [нас] навучыла мудрасьць чалавечая, але [словамі], якім навучыў Дух Сьвяты, параўноўваючы духоўнае з духоўным (1 Кар. 2:7, 12–13, *курсіў аўтара*).

Такім чынам, мудрасць або рада Божая — гэта глыбокая вада, і яна часта з'яўляецца таямніцай для звычайнага розуму. Тым не менш, Ісус запэўнівае, што гэтая жывая вада прыйдзе праз Святога Духа. Як? Павел кажа:

> Бо хто гаворыць [незнаёмай] моваю, той гаворыць ня людзям, але Богу; бо ніхто ня чуе, [як] ён тайны духам гаворыць (1 Кар. 14:2, *курсіў аўтара*).

Вось яно! Вось якім чынам чалавек, які мае розум, знаходзіць раду Божую. Колькі разоў я чытаў Пісанне і не разумеў некаторыя месцы! У мяне ёсць пытанні, на якія няма адказу. Разуменне — для мяне *таямніца*. Часцей за ўсё я проста кажу: «Святы Дух, я гэтага не разумею, ці не мог бы Ты, калі ласка, паказаць мне...» Потым я проста малюся на мовах, і альбо адразу, альбо праз нейкі час, калі я перастаю маліцца на мовах і пакідаю малітоўны пакой, адкрыццё схаванай праўды віруе ў маім розуме або разуменні. Як гэта цудоўна!

Шмат разоў я пісаў кнігу і трапляў у тупік. Кірунак, у якім ісці далей, быў *загадкай*. Я ўставаў з крэсла, пачынаў маліцца на мовах, і праз некаторы час, звычайна праз некалькі хвілін, мудрасць вырывалася, нібы вада з прарванай плаціны, і я набіраў тэкст яшчэ некалькі гадзін.

Калі я быў халасцяком, для мяне было *загадкай*, з кім ажаніцца. За тыя гады мне вельмі падабаліся тры дзяўчыны, але пасля таго, як я маліўся ў Духу, я ведаў, што Бог кажа мне дакладнае «не». Потым я сустрэў Лізу і на працягу месяца кожны дзень маліўся на мовах па трыццаць хвілін наконт нашых адносін. Бог даў мне вельмі моцную падтрымку ў тыя часы малітвы, а пасля шмат пацверджанняў. Але мушу сказаць, што я ведаў без сумневу яшчэ да пацверджанняў,

што яна — тая самая, дзякуючы яснасці, якая суправаджалася спакоем, што прыходзіў падчас малітвы на мовах.

Былі часы, калі я не мог зразумець, што адбылося ў маім жыцці ці ў жыцці кагосьці з блізкіх мне людзей. Гэта для мяне было *таямніцай*. Я проста прасіў Святога Духа даць мне Сваю мудрасць ці погляд на сітуацыю. Вядома, калі Бог хацеў, каб я гэта ведаў, то пасля малітвы на мовах я атрымліваў разуменне.

У мяне былі сітуацыі, калі пэўны член маёй сям'і патрабаваў малітвы, і гэта было схавана ад майго ўласнага разумення, але Дух Божы сыходзіў на мяне, каб я маліўся за гэтага члена сям'і на мовах, а потым я даведаўся пра Божую дапамогу або прадухіленне шкоды.

*Таямніцы* -- гэта рэчы, схаваныя ад нашага фізічнага розуму. Гэта могуць быць веды пра тое, у якую царкву ісці, якім служэннем заняцца, які дом купіць, як эфектыўна маліцца за прэзідэнта або іншых лідараў, ці як эфектыўна маліцца за пастара. Як вы ведаеце, спіс бясконцы.

## Супакой у веданні Божага кіраўніцтва

Сфера *таямніц*, якая, здаецца, абцяжарвае большасць вернікаў, — кіраўніцтва. Гэта асноўная прычына, па якой людзі ідуць да кансультантаў. Але ў мяне выдатная навіна! Вам больш ніколі не прыйдзецца турбавацца, што рабіць. Бог абяцае: «Калі ж у каго з вас не хапае мудрасьці, няхай просіць у Бога, Які дае ўсім шчыра» (Як. 1:5). Мы можам прасіць ідэальна! Як? Праз малітву на мовах адносна нашай сітуацыі. Я бываў у цяжкіх сітуацыях, калі не ведаў, што рабіць, і тады маліўся на мовах, і кожны раз у мяне ў сэрцы з'яўлялася натхнёная ідэя, і гэта была мудрасць, патрэбная мне.

Менавіта так мы працавалі ў служэнні на працягу многіх гадоў. Калі мне не хапала разумення, што рабіць, я маліўся на мовах на працягу пэўнага часу, і раптам пачыналі прыходзіць натхнёныя ідэі. Мы з жонкай пачалі служэнне шмат гадоў таму; кожнае важнае рашэнне, якое мы прымалі, прыходзіла праз малітву ў Духу. Сёння ў нас больш за трыццаць супрацоўнікаў з офісамі на трох кантынентах. Бог даў нам гонар дакрануцца Яго Словам і прысутнасцю да мільёнаў жыццяў. Мы не пазычаем грошы ўжо чатырнаццаць гадоў, і цяпер у нас ёсць значныя фізічныя і чалавечыя рэсурсы, якія дапамагаюць нам эфектыўна служыць Божаму народу. Прычына ў тым, што Бог кажа:

> Гэта кажа ГОСПАД, Адкупіцель твой, Сьвяты Ізраіля: «Я — ГОСПАД, Бог твой, Які вучыць цябе карыснаму, Які вядзе цябе на шляху, па якім ідзеш. Калі б ты зважаў на прыказаньні Мае, стаўся б супакой твой, як рака, і праведнасьць твая — як хвалі марскія (Іс. 48:17–18).

Магу шчыра сказаць, наш спакой цёк, як рака. Мы перажывалі часы, калі, зыходзячы з абставінаў, мусілі б панікаваць. Але калі мы маліліся на мовах і давяралі Госпаду справы, спакой панаваў у нашым жыцці. Адносна малітвы на мовах мы чытаем:

> Бо незразумелымі вуснамі і языком чужым будзе прамаўляць да народу гэтага Той, Які сказаў ім: «Вось супачынак! Дайце супачыць змучанаму! Вось адпачынак!» (Іс. 28:11–12)

Тыя, хто не мае спакою, не маюць супачынку. Супачынак, пра які Госпад кажа ў гэтым вершы, — вынік спакою, які цячэ,

як рака. За гады служэння можна было б прывесці ў якасці ілюстрацыі безліч гісторый. Але хачу падзяліцца адной. Мне было вельмі лёгка страціць спакой, бо я не ведаў, што рабіць. Гэта здарылася, калі я паехаў у Мексіку, каб прапаведаваць на евангелізацыйнай сустрэчы. Я паляцеў у горад Мантэрэй на аднадзённую евангелізацыю ў цэнтры горада. Я цэлы дзень маліўся на мовах і ўбачыў у духу яркае святло, якое лілося з неба на залу, дзе мы павінны былі сустрэцца ў той вечар. Госпад прамовіў да майго сэрца: «Гэта Мая слава, якая праявіцца сёння ўвечары».

У той вечар, усхваляваныя, мы з пастарам, які каардынаваў сустрэчу, паехалі ў залу. Яго царква шмат зрабіла для падрыхтоўкі. Мы прыбылі за пятнаццаць хвілін да пачатку, і я заўважыў, што да пастара падышоў раззлаваны мужчына ў суправаджэнні двух узброеных ахоўнікаў. Яны размаўлялі па-іспанску, і я адчуў непрыемны тон размовы. Тады пастар падышоў да мяне і сказаў: «Джон, ты не зможаш прапаведаваць сёння ўвечары».

Я спытаў: «Чаму?»

Ён сказаў: «Гэты чалавек — высокапастаўлены ўрадавы чыноўнік. Ёсць закон, паводле якога ў Мексіцы нельга прапаведаваць Евангелле, калі ты не з’яўляешся грамадзянінам Мексікі. Закон амаль ніколі не выконваецца, але гэты чалавек настойвае, каб мы паслухаліся. Інакш будуць сур’ёзныя праблемы. Чыноўнік хоча неадкладна пагаварыць з табой».

Я адразу ж падумаў пра Пятра і Яна, якім старшыні юдэяў забаранілі прапаведаваць Евангелле, але тыя не паслухаліся, бо гэта супярэчыла Слову Божаму. Таму я сказаў пастару: «Чыноўнік ніяк не зможа спыніць тое, што Бог паказаў мне сёння днём у малітве! Ці паўплывае гэта на вашу царкву? Калі не, я буду прапаведаваць, як толькі ён пойдзе. Я не прыехаў

сюды, каб сядзець склаўшы рукі! Але калі будуць негатыўныя наступствы для вас, я не буду прапаведаваць».

Пастар сказаў: «Джон, чыноўнік можа стварыць шмат праблем для нашай царквы. Я думаю, лепш за ўсё зрабіць тое, што ён кажа». Я пагадзіўся з парадай пастара, і мы падышлі да чыноўніка.

Той паглядзеў на мяне, а потым груба спытаў: «Вы размаўляеце па-іспанску?»

«Не, сэр», — адказаў я.

Потым ён сказаў: «Хачу вам сказаць толькі адну рэч. Вы будзеце размаўляць з гэтымі людзьмі толькі пра турыстычную дзейнасць». Затым ён зноў строга звярнуўся да пастара па-іспанску; увесь час ахоўнікі са зброяй непрыязна глядзелі на нас. Урадавы чыноўнік скончыў размову, і яны сышлі.

Узрушаны пастар папрасіў прабачэння, што я не змагу служыць, і пайшоў у залу, каб зрабіць апошнюю падрыхтоўку да сустрэчы.

Я вельмі засмуціўся. Мне была патрэбна парада Божая; для мяне было *загадкай,* што рабіць. Таму я выйшаў з будынка і знайшоў някепскае месца, дзе я мог памаліцца. (Я быў у цэнтры горада, таму не было цалкам ідэальнага месца.) Я ведаў спосаб атрымаць параду Божую — гэта малітва ў Духу. Таму я смела пачаў гаварыць на мовах. Некалькі чалавек праходзілі міма, але яны, напэўна, думалі, што я замежнік, які ходзіць і размаўляе сам з сабой.

Праз некалькі хвілін маю душу стаў напаўняць супакой Божы. Я працягваў маліцца яшчэ хвілін пятнаццаць, і раптам у маё сэрца ўварвалася думка: «Адкладзі Біблію і раскажы гэтым людзям пра самага знакамітага турыста, які наведаў Мексіку».

Ускочыўшы ад хвалявання і я закрычаў: «Вось яно, вось

яно! Чыноўнік сказаў мне, што я магу гаварыць толькі пра турыстычныя мерапрыемствы! Я раскажу людзям пра Ісуса, самага знакамітага турыста, які пабываў у Мексіцы».

Я паспяшаўся назад у аўдыторыю. Служэнне ўжо пачалося, і пастар вітаў публіку. Яго жонка была ў канцы залы. «Джон, пастар хоча, каб ты выйшаў наперад», -- сказала яна.

Я выйшаў, пастар паглядзеў на мяне і прашаптаў: «Бог сказаў, каб вы рабілі ўсё, што Ён вам загадаў».

«Дзяржаўны чыноўнік сказаў, што я магу гаварыць з вамі толькі пра турыстычную дзейнасць. Дык вось, я тут, каб расказаць вам пра самага славутага турыста сярод усіх, хто наведваў Мексіку, пра Ісуса», -- пачаў я.

Вернікі радасна загукалі. Наступныя шэсцьдзясят хвілін я прапаведаваў Слова Божае. Скончыўшы, я запрасіў усіх, хто быў гатовы адмовіцца ад старога жыцця, каб жыць пад кіраўніцтвам Ісуса.

Наперад стала выходзіць шмат людзей, і я раптам заўважыў паліцэйскага, які заходзіў у залу і накіроўваўся проста да сцэны. Я падумаў: «*Трэба памаліцца за збаўленне гэтых людзей перш, чым мяне арыштуюць*». Мне ўспомніліся Пётр і Ян, якія прапаведавалі ля Прыгожых дзвярэй святыні і былі арыштаваныя, не паспеўшы расказаць людзям, як прыняць Ісуса. Таму я хутка памаліўся з людзьмі, якія выходзілі наперад, каб атрымаць збаўленне. Пасля малітвы я заўважыў, што паліцэйскі прайшоў міма мяне збоку сцэны. Я адчуў палёгку, бо цяпер мог служыць людзям.

Затым я скіраваў нованавернутых да кансультантаў, якія будуць служыць ім далей. Калі ўсе спускаліся са сцэны, я заўважыў кульгавага чалавека і пачуў, як Святы Дух сказаў: «Ён першы, каго я хачу ацаліць. Спыні яго і неадкладна памаліся за яго».

Я зрабіў менавіта тое, што Ён мне сказаў, і пасля малітвы сказаў: «А цяпер, калі ласка, пакіньце свае мыліцы».

Кульгавы паглядзеў на мяне так, быццам хацеў сказаць: «Я не магу!», але з маімі далейшымі падказкамі ён зрабіў гэта. Потым я ўзяў яго за руку, і мы пайшлі разам. Спачатку павольна, пасля хутчэй і хутчэй, пакуль нарэшце не пабеглі разам.

Усіх ахапіла хваляванне. Людзі спускаліся з усіх бакоў, і на сцэне іх былі ўжо сотні. Многія атрымалі ацаленне сілай Святога Духа. Я ўзгадаю некаторых. Мы маліліся за глухую жанчыну, і Госпад адкрыў ёй вушы. Яна плакала так моцна, што светла-блакітная блузка стала спераду цёмна-сіняй ад патоку слёз, якія ліліся па яе твары. Бог ацаліў жанчыну з хваробай вачэй і яшчэ адну жанчыну з анкалагічнай хваробай.

Потым мы маліліся за пяцігадовага хлопчыка, і ён атрымаў ацаленне. Мы служылі людзям больш за гадзіну; было цудоўна, і многія плакалі ад радасці. У нейкі момант я заўважыў, што там былі людзі з фотаапаратамі і камерамі, але не звярнуў на іх асаблівай увагі.

Наступнай раніцай я вярнуўся ў Злучаныя Штаты. Праз тыдзень мексіканскі пастар прыляцеў у ЗША, каб сустрэцца са мной і расказаць пра ўсё асабіста. Я даведаўся, што ўрадавы чыноўнік у той вечар паслаў на евангелізацыю двух агентаў пад прыкрыццём, і ім было даручана арыштаваць мяне, калі я буду прапаведаваць.

Агенты прыбылі, калі я маліўся за кульгавага. Калі кульгавы стаў хадзіць, адзін з іх сказаў другому: «Як ты думаеш, гэта праўда?»

Яго напарнік адказаў: «Я не ведаю. Давай падыдзем бліжэй і праверым». Пастар ведаў пра іх размову, бо нехта з групы парадку пачуў іх і застаўся побач.

Два афіцэры выйшлі наперад і сталі сведкамі цудаў. Калі жанчына стала чуць, адзін сказаў: «Я думаю, што гэта праўда».

Потым яны ўбачылі пяцігадовага хлопчыка, ацалёнага сілай Бога, паглядзелі адзін на аднаго і сказалі: «Гэта праўда!»

Тады пастар сказаў мне: «Джон, людзі, што прыйшлі арыштаваць цябе, у той вечар выйшлі наперад і папрасілі цябе памаліцца. Яны абодва былі збаўлены!»

Само сабой зразумела, мы з пастарам радаваліся ў маім офісе; але гэта было яшчэ не ўсё. Потым ён адкрыў газету Мантэрэя і паказаў мне артыкул, напісаны на наступны дзень пасля нашай сустрэчы. У артыкуле гаварылася, што чыноўнікі назвалі мяне махляром, які незаконна вывозіць грошы з краіны, але таксама паведамлялася, што людзі назіралі ацаленні, аднак за гэта я не браў грошы. Цікава, што перад паездкай я ў сэрцы адчуваў, што не варта браць ніякіх ахвяраванняў, і наша служэнне аплаціла авіябілет. За гэтыя сустрэчы мы не вывезлі з Мексікі ніводнага цэнта.

Які цудоўны Святы Дух! Як можна пераЖыць гэтыя часы без Яго кіраўніцтва? Калі б я не змог маліцца на мовах у той дзень у сваім пакоі і ўвечары каля флагштока, я б пакінуў Мексіку расчараваным, што не выканаў Божую мэту. Пастар не дазволіў бы мне прапаведаваць з-за ўрадавага чыноўніка. Аднак, дзякуючы малітве на іншых мовах, воля і мудрасць Бога, якія былі для нас *загадкай*, праявіліся. Я змог маліцца за пастара паводле волі Божай, у выніку чаго ён пачуў Божы голас, і Госпад даў мне мудрасць адносна таго, як пераадолець супраціў. Яму ўся слава!

Як вораг змагаецца з гэтым у царкве! Ён баіцца такой наўпроставай сувязі Бога з Яго святымі, і дэманы не ведаюць, што адбываецца. Бываюць выпадкі, калі ў нашым сэрцы

ёсць сітуацыі ці жаданні, якія мы можам выказаць сваім разуменнем, але значна часцей бываюць выпадкі, калі мы не можам апісаць сваім разуменнем нашу сітуацыю і маем патрэбу ў дапамозе слоў Святога Духа. Па гэтай прычыне Павел кажа: «Дык што? Буду маліцца духам, буду маліцца і розумам» (1 Кар. 14:15).

## Будаванне нашага ўнутранага чалавека

Апошнім часам маё сэрца прагне, каб Божы народ увайшоў у большую блізкасць са Святым Духам па прычынах, названых вышэй. Наш адказ на Яго заклік да блізкасці становіцца ўсё больш важным. Мець толькі разуменне Святога Пісання, якім валодалі нават фарысеі, будзе недастаткова. Нам трэба развіваць адчувальнасць да таго, што *кажа* Дух Божы, а не толькі да таго, што Ён *сказаў*. Так жыў Ісус. Ён сказаў: «Я нічога не магу рабіць Сам ад Сябе. Як чую, так і суджу [*прымаю рашэнні*]» (Ян 5:30, *курсіў аўтара*). Пашыраная Біблія яшчэ больш выразна падкрэслівае гэта, кажучы:

> Я нічога не магу рабіць Сам ад Сябе [незалежна, ад Сябе, але толькі так, як навучаны Богам і як атрымліваю Яго загады]. [Я вырашаю, як мне загадана вырашаць. Як голас даходзіць да Мяне, так і я прымаю рашэнне] (Ян 5:30, пашыраны пераклад).

Ісус жыў настолькі чулліва да кіраўніцтва і голасу Святога Духа, што неаднаразова прызнаваў залежнасць ад Яго. Ісус казаў: «Сын нічога ня можа рабіць Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць» (Ян 5:19). Зноў Ён кажа: «Словы, якія Я гавару вам, не гавару ад Сябе» (Ян 14:10). Нам, як Яго вучням, недвухсэнсоўна сказана: «Хто кажа, што ў Ім

застаецца, павінен хадзіць так, як Ён хадзіў» (1 Ян 2:6).

Як і Ён, мы павінны быць чулымі да Духа Божага. Я асабіста лічу, што жаданне Бога — каб мы больш усведамлялі Яго Валадарства, чым тое, што адбываецца вакол нас у натуральным свеце. Малітва на мовах будуе нашага ўнутранага чалавека, каб мы маглі быць чуллівымі да Святога Духа. Зноў жа, мы чытаем:

> «Хто гаворыць [незнаёмай] моваю, *збудоўвае* сябе» (1 Кар. 14:4, *курсіў аўтара*).

Грэчаскае слова «*збудоўвае*» — *oikodomeo*. Яго асноўнае азначэнне — «будаваць дом». Цікава, бо нашы целы — храмы Святога Духа. Павел канкрэтна кажа: «вы — Божая пабудова» (1 Кар. 3:9). Мы — Божы дом. Калі мы молімся на мовах, мы пашыраем сваё жытло для Святога Духа і даём Яму больш месца для жыцця. Вядома, не ў фізічным, а ў пераносным сэнсе. У. Э. Вайн кажа нам, што *oikodomeo* «азначае “будаваць” літаральна ці ў пераносным сэнсе».

Молячыся на мовах, мы павялічваем нашу здольнасць утрымліваць Божую прысутнасць і сілу ў нашым жыцці. Мы ўмацоўваем нашага ўнутранага чалавека, каб нам было лягчэй кіравацца Духам Божым, а не фізічным розумам.

Слоўнік Вайна таксама кажа, што *oikodomeo* выкарыстоўваецца метафарычна ў сэнсе «спрыяць духоўнаму росту і развіццю характару вернікаў». У падобным сэнсе апостал Юда кажа нам у пасланні:

> А вы, улюбёныя, будуючы сябе найсьвяцейшай верай вашаю, молячыся ў Духу Сьвятым (Юда 20).

У гэтым вершы грэчаскае слова «*будаваць*»—

*epoikodomeo*. Яно значыць «будаваць на чымсьці». Зноў жа гэта азначае пастаянны акт умацавання нашага духу. Павел казаў вернікам, што яны — Божая пабудова, і ён па ласцы Божай заклаў падмурак, прывёўшы іх да Хрыста, але потым выразна кажа: «Кожны няхай глядзіць, як будуе» (1 Кар. 3:10).

Сёння дух многіх вернікаў слабы, бо яны не збудавалі ўнутранага чалавека. Яны хутчэй бачаць рэчы фізічнымі вачыма, а не вачыма сэрца. Яны хутчэй вераць таму, што чуюць фізічнымі вушамі, а не таму, што Дух Божы кажа іх сэрцам. Іх знешні чалавек дамінуе ў жыцці. Іх унутраны чалавек цэлы дзень сядзіць на канапе, есць чыпсы і глядзіць тэлевізар. О, яны могуць старанна працаваць ў жыцці і служэнні, але іх унутраны чалавек занядбаны. Гэтыя вернікі часта кажуць: «Чаму я, здаецца, ніколі не чую Бога?» Прычына вельмі простая. Бог размаўляе з нашым духам, а не з нашымі галовамі. «Сьветач ГОСПАДАЎ – дух чалавечы» (Прып. 20:27). Калі наш унутраны чалавек не збудоўваецца, то мы не можам выразна чуць.

Павел сказаў габрэйскім вернікам, што хацеў сказаць яшчэ шмат, але не мог, бо яны сталі маруднымі, каб слухаць (Гебр. 5:11). Гэтым людзям не патрэбныя былі слыхавыя апараты; хутчэй іх унутраны чалавек перажыў такі рэгрэс, што стаў неадчувальным да духоўных рэчаў. Па сутнасці, гэтая група людзей рабіла нешта супрацьлеглае будаванню; іх сэрцы станавіліся ўсё больш маруднымі ў слуханні Слова Госпада. Гэты ж прынцып датычыцца і тых, хто занядбоўвае збудаванне ўнутранага чалавека. Без моцнага ўнутранага чалавека мы маем перашкоды ў блізкасці з Богам! Таму Павел смела заяўляе: «Дзякую Богу майму, больш за ўсіх вас гаворачы мовамі» (1 Кар. 14:18). Ён працягвае ў Пасланні да Гебраяў:

> А цьвёрдая страва ёсьць для дасканалых *[духоўна спелых]*, у якіх праз ужываньне *[практыку]* разуменьне спрактыкаванае распазнаваць добрае і ліхое (Гебр. 5:14, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу, Павел згадвае не знешнія, а ўнутраныя пачуцці. Таксама паглядзіце: ён кажа, што выкарыстоўваючы нашы ўнутраныя пачуцці, мы ўмацоўваем іх, каб адрозніваць, што ад Бога, а што ад злога.

Як у нас ёсць пяць прыродных пачуццяў, так у нас ёсць і пяць духоўных пачуццяў. Пісанне дае нам прыклад. Чытаючы кожны з наступных радкоў, спытайце сябе, ці маглі б вы зрабіць што-небудзь са згаданага сваімі фізічнымі пачуццямі. Гэта дапаможа прыйсці да высновы, што аўтары гавораць пра духоўныя, а не пра фізічныя пачуцці.

## Смак

> *Паспытайце* і ўбачце, які добры ГОСПАД! (Пс. 34:9, *курсіў аўтара*)

> Як салодкія словы Твае *паднябеньню* майму, саладзей за мёд вуснам маім! (Пс. 119:103, *курсіў аўтара*)

> Я знайшоў слова Тваё і *праглынуў* яго, і сталася слова Тваё для мяне пацяшэньнем і радасьцю сэрца майго (Яр. 15:16, *курсіў аўтара*).

## Дотык

> Выйдзіце спасярод іх і аддзяліцеся, — кажа Госпад, — і не *дакранайцеся* да нячыстага, і Я прыйму вас (2 Кар. 6:17, *курсіў аўтара*).

Ідзіце, ідзіце! Выходзьце адтуль! Не *дакранайцеся* нячыстага! Выходзьце з сярэдзіны яго! Ачысьціцеся, вы, якія нясеце начыньні ГОСПАДА! (Іс. 52:11, *курсіў аўтара*)

## Пах

Падзяка ж Богу, Які заўсёды дае нам трыюмфаваць у Хрысьце, і *водар* веданьня пра Сябе выяўляе праз нас у-ва ўсякім месцы. Бо мы — *слодыч* Хрыстовая для Бога ў тых, якія збаўленыя, і ў тых, якія гінуць. Для адных — *водар* сьмерці на сьмерць, а для другіх — *водар* жыцьця на жыцьцё. І хто здатны на гэта? (2 Кар. 2:14–16, *курсіў аўтара*)

І хадзіце ў любові, як і Хрыстос палюбіў нас і выдаў Сябе за нас, як дар і ахвяру Богу, на *водар* салодкі (Эф. 5:2, *курсіў аўтара*).

Я маю ўсё і маю дастатак; я напоўнены, атрымаўшы ад Эпафрадыта тое, што ад вас, *водар* салодкі, ахвяру прыемную, якая падабаецца Богу. А Бог мой няхай напоўніць усякую патрэбу вашую паводле багацьця Свайго ў славе, у Хрысьце Ісусе. (Флп. 4:18–19, *курсіў аўтара*)

## Зрок

Бо крыніца жыцьця — у Табе, у сьвятле Тваім мы *бачым* сьвятло (Пс. 36:10, *курсіў аўтара*).

Прасьветленыя *вочы* сэрца вашага, каб вы ўбачылі, якая ёсьць надзея пакліканьня Яго, і якое багацьце славы спадчыны Яго для сьвятых, і якая бязьмерная вялікасьць моцы Яго для нас, якія верачь праз

дзеяньне ўладнай магутнасьці Яго (Эф. 1:18–19, *курсіў аўтара*).

Бо калі падпарадкаваў яму ўсё, нічога не пакінуў непакорным яму. Але цяпер мы яшчэ ня бачым, каб усё было падпарадкавана яму, а *бачым* Ісуса (Гебр. 2:8–9, *курсіў аўтара*).

Калі *вока* тваё чыстае, усё цела тваё будзе сьветлае. Калі ж *вока* тваё злое, усё цела тваё будзе цёмным. Калі ж сьвятло, якое ў табе, ёсьць цемра, дык якая ж цемра сама? (Мц. 6:22–23, *курсіў аўтара*)

## Слых

І сказаў Ільля Ахаву: «Ідзі, еш і пі, бо [я чую] *шум* вялікага дажджу!» (1 Вал. 18:41, *курсіў аўтара*)

Хто мае *вушы каб слухаць*, няхай *слухае*!» (Лк. 14:35, *курсіў аўтара*)

Хто мае *вуха*, няхай *слухае*, што Дух кажа (Адкр. 2:7, *курсіў аўтара*).

Тое, што наш унутраны чалавек становіцца тупым і неадчувальным да Духа Божага, Ісус растлумачыў, сказаўшы:

Дзеля таго гавару ім прыпавесцямі, што яны, гледзячы *[знешні чалавек]*, ня бачаць *[унутраны чалавек]*, і слухаючы *[знешні чалавек]*, ня чуюць *[унутраны чалавек]* і не разумеюць. І спаўняецца над імі прароцтва Ісаі, якое кажа: «Слыхам пачуеце *[знешні чалавек]*, і не зразумееце *[унутраны чалавек]*, і гледзячы, глядзець будзеце *[знешні чалавек]* і

> ня ўбачыце *[унутраны чалавек].* Бо атлусьцела сэрца *[унутраны чалавек]* народу гэтага, і вушамі з цяжкасьцю чуюць *[унутраны чалавек]*, і вочы свае заплюшчылі, *[унутраны чалавек]*, каб ня ўбачылі вачыма *[унутраны чалавек]* і не пачулі вушамі *[унутраны чалавек]*, і не зразумелі сэрцам *[унутраны чалавек]*» (Мц. 13:13–15, *курсіў аўтара*).

Духоўна сталыя людзі развіваюць унутраныя пачуцці, каб распазнаваць духоўныя рэчы — што ад Бога, а што не. Такое развіццё вызначаецца выкарыстаннем або трэніроўкай пачуццяў верніка. Усе мы маем фізічныя пачуцці, і ў некаторых людзей яны больш развітыя, чым ў іншых, проста дзякуючы трэніроўкам. Напрыклад, ёсць людзі, якія развілі свой смак, каб вызначаць якасць вінаў. Дзякуючы практыцы, яны могуць пакаштаваць віно і вызначыць год вырошчвання віна, ранні ці позні ўраджай, шмат ці мала ападкаў было ў тым годзе і гэтак далей.

Іншыя натрэніравалі вочы, каб вызначаць кошт каштоўных камянёў. Непадрыхтаванаму воку камень здаецца бездакорным, але навучанае вока вызначыць якасць агранкі і глыбіню колеру, колькасць дробных ці буйных дэфектаў і ступень празрыстасці.

Ёсць гукарэжысёры, музыкі, дырыжоры, якія трэніравалі слых, каб добра чуць гукі і мелодыі. Яны заўважаць, калі ўсяго адзін інструмент у цэлым аркестры іграе няправільна, бо гадамі трэніравалі слых, каб распазнаваць гармонію.

Ёсць тыя, хто трэніраваў нюх. Яны могуць назваць асноўны пах і яго адценні, пералічыць поўны букет спецый, кветак і цытрусавых у любых парфумах.

Такія людзі вырашылі ўзмацніць фізічныя пачуцці. Гэта не

значыць, што яны былі больш адоранымі; яны былі поўныя рашучасці развіць тое, што мелі. Такі вынік не прыйшоў за дзень, яны сканцэнтравалі сваю ўвагу на пэўнай мэце.

Верагодна, вы падумаеце пра многія іншыя прыклады, як можна трэніраваць знешнія пачуцці. Такі ж прынцып датычыцца і духу. На працягу гадоў можна быць вернікам і не развіваць дух. Пісанне кажа нам, што Ян Хрысціцель «узрастаў і ўмацоўваўся духам» (Лк. 1:80). Павел сказаў Цімафею цалкам прысвяціць сябе духоўнаму развіццю, каб «посьпех твой быў яўны для ўсіх» (1 Цім. 4:15). Як мы будуем свайго ўнутранага чалавека? Пісанне ясна кажа: праз запісанае Слова Божае (1 Пт. 2:2; Дз. 20:32), паслухмянасць Яго слову (Гебр. 5:9) і малітву на мовах (1 Кар. 14:4; Юды 20).

## Важнасць развіцця нашага духу

Чаму так важна развіваць нашы ўнутраныя пачуцці? Калі нашы духоўныя пачуцці развітыя, у нас лепшыя адносіны са Святым Духам. Ён можа больш блізка гаварыць з намі на многіх узроўнях. Каб растлумачыць, давайце зноў паглядзім на фізічнае. Калі б усе пяць вашых пачуццяў не працавалі, мне было б немагчыма мець адносіны з вамі. Я мог бы крычаць, але вы б не чулі; паляпаць вас па плячы, але вы б не адчулі; трымаць шыльду, але вы б не бачылі, і гэтак далей.

Нядаўна майму бацьку, якому за восемдзесят, спатрэбіўся слыхавы апарат, але ён не хацеў яго насіць. Мы сустрэліся павячэраць, і я заўважаў, што тата выглядае так, быццам знаходзіцца не са мной. Я перапытаў: «Ты зразумеў, тата?» Ён выглядаў збянтэжаным, быццам пытаўся: «Што ты сказаў?» Я зразумеў, што бацьку не падабалася наша размова, бо ён недачувае. (На шчасце, цяпер у яго ёсць слыхавы апарат!)

Тое самае тычыцца і духу. Калі вашы пачуцці прытупленыя, вы – у лепшым выпадку – разумееце толькі частку размовы! Я часта чую, як людзі кажуць: «Здаецца, Бог не размаўляе са мной блізка». Ёсць вялікая верагоднасць, што іх унутраныя пачуцці недастаткова развітыя. Нам трэба запомніць: Бог хоча гаварыць з намі больш, чым мы хочам чуць Яго, але занадта часта мы — як і габрэйскія вернікі — «марудныя, каб слухаць» (Гебр. 5:11).

Мы ўмацоўваем тое, што выкарыстоўваем, і аслабляем тое, чым не карыстаемся. Калі мы молімся ў Духу, моліцца наш унутраны чалавек, а фізічнае разуменне або цела мы ў гэты час не прымаем. Своеасаблівы пост для звыклага мыслення, каб бесперашкодна ўвайсці ў супольнасць з Богам. Я заклікаю вас не толькі маліцца ў Духу, але і давяраць Богу ў тлумачэнні моваў і вучыць сябе слухаць, калі вы моліцеся.

Часта раніцай я больш за гадзіну малюся на мовах. Як толькі я пераадольваю блуканне ў думках, якое хутчэй супакойваецца, калі я спяваю песні пакланення або адкрываю сваё сэрца Яму, мне лёгка засяродзіцца на духоўным. Звычайна пачуццё блізкасці Госпада перамагае любыя клопаты ці абавязкі. Тады я выяўляю, што ў такія моманты ў маё разуменне пранікаюць ідэі, адкрыцці і мудрасць. Я зразумеў, што самае мудрае — запісваць такія рэчы падчас малітвы, а потым Святы Дух пяройдзе да іншых рэчаў.

Напачатку, калі я маліўся ў Духу, я часта адчуваў расчараванне, бо часам, молячыся на мовах, думаў пра паўсядзённыя рэчы. Напрыклад, падчас малітвы мне прыходзілі ідэі назваў новых кніг, жаданне звязацца з людзьмі, з якімі я даўно не размаўляў, ідэі падарунка для кагосьці, як выдаткаваць фінансы служэння і гэтак далей. Урэшце я зразумеў: часцей за ўсё гэта натхненне і кіраўніцтва

Святога Духа. Неўзабаве я пачаў запісваць такія ідэі і заўважыў: як толькі я гэта рабіў, прыходзілі новыя ідэі. Тады я ўвасабляў іх у жыццё і бачыў Божае дабраслаўленне. Я зразумеў, што падчас малітвы на мовах Святы Дух не толькі нагадваў мне людзей ці народы, але і скіроўваў мяне рабіць тое, што Ён хацеў. Зноў жа, гэта спосаб мець адносіны з Богам на якасна іншым узроўні.

## Жыццё ў царстве Духа

Я асабіста лічу, што менавіта так Павел напісаў значную частку пасланняў. У яго мы чытаем такія каментарыі: «Бо хоць я і адсутны целам, але духам я з вамі, радуючыся і *бачачы* ваш парадак і ўмацаванасьць веры вашае ў Хрыста» (Кал. 2:5, *курсіў аўтара*). Ён не бачыў людзей фізічнымі вачамі, бо яго там фізічна не было. Звяртаючыся да Карынцянаў, ён сказаў: «Бо я, адсутны целам, але прысутны духам, ужо прысудзіў» (1 Кар. 5:3). Як Павел мог прысутнічаць і бачыць, што рабілі і казалі вернікі з Карынфа і Калосаў, але не быць там фізічна? Трэба памятаць: мы духоўныя істоты, а ў валадарстве Духа Божага няма адлегласці ці перашкод. Вернікі, чый дух узмоцнены ў Госпадзе, лепш разумеюць, што адбываецца, каб эфектыўней маліцца або служыць людзям у патрэбе. Успомніце, як у папярэднім раздзеле кіраўнік біблейскай школы нашага аўстралійскага офіса вылучыў кітайскага пастара сярод шматлікіх членаў сваёй царквы на фота, ніколі яго не бачыўшы!

Павел бачыў у духу тое, што адбывалася ў розных цэрквах, калі маліўся на мовах; потым пісаў пра гэта ў лістах і адсылаў іх. Падчас падарожжаў, молячыся на мовах, я бачыў, праз што праходзяць члены маёй сям'і або супрацоўнікі. Потым

браў тэлефон і часта ўжо ведаў навіны, перш чым мне іх казалі. Паколькі я маліўся ў Духу, я быў гатовы параіць ім, як справіцца з сітуацыяй.

Падчас знаходжання ў Кеніі я сустрэў племяннога воіна. Ён пазнаёміўся з Ісусам шмат гадоў таму і дагэтуль застаецца сярод свайго народа, каб служыць. У хрысціянскім свеце яго завуць Джон, і ён перыядычна выязджае з Афрыкі служыць і ў ЗША. Аднойчы ён спыніўся ў нашых знаёмых на тры тыдні і час ад часу расказваў навіны пра сваю сям'ю ў Афрыцы. Знаёмыя збянтэжана пыталіся, адкуль яму так шмат вядома пра сям'ю: у афрыканскай вёсцы не было тэлефона. Джон адказаў: «Менавіта так рабіў Павел з цэрквамі ў Азіі. Яны былі яго сям'ёй у Госпадзе, бо ён духоўна нарадзіў іх. Калі Павел знаходзіўся далёка, то ў малітве быў з імі ў духу, назіраючы за іх парадкам. Ён нават мог пісаць ім пра іх справы. Я раблю толькі тое, што Бог даў кожнаму верніку рабіць праз сілу Святога Духа. Вось так я сачу за справамі сваёй сям'і, калі я далёка ад іх».

Сведчанне Джона ідэальна адпавядае Слову Божаму. Чаму мы здзіўляемся? Павел згадвае пра гэта ў Новым Запавеце некалькі разоў. Афрыканцу Джону ніхто не казаў, што Пісанне не праўдзівае або што яно памерла, як казалі многім у Амерыцы. Чаму мы адступілі ад таго, за што Ісус заплаціў такі вялікі кошт? Чаму мы не ўмацоўваем унутранага чалавека, каб быць больш эфектыўнымі слугамі і дзецьмі нашага дарагога Госпада і Збаўцы Ісуса?

Яшчэ не позна! Не мае значэння, дзесяць вам ці восемдзесят пяць; нарадзіліся вы звыш нядаўна ці дзесяцігоддзі таму — вы можаце ўмацоўваць унутранага чалавека праз малітву на мовах і прасіць тлумачэння, калі моліцеся, каб ваш розум мог атрымаць карысць ад цудоўнай супольнасці Святога Духа. Ён так шмат хоча адкрыць вам!

Трэба толькі супакоіць чалавека знешняга і наблізіцца ў сэрцы да Таго, хто ведае ўсё. Якое цудоўнае запрашэнне! Не прапусціце яго!

## Пытанні для вывучэння

1. Ці сутыкаліся вы з сітуацыямі, калі дар моў дапамог вам лепш зразумець, як Бог працуе ў вашым жыцці? У чым вы атрымалі святло, супакой ці абнаўленне?
2. Аўтар піша пра неабходнасць належным чынам кіраваць таямніцамі, якія адкрывае Бог (прыклад Эзэкіі (Іс. 39:2) і сітуацыя з вядомым пастарам). Наколькі важна для вас чакаць належнага часу Госпада, каб адкрыць іншым тое, што Ён адкрыў вам? Ці прыходзіць да вас жаданне ўразіць іншых, якое трэба кантраляваць?

Раздзел 13

# ПОЎНАЯ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ ВЕРЫ

Бог не адказвае на нашы патрэбы.
Ён адказвае на нашу веру!

На працягу гадоў я сустракаў мноства шчырых вернікаў, напоўненых Святым Духам. Яны любяць і баяцца Бога і ўстрымліваюцца ад граху, але пытаюцца: «Чаму я не чую Бога і не адчуваю Яго прысутнасці?» Я разумею расчараванне гэтых святых: яны робяць усё, што ведаюць, але не могуць злучыцца з Богам у малітве. Пагаварыўшы з імі некалькі хвілін, мы звычайна разумеем прычыну складанасцяў. Часцей за ўсё ёсць адзін адказ, і ён знаходзіцца ў наступным вершы:

> Дык, браты, маючы *адвагу* ўваходзіць у сьвятыню праз кроў Ісуса Хрыста, шляхам новым і жывым, які Ён усталяваў для нас праз заслону, гэта ёсьць цела

> Сваё, і маючы вялікага Сьвятара над домам Божым, будзем падыходзіць са шчырым сэрцам, у *поўні веры*, пакрапіўшы сэрцы, [каб ачысьціць] ад сумленьня злога, і абмыўшы цела чыстай вадою (Гебр. 10:19–23, *курсіў аўтара*).

Па-першае, аўтар кажа: мы можам прыйсці ў Святое святых, дзе жыве Госпад. Успомніце, што ў той момант, калі Ісус аддаў Свой Дух на крыжы, заслона ў храме разарвалася зверху да нізу. Бог выйшаў і рыхтаваўся пераехаць у Свой новы храм — адроджанага чалавека. Калі мы набліжаемся да Бога, мы шукаем Яго ўнутры, а не спрабуем уявіць сабе ўваход у тронную залу, якая знаходзіцца за мільёны кіламетраў; бо злучыцца з Духам Божым унутры значыць быць у троннай зале з Ісусам і Айцом.

Звярніце ўвагу, у вершы гаворыцца, што мы павінны прыходзіць з *адвагай*. Як мы можам набліжацца з такой упэўненасцю? Праз тое, што Ісус ужо праклаў нам шлях да Яго прысутнасці праз Сваю кроў, пралітую на Галгофе. Наша сумленне ачысцілася ад тыраніі асуджэння, якое вынікае з граху, і цяпер мы можам прыйсці ў Яго прысутнасць з поўнай упэўненасцю.

Такі сцэнар *нельга* назваць ненадзейным. Бог кажа: калі мы наблізімся да Яго, Ён наблізіцца да нас! Ключавая прычына складанасцяў, з якімі сутыкаецца большасць вернікаў, тлумачыцца словамі «поўная ўпэўненасць веры». Мы павінны прыйсці з верай! Бо Пісанне ясна кажа:

> А бяз веры спадабацца [Богу] немагчыма, бо той, хто *прыходзіць да* Бога, мусіць верыць, што Ён ёсьць і тым, хто шукае Яго, нагароду дае (Гебр. 11:6 AMP, *курсіў аўтара*).

Прыслухайцеся да словаў: «без веры спадабацца [Богу] немагчыма». Падумайце некалькі хвілін і дазвольце ім глыбока пранікнуць у ваша сэрца.

## «Я шукаю кагосьці, хто паверыць!»

Я ніколі не забуду здарэнне, якое адбылося са мной, маладым вернікам, халасцяком. Аднойчы раніцай, калі я моцна спаў, я раптам сеў у ложку, і з маіх вуснаў вырваліся словы: «Я шукаю кагосьці, хто паверыць!»

Я зірнуў на будзільнік: было 4:00 раніцы. Сон быў такі глыбокі, што мне спатрэбіўся час, каб зразумець, дзе я знаходжуся і што адбылося. Я ўключыў святло побач з ложкам і заўважыў: там, дзе я ляжаў, прасціны былі мокрыя, але ў мяне не было ні тэмпературы, ні хваробы. Шакаваны, я зразумеў: Бог толькі што прамовіў праз мае вусны. Потым падумаў: *чаму гэта не было нешта больш глыбокае? Я ведаю, што Ён шукае людзей, якія павераць.* Я стаміўся, таму адразу ж зноў заснуў.

Прачнуўшыся раніцай, я ўвесь час чуў: *Я шукаю кагосьці, хто паверыць... Я шукаю кагосьці, хто паверыць... Я шукаю кагосьці, хто паверыць...* Бліжэй да абеду я раптам зразумеў і сказаў сам сабе ўслых: «Гэта глыбока!»

З таго моманту я разважаў над наступнымі двума пытаннямі: *Што найбольш засмучала Ісуса?* (не тое, што больш за ўсё Яго раззлавала. Вядома, гэта былі крывадушныя фарысеі). *Што найбольш Ісусу падабалася?*

Па-першае, Яго больш за ўсё засмучалі людзі, якія не верылі, што Ён зробіць тое, што абяцаў! Калі сказаць проста, Яго засмучала адсутнасць веры. На самай справе, вера заключаецца вось у чым: мы верым, што Бог кажа тое,

што мае на ўвазе; і што Бог мае на ўвазе тое, што кажа. Бог не чалавек, каб хлусіць. Наадварот, Ён падмацоўвае Сваё Слова гонарам Свайго імя. Бог абяцае Сабой, бо няма нікога вышэйшага. Калі мы сумняваемся ў Ім, мы абражаем Ягоную сумленнасць.

Давайце паглядзім урыўкі з Пісання. Прыслухайцеся да расчаравання Ісуса ў наступных урыўках з кнігі Мацвея:

> «Вы, малаверы!» (Мц. 6:30–31)
>
> І падыйшоўшы, вучні Ягоныя пабудзілі Яго, кажучы: «Госпадзе! Збаў нас, мы гінем!» І кажа ім: «Чаго вы палохаецеся, малаверы?» (Мц. 8:25–26)
>
> А Ісус адразу, працягнуўшы руку, схапіў яго і кажа яму: «Малаверны! Чаму ты засумняваўся?» (Мц. 14:31)
>
> «Чаму разважаеце між сабою, малаверы, што хлябоў ня ўзялі?» (Мц. 16:8)

Вы чуеце Яго расчараванне і смутак у кожным з гэтых сказаў? Аднак найбольш мяне здзіўляе выпадак, калі вучні не змаглі выгнаць дэмана з хлопчыка, хворага на эпілепсію. Паслухайце, што Ісус сказаў Сваім супрацоўнікам:

> «О, пакаленьне бязьвернае і сапсаванае! Дакуль буду з вамі? Дакуль буду цярпець вас? Прывядзіце яго да Мяне сюды». І забараніў яму Ісус, і дэман выйшаў з яго, і хлопец быў аздароўлены ў тую гадзіну (Мц. 17:17–18).

Госпад зусім не стрымліваў пачуццяў. Яго тон выходзіць за межы расчаравання і пераходзіць у агіду і смутак, мяжуючы з праведным гневам!

Пасля вучні спыталі, чаму яны не могуць выгнаць дэмана. Ісус проста сказаў:

«Дзеля недаверства вашага» (Мц. 17:20).

## Бог адказвае на нашу веру

Усё, што мы атрымліваем ад Госпада, прыходзіць праз веру. Я зразумеў: многія ў Целе Хрыстовым не ведаюць адну праўду: Бог адказвае не на нашы патрэбы, Ён адказвае на нашу веру! Спыніцеся і падумайце над гэтым хвіліну. Я мог бы прывесці бясконцую колькасць прыкладаў з Пісання, але прывяду два. Па-першае, неяк Ісус вучыў многіх кіраўнікоў у доме, і мы чытаем:

> І сіла Госпадава была дзеля аздараўленьня іх
> (Лк. 5:17).

Мне падабаецца, як Пісанне канкрэтна кажа: Божая сіла прысутнічала, каб ацаліць лідараў. Яно паведамляе, што прынамсі адзін з гэтых лідараў, а хутчэй за ўсё, некалькі, мелі патрэбу ў ацаленні, але ніхто з іх не атрымаў яго. Чаму? Ніхто не меў веры, каб яго атрымаць.

Аднак была група мужчын, якія на насілках прынеслі паралізаванага чалавека ў дом, але не маглі зайсці ўнутр, бо народу было вельмі шмат. Таму мужчыны вынеслі хворага на дах, разабралі дах і на вяроўках апусцілі чалавека да Ісуса. Далей чытаем:

> І Ён, *бачачы веру іх*, сказаў яму:… «Кажу табе: устань і, узяўшы ложак твой, ідзі ў дом твой». І той, адразу ўстаўшы перад імі, узяў тое, на чым ляжаў, і пайшоў

> у дом свой, славячы Бога. І ўсе былі ў захапленьні, і славілі Бога; і напоўніліся страхам, кажучы: «Дзіўныя рэчы бачылі мы сёньня» (Лк. 5:20–26, *курсіў аўтара*).

Ісус бачыў іх веру. Паралізаваны і тыя, хто яго нёс, ведалі: Госпад выконвае Сваё слова. Хутчэй за ўсё, яны ведалі, што менавіта Бог ужо сказаў Свайму народу: «Не забывайся пра ўсё, што Бог зрабіў! Ён дарує табе ўсе беззаконьні твае, вылечвае ўсякую немач тваю» (Пс. 103:2–3). Лідары ж, наадварот, здзівіліся, убачыўшы паралізаванага аздароўленым, і праслаўлялі Бога; аднак ніхто з іх не ацаліўся. Чаму? Мы не можам прыняць нават тое, што Бог жадае нам даць, калі не прымем гэтага верай! Воля Айца была ў тым, каб хворыя лідары прынялі ацаленне, але яны не прынялі ацаленне! Бог адказвае, калі мы верым, а вера бачная ў нашым руху наперад у адпаведнасці з Яго словамі.

У іншым выпадку да Ісуса прыйшла грачанка і прасіла ацаліць яе дачку ад дэманічнага прыгнёту. Ісус сказаў ёй:

> Дазволь перш насыціцца дзецям, бо нядобра ўзяць хлеб у дзяцей і кінуць сабакам (Мк. 7:27).

Ісус назваў жанчыну сабакам. Тая магла б абразіцца і сысці прэч. Але яна ведала Яго характар, таму адразу ж звярнулася са словамі:

> «Так, Госпадзе, але ж і сабакі пад сталом ядуць крошкі, [што ўпалі] ад дзяцей» (Мк. 7:28)

Жанчына ведала, што знаходзіцца ў прысутнасці Сына Божага, і верыла, што Ён добры Бог, у Якога няма недахопу ў сіле. Яна мела рашучы настрой, бо ведала: ёй трэба трываць

у просьбе, і ёй не адмовяць. Жанчына трывала ў веры, і за гэта Ісус сказаў:

> Дзеля такога слова ідзі; дэман выйшаў з дачкі тваёй (Мк. 7:29).

Прыйшоўшы дадому, яна знайшла дачку цалкам аздароўленай. Мы бачым: Ісус адказаў на веру жанчыны, а не на яе патрэбу. Першая просьба была выказана з патрэбы, але рэакцыя жанчыны на першы адказ Ісуса абапіралася на яе веру.

## Вера — ключ да атрымання ўсяго

Такі прынцып датычыцца ўсяго ў Царстве. Якуб дастаткова смелы, каб заявіць: калі мы прыходзім да Бога ў малітве, трэба прыходзіць...

> ... з вераю, ані не сумняваючыся, бо той, хто сумняецца, падобны да хваляваньня марскога, якое вецер уздымае і ганяе. Дык няхай не мяркуе гэтакі чалавек, што нешта атрымае ад Госпада (Як. 1:6–7).

Ого, паслухайце яшчэ раз: «Няхай не мяркуе гэтакі чалавек, што *нешта* атрымае ад Госпада». Паразважайце хвіліну над словамі «*нічога не атрымаць*». Гэта канчатковае сцверджанне. Выключэнняў няма! Бог хоча, каб мы зразумелі дакладна! Госпад адказвае на веру, і толькі на яе!

Вось чаму так шмат людзей не атрымалі Святога Духа. Яны не просяць з верай. Пісанне пытаецца ў нас:

> Гэтае толькі хачу даведацца ад вас: ці праз учынкі Закону вы атрымалі Духа, ці праз слуханьне веры? (Гал. 3:2, *курсіў аўтара*)

Прыведзенае слова супадае з тым, што кажа Якуб. Вы не можаце *нічога* атрымаць ад Госпада, калі не звернецеся да Яго з верай, якая, безумоўна, уключае Яго Дух. Шмат разоў я сустракаўся з галоднымі вернікамі, што не гавораць на мовах. Яны ведаюць: ёсць нешта большае, і шукаюць гэтага, але пачуўшы Слова Божае пра напаўненне Святым Духам, кажуць: «Я неяк маліўся, каб атрымаць Духа. Нічога не адбылося». Або яны просяць з настроем «магчыма, так». У іх няма рашучасці, якую мела ўзгаданая грачанка. Яны не прыходзяць з поўнай упэўненасцю! Яны не прыходзяць з адвагай! Бог чакае, што мы будзем ведаць Яго волю, бо нам сказана: «Дзеля гэтага ня будзьце неразумнымі, але пазнавайце, якая ёсьць воля Госпада» (Эф. 5:17); а потым, калі мы яе даведаемся, будзем просім з верай і ўпэўненасцю.

Што тычыцца набліжэння да Бога для блізкіх адносінаў, дзейнічае той самы прынцып. Часта вернікі, набліжаючыся да Госпада, спадзяюцца, што будуць мець з Ім сувязь (я кажу не пра біблейскае слова «надзея», якое азначае «ўпэўненае чаканне», а пра надзею ў значэнні «магчыма, так», якое ўласціва англійскай мове). Вернікі часта гавораць словы ў паветра, спадзеючыся, што іх пачуюць. Такі настрой не ёсць верай і не дае доступу да прысутнасці Бога. Мы зноў чытаем: «А бяз веры спадабацца [Богу] немагчыма, бо той, хто прыходзіць да Бога, мусіць верыць, што *Ён ёсьць*» (Гебр. 11:6, *курсіў аўтара*). Аўтар кажа габрэйскім вернікам: калі яны звяртаюцца да Бога, яны павінны верыць, што Бог ёсць. Іншымі словамі, што Бог будзе побач, пачуе іх і адкажа!

Якуб кажа: «Дык няхай не мяркуе гэтакі чалавек, што нешта атрымае ад Госпада. Двудушны чалавек няцьвёрды на ўсіх шляхах сваіх» (Як. 1:7–8). Двудушны чалавек — той, хто звяртаецца да Бога, але сумняецца, што знаходзіцца ў Яго

прысутнасці. Ён можа нават задавацца пытаннем, ці заўважае Бог яго прыход.

Сімптом двудушнасці — блукаючыя думкі. Дазвольце растлумачыць. Часта на служэннях, калі людзі выходзяць наперад, каб за іх памаліліся, я кажу музыкантам перастаць іграць. Прычына наступная: хаця гучыць толькі інструментальная музыка, многія будуць спяваць знаёмыя спевы і не засяродзяцца на Госпадзе. Якуб кажа: «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас... выпраўце сэрцы, двудушныя» (Як. 4:8). Як мы можам шукаць Бога, калі наш розум нават не засяродзіўся на Ім? Вы можаце сабе ўявіць такія стасункі з сябрам?

Увага людзей лёгка рассейваецца, бо яны спадзяюцца, што будуць мець сувязь з Богам, наблізіўшыся да Яго. Не, вы павінны верыць: *Бог ёсць*; вы павінны верыць, што *Бог побач*; вы павінны верыць, што *Бог слухае* і *адкажа.* Бог заслугоўвае вашай непадзельнай увагі. Вера дае ўпэўненасць, што Ён *надае* вам Сваю поўную ўвагу, бо вы ведаеце: Бог абяцаў, і Ён не хлусіць. Калі вы набліжаецеся, Бог, у сваю чаргу, набліжаецца да вас. Я не магу стрымаць хваляванне ў сэрцы. Якому цудоўнаму Богу мы служым. Ён адкажа нам, калі мы звернемся да Яго з верай!

## Як мы атрымліваем веру?

Цяпер мы павінны адказаць на пытанне, якое часта задаюць: як мне павялічыць сваю веру? Такое пытанне задаюць гадамі, яго мелі яшчэ апосталы:

> І сказалі апосталы Госпаду: «Дадай нам веры». А Госпад сказаў: «Калі б вы мелі веру як зерне гарчычнае і сказалі гэтаму фігаваму дрэву: “Будзь вырванае з

> коранем і перасаджанае ў мора”, яно паслухала б вас (Лк. 17:5–6).

Звярніце ўвагу, што Ісус кажа спачатку: «Калі б вы мелі веру як зерне гарчычнае». Зерне — гэта нешта вельмі маленькае, але ў яго ёсць патэнцыял вырасці ў велізарнае дрэва. Перш чым казаць пра развіццё веры ў велізарнае пладаноснае дрэва, трэба спачатку спытаць: адкуль бярэцца зерне? Вось выразны адказ:

> Таму вера — ад *слуханьня*, а *слуханьне* — праз слова Божае (Рым. 10:17, *курсіў аўтара*).

Так проста. Зерне веры прыходзіць ад слухання Божага Слова. Звярніце ўвагу, апостал таксама кажа: ад *слухання, а слуханне...* Часам дастаткова пачуць адзін раз, але часта насенне адкладаецца ў нашых сэрцах, калі мы слухаем зноў і зноў. Вось чаму многія галодныя вернікі слухаюць ці чытаюць пасланне Слова Божага паўторна. Шмат людзей казалі: «Я некалькі разоў чытаў адну з вашых кніг… Я пяць разоў глядзеў відэапасланне… І на пяты раз яно выбухнула ўва мне». У гэты момант зерне было пасеяна і пусціла карані!

Такую простую рэч можна ўскладніць і прапусціць. Насенне веры прыходзіць ад слухання Слова Божага, сказанага ці напісанага пад натхненнем Святога Духа. Як сумна, што сёння кажуць і пішуць так шмат пропаведзяў і кніг, але прамаўляюць так мала Слова Божага. Маю першую кнігу выдавецтва адхіліла, бо, па іх словах, «яна была занадта прапаведніцкай». Занадта шмат Пісання, занадта шмат таго, што кажа Бог. Я мяркую, яны хацелі чагосьці, што ўзрушыць эмоцыі ці цела людзей.

Як ні сумна, але такому ціску паддаюцца многія святары.

Цяпер у нас ёсць цэрквы, «прыязныя да шукальнікаў», куды вернікі не бяруць Бібліі, бо лічаць Біблію непатрэбнай. Там гучаць прыемныя ці смешныя «казані», якая дапамогуць у насычаным жыцці і пошуку задавальненняў. Калі я разважаю пра стан заходняй царквы, такія рэчы здаюцца смешнымі. За апошнія два гады наша служэнне адправіла 50 000 Біблій лідарам падпольнай царквы ў Кітаі. Яны маюць адчайную патрэбу ў Слове Божым. Біблій у Кітаі настолькі мала, што лідары даюць старонкі Новага Запавету старэйшынам і просяць вучыць на памяць ўрыўкі, каб абвяшчаць Слова Божае, нават калі Бібліі канфіскуюць улады. Гэтыя мужчыны і жанчыны ведаюць каштоўнасць запісанага Слова Божага.

У заходніх цэрквах мы спрабуем прыдумаць пасланні, каб забаўляць душы і супакоіць цела, замест пропаведзі Слова Божага, якое перамяняе душу і дапамагае выракацца цела. Чуючы тыя пасланні, мы смяёмся і нават плачам з-за кранальнай гісторыі, але што адбудзецца, калі грэх пастукае ў дзверы «шукальнікаў»? Ці хопіць у іх сілы супрацьстаяць? Што адбудзецца, калі трэба будзе ведаць волю Бога ў вырашальнай сітуацыі: ці ведаюць яны, як маліцца ці прасіць? Ці будзе вера ў тых, хто прыняў Евангелле? Варыянтаў процьма!

Я рады, што кіраўнік выдавецтва адмовіўся друкаваць маю першую кнігу. Прыняўшы яе, ён мог бы папрасіць рэдактараў змякчыць пасланне, і мноства людзей не атрымалі б умацаванне. Кніга ў рэшце рэшт была апублікавана. Іронія лёсу: ранейшы кіраўнік быў звольнены і на яго месца прыйшоў чалавек, што прагнуў Бога. Новы кіраўнік наняў супрацоўнікаў, якія таксама хацелі, каб Божыя словы абвяшчаліся Яго народу. Гэты чалавек спытаўся ў мяне, ці можа апублікаваць маю наступную кнігу. У выніку я напісаў

яшчэ пяць кніг для гэтага выдавецтва, чатыры з якіх сталі бэстселерамі. Больш за тое, мы працягваем атрымліваць незлічоныя сведчанні пра жыцці, сем'і і цэрквы, якія змяніліся. Уся слава Богу!

Я дзялюся гэтым з вамі, бо на зямлі голад, і людзям бракуе Слова Божага (гл. Ам. 8:11). У амерыканскай царкве ў цэлым мала прапаведуецца Слова Божага. Я не кажу, што ў нас не хапае паслання, бо ў нас ёсць велізарная колькасць кніг, відэа і аўдыёкасет, але нам не хапае Слова Божага. Чаму, калі я еду ў краіны Афрыкі і Азіі, я бачу людзей, якія маюць значна менш рэсурсаў, чым мы, амерыканцы, але пры гэтым яны атрымліваюць дабраславенні ад Бога і маюць значна больш веры і пладоў у жыцці? Гэта проста. Яны чуюць слова Госпада, а не законніцкія пасланні ці пасланні, прыязныя да шукальнікаў!

Я абяцаў Богу ніколі не паддавацца ціску несці пасланне, якое падабаецца людзям, замест тых пасланняў, якія прамаўляў Ён. Павел кажа: «Бо ці ж я на людзей спадзяюся, ці на Бога? Ці шукаю, каб спадабацца людзям? Бо калі б я яшчэ людзям дагаджаў, дык ня быў бы слугою Хрыста» (Гал. 1:10). Колькі служыцеляў пачыналі як слугі Хрыста, а цяпер з'яўляюцца рабамі супольнасцяў або слухачоў? Цяпер людзям, якіх яны нібыта вядуць, яны прапаведуюць тое, што тыя хочуць чуць.

Вера прыходзіць ад слухання, а слуханне — ад Слова Божага. Менавіта Слова Божае прыносіць зерне веры ў нашы сэрцы. Як лідары, мы павінны даваць народу Госпада тое, што патрэбна народу, а не тое, што народ лічыць патрэбным. Мы павінны карміць іх вечным Словам Божым, здольным умацаваць і даць ім спадчыну (гл. Дз. 20:32).

Зараз паўстаюць многія лідары, якія зноў абвяшчаюць чыстае і непадробнае Слова Божае. Некаторыя трапілі ў пастку

дагаджэння людзям, а цяпер вяртаюць свабоду, а іншыя толькі пачынаюць служэнне. Яны заклікаюць Божы народ вярнуцца да Бога! Чаму Бог у гэты час падкрэслівае блізкасць з Ім? Адказ просты. Ён хоча, каб вы мелі веру жыць у супольнасці з Ім, бо не можаце мець блізкасці без веры! Ён сее Сваё Слова ў Сваім народзе, каб мы наблізіліся да Яго. Як цікава!

## Як нам павялічваць нашу веру?

Цяпер мы падыходзім да пытання, як павялічваць нашу веру. Ісус кажа вучням:

> А Госпад сказаў: «Калі б вы мелі веру як зерне гарчычнае і сказалі гэтаму фігаваму дрэву: “Будзь вырванае з коранем і перасаджанае ў мора”, яно паслухала б вас. А хто з вас, маючы слугу, які арэ ці пасьвіць, калі ён прыйдзе з поля, скажа: “Ідзі хутчэй, узьляж [за сталом]”? Але ж ці ня скажа яму: “Падрыхтуй мне вячэру і, падперазаўшыся, паслугуй мне, пакуль буду есьці ды піць, і пасьля гэтага еш і пі сам”? Ці дзякуе ён слузе гэтаму за тое, што зрабіў загаданае яму? Ня думаю. Так і вы, калі зробіце ўсё, што загадана вам, кажыце: “Мы — слугі нягодныя, бо зрабілі, што павінны былі зрабіць”» (Лк. 17:6–10)

Мяне раней здзіўляла, што Ісус перайшоў ад размовы пра веру як пра зерне да ролі слугі перад гаспадаром. Такі пераход здаваўся недарэчным, але я ведаў, што гэта няпраўда. Аднойчы Святы Дух адкрыў мне вочы.

Па-першае, Ісус кажа, што вера прыходзіць, як зерне. Зерне вельмі маленькае, але ўтрымлівае ў сабе патэнцыял вырасці ў велізарныя дрэвы. Недастаткова проста пасадзіць зерне.

Яго трэба ўзрошчваць, каб яно дасягнула свайго прызначэння. Другая частка адказу змяшчае ключ да таго, каб зерне веры вырасла ў магутныя пладаносныя дрэвы. Іншымі словамі, вырасла ў такую веру, што здольная выкараніць фігавыя дрэвы, зрушыць горы або прывесці ў прысутнасць Бога!

Чаму слуга займаецца земляробствам або пасе статкі для гаспадара? Канчатковая мэта — атрымаць ежу на свой стол. Ісус пытаецца: ці будзе слуга пасвіць статак або даглядаць ураджай, а потым не скончыць працу і не паставіць ежу на стол гаспадару? Каб дасягнуць поспеху, слуга павінен выканаць *усё*, што яму даручылі. Няскончаную справу можна параўнаць з зернем, якое вы пасеялі, палівалі і ўгнойвалі, але перад самым жнівом знішчылі яго або з-за нядбайнасці дазволілі пладам згніць.

Ісус кажа пра нашу паслухмянасць Яму. Ён — Гаспадар, а мы — слугі на Яго палях. Калі мы хочам бачыць, як зерне веры расце і прыносіць плод, мы павінны быць паслухмянымі слугамі ва ўсім, што нас просяць рабіць. Звярніце ўвагу на Яго словы: «Так і вы, калі зробіце ўсё, што загадана вам». Гэтыя словы пацвярджаюць, што Госпад кажа пра нашу паслухмянасць, і гэта ключ да ўзрастання нашай веры.

## Частковая паслухмянасць — гэта непаслухмянасць

Недастаткова часткова слухацца або спачатку быць паслухмяным, а потым адступаць. Гэта памылка, якую зрабілі многія ў Бібліі. Адзін з прыкладаў — цар Саўл. Госпад выразна сказаў ісці і цалкам знішчыць усіх амалекцаў — забіць кожнага мужчыну, жанчыну і дзіця, а таксама ўсю жывёлу. Нічога жывога не павінна было застацца.

Саўл не адказвае: «Я не зраблю гэтага!» Занадта часта мы абмяжоўваем непаслухмянасць відавочным — адкрытым бунтам. Гэта не зусім правільна. Не было і таго, каб Саўл згадзіўся, а потым памяняў меркаванне. Большасць з нас таксама разумее такую форму непаслухмянасці. Саўл не палічыў загад Госпада настолькі няважным, каб не зрабіць прыярытэтам. Ён не праяўляе непаслухмянасці праз нядбайнасць або праз забыўчывасць. Большасць не палічылі б такі ўчынак паслухмянасцю, але апраўдалі б яго дзеля добрых намераў. Усе пагодзяцца, што прыведзеныя сцэнары ілюструюць непаслухмяныя паводзіны, але давайце звернем увагу на дзеянні Саўла.

Ён адразу збірае войска і атакуе, забіваючы ўсіх мужчын, жанчын, немаўлят і дзяцей, якія кормяцца грудзьмі. Дзясяткі тысяч людзей падаюць пад мячамі Саўлам і вялікага войска. Аднак Саўл шкадуе цара Амалека. Чаму? Я лічу, учынак адпавядае культуры таго часу. Тады, заваёўваючы народ, бралі цара жывым і рабілі яго рабом у палацы, ён быў жывым трафеем.

Саўл таксама забіў тысячы жывёл. Але пашкадаваў лепшых авечак, валоў, адкормленых цялят, ягнят і ўсё, што было добрае, і аддаў гэта свайму народу, каб прынесці ахвяру Богу і зрабіць «біблейскія» рэчы. Уявіце сабе, як людзі гэта ўспрынялі. Прыносячы асуджаных жывёл Яхвэ, яны думалі: «Які ж у нас пабожны цар, ён заўсёды ставіць Госпада на першае месца».

Але ў Бога зусім іншае меркаванне. Ён кажа Самуэлю: «Шкадую, што Я паставіў Саўла валадаром, бо адступіўся ён ад Мяне і не выконвае словы Мае» (1 Сам. 15:11). Саўл забіў дзясяткі тысяч і пашкадаваў толькі аднаго. Ён выканаў 99,9 % загаданага. Большасць з нас убачыць тут паслухмянасць, але

Бог бачыць непаслухмянасць. Праз некалькі вершаў Госпад праз прарока называе такі ўчынак бунтам. Аказваецца, частковая паслухмянасць — зусім не паслухмянасць у вачах Бога. Дакладней кажучы, амаль поўная паслухмянасць, нават 99 працэнтаў, лічыцца не паслухмянасцю, а бунтам. Як часта мы чуем: «Чаму ты не глядзіш на ўсё, што я зрабіў? Ты засяроджваешся толькі на тым малым, чаго я не зрабіў!» Саўл дакладна мог так сказаць. І такая выснова адпавядае чалавечаму, а не Божаму разважанню!

## Блізкасць прама прапарцыйная нашай веры

Зірнуўшы на далейшае жыццё Саўла, вы заўважыце паступовы заняпад веры і аддаленне ад Госпада. Яго ўзровень блізкасці зніжаецца, бо наша здольнасць мець блізкасць з Богам прама прапарцыйна нашай веры. Адносна гэтага апостал Ян кажа:

> «І з гэтага даведаемся, што мы ад праўды, і супакоім перад Ім сэрцы нашыя. Бо калі сэрца нас дакарае, дык Бог большы за сэрца нашае і ведае ўсё. Улюбёныя! Калі сэрца нашае не дакарае нас, мы маем адвагу перад Богам, і чаго ні папросім, атрымаем ад Яго, бо захоўваем прыказаньні Ягоныя і тое, што падабаецца [Яму], робім перад Ім» (1 Яна 3:19–22).

Наша здольнасць мець блізкасць з Богам прама прапарцыйна нашай веры, а наша вера прапарцыйна паслухмянасці Яму. Цяпер дазвольце ўдакладніць адзін момант. Я не кажу пра непаслухмянасць, за якой адразу ідуць вызнанне грэху і пакаянне. Грэх Давіда быў значна большы, чым грэх Саўла, але Давід адразу пакаяўся. Яго

вера не знікла, як і яго здольнасць мець блізкія адносіны з Госпадам. Саўл жа, наадварот, імкнуўся да ўласнай карысці, каб узбагаціцца і абараніць тое, што лічыў сваім. Яго сэрца не шукала Божага, як сэрца Давіда.

Добрым прыкладам у штодзённым жыцці можа быць дынаміка адносінаў мужа і жонкі. Калі адзін з іх становіцца эгаістычным і не падпарадкоўваецца іншаму, губляюцца давер і блізкасць. Муж можа сказаць: «Слухай, я аплачваю рахункі, ежу на стале, дах над галавой і купляю табе вопратку. Што дрэннага ў тым, што ў мяне ёсць яшчэ дзяўчына?» Ён можа сказаць: «Я цябе кахаю» і даводзіць, што добра клапоціцца пра жонку, але ўзровень іх блізкасці гарантавана хутка пагоршыцца праз яго непаслухмянасць толькі ў адной сферы.

Мы можам спытаць: «Госпад, я рэгулярна хаджу ў царкву, плачу дзесяціну, чытаю Біблію і малюся. Чаму мая вера такая слабая?» Дазвольце мне задаць пытанне: як вы ставіцеся да жонкі? Бог кажа: «Таксама і вы, мужы, жывіце з разуменьнем з жонкамі, аддаючы ім, як найслабейшай пасудзіне, пашану, бо і яны — суспадчыньніцы ласкі жыцьця, *каб не было перашкоды ў малітвах вашых*» (1 Пт. 3:7, *курсіў аўтара*). Нашыя адносіны з Богам абцяжараныя, бо мы не паслухмяныя ва ўсіх сферах. Узгадайце словы Ісуса: «Так і вы, калі зробіце ўсё, што загадана вам». Частковая паслухмянасць ніколі не «павялічыць нашу веру»! Такі прынцып датычыцца стаўлення жонак да мужоў, дзяцей – да бацькоў і нават бацькоў да дзяцей.

Можна задаць яшчэ адно пытанне: вы трымаеце слова? Пісанне кажа: чалавек, які будзе мець блізкасць з Богам, — гэта «хто са шкодай для сябе прысягаў, але гэтага не зьмяняў» (Пс. 15:4). Ці даяце вы слова, а пасля не выконваеце яго? Ці звычайна грашыце вуснамі, а потым здзіўляецеся, чаму вера

слабая? Насамрэч, спіс пытанняў тут вельмі вялікі.

Сэнс у тым, каб жыць, імкнучыся быць цалкам паслухмянымі Слову Божаму! Нам адназначна сказана:

> «Дзеткі мае! Пішу вам гэтае, *каб вы не грашылі*»
> (1 Яна 2:1, *курсіў аўтара*)

Многія глядзяць на грэх альбо легкадумна, альбо як законнікі. Тыя, хто ўспрымае грэх легкадумна, лічаць, што могуць парушыць Божае Слова, бо нам належаць ласка і міласэрнасць, за ўсё ўжо заплочана на крыжы. Так, крыж стаў адказам на грэх, але мы павінны памятаць, што Павел кажа вернікам: «Ці вы ня ведаеце, што, каму вы аддаяцё сябе на службу, каб [быць яму] паслухмянымі, таго вы і слугі, каго слухаецеся: ці грэху — на сьмерць, ці паслухмянасьці — на праведнасьць» (Рым. 6:16). Зноў жа, Сам Ісус гаворыць тым, хто называў Яго Госпадам, але пастаянна грашыў: «Адыйдзіцеся ад Мяне, вы, што чыніце беззаконьне» (Мц. 7:23).

Законнікі лічаць, што грэх — гэта нагода, каб выключыць верніка з «клуба святасці». Але матывацыя трымацца далей ад любой формы непаслухмянасці павінна быць іншай. На самай справе, такая матывацыя не можа ўтрымаць нас ад граху. Аднак, калі мы бачым, што грэх шкодзіць нашай веры і перашкаджае блізкасці з Богам, мы ўцякаем ад граху! Чаму? Таму што больш за ўсё жадаем блізкасці з Госпадам.

Цяпер мы разумеем, чаму Якуб кажа непасрэдна да і пасля запрашэння наблізіцца да Бога:

> Дык *падпарадкуйцеся* Богу; супраціўцеся д’яблу, і ўцячэ ад вас. Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас. *Ачысьціце рукі, грэшнікі*! (Як. 4:7–8, *курсіў аўтара*)

Усё круціцца вакол паслухмянасці! Чаму? Каб мы маглі прыступаць да Бога з поўнай упэўненасцю. Давайце зноў паглядзім на ўрывак з Пісання, прыведзены на пачатку раздзела:

> Дык, браты, маючы *адвагу* ўваходзіць у сьвятыню праз кроў Ісуса Хрыста, шляхам новым і жывым,… будзем *падыходзіць* са шчырым сэрцам, *у поўні веры*, пакрапіўшы сэрцы, [каб ачысьціць] ад сумленьня злога, і абмыўшы цела чыстай вадою. *Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі*, бо верны Той, Які абяцаў (Гебр. 10:19–23, *курсіў аўтара*).

Наша ўпэўненасць або поўная ўпэўненасць вынікае з веры, якая прыходзіць праз слуханне Божага Слова і павялічваецца праз нашу пастаянную паслухмянасць. Калі мы грашым, маем Заступніка перад Айцом, і калі мы хутка пакаемся, то наша сумленне будзе вольнае ад асуджэння, бо Яго кроў ачышчае нас і робіць бялейшымі за снег. Аднак, калі мы свядома працягваем грашыць, то наша сумленне асудзіць нас, а Бог большы за наша сумленне. Гэта перашкодзіць нам наблізіцца да жывога Бога з упэўненасцю.

## Надзея

Цяпер звернемся да другога сцверджання ўзгаданага урыўка з Пісання: «будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі». Надзею часта няправільна разумеюць; яна не раўназначная слову «магчыма». Хутчэй, яна азначае «ўпэўненае чаканне».

Калі Бог упершыню з’явіўся Абрагаму, Ён абяцаў: «Я — шчыт твой, узнагарода твая вельмі вялікая» (Быц. 15:1). У

Абрагама не было *натуральнай надзеі* мець дзяцей ад бясплоднай жонкі, таму яго адказ быў крыху роспачным:

> ГОСПАДЗЕ, што Ты дасі мне? Я хаджу бязьдзетны, і распарадчык у доме маім — Эліезэр з Дамаску... Вось, ня даў Ты мне насеньня. І вось, народжаны ў доме маім [слуга] будзе спадкаемцам маім (Быц. 15:2–3).

Было зразумела, што ў гэтага чалавека мала ці зусім няма надзеі, і Бог ведаў, што Абрагам не зможа атрымаць Яго абяцанняў без надзеі. Таму Госпад вывеў яго ўвечары на вуліцу і сказаў яму палічыць зоркі. Я думаю, Абрагам у рэшце рэшт заснуў, лічачы незлічоныя зоркі. На наступную раніцу Госпад разбудзіў яго пытаннем: «Ці палічыў ты іх усе?»

Абрагам сказаў: «Не, іх занадта шмат!»

У Бога быў адказ, якога шукаў Абрагам. Бог сказаў: «Такім будзе насеньне тваё» (Быц.15:5). Бог уклаў Сваю надзею — выразную карціну Свайго абяцання Абрагаму, карціну мноства дзяцей. Кожны раз, калі Абрагам глядзеў на зоркі, ён успамінаў Божае абяцанне і чуў незлічоных нашчадкаў, якія крычалі: «Тата Абрагам, тата Абрагам!» У сувязі з гэтым ў Новым Запавеце пра Абрагама сказана:

> Ён, насуперак надзеі, паверыў з надзеяй, што станецца бацькам многіх народаў, паводле сказанага (Рым. 4:18).

Што было сказана? «Такім будзе насеньне тваё – занадта шматлікім, каб злічыць!» Там, дзе не было натуральнай надзеі, умяшалася Божая надзея, каб абяцанне адолела бачнае. Божая надзея глядзела далей за відавочнае ў Божую сферу ўпэўненага чакання. Абрагам вырашыў, што Божае было важней

за відавочнае. Пісанне кажа, што Абрагам меў «пэўнасьць, што Бог магутны зрабіць тое, што абяцаў» (Рым. 4:21), і атрымаў абяцанне верай, узмоцненай надзеяй. Нам сказана:

> «А вера ёсьць пэўнасьць у тым, чаго спадзяемся» (Гебр. 11:1).

Наша вера дае пэўнасць надзеі або абяцанням Бога. Як мы бачылі ў выпадку з Абрагамам, Божая надзея — гэта бачанне або план Божай волі, які мы пакуль не можам убачыць фізічнымі вачамі. Божая надзея надзвычай важная, бо без надзеі вера не мае пэўнасці. Слова Божае не толькі ўкладвае веру ў нашыя сэрцы, але і дае веры надзею, або бачанне.

Гэта можна параўнаць з будоўляй. У нас могуць быць будаўнічыя матэрыялы: вокны, дахоўка, дрэва, цэмент, цэгла і гэтак далей. Мы можам мець усе рэсурсы, але без праекта будоўля скончыцца катастрофай! Вы можаце падумаць: *я мог бы будаваць без праекта*. Магчыма, калі б вы ўжо прыдумалі нейкі праект, але вам усё роўна спатрэбіцца план.

## Увайсці ў прысутнасць за заслонай

Што да блізкасці, давайце зноў паглядзім на наш галоўны ўрывак з Пісання:

> Дык, браты, маючы *адвагу* ўваходзіць у сьвятыню праз кроў Ісуса Хрыста, шляхам новым і жывым,… будзем *падыходзіць* са шчырым сэрцам, *у поўні веры*, пакрапіўшы сэрцы, [каб ачысьціць] ад сумленьня злога, і абмыўшы цела чыстай вадою. *Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі*, бо верны Той, Які абяцаў (Гебр. 10:19–23, *курсіў аўтара*).

Аўтар выразна кажа пра набліжэнне да Госпада. Спыніцеся на словах: «Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі». Памятайце, што надзея — гэта праект, бачанне, Божая карціна таго, што мы не можам бачыць нашымі фізічнымі вачамі. Маючы гэта на ўвазе, уважліва чытаем далей:

> Бо людзі прысягаюць вышэйшым, і ўсякая спрэчка між імі завяршаецца прысягай на сцьвярджэньне. Дзеля гэтага Бог, хочучы празьмерна паказаць спадкаемцам абяцаньня нязьменнасьць намеру Свайго, ужыў прысягу, каб праз дзьве нязьменныя рэчы, у якіх Богу хлусіць немагчыма, вялікае пацяшэньне мелі мы, якія прыбеглі ўхапіцца за надзею, што перад намі ляжыць, якую маем, як якар душы, пэўны і трывалы, які *ўваходзіць ва ўнутранае за заслону* (Гебр. 6:16–19, *курсіў аўтара*).

Бачыце? Злучыце вершы разам, і вы атрымаеце:

> будзем *падыходзіць* са шчырым сэрцам, *у поўні веры… Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі*, бо верны Той, Які абяцаў… за надзею, што перад намі ляжыць, якую маем, як якар душы, пэўны і трывалы, які *ўваходзіць ва ўнутранае за заслону* (Гебр.10:22-23; 6:19, *курсіў аўтара*).

У Новым Жывым Перакладзе гаворыцца пра так: «Яна вядзе нас праз заслону нябесную ва ўнутраную святыню Божую». Менавіта Бог даў Абрагаму яснае бачанне Божай надзеі. Калі гаворка ідзе пра блізкасць, Святы Дух дае Божае бачанне таго, чаго не могуць бачыць нашы зямныя вочы, Самога Госпада, Які жыве ў троннай зале нябёсаў.

Калі мы набліжаемся, мы звяртаемся да Духа Божага ўнутры, праходзім праз заслону нашага цела і абмежаванага мыслення і ўваходзім ў Яго прысутнасць. У гэтай прысутнасці, ва ўнутранай святыні нябёсаў, мы сустракаем Ісуса і Айца. У гэтай унутранай святыні мы адчуваем блізкасць з Госпадам Славы!

Вернікі часта спрабуюць уявіць, як яны ўваходзяць у тронную залу падчас малітвы. Аднак без дапамогі Святога Духа гэта можна параўнаць з няздольнасцю Абрагама зразумець абяцанне Бога без бачання. Толькі пасля таго, як Сам Госпад намаляваў яму ясную карціну, Абрагам ухапіўся за тое, што абяцаў Бог.

Мы не можам адчуць сапраўдную глыбокую блізкасць ва ўнутранай святыні без Святога Духа. Ён дае нам надзею або яснае бачанне таго, што нашы фізічныя вочы не могуць бачыць. Маючы гэта бачанне, мы набліжаемся да Бога з поўняй веры і з усёй адвагай, каб атрымліваць асалоду ад таго, за што Ісус заплаціў такі вялікі кошт. Дзякуй Табе, Ісусе, за тое, што Ты праліў Сваю кроў за нас, каб мы маглі з упэўненасцю прыйсці ў самую прысутнасць Бога як цяпер, так і заўжды!

## Пытанні для вывучэння

1. Біблійнае слова «надзея» ў значэнні «ўпэўненае чаканне» супрацьпастаўляецца слову «надзея» ў значэнні «магчыма». Ці казалі вы пустыя словы з настроем «магчыма», не маючы ўпэўненага чакання? Калі так, то што гэта можа сказаць пра стан вашай веры?

2. З часоў апосталаў вернікі задавалі два пытанні. Пытанні падобныя па фармулёўцы, але глыбока адрозніваюцца па тым, што маецца на ўвазе:

- Як нам атрымаць веру?

- Як нам павялічыць веру?

  Як бы вы адказалі на гэтыя пытанні з улікам таго, што даведаліся ў гэтым раздзеле?

3. Якія адрозненні вы бачыце ў паслухмянасці Саўла і паслухмянасцю Давіда? Як іх паслухмянасць паўплывала на іх блізкасць з Богам?
4. Як паслухмянасць уплывае на здольнасць чалавека звяртацца да Бога з адвагай?

Раздзел 14

# НАБЛІЗІЦЦА ДА БОГА

Вы можаце мець адвагу наблізіцца да Бога,
бо Ён даў вам Сваё вечнае запрашэнне.

У заключным раздзеле я разгледжу практычныя крокі па набліжэнні да Таго, Хто так моцна любіць нас. Іх можна параўнаць з падрабязнымі інструкцыямі па блізкасці з жонкай пасля вяселля для тых, хто збіраецца ажаніцца. Вы можаце навучыцца толькі некаторым рэчам, астатняе ідзе ад сэрца. І ў гэтым заключаецца прыгажосць блізкасці: яна квітнее з нашых сэрцаў, ёй немагчыма навучыць розумам.

Набліжаючыся да Госпада, мусім памятаць, што мы створаны на Яго вобраз. Ён, як і мы, перажывае розныя эмоцыі. Як нам трэба быць адчувальнымі да настрою блізкага сябра, гэтаксама трэба быць чуллівымі і да Госпада. Напрыклад, бывае, прыходзім у Яго прысутнасць са спевам,

а бывае — са слязамі; часам прыходзім з адвагай, а часам — у трымценні. Мы перажываем часы смеху і часы плачу, часы барацьбы з Яго дапамогай супраць сіл цемры, і часы міру і супакою ў Яго цудоўнай прысутнасці.

Прыкладам апошняга можа быць дом у небяспецы. Дапусцім, злачынцы ломяцца ў дзверы дома. У гэты момант адзін з сыноў падыходзіць да таты, які шукае зброю, і кажа: «Тата, я лічу, што ты класны. Ты добра забяспечваеш нас, ты вясёлы і разумны...»

Бацька перапыніў бы сына, строга сказаўшы: «Зараз не час казаць мне пра пачуцці, ідзі вазьмі бейсбольную біту і пойдзем разам да дзвярэй!»

Вы павінны памятаць, што мы, царква Ісуса Хрыста, — Божы дом. Ёсць сапраўдныя ворагі. Бывалі выпадкі, калі я маліўся, і Святы Дух вёў мяне да бітвы, але спосабы бітвы бывалі рознымі. Часам трэба было прамовіць Слова, часам – упарта маліцца ў Духу ці нават моцна хваліць Бога (Язафат і войскі Ізраіля, гл. 2 Лет. 20:20–24). Мы павінны быць не толькі ўспрымальнымі да атмасферы, але і ўспрымальнымі да таго, як выканаць Божае жаданне.

Вяртаючыся да нашага прыкладу, паглядзім на адваротную сітуацыю. Уявіце сабе тую ж сям'ю: усё спакойна, бацька адпачывае каля каміна. На гэты раз сын уваходзіць у шлеме і з бейсбольнай бітай і крычыць: «Давай іх зловім, тата!»

Бацька паглядзіць на яго і скажа: «Сынок, зараз усё ў парадку. Чаму б табе не далучыцца да нашай кампаніі»

Я ўпэўнены, можна ўявіць мноства розных сцэнарыяў, па якіх могуць развівацца адносіны з блізкімі людзьмі. Гэтаксама бываюць розныя часы і поры ў малітве. У Пісанні згадваецца кожны з пералічаных вышэй выпадкаў і іншыя. Галоўнае — ведаць, што ў Бога на сэрцы ў дадзены момант.

## Божыя інтарэсы

Як вы сябе адчуваеце, калі сябар заўсёды пільнуецца толькі ўласных інтарэсаў? Як адчувае сябе бацька, калі сын прыходзіць да яго толькі са сваімі просьбамі? Вы адкрыеце сэрца тым, хто эгаістычны, ці тым, хто, як вы ведаеце, не мае спачування? Калі мы хочам дакрануцца да сэрца Госпада, мы павінны імкнуцца ведаць, чаго Ён жадае і ў чым мае патрэбу. Так, патрэбу! Нягледзячы на тое, што Ён Усемагутны і нібыта ні ў чым не мае патрэбы, Ён усё ж даў чалавецтву свабоду волі і пэўныя магчымасці на гэтай зямлі. Праз гэта Ён зрабіў сябе ўразлівым. З-за грэхападзення чалавека і сіл цемры, якія падманваюць людзей, ловяць у пастку і мучаюць, шмат хто пакутуе і патрабуе дапамогі. Бог прагне заступіцца за іх і чакае тых, хто будзе за іх маліцца. Так можна зразумець: Госпад вельмі блізка да тых, хто заступаецца і і просіць Божай ласкі для людзей у бядзе. На судзе Ісус скажа:

> “Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есьці; Я смагнуў, і вы напаілі Мяне; быў чужынцам, і вы прынялі Мяне, быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязьніцы, і вы прыйшлі да Мяне” (Мц. 25:35–36).

Вы бачыце Госпада славы, Які мае ўсю ўладу і сілу света. І Ён кажа, што мае патрэбу. Яго патрэбай сталі нашы патрэбы, патрэбы тых, каго Ён любіць. Бо госпад кажа: «Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (верш 40). Той, хто моліцца, аказвае фізічную дапамогу, прапаведуе вестку Божага вызвалення, лечыць раны Божай сілай, спазнае Яго сэрца хутчэй, чым хто іншы.

Калі быў час, што Божы народ старанна прыходзіў да

Госпада, Ён нават сказаў пра іх: «Яны шукаюць Мяне з дня ў дзень і жадаюць ведаць шляхі Мае» (Іс. 58:2). Аднак Госпад не адказваў. Людзі пачалі пытацца, чаму Бог не набліжаецца да іх. Яны не маглі зразумець, чаму няма адказу на іх малітвы. Тады Бог сказаў:

> «Вось, у дзень посту вашага вы спаўняеце пажаданьні вашыя і ўсіх работнікаў сваіх вы прыгнятаеце. Вось, вы посьціце, каб вадзіцца і сварыцца» (Іс. 58:3–4).

Звярніце ўвагу: людзі вадзіліся і сварыліся. Давайце вернемся да нашага галоўнага ўрыўка з Пісання: «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас». Вы ўбачыце, што Якуб пачынае раздзел словамі:

> «Адкуль войны і звадкі між вамі? Ці не адсюль, з [пажаданьня] асалодаў вашых, якія змагаюцца ў членах вашых? Вы жадаеце і ня маеце; забіваеце і зайздросьціце, і ня можаце атрымаць, вадзіцеся і ваюеце; а ня маеце дзеля таго, што ня просіце. Просіце і не атрымліваеце, бо блага просіце, каб выдаткаваць дзеля асалоды вашай. Чужаложнікі і чужаложніцы!... Дык падпарадкуйцеся Богу; супраціўцеся д’яблу, і ўцячэ ад вас. Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас» (Як. 4:1–8).

Вось і ўсё. Практычны крок нумар адзін: мы павінны адмовіцца ад свайго жыцця дзеля Госпада і Евангелля. Мы павінны жыць паводле Яго жаданняў. Мы павінны любіць тое, што любіць Госпад, і ненавідзець тое, што ненавідзіць Ён. Тое, што важна для Яго, павінна стаць важным для нас, а тое, што не вельмі важна для Яго, не павінна быць важным для

нас. Мы павінны мець Яго сэрца!

Ці азначае гэта, што ў нашым жыцці не будзе часу на асабістае аднаўленне? Ці адмаўляе Бог свайму народу ў адпачынку і спакоі? Абсалютна не! Пісанне кажа, што Бог «дае нам багата ўсё дзеля прыемнасці» (1 Цім. 6:17). Мы губляем сувязь з Яго сэрцам менавіта калі імкнемся да ўласных жаданняў, грэбуючы Ягонымі.

Ёсць тыя, хто лічыць: мы не выконваем Божых жаданняў, калі фізічна не дапамагаем бедным. Калі гэта праўда, то чаму, калі трэба было накарміць ўдоваў, Пётр сказаў: «Ня гожа нам, пакінуўшы слова Божае, служыць пры сталах. Дык нагледзьце спасярод вас, браты, сем засьведчаных мужоў, поўных Духа Сьвятога і мудрасьці, якіх мы паставім на гэтую патрэбу, а мы будзем трываць у малітве і служэньні слова» (Дз.6:2–4). Пётр разумеў: ёсць тыя, хто задаволіць патрэбы бедных (людзей, якія жывуць у нястачы), кормячы іх Словам Божым, і іншыя, хто адкажа на фізічныя патрэбы. Але ўсіх іх аб'ядноўвае адно: яны адказваюць на патрэбу Ісуса: «Бо Я быў галодны, і вы далі Мне...».

Тым, хто дбае пра інтарэсы Госпада, лягчэй наблізіцца да Яго. Майсей быў такім чалавекам, бо пасвіў Божы народ, маючы на ўвазе інтарэсы Госпада, ён быў чулы да сэрца Бога і меў глыбокую супольнасць з Ім.

Бог казаў пра Ёсію, які быў добрым лідарам: «Ён разьбіраў справу ўбогага і беднага, і добра было яму тады. Ці ж ня гэта [значыць] *ведаць Мяне*? — кажа ГОСПАД» (Яр. 22:16, *курсіў аўтара*).

Тым, хто добра выконвае сваё служэнне дапамогі, кіравання, навучання, адміністравання, ахвяраванняў і гэтак далей, лягчэй наблізіцца да Бога, чым тым, хто жыве ўласнымі мэтамі, якія падсілкоўваюць іх жыццё і нават

служэнне. Бо, як сказаў Сам Госпад: «Ці ж не гэта значыць ведаць Мяне?»

## Падыдзі бліжэй, каб слухаць

Наступная практычная парада, якую можна даць тым, хто жадае падысці да Госпада, знаходзіцца ў наступных урыўках з Пісання:

> «Захоўвай ногі свае, калі ідзеш у Дом Божы, і набліжайся туды, каб слухаць, а не складаць ахвяры як дурні, бо яны ня маюць ведання, робячы зло. Ня будзь хуткі вуснамі тваімі, і сэрца тваё няхай не сьпяшаецца вымавіць слова перад абліччам Божым, таму што Бог у небе, а ты — на зямлі. Дзеля гэтага няхай словы твае будуць нешматлікімі. Бо ад мноства заняткаў прыходзіць сон, і мноства словаў [мае] голас дурня» (Экл. 4:17 – 5:1–2).

Давайце вылучым першую частку. У адным з англійскіх перакладаў мы чытаем: «Набліжайся туды, каб слухаць, а не прыносіць ахвяру дурняў». Я бачу, што многія заўсёды набліжаюцца да Бога з размовай або спевам. Гэта, безумоўна, слушна. Аднак я знайшоў вялікі поспех у тым, каб звяртацца да Яго моўчкі і слухаць, перш чым сказаць слова або праспяваць песню хвалы.

Нядаўна я сустрэўся з пастарам вельмі вялікай і моцнай у Госпадзе царквы. За абедам ён сказаў мне: «Джон, я прыйшоў да таго, што сказаў Госпаду: “Я стаміўся прыходзіць у гэты пакой кожную раніцу і размаўляць без адказу. Таму, пакуль Ты не загаворыш да мяне, я буду проста прыходзіць сюды кожную раніцу і слухаць”».

Спатрэбілася некалькі раніц, таму што Госпад выпрабоўваў шчырасць яго сэрца. Аднойчы пастар зайшоў раніцай у пакой, і раптам Святы Дух пачаў гаварыць да яго. Менавіта ў гэты перыяд Бог даў наймагутнейшыя адкрыцці, і пастар абвяшчаў іх царкве на працягу некалькіх тыдняў. Яго малітоўнае жыццё змянілася.

Я даведаўся, што вельмі магутны спосаб прыйсці ў Божую прысутнасць — гэта ўзяць Біблію і чытаць урыўкі з Пісання (асабліва з Псалмаў ці Новага Запавету); не шмат урыўкаў з Пісання, а ўсяго адзін, а часам нават палову ўрыўка, і разважаць над ім, потым павольна чытаць іншы, і ў рэшце рэшт адчуваецца прысутнасць Госпада. Тады я спыняю чытанне і засяроджваюся на Ім і дазваляю Яму вучыць мяне ці паказваць мне тое, што будзе далей.

У любым выпадку, вы атрымаеце большы эфект, калі прыйдзеце ў Яго прысутнасць і, перш чым гаварыць, будзеце слухаць. Таксама я хаджу на служэнні хвалы, супакойваю розум і прыслухоўваюся да Духа Божага, каб адчуць Яго жаданне або настрой. Потым я пачынаю спяваць са служыцелямі хвалы. Гэта не абавязкова, бываюць выпадкі, калі я адразу ж звяртаюся да Госпада з падзякай, хвалой або радасцю, што выцякаюць з майго сэрца. Было так, быццам Дух Божы казаў: «Хадзем!» Бо Пісанне таксама кажа нам:

> Станьма перад абліччам Ягоным з падзякаю, гімны ўсклікайма Яму! (Пс. 95:2)

І яшчэ:

> Служыце ГОСПАДУ з радасьцю, прыходзьце перад аблічча Ягонае з хвалою! (Пс. 100:2)

Такім чынам, мы бачым, што Пісанне заклікае нас прыйсці

ў прысутнасць Госпада са спевамі і падзякай, у той час як папярэдні ўрывак Пісання заклікаў наблізіцца, каб паслухаць. Усё зводзіцца да таго, каб быць чуллівымі да Яго! Як немагчыма расказаць мужчыне пакрокавы працэс інтымных адносінаў з жонкай, так і з нашым набліжэннем да Госпада.

Уявіце мужчыну, які ў першую шлюбную ноч прыходзіць да жонкі з інструкцыяй. Ён чытае з карткі першы пункт: скажы ёй, якая яна прыгожая. Другі пункт: правядзі рукой па яе валасах. Трэці крокі: прыглушы святло. Чацвёрты… Ой, не магу прачытаць! Дзе ліхтарык? Смешна, праўда? Настолькі ж смешнай і недарэчнай некаторыя зрабілі малітву. Згубілася здольнасць дакранацца да Госпада, адчуваць Яго сэрца. Зразумейце мяне правільна: ёсць пэўныя рэкамендацыі з Пісання, якіх варта прытрымлівацца, але ў Божую прысутнасць нас прыводзіць Святы Дух. Пісанне выразна кажа нам: «літара забівае, а дух ажыўляе» (2 Кар. 3:6). Такім чынам, Дух Божы можа весці нас да хадайніцтва, спеваў, крыкаў, плача, маўчання і гэтак далей.

Яшчэ адна парада: не спяшайцеся з просьбамі ці словамі. Нават у адносінах з людзьмі. Калі хтосьці занадта шмат гаворыць, мы слухаем не так уважліва. Калі чалавек мудра выбірае словы, мы слухаем уважліва, нават калі ён гаворыць шмат. Таму вялікая частка маіх малітваў праходзіць у цішыні, малітве на мовах або ў чытанні Слова Божага.

Я ведаю: размаўляючы на мовах, я малюся пра дасканалую волю Бога. Святы Дух дае мне словы, якія я кажу Айцу ў імя Ісуса. Калі я малюся Духам, я не магу маліцца няправільна або прамаўляць пустыя словы,! Калі я кажу Яго запісанае Слова, я таксама адчуваю, што ўся мая істота, у тым ліку і мой розум, умацоўваецца. Вось чаму маліцца розумам таксама так важна.

Аднак адкрыццё, разуменне і мудрасць прыходзяць менавіта калі я знаходжуся ў Яго прысутнасці і слухаю. Так важна даваць Госпаду час гаварыць з намі. Уявіце сабе чалавека, які, звяртаючыся да вас, гаворыць бесперапынна і не дае магчымасці сказаць хоць слова. Думаю, менавіта так мы часам выглядаем у вачах Святога Духа. Нам трэба слухаць і гаварыць. Памятайце, малітва — гэта дыялог, а не маналог!

## Розныя спосабы перадачы інфармацыі

Калі Бог набліжаецца да нас, Ён адкрывае Сябе і Свае шляхі. Ён паказвае нам вялікія і магутныя рэчы, якіх мы не ведаем (Яр. 33:3). Ключ да разумення гэтага заключаецца ў разуменні таго, што ёсць розныя спосабы, якімі Госпад даносіць нам інфармацыю, калі прыходзіць. Часам мы чуем, як Ён гаварыць. Гэта можа быць моцны голас у нашых сэрцах, які можна памылкова прыняць за голас, які мы чуем фізічнымі вушамі. Таксама гэта можа быць ціхі голас, які мы чуем глыбока ў сэрцах, і які, як і ўсе іншыя спосабы, заўсёды суправаджаецца Яго ўнутраным супакоем і адпавядае Пісанню. Часам Ён будзе прамаўляць праз іншага верніка або лідара. Яны прамовяць нам, калі мы слухаем іх або чытаем іх творы, і ў нашых сэрцах нешта загарыцца. Бог можа вырашыць гаварыць з намі праз відзеж або сон. Іншым разам – і я лічу, што гэты спосаб даволі часты – мы проста будзем ведаць рэчы, якіх раней не ведалі. Часта Ён укладае ў наша сэрца Сваё Слова, і яно не адкрываецца, пакуль мы не загаворым. Святло прыходзіць, калі мы пачынаем прамаўляць.

Менавіта так здарылася з Пятром у дзень Пяцідзясятніцы. Пакуль на яго не зышла прысутнасць Бога, ён меў толькі разумовае веданне Слова Божага, за выключэннем адкрыцця, якое Бог даў яму пра тое, што Ісус — Хрыстос

(Мц. 16). Акрамя гэтага адкрыцця, Пятру было складана размаўляць пра духоўныя рэчы. У пакоі, дзе вучні чакалі Духа Святога, ён спрабаваў заняцца духоўным кіраваннем, выбраўшы замену Юдзе. Відавочна, заўчасна, бо пра абранага чалавека мы больш не чуем; а пазней Павел сказаў пра сябе, што ён нарадзіўся несвоечасова (1 Кар. 15:8). Здаецца, на замену Юдзе Бог абраў Паўла, а не таго, каго Пётр няўдала прапанаваў абраць праз жэрабя.

Па сутнасці, духоўна Пётр, здавалася, пастаянна памыляўся. Аднак, як толькі Бог наблізіўся да яго, той кажа глыбокае і магутнае пасланне з Ёіля і Псалмоў і тлумачыць тое, што адбылося, са ста дваццаццю вернікамі. Пётр не мог падрыхтаваць настолькі грунтоўную прамову ўсяго за некалькі хвілін, пакуль збіраліся людзі. Ён імгненна атрымаў веды, якіх не было раней. І не толькі Пётр, але і ўсе прысутныя пасля таго, як сышла Божая прысутнасць, пачалі гаварыць «пра веліч Божую» (Дз. 2:11).

Такім чынам, Госпад, набліжаючыся, адкрывае нам розныя спосабы. Адно можна сказаць дакладна: мы не застанемся ранейшымі, сустрэўшы Яго.

## Заключнае слова

Як гаварылася ў першым раздзеле, гэтае пасланне — не інструкцыя, як дзейнічаць. Блізкасць немагчыма прадставіць у інструкцыі. Хутчэй гэта карта, якая вядзе да скарбаў Божага сэрца. Я лічу, гэта прароцкае пасланне, заклік Божага сэрца да ўсіх нас, таму што Бог пяшчотна і горача жадае бачыць нас побач з Сабой. Прыкладаючы энергію і знаходзячы час, каб прытрымлівацца «карты» Слова Божага, выкладзенай ў гэтай кнізе, мы абавязкова знойдзем прысутнасць Бога і пазнаем

Яго сэрца. Памятайце: Яго абяцанне наблізіцца да кожнага з нас асабіста, калі мы наблізімся да Яго, — гэта не сцэнар магчымага развіцця падзеяў, а Яго абяцанне, якое Госпад заўсёды будзе трымаць і ніколі не парушыць.

Дазвольце скончыць кнігу яшчэ некалькімі ўрыўкамі з Пісання, якія натхняць вас наблізіцца да Бога:

> Бо ГОСПАД брыдзіцца крывадушным, а з правымі Ён сябруе (Прып. 3:32).

> А для мяне блізкасьць Бога ёсьць дабро (Пс. 73:28).

> ГОСПАД блізкі да ўсіх, што клічуць Яго, да ўсіх, што клічуць Яго ў праўдзе. Ён робіць паводле жаданьня тых, што баяцца Яго, і чуе лямант іхні і выбаўляе іх. ГОСПАД захоўвае ўсіх, што любяць Яго, але ўсіх бязбожных Ён зьнішчыць (Пс. 145:18–20).

> І Я набліжу яго да Сябе, і ён наблізіцца да Мяне, бо хто ёсьць той, хто адважыцца ў сэрцы сваім наблізіцца да Мяне? — кажа ГОСПАД (Яр. 30:21).

З адвагай наблізьцеся да Госпада, бо Ён даў вам Сваё вечнае запрашэнне. Таму прысвяціце сябе, каб жыць у Яго прысутнасці. Ён чакае вас — чаго ж вам марудзіць? Ідзіце да Яго!

> А Таму, Які можа захаваць вас ад упадку і паставіць перад славаю Сваёю беззаганнымі і ў радасьці, адзінаму мудраму Богу, Збаўцу нашаму, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага, слава і веліч, сіла і ўлада цяпер і на ўсе вякі. Амэн (Юды 24–25).

## Пытанні для вывучэння

1. Ці задумваліся вы перад тым, як чытаць гэты раздзел, што ў Бога ёсць «патрэбы»? Якім чынам мы служым гэтым патрэбам?

2. Наколькі важна для вас прыслухоўвацца да Святога Духа? Ці спрабавалі вы звярнуцца да Бога ў цішыні, нягледзячы на тое, што ведаеце мноства песень хвалы і пакланення, натхнёных Духам? Паспрабуйце гэта практыкаваць і запішыце або падзяліцеся вынікамі з іншымі.

3. У першым раздзеле аўтар кажа, што гэтая кніга не пакрокавая інструкцыя, а карта, якая дапамагае наблізіцца да Бога. Паразважайце над тым, што вы даведаліся, якія скарбы вы ўжо адкрылі і якія яшчэ трэба адкрыць?

Дадатак А

# ПАТРЭБА Ў ЗБАЎЦЫ

Ёсць два стандарты жыцця: адзін усталяваны грамадствам, а другі – Богам. Культура можа лічыць вас «добрым» паводле сваіх параметраў, але што думае Бог? Пісанне кажа: ніводны чалавек не адпавядае Божаму стандарту справядлівасці: «як напісана: «Няма праведнага аніводнага»» (Рым. 3:10) і яшчэ: «бо ўсе зграшылі і пазбаўлены славы Божае» (Рым. 3:23)

Грашыць — значыць не адпавядаць Божаму стандарту. Чалавек не быў створаны грэшнікам; Адам абраў такі шлях па ўласнай волі. Бог змясціў першага чалавека, Адама, у прыгожы свет без хвароб, беднасці ці стыхійных бедстваў. Там не было страху, нянавісці, сварак, зайздрасці. Бог назваў гэтае месца Эдэмам, сапраўдным садам Божым.

Адам вырашыў не падпарадкавацца Божаму прыказанню і адчуў неадкладную духоўную смерць, хоць фізічна ён памёр толькі праз сотні гадоў. Цемра агарнула яго сэрца. Духоўная смерць адрозніваецца ад фізічнай. Пры фізічнай смерці перастае дзейнічаць цела; а духоўная смерць — гэта аддзяленне ад Бога, Які ёсць крыніцай усяго жыцця.

Грэх увайшоў у нутро Адама, і Адам нарадзіў дзяцей паводле грэшнай прыроды: «І жыў Адам сто трыццаць гадоў, і нарадзіў [сына] на падабенства сваё і на вобраз свой» (Быц. 5:3).

Нашчадкі Адама пераймалі яго прыроду, і з гэтага моманту кожны чалавек нараджаецца паводле вобраза граху, перададзенага праз бацькоў. Адам аддаў сябе і сваіх нашчадкаў новаму гаспадару — шатану, і свет прыроды таксама рушыў у палон. Цяпер жорсткі гаспадар меў законныя прэтэнзіі на любімае стварэнне Бога. Гэта выразна відаць з наступных вершаў: «І, узьвёўшы Яго на высокую гару, д’ябал паказаў Яму ўсе валадарствы сусьвету ў імгненьне часу. І сказаў Яму д’ябал: “Дам Табе ўладу над усім гэтым і славу іхнюю, бо *яна мне аддадзена*, і я, каму хачу, даю яе”» (Лк. 4:5–6, *курсіў аўтара*).

Звярніце ўвагу: улада была дадзена д’яблу. Калі? У садзе, бо першапачаткова Бог даў уладу над зямлёй чалавеку (гл. Быц. 1:26–28). Адам, разам з нашчадкамі ва ўсіх пакаленнях, страціў усё... Зноў мы чытаем: «увесь сьвет ляжыць у зьле» (1 Яна 5:19).

Перад тым, як выслаць Адама з саду, Бог абяцанне: паўстане Збаўца і знішчыць рабства і палон, у якія патрапіла чалавецтва.

Гэты вызваліцель нарадзіўся праз чатыры тысячы гадоў у дзяўчыны на імя Марыя. Яна была дзяўчынай, бо бацькам Ісуса быў Святы Дух, ад Якога яна зацяжарыла. Калі б Ісус

нарадзіўся ад фізічных бацькоў, Ён нарадзіўся бы ў палоне граху Адама.

Яго бацькам быў Бог, а маці была чалавекам. Гэта зрабіла Яго цалкам Богам і цалкам чалавекам. Сын Чалавечы мусіў нас вызваліць. Менавіта таму Ісус пастаянна называў Сябе «Сынам Чалавечым». Хоць Ён быў з Айцом ад пачатку, Ён адмовіўся ад Сваіх прывілеяў і стаў чалавекам, каб аддаць Сябе як ахвяру за грэх.

Калі Ісус пайшоў на крыж, Ён узяў на Сябе суд за наш грэх, каб вызваліць нас з рабства. Пісанне абвяшчае: «Ён грахі нашыя Сам узьнёс у целе Сваім на дрэва, каб мы, памёршы дзеля грахоў, жылі ў праведнасьці» (1 Пят. 2:24).

Дзіўна: чалавек саграшыў супраць Бога, і ўсё ж Бог (з’яўлены ў целе) заплаціў за сур’ёзную памылку чалавека. Мы зноў чытаем: «Бо Таго, Які грэху ня ведаў, Ён зрабіў за нас грэхам, каб мы ў Ім сталіся праведнасьцю Божай» (2 Кар. 5:21).

Звярніце ўвагу: там гаворыцца, што мы можам прымірыцца з Богам. Мы не атрымліваем свабоды, за якую Ён заплаціў такі вялікі кошт, пакуль не паверым у сэрцы, што Ісус памёр за нас і ўваскрос з мёртвых і не прымем Ісуса як нашага Госпада. Менавіта тады Ён становіцца нашым Збаўцам. Як гаворыцца ў Пісанні: «А тым, што прынялі Яго, дало Яно ім уладу дзецьмі Божымі стацца, тым, якія вераць у імя Яго, тым, што не ад крыві, не ад жаданьня цела, не ад жаданьня мужа, але ад Бога нарадзіліся» (Ян 1:12-13).

Прымаючы Ісуса Хрыста як нашага асабістага Госпада і Збаўцу, мы паміраем як рабы ў царстве шатана і духоўна нараджаемся як цалкам новыя дзеці Бога ў Яго валадарстве. Як гэта адбываецца? Проста. Калі мы верым у гэта ў сэрцы, нам трэба вызнаць вуснамі Ісуса як нашага Госпада, і мы нараджаемся зноў. Пісанне пацвярджае: «Бо калі ты вуснамі

тваімі вызнаеш Ісуса Госпадам і ў сэрцы тваім будзеш верыць, што Бог уваскрасіў Яго з мёртвых, будзеш збаўлены, бо сэрца верыць дзеля праведнасьці, а вусны вызнаюць дзеля збаўленьня» (Рым. 10:9-10).

Усё так проста! Мы не збаўлены нашымі добрымі справамі. Нашы добрыя справы ніколі не маглі б заслужыць нам месца ў Божым Валадарстве. Калі было б так, то Хрыстос памёр дарэмна. Мы збаўлены Яго ласкай. Гэта дар, які мы не можам заслужыць. Усё, што нам трэба, каб атрымаць яго, — адмовіцца ад жыцця для сябе і прысвяціць жыццё Ісусу як Госпаду, Галоўнаму Настаўніку. «І Ён памёр за ўсіх, каб тыя, якія жывуць, больш не дзеля сябе жылі, але дзеля Таго, Які памёр за іх і ўваскрос» (2 Кар. 5:15).

Калі верыце, што Хрыстос памёр за вас, і гатовы аддаць Яму сваё жыццё і больш не жыць для сябе, давайце разам памолімся гэтай малітвай, і вы станеце дзіцем Божым:

*Божа Нябесны, я прызнаю: я – грэшнік і не адпавядаю Твайму праведнаму стандарту. Я заслугоўваю вечнага асуджэння за мой грэх. Дзякуй Табе, што не пакінуў мяне ў гэтым стане, бо я веру, што Ты паслаў Ісуса Хрыста, Твайго адзінароднага Сына, які нарадзіўся ад Марыі, каб Ён памёр за мяне і панёс маё асуджэнне на Крыжы. Я веру, што Ісус уваскрос на трэці дзень і цяпер сядзіць праваруч Цябе як мой Госпад і Збаўца. Таму ў гэты дзень ______, 20__ года, я цалкам аддаю маё жыццё Госпаду Ісусу.*

*Ісусе, я прызнаю Цябе як майго Госпада і Збаўцу. Прыйдзі ў маё жыццё праз Твой Дух і перамяні мяне ў дзіця Божае. Я адракаюся справаў цемры, якіх калісьці трымаўся, і ад гэтага дня я больш не жыву*

*для сябе. Маё жыццё належыць Табе, бо Ты аддаў Сябе за мяне, каб я мог жыць вечна.*

*Дзякуй Табе, Госпадзе! Маё жыццё цяпер цалкам у Тваіх руках. І, паводле Твайго Слова, я ніколі не буду асаромлены.*

Цяпер вы збаўленыя. Вы — Божае дзіця! Нябёсы радуюцца з вамі ў гэты момант. Сардэчна вітаем у Божай сям'і!

Дадатак Б

# ЯК НАПОЎНІЦЦА СВЯТЫМ ДУХАМ

Атрымаць паўнату Святога Духа гэтаксама проста, як прыняць Ісуса як Госпада і Збаўцу. Некаторыя людзі сутыкаюцца з цяжкасцямі, губляюць веру і не могуць прыняць Духа Святога, але так часцей за ўсё здараецца, калі яны не трымаюцца асноўных біблейскіх настаўленняў. Перад тым, як маліцца, заўсёды лепш паказаць Божыя абяцанні тым, хто шукае Духа, бо гэта ўмацоўвае веру ў Яго атрыманне. Перш чым мы будзем маліцца, дазвольце спачатку даць настаўленні. Заўвага: важна, каб вы спачатку прачыталі раздзел 11.

Перш за ўсё, вы павінны ўжо прыняць Ісуса Хрыста як асабістага Госпада і Збаўцу (гл. Ян 14:17).

У вашым жыцці не можа быць ніякай непаслухмянасці.

Нам сказана, што Бог дае Свайго Духа «тым, што слухаюцца Яго» (Дз. 5:32). З досведу я зразумеў: асабліва гэта тычыцца непрабачэння. На служэннях я шмат разоў бачыў, як сотні людзей атрымлівалі Святога Духа і адразу ж гаварылі на іншых мовах, але дзесяць-дваццаць чалавек збянтэжана стаялі без вынікаў. Амаль у кожным выпадку, звяртаючыся да іх, я бачыў: Госпад вядзе мяне да барацьбы з затоенай крыўдай. Як толькі яны даравалі, то адразу ж атрымлівалі Святога Духа і гаварылі на іншых мовах. Таму, перш чым ісці далей, давайце памолімся разам.

> Ойча, я прашу, каб Ты выпрабаваў мяне і паказаў, ці ёсць у маім сэрцы непаслухмянасць. Калі ласка, пакажы мне, ці ёсць хто-небудзь, каму я адмовіў у прабачэнні. Я маю намер слухацца і дараваць, што б Ты мне ні адкрыў. Прашу ў імя Ісуса і дзякую Табе.

Каб атрымаць Святога Духа, нам трэба проста папрасіць! Ісус кажа: «Хто з вас бацька, калі сын папросіць хлеба, дасьць яму камень? Ці [калі папросіць] рыбы, дасьць яму зьмяю замест рыбы? Ці калі папросіць яйка, дасьць яму скарпіёна? Дык вось, калі вы, будучы злымі, умееце добрыя дары даваць дзецям вашым, тым больш Айцец Нябесны дасьць Духа Сьвятога тым, што просяць у Яго» (Лк. 11:11–13). Ісус кажа: калі нашы дзеці папросяць у нас тое, што мы хочам ім даць, мы не дамо ім нешта злое ці дзіўнае. Калі вы папросіце ў Айца Яго Духа, Ён не дасць вам злога духа. Усё, што вам трэба зрабіць, гэта папрасіць у Айца ў імя Ісуса, і вы атрымаеце Святога Духа.

Вы павінны прасіць з верай. Новы Запавет кажа: немагчыма штосьці атрымаць ад Бога без веры. У Пасланні Якуба 1:6–7 гаворыцца: «Але няхай просіць з вераю, ані

не сумняваючыся, бо той, хто сумняецца, падобны да хвалявaньня марскога, якое вецер уздымае і ганяе. Дык няхай не мяркуе гэтакі чалавек, што нешта атрымае ад Госпада». Таму спытайце сябе: «Калі я атрымаю? Тады, калі буду гаварыць іншымі мовамі, ці ў той момант, калі папрашу?» У той момант, калі вы папросіце! Бо ў Валадарстве мы верым, а потым атрымліваем. Тыя, хто не мае веры, кажуць: «Пакажы мне, і я паверу», але Ісус кажа: «Кажу вам: Усё, пра што ў малітве будзеце прасіць, верце, што атрымаеце, і будзе вам» (Мк. 11:24). Звярніце ўвагу: спачатку вы паверыце, а потым атрымаеце тое, што прасілі.

У Дзеях 2:4 гаворыцца: «І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі гаварыць іншымі мовамі, як Дух даваў ім прамаўляць». Звярніце ўвагу: вернікі гаварылі на мовах, а не Святы Дух гаварыў на мовах. Людзі мусілі гэта зрабіць, бо Дух даў ім словы. Трэба падпарадкавацца! Я магу стаяць у хуткай рацэ, але не паплыву разам з ёй, пакуль не адарву ногі ад дна і не падпарадкуюся плыні. Такім чынам, ёсць тры сферы, у якіх мы павінны падпарадкавацца: па-першае, вусны. Калі я не рухаю вуснамі, словы ні на якой мове – англійскай, замежнай ці нябеснай – не могуць выйсці. Па-другое, язык. Калі я не рухаю языком, я не магу гаварыць. Па-трэцяе, галасавыя звязкі. Калі я не падпарадкую свае галасавыя звязкі лёгкім, я не магу гаварыць.

Вы падумаеце, што я іранізую, але гэта не так. Шмат гадоў я назіраў за цяжкасцямі людзей і зразумеў: многія падсвядома лічаць, што Святы Дух возьме іх вусны, язык і галасавыя звязкі і прымусіць гаварыць. Не! Гаворым, або паддаёмся мы, калі Ён дае прамаўляць.

Ісус кажа: «“Хто верыць у Мяне, як сказана ў Пісаньні, у таго з жывата пацякуць рэкі вады жывое”. Гэта сказаў Ён

пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго, бо не было яшчэ Духа Сьвятога, бо ня быў яшчэ Ісус праслаўлены» (Ян 7:38–39). Калі вы просіце пра атрыманне Святога Духа, у вашай свядомасці пачнуць узнікаць склады словаў. Прамаўляйце іх у голас з верай, і, быццам вада праз плаціну, гаварэнне на мовах вырвецца на свабоду. Гэта можна параўнаць з катушкай ніток, якая знаходзіцца ў вас унутры. Пачатак ніткі відаць на вашым языку, і як толькі вы пачынаеце цягнуць за яго (гаварыць), выцягваецца і астатняя нітка. Некаторыя думаюць, што будуць мець у розуме ўсю мову, а потым загавораць. Не, мы павінны з верай прамаўляць асобныя склады.

Я памятаю, як мая жонка Ліза малілася, каб атрымаць Святога Духа. Быў час, калі яна не гаварыла на мовах. Праз некалькі тыдняў жонка і некалькі сяброўак маліліся разам, і Ліза пачала гаварыць на мовах. Тады яна сказала: «У мяне ў галаве падчас малітвы круціўся адзін і той жа склад, але да сённяшняга вечара я не паддавалася, каб вымавіць яго». Я думаю, так здараецца з многімі — яны просяць, атрымліваюць, але не паддаюцца.

У Пісанні гаворыцца: «І духі прарочыя паслухмяныя прарокам» (1 Кар. 14:32). Гэта сведчыць, што мы маем уладу гаворыць і што Святы Дух не будзе нам навязвацца. Я памятаю, што на наступны дзень пасля напаўнення Святым Духам я не ведаў, як гаварыць на мовах зноў. Я пайшоў да іншага брата ў спартзале і спытаў: «Як мне гаварыць на мовах зноў?» Ён адказаў: «Джон, проста гавары!» Я выйшаў на прабежку і зноў пачаў гаварыць на мовах падчас бегу. Мяне ахапіла радасць. Мы павінны памятаць, што Святы Дух заўсёды гатовы дзейнічаць; а мы павінны быць гатовыя падпарадкавацца. Гэта як кран. Вада ёсць заўсёды,

нам трэба проста павярнуць ручку, і вада пальецца. Таму маліцеся на мовах часта!

Цяпер, атрымаўшы асноўныя інструкцыі з Пісання, вы верыце, што атрымаеце, і мы памолімся разам. І апошняе: вы не можаце адначасова гаварыць па-беларуску і па-англійску. Гэтаксама вы не можаце адначасова гаварыць па-беларуску і на мовах. Таму памятайце: проста верце і падпарадкуйцеся! Давайце памолімся:

*Ойча, у імя Ісуса, я прыходжу да Цябе як Тваё дзіця. Ты сказаў: калі я папрашу ў Цябе Святога Духа, Ты дасі Яго мне. З верай і з радасцю я зараз прашу: калі ласка, ахрысці і напоўні мяне ў гэты момант Тваім Святым Духам. Я прымаю ўсё, што Ты маеш для мяне, у тым ліку здольнасць гаварыць на розных мовах. Таму цяпер з верай я буду гаварыць на новых мовах! Амэн!*

# ПРЫНАДА ШАТАНА

***Жыць у свабодзе ад смяротнай пасткі крыўды***




У кнізе «Прынада шатана» разглядаецца адзін з найвялікшых падманаў ворага: праз яго вернікі часта перастаюць выконваць Божую волю. Гэта крыўда. Большасць людзей трапляе ў пастку крыўды і нават не заўважае гэтага.

Не падманвайцеся! Хрыстос сказаў: «Згаршэньні ня могуць не прыйсьці» (Лукі 17:1). Вы не выбіраеце, будуць вас крыўдзіць ці не, але вы можаце выбраць, як на гэта рэагаваць. Калі вы правільна падыходзіце да крыўдаў, то робіцеся мацнейшымі, у вашым сэрцы знікае горыч. Толькі правільная рэакцыя дапаможа мець адносіны з Богам, у якіх няма перашкодаў.

Гэтая кніга Джона Бэвіра дапаможа заставацца ў Божай волі і мець свабоду ад падазрэнняў і недаверу. Вы зразумееце, як развітацца з менталітэтам ахвяры і жыць без занепакоенасці і расчаравання. Адкрываючы ў сабе ўсё большую паслухмянасць Богу, вы напоўніце жыццё прабачэннем, прымірэннем і радасцю.

Больш інфармацыі: MessengerX.com

# MessengerX

*Падарожжа вучнёўства для ўсіх і паўсюль*




- **Бясплатна больш чым на 130 розных мовах**
- Праграма для мабільных прыладаў і сайт
- Матэрыялы, распрацаваныя для вашага духоўнага росту
- Магчымасць захоўваць гісторыю праглядаў і свой прагрэс



Даследуйце вялікую бібліятэку матэрыялаў ад Messenger, якія вы можаце глядзець, чытаць і слухаць на ўсіх прыладах: электронныя кнігі, аўдыякнігі, кароткаметражныя фільмы, відэакурсы, Бібліі і многае іншае.




**MessengerX.com**

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

Даступна па ўсім свеце праз App Store і Google Play

У кнізе "Наблізіцца да Бога" Джон Бэвір заклікае не спыняцца на сухім вобразе хрысціянства, якое ведае пра Бога, але не ведае Бога. Цудоўнае запрашэнне Творцы сусвету адкрывае нам магчымасць не толькі здалёк пакланяцца Яму, але і мець настолькі блізкія і насычаныя адносіны з Ім, што вы будзеце ведаць Яго сэрца, а Ён – ваша.

**Магчыма, гэта самае цудоўнае абяцанне ў Бібліі…**
**Бог прагне блізка ведаць вас.**



ДЖОН БЭВІР – вядомы спікер і аўтар бэстселераў, які адважна і непрадузята абвяшчае праўду Божага Слова. Джон і яго жонка Ліза – заснавальнікі служэння Messenger International, якое імкнецца фармаваць пасвячоных вучняў Хрыста, здольных перамяніць гэты свет. Калі Джон бывае дома, ён гуляе з сям'ёй або спрабуе ўгаварыць Лізу згуляць у гольф.

**MessengerX**

Каб бясплатна спампаваць ці праглядзець відэаматэрыялы, наведайце **MessengerX.com**

Даведацца больш

Messenger INTERNATIONAL

Гэтая кніга – падарунак ад аўтара і не падлягае продажу.